Установа адукацыі
"Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"

Факультэт эстэтычнай адукацыі
Кафедра тэорыі і методыкі выкладання мастацтва

(рэг. № УМ 30-01мм 185-2025)

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры
__________ Ю.Ю. Захарына
24.09 2025 г.

УЗГОДНЕНА
Намеснік дэкана
па вучэбнай рабоце
__________ І.Э.Цішкевіч
25.09 2025 г.

# ЭЛЕКТРОННЫ ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# "МАСТАЦТВА СТАРАЖЫТНАГА СВЕТУ І СЯРЭДНІХ СТАГОДДЗЯЎ"

для спецыяльнасці:
6-05-0113-07 "Музычная адукацыя. Прафілізацыя: Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)"

Складальнік: Ю.Ю. Захарына, загадчык кафедры тэорыі і методыкі выкладання мастацтва, доктар мастацтвазнаўства, прафесар

Разгледжаны і зацверджаны
на пасяджэнні Савета БДПУ 25.09 2025 г. пратакол № 1

2025 г.

# ЗМЕСТ

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА ....................................................................................4
I. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ....................................................................................6
КАРОТКІ КУРС ЛЕКЦЫЙ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ..........................................6
ТЭМА 1. МАСТАЦТВА ПЕРШАБЫТНАГА ГРАМАДСТВА ......................................6
ТЭМА 2. МАСТАЦТВА СТАРАЖЫТНЫХ ЦЫВІЛІЗАЦЫЙ. СТАРАЖЫТНЫ ЕГІПЕТ ..........10
ТЭМА 3. МАСТАЦТВА СТАРАЖЫТНЫХ ЦЫВІЛІЗАЦЫЙ. МЕСАПАТАМІЯ...16
ТЭМА 4. МАСТАЦТВА СТАРАЖЫТНЫХ ЦЫВІЛІЗАЦЫЙ. СТАРАЖЫТНАЯ ІНДЫЯ..........17
ТЭМА 5. МАСТАЦТВА СТАРАЖЫТНЫХ ЦЫВІЛІЗАЦЫЙ. СТАРАЖЫТНЫ КІТАЙ..........19
ТЭМА 6. МАСТАЦТВА СТАРАЖЫТНЫХ ЦЫВІЛІЗАЦЫЙ. СТАРАЖЫТНАЯ ЯПОНІЯ..........21
ТЭМА 7. МАСТАЦТВА СТАРАЖЫТНЫХ ЦЫВІЛІЗАЦЫЙ. СТАРАЖЫТНЫ ІРАН..........23
ТЭМА 8. МАСТАЦТВА СТАРАЖЫТНЫХ ЦЫВІЛІЗАЦЫЙ. СТАРАЖЫТНАЯ КАРЭЯ..........27
ТЭМА 9. МАСТАЦТВА СТАРАЖЫТНЫХ ЦЫВІЛІЗАЦЫЙ. СТАРАЖЫТНАЯ МАНГОЛІЯ..........29
ТЭМА 10. МАСТАЦТВА СТАРАЖЫТНАЙ АМЕРЫКІ ..........30
ТЭМА 11. АФРЫКАНСКАЕ МАСТАЦТВА ..........33
ТЭМА 12. АНТЫЧНАЕ МАСТАЦТВА. КРЫТА-МІКЕНСКАЯ КУЛЬТУРА ..........34
ТЭМА 13. АНТЫЧНАЕ МАСТАЦТВА. МАТЭРЫКОВАЯ ГРЭЦЫЯ..........37
ТЭМА 14. АНТЫЧНАЕ МАСТАЦТВА. ЭТРУСКАЯ МАСТАЦКАЯ КУЛЬТУРА 40
ТЭМА 15. АНТЫЧНАЕ МАСТАЦТВА. СТАРАЖЫТНАРЫМСКАЕ МАСТАЦТВА..........41
ТЭМА 16. МАСТАЦТВА СЯРЭДНЯВЕЧЧА. ПЕРАДУМОВЫ ФАРМІРАВАННЯ СТЫЛІСТЫКІ МАСТАЦТВА..........43
ТЭМА 17. МАСТАЦТВА ВІЗАНТЫІ ..........43
ТЭМА 18. ІРЛАНДСКАЕ І ДАРАМАНСКАЕ МАСТАЦТВА..........49
ТЭМА 19. СТАРАЖЫТНАРУСКАЕ МАСТАЦТВА ..........50
ТЭМА 20. РАМАНСКАЕ МАСТАЦТВА ..........54
ТЭМА 21. ГОТЫКА..........56
ТЭМА 22. МАСТАЦТВА СЯРЭДНЕВЯКОВАГА ЎСХОДУ. МАСТАЦТВА ІНДЫІ ..........59
ТЭМА 23. МАСТАЦТВА СЯРЭДНЕВЯКОВАГА ЎСХОДУ. МАСТАЦТВА КІТАЯ ..........61
ТЭМА 24. МАСТАЦТВА СЯРЭДНЕВЯКОВАГА ЎСХОДУ. МАСТАЦТВА ЯПОНІІ..........67
ТЭМА 25. МАСТАЦТВА СЯРЭДНЕВЯКОВАГА ЎСХОДУ. МАСТАЦТВА КАРЭІ ..........68
ТЭМА 26. МАСТАЦТВА СЯРЭДНЕВЯКОВАГА ЎСХОДУ. МАСТАЦТВА МАНГОЛІІ ..........71
ТЭМА 27. МАСТАЦТВА АЗЕРБАЙДЖАНА І СЯРЭДНЯЙ АЗІІ ..........74
ТЭМА 28. МАСТАЦТВА АРАБАЎ ..........76
ТЭМА 29. МАСТАЦТВА КАЎКАЗА ..........79
II. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ..........81
2.1 ПЛАН СЕМІНАРСКІХ ЗАНЯТКАЎ ..........81
2.2 ПРЫКЛАДНАЯ ТЭМАТЫКА ДАКЛАДАЎ НА СЕМІНАРСКІЯ ЗАНЯТКІ..........84
2.3 ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ПА ВЫВУЧЭННІ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ ..........85
Пытанні і заданні да тэмы 1..........85

Пытанні і заданні да тэмы 2 ... 86
Пытанні і заданні да тэмы 3 ... 87
Пытанні і заданні да тэмы 4 ... 87
Пытанні і заданні да тэмы 5 ... 88
Пытанні і заданні да тэмы 6 ... 89
Пытанні і заданні да тэмы 7 ... 89
Пытанні і заданні да тэмы 8 ... 90
Пытанні і заданні да тэмы 9 ... 91
Пытанні і заданні да тэмы 10 ... 92
Пытанні і заданні да тэмы 11 ... 93
Пытанні і заданні да тэмы 12 ... 94
Пытанні і заданні да тэмы 13 ... 95
Пытанні і заданні да тэмы 14 ... 97
Пытанні і заданні да тэмы 15 ... 98
Пытанні і заданні да тэмы 17 ... 99
Пытанні і заданні да тэмы 18 ... 100
Пытанні і заданні да тэмы 19 ... 100
Пытанні і заданні да тэмы 20 ... 102
Пытанні і заданні да тэмы 21 ... 103
Пытанні і заданні да тэмы 22 ... 104
Пытанні і заданні да тэмы 23 ... 104
Пытанні і заданні да тэмы 24 ... 105
Пытанні і заданні да тэмы 25 ... 105
Пытанні і заданні да тэмы 26 ... 106
Пытанні і заданні да тэмы 27 ... 107
Пытанні і заданні да тэмы 28 ... 107
Пытанні і заданні да тэмы 29 ... 108
III. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ ... 110
3.1 КРЫТЭРЫІ АЦЭНЬВАННЯ СТУДЭНТАЎ ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ ... 110
3.2 КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ (ТЭСТЫ) ... 114
Кантрольныя пытанні 1 ... 114
Кантрольныя пытанні 2 ... 116
Кантрольныя пытанні 3 ... 120
Кантрольныя пытанні 4 ... 122
Кантрольныя пытанні 5 ... 125
Кантрольныя пытанні 6 ... 127
3.3 АДКАЗЫ НА КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ (ТЭСТЫ) ... 130
3.4 ПРЫКЛАДНЫЯ ПЫТАННІ ДА ЭКЗАМЕНУ ... 131
IV. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ ... 133
4.1 ВУЧЭБНЫ ПЛАН ... 133
4.2 ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА ... 138
4.3 ГЛАСАРЫЙ ... 204
4.4 СПІС РЭКАМЕНДАВАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ ... 213
4.5 СПІС ІЛЮСТРАЦЫЙ ДЛЯ ПАДРЫХТОЎКІ ДА КАЛЁКВІЎМАЎ ... 215

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

У адпаведнасці са стандартам і вучэбным планам спецыяльнасці 6-05-0113-07 "Музычная адукацыя. Прафілізацыя: Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)" вучэбная дысцыпліна "Мастацтва Старажытнага свету і Сярэдніх стагоддзяў" ўваходзіць у модуль "Дысцыпліны прафілізацыі" кампанента ўстановы адукацыі. У аснову структурыравання вучэбнага матэрыялу пакладзены гістарычны, відава-жанравы, стылявы і мастацка-вобразны падыходы, якія вызначаюць логіку выкладання дысцыпліны. З мэтай грунтоўнага вывучэння студэнтамі асаблівасцей развіцця мастацкай культуры ў краінах Еўропы, Амерыкі, Азіі, Афрыкі прапануецца паслядоўнае асваенне эвалюцыі мастацкіх вобразаў архітэктуры, выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ад першабытных часоў па Сярэднія стагоддзі.

Мэтай электроннага вучэбна-метадычнага комплекса па вучэбнай дысцыпліне "Мастацтва Старажытнага свету і Сярэдніх стагоддзяў" з'яўляецца павышэнне ўзроўню ведаў, уменняў і навыкаў у галіне тэорыі і гісторыі мастацтва ў сістэме прафесійнай падрыхтоўкі выкладчыкаў вучэбнага прадмета "Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура"). Электронны вучэбна-метадычны комплекс дае магчымасць самастойнага вывучэння асобных тэм вучэбнай дысцыпліны у адпаведнасці з вызначанымі ў вучэбнай праграме патрабаваннямі да ўзроўню асваення матэрыялу; паглыбленага вывучэння і паўтарэння асобных раздзелаў; удасканалення ўзроўню ведаў аб мастацкім жыцці ў перыяд першабытнага ладу, Антычнасці і Сярэднявечча, мастацкіх вобразах, шэдэўрах мастацтва, карысных пры падрыхтоўцы да калёквіўмаў, тэстаў, кантрольных работ, экзамену.

З мэтай павышэння якасці адукацыі пры вывучэнні дысцыпліны "Мастацтва Старажытнага свету і Сярэдніх стагоддзяў" студэнтам спецыяльнасці 6-05-0113-07 "Музычная адукацыя. Прафілізацыя: Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)" рэкамендуецца:

1. для замацавання ведаў – па выніках вывучэння кожнай тэмы адказаць на пытанні і выканаць заданні да адпаведнай тэмы, прыведзеныя ў электронным вучэбна-метадычным комплексе; прагледзіць ілюстрацыі да адпаведнай тэмы, што прапануюцца да калёквіўмаў;

2. для набыцця новых ведаў – рыхтаваць паведамленні (даклады) па прапанаваных тэмах (прыведзены ў раздзеле кантролю ведаў), азнаёміцца са спецыфікай мастацкай культуры адпаведнага тэме перыяду па прапанаванай літаратуры (спіс прыведзены у дапаможным раздзеле), на прыкладзе твораў, што экспануюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўным гістарычным музеі (Мінск), на часовых выставах, у галерэях мастацтва Беларусі;

3. для выпрацоўкі ўменняў і навыкаў аналізу мастацкіх твораў – прааналізаваць адзін з твораў мастацтва (на выбар студэнта) па адпаведнай тэме, схематычна выявіць яго.

Электронны вучэбна-метадычны комплекс уключае *тэарэтычны раздзел*, у якім прыведзены кароткі курс лекцый па вучэбнай дысцыпліне; *практычны раздзел*, які ўключае план семінарскіх заняткаў, прыкладную тэматыку дакладаў (паведамленняў) на семінарскія заняткі, пытанні і заданні па вывучэнні вучэбнага матэрыялу, *раздзел кантролю ведаў*, у якім падаюцца крытэрыі ацэньвання студэнтаў па дысцыпліне, кантрольныя пытанні (тэсты), адказы на кантрольныя пытанні (тэсты), прыкладныя пытанні да экзамену; *дапаможны раздзел*, у якім прадстаўлены вучэбны план навучання студэнтаў па спецыяльнасці 16-05-0113-07 "Музычная адукацыя. Прафілізацыя: Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)", вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне "Мастацтва Старажытнага свету і Сярэдніх стагоддзяў", гласарый, спіс рэкамендаванай літаратуры, спіс ілюстрацый для падрыхтоўкі да калёквіўмаў. Дадаецца *тлумачальная запіска* у якой даюцца парады і рэкамендацыі па арганізацыі работы з вучэбна-метадычным комплексам. Электронны вучэбна-метадычны комплекс утрымлівае *гіперспасылкі* на ілюстрацыйны матэрыял.

Матэрыял тэатрэтычнага раздзелу дае магчымасць самастойнага вывучэння дысцыпліны "Мастацтва Старажытнага свету і Сярэдніх стагоддзяў" ад вытокаў па эпоху Сярэднявечча. Для лепшага асваення вучэбнага матэрыялу студэнтам прапануецца вывучыць тэму, адказаць на пытанні і выканаць заданні да яе, а па выніках вывучэння раздзелаў – адказаць на кантрольныя пытанні ў форме тэстаў самаправеркі ведаў, адказы якія прыведзены ў раздзеле кантролю ведаў. Да семінарскіх заняткаў рэкамендуецца рыхтавацца па матэрыялах кароткага курса лекцый, а таксама з выкарыстаннем крыніц, пададзеных у дапаможным раздзеле.

Практычны раздзел служыць асновай для самастойнай падрыхтоўкі да семінарскіх заняткаў.

Раздзел кантролю ведаў дапаможа пры выбары тэм і афармленні навукова-даследчых работ, пры падрыхтоўцы да экзамену.

Дапаможны раздзел носіць інфармацыйна-метадычны характар. У ім прадстаўлены спецыяльныя тэрміны і паняцці, крыніцы (у тым ліку, рэсурсы аддаленага доступу), якія рэкамендуецца ведаць пры вывучэнні дысцыпліны.

# I. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## КАРОТКІ КУРС ЛЕКЦЫЙ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

### ТЭМА 1. МАСТАЦТВА ПЕРШАБЫТНАГА ГРАМАДСТВА

Паняцце “мастацтва” развівалася гістарычна. У Старажытнай Грэцыі мастацтва (“techné”) разумелася як майстэрства, уменне, спрытнасць, рамяство, г. зн. завершанасць твора, яго выражанасць. Techné як адзін з кампанентаў мастацтва выступала не толькі ў ролі духоўнай дзейнасці чалавека, але ўключала і матэрыяльную складаючую, увасабленне творчых пошукаў чалавека. У сучасным разуменні старажытнагрэчаская трактоўка techné падобна па свім семантычным значэнні да паняцця “майстэрства”, умелага выканання якога-небудзь рода дзейнасці.

Асобным кампанентам techné ў Старажытнай Грэцыі былі “мусічныя мастацтвы”. Да мусічных мастацтваў (ад грэч. musa – чалавек, які думае) адносіліся 9 відаў, якімі згодна міфалогіі кіравалі дачкі Зеўса і Мнемасіны:

1. Эрата – муза паэзіі пра каханне;
2. Эўцерпа – муза лірычнай паэзіі;
3. Каліопа – муза эпічнай паэзіі і навукі;
4. Кліо – муза гісторыі;
5. Мельпамена – муза трагедыі;
6. Палігімнія – муза паэзіі гімнаў;
7. Тэрпсіхора – муза танцаў і харавых спеваў;
8. Талія – муза камедыі;
9. Уранія – муза астраноміі.

У перыяд сярэднявечча было вылучана “сем вольных мастацтваў”, якія налічвалі найбольш значныя для таго часу навуковыя напрамкі – граматыку, геаметрыю, арыфметыку, астраномію, рыторыку, дыялектыку, музыку; сярод мастацтваў у сучасным разуменні была вылучана толькі музыка. Сучаснае ўяўленне пра мастацтва бярэ свой пачатак з часоў Адраджэння, калі мастацкая культура пачынае класіфікавацца па відах. У Новы час мастацтва развіваецца ў межах пануючых стыляў і кірункаў (барока, класіцызм, ракако і г. д.), якія маюць сваю праграму, правілы, нормы, прынцыпы. З сярэдзіны XIX ст. вялікую ролю ў развіцці мастацтва адыгрываюць дасягненні навукі і тэхнікі (фатаграфія, кіно, кампьютэрная графіка). Сучаснае мастацтва ўключае шмат відаў, родаў і жанраў.

**§ Тэорыі паходжання мастацтва**

Існуе мноства тэорый паходжання мастацтва, у якіх даказваецца першанства вылучэння таго ці іншага віда мастацкай творчасці. Сярод іх асобна вылучаюцца:

1. Тэорыя з’яўлення арнаменту.

Агульнавядомы факт, што камень служыў першабытнаму чалавеку матэрыялам для вынаходніцтва зброі і прылад працы. Першапачаткова

каменныя сякеры не мелі рукаятак. З часоў свайго з’яўлення рукаятка злучалася з сякерай пры дапамозе больш ці менш трывалых звязак. Пазней людзі навучыліся злучаць сякеру з рукаяткай без звязак, на месцы якіх з’явілася адлюстраванне апошніх (перакрыжаваныя ці паралельныя лініі выконвалі функцыю ўпрыгажэння). З цягам часу ўзніклі “геаметрычныя” ўпрыгажэнні, якія ўтваралі своеасаблівы *арнамент*.

Вялікую ролю ў распаўсюджанні арнаменту адыграла ганчарнае мастацтва, якому папярэднічала пляценне. Шмат матываў для арнаменту дало і ткацтва. З таго моманту, калі людзі навучыліся апрацоўваць металы, побач з прамымі лініямі пачалі ўжывацца і крывыя. Узоры арнаментыкі паступова развіваліся, ускладняліся і удасканальваліся. Паступова ў адносінах да прадметаў у першабытнага чалавека побач з вырашэннем утылітарна-практычных задач вылучыўся і эстэтычны аспект.

2. Тэорыя эстэтызацыі асяроддзя жыццядзейнасці чалавека.

Першабытны чалавек у пошуках месца, якое ахоўвала бы яго ад дзікіх жывёл і сутыкненняў з ворагамі, прыстасоўваў пячоры і гроты ў скалах пад жыллё. Сцены пячор упрыгожваліся *малюнкамі*, на якіх выяўляліся жывёлы, што шанаваліся першабытным чалавекам, адлюстроўваліся сцэны палявання. Імкненне ўпрыгожыць сваё жыллё мела ў аснове эстэтычны характар.

3. Тэорыя “макарон”.

Найбольш раннімі пячорнымі выявамі, захаванымі да нашага часу, з’яўляюцца адбіткі рук чалавека і шэрагі пераплеценых паміж сабой хвалепадобных ліній, якія нагадваюць макароны. Такія *графічныя* ўзоры абстрактнага характару ствараліся шляхам праскрабання малюнка пальцамі рук па сырой гліне і не мелі ўтылітарнага прызначэння. Яны не адыгрывалі ролю іканаграфічных знакаў, не неслі інфармацыйнай нагрузкі, а выконвалі функцыю ўпрыгажэння, арнаментацыі.

**§ Перыядызацыя мастацкай культуры першабытных часоў**

У сваім развіцці мастацтва першабытнага грамадства прайшло шэраг паслядоўных этапаў, якія адпавядаюць перыядам гісторыі чалавецтва гэтага часу:

I. Каменны век:

1. Палеаліт (ад грэч. palaiós – старажытны і litos – камень) – старажытны каменны век [2 млн. – X тыс. да н. э.]:

1.1. Арыньяк-Салютрэйскі перыяд [XXXV–XX тыс. да н. э.];

1.2. Мадлен [XX–X тыс. да н. э.];

2. Мезаліт (ад грэч. mésos – сярэдні і litos – камень) – сярэдні каменны век [X–VI тыс. да н. э.];

3. Неаліт (ад грэч. néos – новы і litos – камень) – новы каменны век [VI–II тыс. да н. э.].

II. Бронзавы век [II–I тыс. да н. э.].

III. Жалезны век [I тыс. да н. э. – I-я стст. н. э.].

Культура першабытнага грамадства мела сінкрэтычны характар. *Сінкрэтызм* – гэта непадзельнасць матэрыяльнай і духоўнай культуры, паўсядзёнага жыцця і мастацкай творчасці. Першабытны чалавек не

размяжоўваў віды дзейнасці. У сінкрэтызме са штодзённымі рытуаламі развіваліся розныя віды мастацкай культуры.

**§ Асаблівасці развіцця першабытнага мастацтва**

Першыя спробы ў мастацкай культуры датуюцца XXXV тыс. да н. э. З перыяду палеаліту да нашых дзён захаваліся каменныя пліты з рэльефным малюнкам, а таксама маляваныя выявы жывёл, якія прадстаўлены наскальным жывапісам. Па выніках разнастайных археалагічныя раскопак вядома, што людзі гэтых часоў уладкоўвалі жыллё. Першымі месцамі жылля неандэртальцаў былі пячоры і гроты ў скалах. З цягам эвалюцыі першабытны чалавек, вымушаны перасоўвацца з месца на месца ў пошуках ежы, пачаў бадаваць жыллё на адкрытай прасторы – *зямлянкі*, якія ўяўлялі невялікія паглыбленні ў зямлі авальнай формы. Падлога зямлянак была ўтрамбаванай, пасярэдзіне разводзілі вогнічша. У якасці канструкцыйных элементаў сцен жылля нярэдка выкарыстоўвалі галінкі і тонкія ствалы дрэў, а таксама косці і біўні мамантаў. З мэтай захавання цяпла сцены зямлянак пакрывалі галінкамі, травой і скурай (футрай) жывёл. Для абароны ад дажджу і ветру ўладкоўвалі ветравы заслон або павець з пальмавых лісцеў (у Афрыцы). Так паступова з'явіўся *шалаш*. Разам з жыллёвай архітэктурай з'яўляецца і мемарыяльная. Вядома, што для пахавання сваіх продкаў першабытныя людзі стваралі спецыяльныя ямы-пахаванні.

Першыя спробы жывапісу звязаны з выкарыстаннем мінеральных фарбаў, пераважна вохры. Самыя вядомыя *пячорныя роспісы* перыяду палеаліту, захаваныя да нашага часу, знаходзяцца ў Іспаніі (пячоры Касцільё, Альтаміра, Хорнас дэ ла Пенья) і ў Францыі (пячоры Ля Мадлен, Фон дэ Гом, Ляско). З'яўляецца круглая скульптура, якую вырабляюць з косці, рагоў жывёл ці з дрэва. Галоўным *вобразам у скульптуры* з'яўляецца *жанчына-маці*. Найбольш праслаўленая скульптура гэтага часу – "Венера Вілендорфская" (па назве мястэчка ў Аўстрыі, дзе была знойдзена), для якой характэрна зглажванне канечнасцяў, малавыразная прапрацоўка галавы. У перыяд Мадлен асноўным вобразам становяцца *жывёлы, прадстаўленыя ў руху* (маманты, алені, бізоны, коні). Жывёлы выяўляюцца вельмі натуралістычна. У перадачы вобразаў выкарыстоўваецца прыём стылізацыі – абагульненне з мэтай зрабіць матыў больш зразумелым для ўспрымальніка, а таксама палегчыць яго выкананне для мастака.

У перыяд мезаліту наскальны жывапіс па-ранейшаму застаецца вядучым відам мастацкай творчасці. Але ў параўнанні з папярэднім перыядам ў наскальным жывапісе з'яўляецца кампазіцыя. Галоўнае месца ў жывапісе займае вобраз чалавека, які выяўляецца схематычна, але дынамічна і адлюстроўвае пэўнае дзеянне. У адлюстраванні сцэн палявання мастакі выкарыстоўваюць знакава-сімвалічную мову (пячора Тасілі ў Сахары, Афрыка). Найбольш яскравыя помнікі мастацтва гэтага перыяду захаваліся ў пячорах на Каўказе і ў Іспаніі.

Перыяд неаліту пакінуў шматлікія творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. У гэты час кожная рэч упрыгожвалася арнаментам, які адлюстроўваў унутраны свет чалавека. З'яўляюцца стылізаваныя,

абстрактныя матывы, якія складваюцца ў завершаны арнамент з крыжоў, спіраляў, трохкутнікаў. Пачынае развівацца тэхніка разьбы, пры дапамозе якой вырабляюць жаночыя статуэткі.

У часы неаліту дэкаратыўны напрамак развіваецца ў аздабленні адзення, зброі, посуду; пашыраюцца тэхнікі разьбы, вышыўкі, аплікацыі. У арнаментыцы адлюстроўваюцца салярныя і лунарныя сімвалы. Сімвалам сонца былі круг, круг з кропкай, крыж, крыж упісаны ў круг, свастыка. Луну адлюстоўвалі ў выглядзе серпападобных насечак.

Значныя змены адбываюцца ў архітэктуры. У гэты час жыллё пачынаюць будаваць з каменю. Звычайна гэта круглыя, авальныя або прамавугольныя ў плане дамы (захаваліся ў басейне Эгейскага мора), складзеныя з дробнага каменю на гліняным растворы або з сырца.

Эпоха бронзы славіцца *мегалітычнай архітэктурай* (ад грэч. mégas – вялікі і litos – камень). Мегалітычная архітэктура мела культавы характар. Асноўнымі тыпамі мегалітычнай архітэктуры з’яўляюцца:

1. Менгір (ад брэтон. men – камень і hir – доўгі). Менгіры ўяўляюць вертыкальна пастаўленыя каменныя пліты даўжынёй больш 4 м. Менгіры ставіліся ў значных з пункту гледжання старажытных вераванняў месцах. Часам менгіры пакрываліся гравіраваным арнаментам з адлюстраваннем вобразаў жывёл.

2. Дальмен (ад брэтон. tol – стол і men – камень). Дальмен уяўляў канструкцыю з трох або пяці велізарных камянёў, адзін з якіх служыў перакрыццем, а іншыя ўтваралі апоры. Дальмен з’яўляецца правобразам першага храма.

3. Кромлех (ад брэтон. crom – круг і lech – камень). Кромлех утвараў круглае ў плане збудаванне з велізарных камянёў. Па розных тэорыях кромлех уяўляе сабой першую абсерваторыю або культавую пабудову. У найлепшым стане да сённяшняга часу захаваўся кромлех Стоўнхэндж у Англіі.

4. Каменныя шары цэнтральнаамерыканскай дзяржавы Коста-Рыка. Знойдзены па ўсёй тэрыторыі Коста-Рыка. Маюць розныя памеры да 3 м у дыяметры. Найбольш вялікія важаць каля 16 т. Пры тым, што яны выраблялiся з апсідзіяну і мелі значныя памеры, адхіленні дыяметру складаюць не больш 8 мм. Прызначэнне шароў невядома. Але існуе тэорыя, згодна якой размяшчэнне шароў паўтарала карту зорнага неба або карту сусвету.

Шырокае распаўсюджанне ў бронзавым веку атрымалі *свайныя канструкцыі пабудоў*. На тэрыторыі Італіі існавала ўласная канструкцыя жылля – тэрамары (разнавіднасць свай). Гэта былі драўляныя зрубы, што запаўняліся каменем і глінай. На іх уладкоўвалі памосты, на якіх узводзілі жыллё ў выглядзе круглых у плане хацін.

У перыяд Жалезнага веку з’яўляецца і пашыраецца жалезная зброя, якая ўпрыгожвалася арнаментам. Вядучым відам мастацкай творчасці з’яўляецца дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. З гэтага часу захаваліся жалезныя і бронзавыя прылады працы, жалезная зброя, залатыя

ўпрыгожванні, аздобленыя гравіраваным арнаментам. Асноўным матывам арнаментыкі гэтага часу з'яўляецца геаметрычны.

## ТЭМА 2. МАСТАЦТВА СТАРАЖЫТНЫХ ЦЫВІЛІЗАЦЫЙ. СТАРАЖЫТНЫ ЕГІПЕТ

### § Агульная характарыстыка і перыядызацыя мастацкай культуры

Адной з самых старажытных цывілізацый з'яўляецца цывілізацыя Старажатнага Егіпта, зараджэнне якой адносяць да канца IV тыс. да н. э. Мастацкая культура Старажытнага Егіпта прайшла ў сваім развіцці шэраг паслядоўных стадый:

1. Дадынастычны перыяд (V–IV тыс. да н. э.).
2. Ранняе царства (XXX–XXVIII стст. да н. э.).
3. Старажытнае царства (XXVIII–XXIII стст. да н. э.).
4. Сярэдняе царства (XXI–XVIII стст. да н. э.).
5. Новае царства (XVI–XI стст. да н. э.).
6. Познеегіпецкі перыяд (сяр. XI ст. да н. э. – 332 г. да н. э.).
7. Элiнiстычны перыяд (332–30 гг. да н. э.).

У III тыс. да н. э. склалася дзяржаўнасць. На першапачатковым этапе формай кіравання была тыранія. У гэты час Егіпет не меў моцных сувязей з іншымі краінамі свету. На чале дзяржавы стаялі дэспат-фараон і вярхоўныя жрацы. Войны, якія вёў Егіпет з суседнімі народамі, служылі крыніцай для папаўнення колькасці рабоў. Кіруючая вярхушка грамадства была зацікаўлена ў назменнасці існуючых сацыяльных адносін. Для духоўнай культуры Егіпта былі характэрны ўяўленні аб нязменнасці ўсталяванага парадку. Быт і культура адрозніваліся кансерватыўнасцю, устойлівымі традыцыямі. У перыяд Сярэдняга царства мяняецца форма кіравання і Егіпет паступова пашырае сувязі з навакольным светам. На працягу ўсіх перыядаў вельмі моцным уплывам на ўсе сферы чалавечага жыцця валодала міфалогія.

У Старажытным Егіпце існавала развітая пісьменнасць. Высокага ўзроўню дасягнула мастацтва. Вядучымі відамі мастацкай культуры на працягу ўсіх перыядаў заставаліся архітэктура і скульптура.

### § Архітэктура

Вялікае значэнне ў перыяд Ранняга царства атрымаў культ памерлых. Першыя пахаванні ўяўлялі яму, над якой насыпалі ўзгорак з камянёў і галькі. Крыху пазней для захавання насыпі і надання ёй правільнай формы яе пачалі абмазваць ілам і абмуроўваць цэглай. Форма і памеры грабніцы залежалі ад маёмаснага становішча ўладальніка. Сустракаліся адна- і шматкамерныя пахаванні. Сцены грабніц былі масіўнымі і мелі невялікі нахіл да цэнтру. Такія пабудовы атрымалі назву "*мастабы*" (з араб. – літаральна, каменная лаўка).

Мастабы працягвалі будаваць і перыяд Старажытнага царства, на іх аснове паступова з'явіліся *пірамiды*. Доказам сувязі мастаб з пірамідамі з'яўляецца знакамітая піраміда фараона Джосэра (XXVIII ст. да н. э.) – самая ранняя з вядомых пірамід. Першапачаткова грабніца фараона Джосэра мела форму мастабы. Але ў працэсе будаўніцтва ўзнікла патрэба павелічэння

наземнай часткі грабніцы па вертыкалі. На першую мастабу паставілі яшчэ тры, кожная з якіх была меншай па памерах. У далейшым яе павысілі яшчэ на дзве ступені, а для захавання прапорцый павялічылі агульныя памеры піраміды. У выніку піраміда Джосэра (арх. Імхатэп) атрымала вышыню 60 м з аснаваннем памерамі 109,2 х 121 м.

Старажытныя егіпцяне верылі, што ў замагільным свеце душа памерлага працягвае жыць, пакуль захоўваецца яго цела. Целы памерлых муміфіцыраваліся сродкам бальзаміравання, а для захавання мумій будавалі грабніцы. Каб працягнуць жыццё фараона пасля яго смерці ў іншым свеце ў грабніцу ставілі статую-двайнік памерлага, у якую ў выніку знікнення цела павінна была перасяліцца душа. Грабніца лічылася адвечным домам памерлага, таму формы грабніц былі падобныя да архітэктуры жылля. Грабніца фараона будавалася на працягу ўсяго яго царствавання. Фараон валодаў неабмежаванай уладай. Усе рэсурсы краіны і ўсе жыхары былі ў яго прыватным распараджэнні, што дазваляла ўзводзіць усыпальніцу грандыёзнай. Грабніца ўяўляла сабой велізарнае, складзенае з каменных блокаў збудаванне ў форме чатырохграннай піраміды. У глыбіні піраміды знаходзілася пахавальная камера, дзе стаяў саркафаг з муміяй. Каля велізарных пірамід фараонаў размяшчаліся групамі піраміды меншых памераў – грабніцы вышэйшай знаці. Пры пірамідзе будаваўся памінальны храм, які складаўся з некалькіх невялікіх памяшканняў. Масіўныя сцены і слупы гэтых храмаў былі выкладзены з вялікіх, гладка абчасаных камянёў. Тры буйныя піраміды, захаваныя да нашага часу – Хеопса (146,6 м), Хефрэна (143,3 м) і Мікерына (62 м) знаходзяцца на заходнім беразе Ніла. Непадалёк ад піраміды Хефрэна ўзвышаецца велізарная фігура *сфінкса*. Яна высячана з вялікай скалы і нагадвае фігуру ляжачага льва. Галава сфінкса мае партрэтнае падабенства з фараонам Хефрэнам. У старажытнасці фігура сфінкса мела афарбоўку, ад якой зараз мала што захавалася. На галаве фараона апрануты клаўт – галаўная хустачка з двума канцамі на плячах, упрыгожанымі папярочнымі паласамі. Гэта найбольш грандыёзная скульптура, захаваная да нашага часу. Яе вышыня складае 20 м, даўжыня – 57 м.

У перыяд Сярэдняга царства праводзіліся ірыгацыйныя работы, раслі гарады, развівалася гарадское жыццё і культура. Піраміды фараонаў гэтага перыяду значна меншыя па памерах. Затое большая ўвага надаецца будаўніцтву *храмаў*. Многія грабніцы гэтага часу ўваходзяць у комплекс храмаў. Цікавым па архітэктурнай задуме з’яўляецца замагільны храм фараона Аменемхета III. У сучасны перыяд ад яго захавалася мала, але па апісаннях старажытных грэкаў вядома, што ён меў велізарныя памеры. Грэкі назвалі храм *Лабірынтам* (ад троннага імя Аменемхета III – Німаатр, у грэчаскім вымаўленні – Лабір). Па апісаннях Герадота вядома, што Лабірынт меў 12 крытых залаў, злучаных паміж сабой у адно памяшканне. Шэсць з іх былі звернуты на поўдзень, шэсць – на поўнач. Звонку яны былі акружаны масіўнай сцяной. Пры гэтым пакояў у Лабірынце існавала 3 тысячы: па 1,5 тысячы з кожнага боку. Некаторыя пакоі былі падземнымі, іншыя –

наземнымі. Сярод іх былі залы, малельні, калідоры, сховішчы і інш. Дах і сцены ўсіх пакояў былі зроблены з каменю. Сцены паўсюль пакрыты рэльефамі. Кожная зала мела калоны з белага мармуру. У завяршэнні Лабірынта знаходзілася піраміда – усыпальніца фараона.

У перыяд Сярэдняга царства зараджаецца форма храма, якая атрымала развіццё ў перыяд Новага царства. Распаўсюджанне атрымліваюць грабніцы ў выглядзе пячорных залаў, высячаных у скале. Адным з самых знакамітых архітэктурных збудаванняў гэтага часу з'яўляецца храм фараона Ментухатэпа I. Гэта складаны комплекс збудаванняў, які ўключае скальныя грабніцы, храмавыя двары і залы з манументальнымі каланадамі, размешчанымі на трох вялікіх тэрасах, што паслядоўна ўзвышаюцца.

У XVII ст. да н. э. на тэрыторыю Егіпта ўварваліся ваяўнічыя плямёны гіксаў (жыхары гор), якія захапілі ўладу ва ўсіх раёнах краіны, акрамя сталіцы – г. Фіваў. Бойка за тэрыторыю Егіпта цягнулася амаль стагоддзе, і ў XVI ст. да н. э. егіпецкі фараон Яхмос выгнаў гіксаў за межы краіны, паклаўшы пачатак новаму перыяду ў гісторыі Егіпта. У перыяд Новага царства вядучым тыпам архітэктуры становіцца храм. Першыя храмавыя пабудовы яшчэ маюць падабенства з архітэктурнымі комплексамі папярэдняга перыяду. Адным з буйных храмавых комплексаў Новага царства з'яўляецца храм царыцы Хатшэпсут. Па планіровачнай структуры і аздабленні храм Хатшэпсут падобны да храма Ментухатэпа I, узведзенага ў перыяд Сярэдняга царства. *Храм* размешчаны ў скалах *на трох тэрасах*. Аднак, у адрозненне ад храмаў Сярэдняга царства храм Хатшэпсут пазбаўлены пахавання. Да храма вядзе доўгая дарога, па баках якой праз кожныя 10 м стаяць зробленыя з пясчаніка статуі сфінксаў. У выявах сфінксаў вобраз фараона ўвасоблены з усімі атрыбутамі цара – з клаўтам (хусткай), падвіснай барадой, але ў той жа час з тварам жанчыны – царыцы Хатшэпсут. Храм паўсюль упрыгожаны рэльефамі, статуямі і роспісамі. Статуі, рэльефы і столя афарбаваны. Падлога некаторых залаў дэкарыравана золатам і срэбрам. Да ніжняй тэрасы храма датыкаюцца два маленькіх свяцілішчы: адно прысвечана богу-шакалу Анубісу, другое – багіні-карове Гатор (Хатхор). Свяцілішча багіні Гатор падтрымліваюць калоны з капітэлямі ў выглядзе галавы жанчыны з ушамі каровы.

У перыяд Новага царства фараоны працягваюць будаваць грабніцы. Па прычыне магчымага абрабавання грабніц іх будуюць у скалах, асобна ад замагільных храмаў. Найбольшую цікавасць у гэты перыяд уяўляе грабніца фараона Тутанхамона, адкрытая ў 1922 г. англійскім археолагам Картэрам. Грабніца мае Т-падобную форму. Да яе вядзе лесвіца, што завяршаецца дзвер'ю, за якой адкрываецца праход. У праходзе маецца дзве дзверы: адна вядзе ў кладавую, другая – у пахавальны пакой. У пахавальным пакоі раней знаходзіўся алебастравы саркафаг у форме чалавечага цела, у якім памяшчаліся 7 устаўленыя адна ў адну труны (зараз – у Нацыянальным Каірскім музеі). Тры з іх былі зроблены з золата і інкрусціраваны каляровай пастай з каштоўнымі камянямі. У апошнім ляжала мумія Тутанхамона. У

сумежных з пахавальняй пакоях захоўваліся мэбля, калесніцы, мадэлі караблей, адзенне, начынне.

З цягам эвалюцыі ў Егіпце складваецца і распаўсюджваецца *новы тып храма*. Ён складаецца з *размешчаных адзін за адным двара, залы і свяцілішча*. Храм абнесены глухой сцяной. Да яго вядзе дарога, па баках якой на працягу сотняў метраў стаяць барашкі або сфінксы – фігуры ільвоў з чалавечымі галавамі. Галоўны фасад храма ўяўляў сабой два пілона (вежападобнае масіўнае збудаванне, якое пашыраецца да нізу), паміж якімі размешчаўся ўваход. Часам пілоны былі аб’яднаны ў адзіныя магутныя вароты. Фасад пакрываўся надпісамі і рэльефнымі выявамі. За ўваходнымі пілонамі знаходзіўся гіпасцільны двор (перасечаны калонамі). За дваром – зала з велізарнымі калонамі, таксама пакрытымі выявамі і надпісамі ў выглядзе лотасу, трыснягу, вераску, папірусу і акенцамі на столях. Калоны былі масіўнымі, а прамежкі паміж імі вузкімі. За залай размяшчалася цёмнае свяцілішча. Храм уяўляў сабой вобраз нільскіх берагоў. Найбольш буйныя храмы гэтага часу захаваліся сёння ў Луксоры і Карнаку. Іншы знакаміты храм гэтага перыяду – храм Рамсеса II (Рамесеўм), які ўяўляе сабой некалькі гіпасцільных залаў, свяцілішча і палац фараона з пакоямі, канюшняй, сховішчамі. Увесь комплекс мае каланады і ўпрыгожаны манументальнымі скульптурамі Рамсеса II велізарных памераў (20 м увышыню).

У 671 г. да н. э. Егіпет быў заваяваны Асірыяй. Барацьбу з асірыйцамі пачалі жыхары заходніх рэгіёнаў Егіпта, якія пасля перамогі заснавалі новую сталіцу – г. Саіс. Буйныя вельможы новай дынастыі ўзводзілі грабніцы, якія па форме нагадвалі мастабы Ранняга і Старажытнага царстваў. Аднак кіраўніцтва Саіскай дынастыі было нядогім. У 525 г. да н. э. Егіпет быў заваяваны персамі, якія кіравалі каля 200 г. да іх перамогі войскам Аляксандра Македонскага ў 332 г. да н. э. Егіпецкія жрацы падтрымалі вызваленне Аляксандрам краіны і аб’явілі яго “Сынам Ра, які любіць Амона”. У дэльце Ніла Аляксандр пабудаваў новы горад – Александрыю, які ў IV ст. да н. э. стаў буйнейшым гандлёвым і культурным цэнтрам грэка-усходняга свету. Вялікае будаўніцтва вялося ў Егіпце пасля смерці Македонскага, пры яго пераемніках – царах македонскай дынастыі – Пталемеях. Пталемеі будавалі храмы па старажытных егіпецкіх традыцыях. Найбольш буйнымі храмамі гэтага перыяду з’яўляюцца храм Гора ў Эдфу і храм Ісіды на в. Філе. У параўнанні з папярэднімі перыядамі храмы элiністычнага Егіпта больш масіўныя і складаныя па планіроўцы, маюць большую колькасць калон, аднак, многія архітэктурныя формы, якія раней мелі ўтылітарнае прызначэнне, у элiністычны перыяд набылі дэкаратыўны характар.

Сцены храмаў Старажытнага Егіпта часта ўпрыгожваліся *каменнымі рэльефамі*. Рэльеф вонкавых сцен прысвячаўся шанаванню магутнасці фараона і выяўляў вайсковыя і паляўнічыя сцэны. Сцены інтэр’ераў адлюстроўвалі сюжэты культавага характару (храм Рамесеўм, храм у Карнаку). Найбольшую цікавасць заслугоўваюць слупы, пілоны і калоны. Калоны з’явіліся ў перыяд Старажытнага царства ў Сакары. Капітэлі першых калон мелі форму кветкі папіруса. У больш позні перыяд на слупах і калонах

з’яўляюцца выявы кветак лотаса (гранітныя слупы Тутмоса III перад Карнакскім свяцілішчам). Разьба па каменю ўжывалася і ў грабніцах (рэльефныя фрызы, стэлы), і для аздаблення саркафагаў.

У егіпецкай архітэктуры быў вынайдзены *ордэр* (ад лац. ordo – парадак) – характэрнае для пэўнай краіны і эпохі разуменне суадносінаў бэлечна-стоечнай канструкцыі. Калоны егіпецкага ордэра прадстаўлены 6-цю тыпамі:

1. Папірусападобная з адкрытым ці закрытым бутонам (асноўны тып калоны Новага царства);
2. Лотасападобная;
3. Пальмападобная;
4. Са складанай ці кампазітнай капітэллю;
5. З гатарычнай капітэллю (з выявай галавы багіні Гатор);
6. З капітэллю ў выглядзе перавернутага звана (Карнакскі храм).

**§ Выяўленчае мастацтва**

У выяўленчым мастацтве Егіпта існаваў жорсткі *канон*: галава і ногі выяўляліся ў профіль, плечы і вока – у фас, грудзь і жывот – у тры чвэрці. У сваім мастацтве егіпцяне выкарыстоўвалі метад, які дазваляе паказаць усё істотнае ў чалавечай фігуры. Пры гэтым сюжэтныя кампазіцыі выконваліся з захаваннем сацыяльнага значэння асобы: фараоны выяўляліся большымі па памерах, чым рабы. Кампазіцыі на міфалагічную тэматыку па гарызанталі дакладна падзяляюцца на тры часткі: уверсе размяшчаюцца выявы багоў, пасярэдзіне распавядаецца пра зямное жыццё фараонаў, унізе выяўляецца жыццё ў замагільным царстве. Адным з дасягненняў егіпецкага мастацтва з’яўляецца тое, што любая скульптурная, жывапісная ці архітэктурная форма дакладна кладзецца на сваё месца, быццам бы падпарадкоўваецца пэўнаму закону. Так быў сфарміраваны стыль Старажытнага Егіпта. У скульптуры ўсе сідзячыя фігуры трымаюць рукі на каленях; выявы мужчынскіх асоб афарбаваны ў больш цёмны колер, чым жыночыя; аблічча кожнага божаства выяўляецца вельмі дакладна.

У перыяд Новага Царства – *амарнскі* – была зроблена спроба пазбавіцца ад канонаў. Цар Аменхатэп IV паспрабаваў змяніць рэлігійныя ўстаноўкі і ўвёў культ вышэйшага божаства – Атона, які выяўляўся ў выглядзе сонечнага дыска з прамянямі, якія завяршаюцца далонямі на канцах. Сябе ён назваў Эхнатонам (прыбліжаным да бога Атона) і перасяліўся далей ад жрацоў папярэдніх культаў у горад Амарну – Ахетатон (“небасхіл Атона”). Найбольш праслаўленыя рэльефы і роспісы гэтага часу выяўляюць Эхнатона з яго жонкай Ніферціці пад баслаўляючымі прамянямі сонца.

Дэкаратыўны жывапіс Егіпта ўжываўся для аздаблення храмаў, палацаў, жылых дамоў і грабніц. Пры гэтым выкарыстоўваліся наступныя фарбы: чорная, белая, шэрая, сіняя, зялёная, карычневая, чырвоная, ружовая і жоўтая. Фарбы разводзіліся на вадзе з клеям і наносіліся плоскімі мазкамі з дапамогай пэндзэляў, якія выраблялiся з раслінных матэрыялаў. Фрэскавы

жывапіс адлюстоўваў бытавыя сцэны і ўпрыгожваўся геаметрычнымі і раслліннымі матывамі.

**§ Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва**

Важнае значэнне ў развіцці дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва меў камень. Каменныя пасудзіны выраблялiся з базальта, мелі канічную ці цыліндрычную форму. Пасудзіны з цвёрдых парод каменю не мелі дэкора. Выкарыстанне цвёрдых парод каменю ўвогуле характэрна для больш архаічных эпох, у больш познія часы ўжываліся мяккія пароды. Са старажытнага перыяду (неаліт) да нашага часу захавалася блакітная мармурная ваза ў форме дзвюх сіметрычна размешчаных вутак са звязанымі лапамі. З эпохі Новага царства захаваліся алебастравыя пасудзіны, знойдзеныя ў грабніцы Тутанхамона. Кубкі, свяцільні былі дэкарыраваны рэльефнымі выявамі багоў і багінь замагільнага свету. З шыферу выраблялі *палеткі для расціранння фарбаў*. Палеткі звычайна мелі формы жывёл – слана, чарапахі, гіпапатама, рыбы ці антылопы.

Гліняны посуд вядомы з часоў неаліту, а каля 3200 г. да н. э. з’явілася ганчарнае кола. З перыяду Старажытнага царства вырабы пачалі абпальвацца ў печах, а затым пакрывацца роспісамі. З гэтага часу захаваліся фігурныя пасудзіны ў выглядзе жывёл і жаночых фігур. У наступныя эпохі гліняны посуд выцясніўся металічным. Вырабы з фаянсу вядомы з перыяду Ранняга царства. Сіні фаянс выкарыстоўваўся для аздаблення памяшканняў грабніц і для вытворчасці дэкаратыўных элементаў архітэктуры. Фаянсавая плітка выкарыстоўвалася ў г. Амарне, у архітэктурным комплексе Рамсеса II і III. З фаянса выраблялі таксама статуэткі, каралі, пасудзіны, чашы і кубкі.

Росквіт вырабаў са шкла прыпадае на перыяд Новага царства. Першапачаткова з сіняга, затым з паліхромнага шкла выраблялі чашы, флаконы, вазы, пацеркі, амулеты. Егіпцяне ведалі таксама *шкляную мазаіку*.

Поспеху дасягнула ювелірная справа. У класічны перыяд гісторыі Егіпта ў ювелірнай справе ўжывалі фармоўку, паянне, коўку, для нанясення арнаменту выкарыстоўваліся насечка, гравіроўка, залачэнне, штампоўка, цісненне, інкрустацыя, перагародчатая эмаль, зернь, траўленне і афарбоўка. Звычайна дэкор меў у аснове раслінны і анімалістычны матывы.

Шырока ўжывалася драўляная мэбля. Звычайна ў якасці ўпрыгажэнняў выкарыстоўваліся выявы кветак папіруса, лотаса, *ножкі крэслаў мелі завяршэнні ў выглядзе ільвіных лап*. Інкрусціравалася мэбля слановай косцю. Егіпецкая мэбля дадавалася жывапіснымі і скульптурнымі выявамі. Асноўнымі пародамі дрэў былі: сікамор, акацыя, кедр, кіпарыс і чорнае дрэва.

Самабытны характар мае егіпецкае ткацтва. Лён пачалі апрацоўваць ужо ў эпоху неаліта, шэрсць і каноплі ўжываліся рэдка. У перыяд Новага царства распаўсюджанне атрымала шпалерная тканіна з узорам з шасці фарбаў, які выяўляе россып кветак. Царскае адзенне пакрывалася вышыўкай і аплікацыяй. Так, на адным з прадметаў адзення Тутанхамона нашыта ромбападобная сетка з фаянсавых пацерак і залатых пласцінак. Цікавасць

уяўляе і т. зв. “пояс Рамсеса III” даўжынёй 5,2 м, дэкарыраваны зігзагамі і шэрагам іерогліфаў “жыццё”.

## ТЭМА 3. МАСТАЦТВА СТАРАЖЫТНЫХ ЦЫВІЛІЗАЦЫЙ. МЕСАПАТАМІЯ

### § Агульная характарыстыка і перыядызацыя мастацкай культуры

Месапатамія (ад грэч.) – Міжрэчча, адна з самых старажытных цывілізацый, якая ўзнікла ў IV тыс. да н. э. на тэрыторыі паміж рэкамі Тыгр і Еўфтрат (зараз – тэрыторыя Ірака з сумежнымі краінамі) і існавала адначасова з цывілізацыямі Індыі, Кітая, Егіпта. Яшчэ ў IV тыс. да н. э. у паўднёвай частцы Месапатаміі складваецца высокая культура шумераў, якая пазней была атрымана ў спадчыну вавіланянамі і асірыйцамі. На рубяжы III–II тыс. да н. э. цывілізацыя шумераў прыходзіць у заняпад, шумерская мова становіцца мёртвая; яе ведалі толькі вавілонскія жрацы, яна заставалася мовай іх свяшчэнных тэкстаў. У пачатку II тыс. да н. э. росквіт культуры Месапатаміі адбваецца ў Вавілоне, а першая палова I тыс. да н. э. характарызуецца пад’ёмам і ўзмацненнем Асірыі, якая займае паўночную частку Міжрэчча. У сярэдзіне I тыс. да н. э. адбываецца новы росквіт Вавілона.

Грамадскі лад у дзяржавах Месапатаміі ўяўляў сабой рабаўладальніцкую дэспатыю крайняй формы: нават вышэйшая знаць і саноўнікі лічыліся рабамі цара. Цар утрымліваў у сваіх руках усю паўнату грамадскай, вайсковай і судзебнай улады, быў вярхоўным жрацом, яго асоба абажаствлялася.

У духоўнай культуры вялікае значэнне мела рэлігія. Усе гарады мелі мясцовых багоў. Былі вылучаны і агульнадзяржаўныя багі: Мардук (у Вавілоне), Ашур (у Асірыі).

### § Архітэктура

Росквіту дасягнула будаўніцтва палацаў і храмаў. *Палац* цара з’яўляўся адміністратыўным цэнтрам дзяржавы, ён павінен быў ўражваць велічнасцю і магутнасцю. Палацы мелі тронныя залы, памяшканні для архіваў, сістэму каналізацыі і багата аздабляліся каляровымі фрэскамі і статуямі, каменнымі барэльефамі і глазураванай пліткай. Дзверы з кіпарысавага дрэва абіваліся бронзай. Такімі былі палацы Ашурбаніпала ў сталіцы Асірыі – г. Ніневіі, цара Саргона II у г. Хорсабадзе, вавілонскага цара Навуходаносора (VII–VI стст. да н. э.), часткай якога былі Вісячыя сады Сімірамiды.

Сярод культавых пабудоў былі распаўсюджаны *зікураты*, якія выкладваліся з сырцовай цэглы, абліцоўваліся абпаленай цэглай, пакладзенай на бітуме. На ярусы тэрас вялі шырокія лесвіцы, па якіх падымаліся ўрачыстыя рэлігійныя працэсіі. Галоўны зікурат Вавілона – Вавілонская вежа, узведзеная ў II тыс. да н. э., перабудаваная ў VII–VI стст. да н. э. Гэта быў храм, прысвечаны богу Мардуку. Ён меў квадратную аснову з бакамі каля 90 м, такая ж была і вышыня. Храм меў 7 ярусаў, кожны з якіх быў афарбаваны ў пэўны колер. Верхні ярус – свяцілішча бога Мардука – быў упрыгожаны золатам і каштоўнымі камянямі.

### § Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва

Дасягненнем у выяўленчым мастацтве з'явіўся *партрэт*, які не меў партрэтнага падабенства. У выяве цара перадаваліся рысы, уласцівыя герою тых часоў. Характэрнай рысай скульптуры было тое, што майстры ў камені імітавалі гліняныя прыёмы. Скульптура прадстаўлена пераважна рэльефамі палацаў, на якіх выяўляліся богі, цары, воіны і жывёлы. Пашыраным вобразам, які знайшоў адлюстраванне як у рэльефах, так і ў круглай скульптуры Асірыі, быў свяшчэнны бык – *шэду*. Шэду выяўляўся ў вобразе крылатага быка з галавой чалавека і з пяццю быч'імі лапамі, дзве з якіх (пярэднія) адлюстроўваліся франтальна, астатнія тры – у руху. Прадстаўлены ў дынаміцы бык з пяццю лапамі, здавалася, рухаўся насустрач чалавеку, што падыходзіў да яго. Звяртае ўвагу той факт, што нават у вобразе шэду перадаваўся партрэт цара.

Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Месапатаміі – гэта мастацтва народаў сучасных Ірана, Ірака, Турцыі, Сірыі, Лівана, Ізраіля, Іарданіі, Саудаўскай Аравіі і Кіпра. На ранніх этапах развіцця цывілізацыі жыхары Месапатаміі апрацоўвалі камень. Першымі каменнымі вырабамі з'яўляюцца амулеты, цыліндрычныя пячаткі, грушападобныя ці рабрыстыя рукаяткі молатаў і культавыя пасудзіны. Шумерская цывілізацыя ведала каменную мазаіку – "*штандарты*", якая ўяўляла сабой шэраг выцягнутых прамавугольных пласцін, што адрозніваліся багатай паліхроміяй. Ужо ў IX–VIII стст. да н. э. з'яўляюцца каменныя рэльефы, якія ўпрыгожваюць сцены асірыйскіх палацаў і храмаў.

Дэкаратыўны жывапіс выконваўся ў тэхніках фрэскі і тэмперы. Роспісы рабіліся на вапневай аснове і адлюстроўвалі рэлігійныя і свецкія сюжэты.

У керамічных вырабах панаваў геаметрычны арнамент. Кераміка ўжывалася для аздаблення храмаў (алтар перад уваходам у храм Тэль-Халафа, IV тыс. да н. э.) і вырабу посуду. У вырабах са шкла назіраецца егіпецкі ўплыў.

У Месапатаміі квітнела ювелірная справа. З золата выраблялі посуд, прадметы туалета, статуэткі, часткі музычных інструментаў (абрамленні арфаў). У параўнанні з Егіптам тэхніка ювелірных вырабаў была больш тонкай і зграбнай. Часта ўжывалася *філігрань*.

З металаў, як і ў Егіпце, апрацоўваліся бронза і медзь. Да сённяшняга часу захаваліся шматлікія пасудзіны з гравіраванымі выявамі чалавечых твараў, упрыгожванні, люстэркі. Слановая косць ужывалася для аздаблення драўлянай мэблі.

У галіне тэкстылю вядомы былі дывановая справа, драпіроўка і вышыўка.

## ТЭМА 4. МАСТАЦТВА СТАРАЖЫТНЫХ ЦЫВІЛІЗАЦЫЙ. СТАРАЖЫТНАЯ ІНДЫЯ

### § Агульная характарыстыка мастацкай культуры

Паўвостраў Індастан (тэрыторыя Старажытнай Індыі) насяляе шмат народнасцей. Адной з іх з'яўляюцца нашчадкі дравідаў (старажытнае

мясцовае насельніцтва), іншыя ўтварыліся ў выніку зліцця з плямёнамі арыяў. Плямёны гэтыя трапілі ў Індыю ў III тыс. да н. э. з Сярэдняй Азіі. На сённяшні час на тэрыторыі Індастана існуе 4 дзяржавы: Індыя, Пакістан, Бангладэш і Непал. Культура ўсіх гэтых народаў пры ўсёй сваёй разнастайнасці мае шмат агульнага.

У Старажытнай Індыі існаваў каставы лад. Паходжанне варнаў (каст) звязваецца з узнікненнем грамадскай і маёмаснай няроўнасці. Існавала 4 варны: кшатрыі (вайсковая знаць), брахманы (жрацы), вайш'і (вольныя абшчыннікі), шудры (беднякі).

Вялікі ўплыў на ўсе сферы культурнага жыцця, у тым ліку мастацтва, у Старажытнай Індыі аказвала рэлігія: ведызм, індуізм, будызм, што сказалася на фарміраванні мастацкіх вобразаў.

**§ Архітэктура**

У III тыс. да н. э. у часы Старажытных культур Егіпта і Месапатаміі існавала самастойная і своеасаблівая цывілізацыя ў даліне ракі Інд (Пакістан). Пад час раскопак тут знайшлі рэшткі гарадоў з прамавугольнай сеткай вуліц, каналізацыяй, басейнамі. Дамы будаваліся з абпаленай цэглы, аднак асноўным будаўнічым матэрыялам было дрэва. У значных манументальных пабудовах ужывалі камень, які імітаваў формы, выпрацаваныя пры будаўніцтве з дрэва. У III ст. да н. э. у Індыі пачалося шырокае ўжыванне каменю для будаўніцтва храмаў, што было звязана з прыняццем будызма. Грамадскія пабудовы і палацы будаваць з каменю не дазвалялася, іх будавалі з дрэва, таму яны не захаваліся. Грабніц у Індыі не было: па рэлігійных вераннях нябожчыкаў спальвалі. Таму асноўная захаваная архітэктура прадстаўлена храмамі. Адным з самых старажытных тыпаў культавай пабудовы з'яўляецца *ступа* – збудаванне ў выглядзе сферычнага купала, але без унутранай прасторы. Наверсе знаходзілася надбудова для захавання рэліквій будыйскага культу (ступа ў г. Санчы). На працягу доўгага перыяду – з III ст. да н. э. па X ст. у Індыі будаваліся храмы, выдзеўбаныя ў скале – пячорныя храмы *чаіцы*. Такі храм уяўляў сабой выдзеўбаную ў скале залу, у якой знаходзіўся культавы сімвал – ступа ці статуя Будды. Гэта было памяшканне з калонамі і мноствам буйных ці дробных дэталей, выдзеўбаных у суцэльнай скале. Формы пячорных храмаў у дакладнасці (нават да шляпак цвіка) узнаўлялі аблічча драўляных пабудоў. Паверхня каменных слупоў, бэлькі і іншыя элементы канструкцыі пакрываліся рэльефамі, правобразам якіх была разьба па дрэве. Адной з характэрных рыс архітэктуры Старажытнай Індыі з'яўляецца шматлікі пластычны рэльеф.

**§ Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва**

Асноўнай тэхнікай жывапісу з'яўлялася *фрэска*. Фрэскі Індыі вядомы з II тыс. да н. э. Звычайна яны выяўляюць святочныя шэсці і цырымоніі, а таксама бытавыя сцэны. Галоўным аб'ектам дэкора быў чалавек. Падмалёвак выконваўся грызайллю (адценні аднаго колеру) па сырой тынкоўцы. Потым наносіліся фарбы сухім спосабам ці тэмперай, затым паверхня шліфавалася слановым біўнем.

*Дэкаратыўная скульптура* ўзнікла ў II тыс. да н. э. у даліне ракі Інд. У асноўным у ёй выкарыстоўваўся анімалістычны матыў (слон, тыгр, буйвал) і выявы чалавека са скрыжаванымі і падагнутымі нагамі. Скульптурныя выявы багінь дэкарыраваліся паясамі, буйнымі каралямі, завушніцамі з золата і срэбра. У X–V стст. да н. э. з золата выраблялі не толькі ўпрыгожванні, але і посуд. Актыўна ўжываліся каштоўныя і паўкаштоўныя камяні, жэмчуг. Бронзавыя статуэткі і зброя вядомы з II ст. да н. э. У керамічных вырабах пануючым з'яўляўся геаметрычны і анімалістычны матыў. Тканіна моцна пашкоджана пад уздзеяннем клімату. Аднак ужо з III тыс. да н. э. вядомы тканіны з бавоўны і шэрсці.

## ТЭМА 5. МАСТАЦТВА СТАРАЖЫТНЫХ ЦЫВІЛІЗАЦЫЙ. СТАРАЖЫТНЫ КІТАЙ

### § Агульная характарыстыка мастацкай культуры

Цывілізацыя Кітая – адна з самых старажытных. Старажытны перыяд ахоплівае час з II тыс. да н. э. па III ст. (да гібелі імперыі Хань). У гэты час узнікаюць першыя кітайскія дзяржавы. У сілу сваёй значнай аддаленасці культура Кітая не зведала значных уплываў, як культура Еўропы і Бліжняга Усходу. Гэтай культуры ўласцівы 2 асноўныя рысы:

1. перавага традыцый ва ўсіх сферах грамадскага жыцця (гэта добра прасочваецца да XIX ст. – да моманту ўключэння Кітая ў сусветную капіталістычную сістэму);
2. культура валодае надзвычай вялікай адаптацыйнай сілай. Многія ідэалагічныя ўплывы былі творча перапрацаваны кітайцамі, напрыклад, будызм.

Кітайскую культурную традыцыю часта называюць канфуцыянскай. З часоў імперыі Хань канфуцыянства становіцца вядучай ідэалогіяй.

У развіцці мастацкай культуры Старажытнага Кітая вылучаецца 2 найбольш значныя перыяды:

1. Часы кіравання дынастыі Чжоў (1122–256 гг. да н. э.);
2. Часы кіравання дынастыі Хань (206 г. да н. э. – 220 г.).

Да асаблівасцяў старажытнакітайскага мастацтва адносяць: увага да праблем каларыстыкі, шанаванне тэмы прыроды, стылізацыя матываў, сімвалізм.

### § Архітэктура

Планіроўка кітайскіх гарадоў была рэгулярнай. Гарады былі абнесены глінабітнымі сценамі і абмураваны цэглай, ці каменнымі сценамі з вежамі.

Архітэктура Кітая адрозніваецца кананізаванасцю. Са старажытных часоў ужываюцца глінабітныя канструкцыі, камень і цэгла. Але асноўны будаўнічы матэрыял – дрэва. Старажытныя пабудовы не захаваліся. Пра іх можна меркаваць па выявах, апісаннях і рэштках археалагічных раскопак. Старажытным збудаваннем, захаваным да нашага часу, з'яўляецца *Вялікая Кітайская сцяна*, узведзеная на поўначы для абароны ад набегаў качэўнікаў. Першапачаткова яна была пабудавана са шчэбню і зямлі, пазней абмуравана каменем і цэглай. Вышыня яе складае 8–9 м, шырыня наверсе – 5–6 м,

даўжыня – 4 тыс. км. Паверху сцяны з абодвух бакоў ідзе парапет з зубцамі. Праз кожныя 100–150 м былі ўстаноўлены вежы, усяго іх налічваецца каля 60 тыс. З часоў Ханьскай эпохі захаваліся *керамічныя мадэлі жылля*, па якіх можна меркаваць аб будаўніцтве ў той час шматпавярховых будынкаў з яруснымі дахамі, якія мелі вялікі вынас, але яшчэ не набылі выгнуты контур. Архітэктура перыяду Хань адрозніваецца строгім стылем. Сцены дэкарыраваліся простым геаметрычным арнаментам, каменныя дэталі ўпрыгожваліся скульптурнымі выявамі жывёл і фантастычных істот. Кітайскі жылы дом стаў правобразам далейшай архітэктуры культавага і грамадскага прызначэння.

**§ Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва**

Найбольшага росквіту ў выяўленчым мастацтве Старажытнага Кітая дасягнуў жывапіс, які выконваўся на паперы або на шоўку. Жывапіс гэтага часу афармляецца не ў выглядзе карцін, а выглядзе скруткаў (гарызантальных і вертыкальных даўжынёй да 3 м). Асаблівасцю жывапісу з’яўляецца недамаляванасць дэталей, якая эстэтычна асэнсавана. Вышэйшай ацэнкай кампазіцыі з’яўляецца тое, што яна служыць стымулам для творчасці гледача. Большасць жывапісу аздоблена вершамі. Жывапіс мае сімвалічны характар. Ужо ў Старажытны перыяд складваецца два *жанры кітайскага жывапісу на скрутках*:

1. “горы і воды”;
2. “кветкі і птушкі”.

Згодна кітайскай традыцыі галоўным прынцыпам мастацтва з’яўляецца сузіранне, таму ў мастацтве ідзе імкненне не да адлюстравання рэчаіснасці, а да яе асэнсавання. Кітайскія жывапісцы карыстаюцца нефіксаваным позіркам: сумяшчаюць розныя кропкі позірку на адзін прадмет. Выявы раслін і дрэў нясуць у сабе сімвалічны сэнс.

Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Старажытнага Кітая зведала ўплыў мастацтва Індыі і Ірана. Сярод напрамкаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Старажытнага Кітая найбольшага росквіту дасягнулі керамічныя, драўляныя і ювелірныя вырабы, ткацтва. Першыя *керамічныя вырабы* – гэта посуд з грубай шэрай гліны, а таксама танкасценныя вырабы з белай гліны, статуэткі з шэрай гліны, пакрытыя чорным лакам і афарбаваныя чырвоным колерам, якія выяўляюць танцаўшчыц і музыкантаў. З III ст. да н. э. у кераміцы Кітая ўжываецца паліва. Тэракотавая кераміка адрозніваецца маляўнічасцю.

*Шкляныя* вырабы старажытнага перыяду прадстаўлены разнастайнымі *ўпрыгожваннямі*, складзенымі з бусінак цёмна-сіняга колеру з паліхромным узорам. Сярод ювелірных вырабаў вядомы срэбраны посуд і спражкі з чаканнага золата. З часоў дынастыі Шан (з 1700 г. да н. э.) Кітай славіцца вырабамі з бронзы – гэта званы, зброя і посуд. Вырабы адрозніваюцца разнастайным арнаментам, які мае сімвалічны характар, звязаны з касмагоніяй, і геаметрычны малюнак.

З дрэва ў Старажытным Кітаі выраблялі мэблю. Ужо ў старажытныя часы склалася *дзве асноўныя канструкцыі мэблі*: куфар і аголены каркас, на

аснове якіх выраблялі сталы, шафы, табурэты, крэслы, троны, лютні, гітары і арфы. Для драўляных вырабаў ужываліся розныя пароды дрэў: палісандравае, сандалавае, кедр, цік. Чорнае дрэва служыла толькі для інкрустацый. У канцы старажытнага перыяду росквіту дасягае мастацтва лака. У гэты ж час пашыраюцца вырабы са слановай касці, дэкор якіх імітуе аранамент бронзавых вырабаў.

*Шоўк* вядомы з III тыс. да н. э. Разнастайнасць арнаментальнага малюнка дазваляла атрымліваць самыя розныя ўзоры. Асноўнымі відамі арнаменту былі: геаметрычны, анімалістычны, раслінны. Даволі часта ўжываўся прынцып стылізацыі. Шаўковая тканіна Кітая адрозніваецца разнастайнасцю тэхнік: “дама” (з матавым узорам на бліскучым фоне), “муар” (шчыльная шаўковая ці паўшаўковая тканіна з разводамі, якія пераліваюцца рознымі адценнямі), “піке” (шаўковая ці баваўняная тканіна з рэльефнымі вузкімі рубчыкамі ці выпуклым геаметрычным узорам на асноўным баку), “газ” (тонкая празрыстая тканіна). Развіта было дывановае майстэрства (“кэсы”). За выключэннем тканін “дама” і “газ” астатнія заўсёды шматколерныя і адрозніваюцца насычанымі фарбамі.

## ТЭМА 6. МАСТАЦТВА СТАРАЖЫТНЫХ ЦЫВІЛІЗАЦЫЙ. СТАРАЖЫТНАЯ ЯПОНІЯ

### § Агульная характарыстыка мастацкай культуры

Культура Старажытнай Японіі сфарміравалася ў III ст. да н. э. Пры гэтым сама цывілізацыя ўзнікла на астравах Японскага архіпелагу на Далёкім Усходзе яшчэ ў IX тыс. да н. э. Адной з істотных асаблівасцяў развіцця культуры Японіі з’яўляюцца прыродна-геаграфічныя ўмовы, вызначаныя шматлікімі здарэннямі – землятрусамі, паводкамі, тайфунамі, цунамі і інш. Значную частку тэрыторыі Японіі складаюць горныя масівы, у той час як прыгодных для земляробчай культуры месцаў амаль няма. Але пры гэтым культура краіны валодае надзвычай высокім узроўнем. Сама назва “Японія” (Ніппон ці Ніхон) літаральна азначае ў перакладзе “узыходзячае сонца”, таму часам Японію называюць“краінай узыходзячага сонца”.

Для японскай культуры заўсёды было характэрна імкненне да пераймання культур іншых народаў – традыцый, звычаяў, абрадаў, рэлігійных і міфалагічных уяўленняў, асабліва культуры Кітая і Карэі. Паколькі Японія вылучаецца своеасаблівымі прыродна-кліматычнымі ўмовамі, з цягам часу вызначалася спецыфічная рыса культуры – т. зв. “паяднанасць” з прыродай.

У рэлігійных адносінах у Старажытнай Японіі існаваў політэізм – шматбожжа. Адной з першых японскіх рэлігій з’яўляецца сінтаізм (Сінта – літаральна, шлях багоў). Рэлігія склалася на аснове анімалістычных уяўленняў, яе характэрнай рысай стала абагаўленне прыроды. Для багоў Сінта будаваліся спецыяльныя свяцілішчы, хаця лічылася, што духі – камі насяляюць рэкі, азёры, горы, даліны і жывуць побач з людзьмі.

Паступова на аснове агульных культурных традыцый вызначыліся асаблівасці японскага мастацтва: элітны мастацкі густ, любоў да прыроды, асіметрыя ў дэкоры, адчуванне прыгажосці матэрыяла, паўтарэнне матываў.

Старажытны перыяд японскага мастацтва ахоплівае час з VIII тыс. да н. э. па XII ст. Унутры гэтага перыяду вылучаюць:

1. Ранні гістарычны перыяд (VIII тыс. да н. э. – VI ст.);
2. Ранні феадалізм (VI–XII стст.).

**§ Архітэктура**

Архітэктура старажытнага перыяду прадстаўлена храмамі Сінта, якія паводле рэлігійных вераванняў павінны адлюстроўваць шлях багоў. Унутры храмы не аздабляліся, бо па ўяўленнях унутры храма павінна быць цемра і пустэча, дзе лунаюць духі прыроды.

У Японіі здаўна існаваў звычай, згодна з якім састарэлы старажытны храм у пэўны перыяд узнаўляецца ў якасці дакладнай копіі былой пабудовы. Дзякуючы гэтаму мы маем верагоднае ўяўленне аб старажытных архітэктурных збудаваннях Японіі. У перыяд ранняга феадалізму ў Японію з Кітая праз Карэю трапляе будызм, а затым і формы кітайскай архітэктуры (дах з вялікім вынасам). Будыйскія храмы і *пагады* будаваліся кітайскімі і карэйскімі архітэктарамі. Адно з такіх збудаванняў – храм у г. Нара з’яўляецца нацыянальнай святыняй Японіі.

**§ Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва**

У гэты ж час атрымлівае росквіт круглая скульптура. Узнікае скульптурны партрэт. У скульптуры адлюстроўваюцца вобразы імператараў і военачальнікаў. Для скульптуры гэтага часу характэрна імкненне выразіць характар партрэтаванага, выявіць рысы яго мужнасці.

Японскае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва бярэ пачатак ад кітайскага. Высокага ўзроўню дасягнулі тут апрацоўка металаў і ткацтва. Яскравае сведчанне кансерватызму эстэтычных канонаў дае скарбніца Сёсоін у прысвечаным Вялікаму Буддзе манастыры Тодайдзі, якая ўтрымлівае скарбы імператара Сёму (VIII ст.).

*Бронза* вядома ў Японіі з III ст. да н. э. З гэтага часу захаваліся званы з геаметрычным арнаментам. Анімалістычны матыў выкарыстоўваўся ў аздабленні зброі, рытуальных ліхтароў, пахавальных урн з бронзы і жалеза. Зброя спачатку інкруставалася латунню, пазней – меддзю. Вядомы і пластычныя фігуркі жывёл з бронзы ў натуральную велічыню (перапёлка) і з жалеза (вораны і насякомыя).

Тканіна вядома з III ст. да н. э., калі апрацоўваліся толькі лён і каноплі. Каля 200 г. японцы праз Карэю пазнаёміліся з кітайскім шоўкам. Асноўнымі тэхікамі дэкарыравання тканіны былі: набіўка, баціка (малюнак воскам), нанясенне малюнка па трафарэце.

Кераміка вядома з VII тыс. да н. э. Асноўным арнаментам у гэты час было пляценне ці лінейны. З гліны выраблялі фігуркі людзей і жывёл. З V ст. ужываецца ганчарнае кола і абпальванне. З’яўляецца тэракотавая скульптура – *ханіва*, якая выяўляе людзей, коней і дамы. У кераміцы VI–VIII стст.

адчуваецца ўплыў Карэі – з’яўляецца падабенства палівы. Арнамент пасудзін дадаецца эфектамі падцёкаў.

## ТЭМА 7. МАСТАЦТВА СТАРАЖЫТНЫХ ЦЫВІЛІЗАЦЫЙ. СТАРАЖЫТНЫ ІРАН

### § Агульная характарыстыка мастацкай культуры

Іранскае пласкагор’е размяшчаецца на ўсходзе ад рэк Тыгр і Еўфрат. Яшчэ ў VI тыс. да н. э. тут узнікла земляробства і атрымала развіццё мясцовая культура. У II тыс. да н. э., у перыяд перасоўвання ваяўнічых жывёлагадоўчых плямёнаў сюды трапілі іранскія плямёны – выхадцы з Сярэдняй Азіі. Яны змяшаліся са старажытным мясцовым насельніцтвам, якое, у сваю чаргу, успрыняла іранскую мову. Так склалася іранская народнасць.

У развіцці мастацтва Старажытнага Ірана вылучаюць 3 перыяды:

1. Часы Ахемянідаў (559–330 гг. да н. э.);
2. Парфянскае царства (каля 247 г. да н. э. – 226 г.);
3. Часы Дынастыі Сасанідаў (226–651 гг.).

Асноўнымі рэлігіямі з’яўляліся маздакізм, зораастрызм, маніхейства. Сярод відаў мастацкай творчасці іранцаў найбольшы росквіт атрымала архітэктура.

### § Архітэктура і манументальна-дэкаратыўнае мастацтва

У X ст. да н. э. на тэрыторыі Паўночна-Заходняга Ірана ўтварылася магутная дзяржава – Мідыя. У канцы VII ст. да н. э. мідзяне ў саюзе з вавіланянамі разграмілі Асірыю, а затым заваявалі ўсю тэрыторыю сучаснага Ірана. Але ў 553 г. да н. э. адно з іранскіх плямёнаў – персы на чале з Кірам зверглі панаванне мідзян. Кір – заснавальнік старажытнаіранскай царскай дынастыі Ахемянідаў, заваёўваў адну дзяржаву за другой і стварыў вялізную імперыю (ад Сярэдняй Азіі да Егіпта).

У старажытнасці ў многіх народаў існаваў звычай хаваць нябожчыкаў у пячорах. У Іране таксама хавалі цароў і іншых знатных асоб у скальных грабніцах. Фасад некаторых з гэтых грабніц быў аформлены як фасад жылля, бо грабніца лічылася адвечным домам для пахаванага. Пазней грабніцы пачалі ўзводзіць на адкрытай прасторы.

Грабніца першага з магутных цароў Старажытнага Ірана – Кіра – мае выгляд дома з двухсхільным дахам. Існавалі ў Іране і грабніцы ў выглядзе вежаў. Гэта звязана з тым, што ў Пярэдняй Азіі са старажытных часоў існаваў тып вежавага жылля, які ўяўляў дом-крэпасць. Вежавыя грабніцы ўзводзіліся з абпаленай цэглы і мелі гафрыраваную паверхню сцен, падобна да старажытных пабудоў з сырца. Дах звычайна меў выгляд шатра. Шырокага распаўсюджання дасягнулі грабніцы кубічнай формы, увенчаныя купалам. Яны імітавалі адну з форм мясцовага жылля.

У Старажытным Іране некаторыя старыя паселішчы акружаліся з мэтай бяспекі крапасной сцяной. Уезд у паселішча фланкіравалі 2 абарончыя вежы. Гэты прыём і зараз ужываецца ў архітэктуры Пярэдняй і Сярэдняй Азіі, але

як дэкаратыўная форма. Ён быў запазычаны і Еўропай для кампазіцый сярэдневечных цэркваў.

Пераемнікам Кіра быў цар Дарый-І, які ўзыйшоў на прастол у 521 г. да н. э. Як і ўсе ахемяніды, Дарый быў тыранам. Узыходжанне яго на царскі трон суправаджалася забойствам 9-ці яго супернікаў, пасля чаго ён аб'явіў сябе другой асобай у сусвеце пасля вярхоўнага бога Ахурамазды. Сваю барацьбу за царскі трон Дарый-І вырашыў пры жыцці адлюстраваць у мануменце. Для выканання волі цара скульптары выбралі недасягальны ўчастак скалы *Бехістун*, размешчанай на караванным шляху, і выдзеўбалі на ім на вышыні 50 м ад зямлі вялізны прамавугольнік. Пасля таго, які скульптары прыбралі будаўнічыя лясы, на працягу 2-х тысячагоддзяў ніхто не прыбліжаўся да манумента. Выява разлічана на ўспрыманне здалёк. На ёй у тэхніцы барэльефа выяўлены некалькі фігур у рост чалавека, буйней за іх выяўлена фігура Дарыя. Увесь рэльеф створаны па канонах Ірана: Дарый мае вялікія вочы і дугападобныя бровы, завітую бараду і ваенную карону на галаве, якая выяўлена ў дакладнасці. Сама карона была зроблена з золата і ўпрыгожана каштоўнымі камянямі авальнай формы. Дарый падымае руку да крылатага бога, які парыць у небе, а нагой Дарый цяжка націснуў на жывот свайго суперніка – Гаўматы. За спіной Дарыя стаяць прыдворныя, якія трымаюць лукі і коп'і. Тварам да цара стаяць астатнія 8 прэтэндэнтаў на трон, якія звязаны агульнай вяроўкай на шыях. Побач выяўлена перамога над скіфскім царом, рэльеф якой быў зроблены пазней. Вялікі Бехістунскі манумент утрымлівае таксама каліграфічны надпіс на трох мовах – старажытнапярсіцкай, акадскай (вавілонскай) і эламскай. У надпісах распавядаецца пра перамогі цара і пра забарону ад шкоды манумента.

Ахеменіды, як і усе тыраны, адрозніваліся грандыёзным будаўніцтвам. Матэрыялы для будаўніцтва царскай рэзідэнцыі прывозіліся з усіх бакоў імперыі. Рабы з вялікімі цяжкасцямі дастаўлялі каменныя глыбы і масіўныя ствалы кедра па горных дарогах. У ахемянідскім Іране працавала шмат мастакоў і рамеснікаў-рабоў з розных краін свету – егіпцяне, мідыйцы, вавіланяне, армяне, іудзеі, грэкі. Вялікі тыран – Дарый-І распрарадзіўся пазбавіць архітэктараў, скульптараў і жывапісцаў пэўных частак цела або твара, якія не патрэбны пры іх працы, каб мастакі не збеглі. У адных мастакоў былі адсечаны левыя рукі, у іншых – ступні ног, вушы, насы.

Неабмежаваўшыся Бехістунскім помнікам, Дарый вырашыў узвесці для сябе велізарны палац. Рэзідэнцыя Дарыя атрымала ў грэкаў назву Персеполь (пярсіцкая назва – Парса, грэч. Персеполь – горад персаў). Персеполь ўяўляў крэпасць на схіле скалістай гары. Тут была пабудавана вялікая тэраса – гарызантальная пляцоўка памерамі 450 х 300 м, выдзеўбаная ў скале і ўмацаваная падпорнай сценкай з велізарных камянёў. Тэрасу агароджвала высокая масіўная сцяна з сырца. У Персеполе Ахемяніды на працягу VI–IV стст. да н. э. будавалі палацы і залы для ўрачыстых цырымоній. Вялізныя залы мелі плоскі земляны дах і тоўстыя сцены з сырца. Высокія стройныя каменныя калоны неслі магутныя драўляныя бэлькі даха, абітыя ліставым золатам. У адрозненне ад егіпецкіх храмаў, тут калоны былі

шырока растаўлены. Да ўвахода ў будынак вялі ўрачыстыя лесвіцы. Галоўная зала была ўпрыгожана каменнымі барэльефамі з выявай воінаў і палонных, капітэлі калон мелі выгляд здвоеных паўфігур быкоў, базы калон і лесвіцы ўпрыгожваліся тонкім кветкавым арнаментам. Сцены будынкаў пакрываліся глазураванай *каляровай кафляй*, пабудаванай на *спалучэнні сіняга, белага і зялёнага колераў*. З глазураваных плітак складалі і дэкаратыўныя арнаменты, і выявы фантастычных істот (крылатых сфінксаў, крылатых быкоў). Для аздаблення залаў выкарыстоўваліся металічныя накладкі, тканіна, дываны з анімалістычным арнаментам і выявамі фантастычных істот. Аднак Дарый не дабудаваў персепольскі палац, яго будаўніцтва працягвалася Ксерксам і Артаксерксам – пераемнікамі Дарыя. Усё будаўніцтва цягнулася некалькі дзесяцігоддзяў. За гэты час Ксеркс арганізоўваў ваенныя паходы ў Эладу. Аднак Грэцыю пакарыць не ўдалося, персіцкі флот быў патоплены, але ў 480 г. да н. э. Ксеркс паспеў спаліць Афіны. Узбураныя грэкі праз некалькі год падпалілі Персеполь, усе палацы якога сгарэлі.

Акрамя архітэктуры і скульптуры, высокага ўзроўню развіцця дасягнула ювелірнае мастацтва ахемянідаў. Асноўнай тэхнікай упрыгожвання ювелірных вырабаў была чаканка. Да нашага часу захаваліся залатыя і срэбраныя пасудзіны, упрыгожванні, а таксама статуэткі жывёл і ўрачыстая зброя. Сярод металаў апрацоўвалася бронза.

У 333 г. да н. э. Александр Македонскі заваяваў дзяржаву Ахемянідаў, былі спалены і канчаткова разбураны пабудовы Персеполя. Пасля распаду імперыі Іран увайшоў у склад эліністычнай дзяржавы Селеўкідаў. Праз 70 год на тэрыторыі Ірана і Месапатаміі ўтварылася Парфянскае царства. У III ст. была ўзноўлена магутная Іранская дзяржава, якой кіравалі цары дынастыі Сасанідаў да яе заваёвы арабамі ў 651 г.

Асноўным будаўнічым матэрыялам у Іране, як і ў Месапатаміі, была гліна, таму ўся манументальная архітэктура ўзводзілася з цэглы, у чым сказваўся ўплыў архітэктуры Месапатаміі, якая з сярэдзіны І тыс. да н. э. уваходзіла ў склад Іранскай імперыі.

Пераемнасць традыцый адбілася і на планіровачных прыёмах. Так, у Месапатаміі важнай часткай жылля і палацавых комплексаў быў унутраны дворык. З цягам часу пачалі будаваць выходзячую ў дворык лоджыю, у якой праводзілі час у знойныя летнія дні. Характэрнае для Усхода імкненне да сіметрыі і рэгулярнасці выявілася ў тым, што ў палацавых комплексах пачалі будаваць такія лоджыі з кожнага боку чатырохвугольнага дворыка. У гэты час ва ўсёй Пярэдняй Азіі дасягае высокай дасканаласці тэхніка распорных канструкцый. Акрамя ўжо вядомых арак і скляпенняў, атрымліваюць шырокае распаўсюджанне купалы, павялічваюцца іх пралёты, дзякуючы таму, што яны ўжо ўзводзяцца з абпаленай цэглы не на гліне, а на вапне.

У эпоху Сасанідаў атрымлівае шырокае распаўсюджанне ўзвядзенне арак, скляпенняў і купалоў з абпаленай цэглы. Адным з ранніх помнікаў гэтага перыяду з’яўляецца палац першага цара дынастыі Сасанідаў – *палац у г. Фірузабадзе*. Кампазіцыя плана сіметрычная, прамавугольная, плоскасці фасадаў расчленены вертыкальнымі выступамі і ўпадзінамі, як і ў

старажытных збудаваннях з сырца. Таўшчыня сцен складае 3–4 м і больш. Афіцыйная частка палаца ў Фірузабадзе (ІІІ ст.) складаецца з трох квадратных залаў, перакрытых манументальнымі купаламі, а жылую частку ўтвараюць памяшканні і лоджыі вакол унутранага двара. На галоўным фасадзе знаходзіцца глыбокая лоджыя, перакрытая скляпеннем – свайго рода тронная зала. Такая форма на фасадзе атрымала распаўсюджанне і ў далейшым. Аднак лоджыю пачалі рабіць меншай па глыбіні, і яна пераўтварылася ў велізарную нішу – партал, у глыбіні якога знаходзіўся ўваход у будынак.

Для купальнага перакрыцця ўсталёўвалі дадатковыя канструкцыі ў вуглах верхняй часткі сцен. Існавала *два прыёмы*:

1. прыбудоўваліся канічнай формы невялічкія скляпенні – *тромпы*;
2. пры дапамозе напуска цэглы ўтваралі выступ. На аснове другога прыёму сфарміравалася спецыфічная дэталь іранскай і арабскай сярэдневечнай архітэктуры – т. зв. *сталактыты*.

Пры Сасанідах атрымлівае таксама развіццё аркада на калонах, якая ў далейшым становіцца характэрнай рысай архітэктуры Візантыі і Еўропы. У VІІ ст. Іран быў заваяваны арабамі, панаванне якіх працягвалася 100 гадоў. У гэты час быў прыняты іслам.

З Х да сярэдзіны ХІІІ ст., у перыяд паміж вызваленнем ад арабскай улады і нашэсцем манголаў, культура Ірана квітнела. Поспехаў дасягнулі ў гэты час шматлікія навукі, мастацтва і рамёствы. Узводзяцца новыя тыпы будынкаў – *медрэсэ, караван-сараі, крытыя рынкі, лазні*. Правіцелі будавалі шыкоўныя палацы, маўзалеі. З прыняццем ісламу ўзводзяцца *мячэці*, прычым яны будуюцца па мясцовых традыцыях: з ужываннем скляпеністых і купальных перакрыццяў. Пры мячэці будаваўся мінарэт.

Карнізаў у архітэктуры Ірана не ўжывалі, таму што не было схільных дахаў; архітэктурныя аб’ёмы вянчаліся купаламі. Шырока ўжываліся лоджыі, перакрытыя стральчатымі аркамі. Вокны былі невялікія і размяшчаліся рэдка.

У Сярэднія стагоддзі фактура паверхні сцен і скляпенняў у архітэктуры Ірана ўтваралася адкрытай кладкай з абпаленай цэглы. У ХІ–ХІІ стст. пачалі шырока ўжываць фігурную кладку з дэталямі з тэракоты (неглазураваная кераміка) і з разнога гіпсу. У ХІІІ ст. адраджаецца старажытны тып дэкору – каляровая кафля. У аздабленні інтэр’ераў вялікую ролю адыгрываў роспіс і арнаментальная разьба па гіпсу, якая ўзнікла яшчэ ў Парфянскі перыяд.

У канцы ХІV ст. Тамерлан стварыў вялізную імперыю, у склад якой уваходзілі Сярэдняя Азія і Іран. Архітэктура пры Тамерлане адрознівалася грандыёзнасцю пабудоў і раскошаю дэкаратыўнага аздаблення. Асноўныя элементы пабудоў заставаліся былымі, але ўскладняліся. Парталы набылі велізарныя памеры і пераўзыходзілі па вышыні нават сам будынак. Арнаментацыя ўзбуйнілася па маштабе і стала разнастайнай, важным яе кампанентам стала шматкаляровая глазураваная кераміка – *маёліка*.

У ХVІІІ–ХІХ стст. мастацтва Ірана разам з паслабленнем дзяржавы прыходзіць у заняпад.

# ТЭМА 8. МАСТАЦТВА СТАРАЖЫТНЫХ ЦЫВІЛІЗАЦЫЙ. СТАРАЖЫТНАЯ КАРЭЯ

## § Агульная характарыстыка мастацкай культуры

Мастацкая культура Карэі фарміраваліся пры ўзаемадзеянні з культурамі іншых народаў і дзяржаў Азіі. Значную ролю ў гісторыі карэйскага народа адыграла геаграфічнае размяшчэнне краіны. Карэйскі паўвостраў, які займае ўсходнюю частку Азіяцкага кантыненту і амываецца з трох бакоў марамі, з'яўляецца ланцугом паміж велізарнымі матэрыковым светам і светам ціхаакіянскіх астравоў. На працягу шматлікіх стагоддзяў вельмі інтэнсіўнымі былі сувязі з Кітаем. Праз Кітай у Карэю трапіў будызм разам з распрацаванай сістэмай вобразаў і іканаграфічных канонаў, з Кітая трапілі эстэтычныя нарматывы канфуцыянства і даоскія ідэі. Карэяй былі ўспрыняты прынцыпы кітайскай пісьменнасці, многія архітэктурныя прыёмы, метады жывапісу тушшу. Аднак пры гэтым дойлідства, скульптура, жывапіс і рамёствы Карэі валодаюць сваёй непаўторнай нацыянальнай спецыфікай.

У развіцці мастацтва Старажытнай Карэі вылучаюць 2 перыяды:

1. Старажытны (ІІІ тыс. да н. э. – І-я стст. да н. э.);
2. Перыяд трох дзяржаў – Когурё, Пэкчэ, Сілла (IV–VI ст.).

## § Архітэктура

Старажытныя помнікі мастацтва Карэі ўзыходзяць да эпохі неаліту (ІІІ – пачатак ІІ тыс. да н. э.). У гэты час на тэрыторыі Карэі ўзніклі аселыя паселішчы, жыхары якіх жылі ў невялікіх зямлянках, займаліся паляваннем і рыбалоўствам. Паступова мяняецца аблічча неалітычных паселішчаў, якія ўмацоўваюцца абарончым земляным валам; з'яўляюцца і першыя жылыя дамы. Замест зямлянкі будуюць паглыбленую ў зямлю на 30–40 см хаціну, якая ўяўляла сабою зарытыя ў зямлю слупы, нясучыя двухсхільны дах; плеценыя і абмазаныя глінай сцены; звязаную з агменем сістэму ацяпляльных каналаў, якія праходзяць пад падлогай. Разам з развіццём пахавальнага рытуала, адначасова з маленькімі хацінамі на працягу І тыс. да н. э. узводзяцца магутныя дальмены, складзеныя з велізарных каменных пліт (да 9 м у даўжыню і да 5 м у шырыню), якія мелі на мэце ўзвелічэнне памерлага племяннога правадыра.

У выніку разбурэння патрыярхальна-родавай сістэмы ў VII–V стст. да н. э. на Карэйскім паўвостраве фарміруюцца шматлікія племянныя аб'яднанні. Доўгі працэс аб'яднання карэйскіх плямёнаў прывёў да вызвалення ад кітайскага ўздзеяння і вылучэння трох буйных племянных саюзаў, якія на працягу IV–VI стст. пераўтварыліся ў першыя карэйскія раннефеаддальныя дзяржавы: на поўначы – Когурё, на паўднёвым захадзе – Пэкчэ, на паўднёвым усходзе – Сілла. Шырокае распаўсюджанне жалезнай зброі, удасканаленне ірыгацыйных сістэм, змены на ўзроўні вытворчых сіл пацягнулі за сабой змены ва ўсіх сферах жыцця. Адбываліся зрухі і ў мастацкай свядомасці. Палепшылася тэхніка будаўнічай працы, выраслі гарады, высокага ўзроўню дасягнула апрацоўка металаў, выплаўка бронзы і рамёствы. Усё духоўнае жыццё складвалася пад уздзеяннем канфуцыянскай

эстэтыкі, якая распаўсюджвала свае законы на адукацыю, архітэктуру, музыку, выяўленчае мастацтва, якім надавалася важнае дзяржаўнае і выхаваўчае значэнне. Амаль адначасова з канфуцыянствам з’явіўся і будызм, і даоскія ідэі аб узаемадзеянні двух палярных пачаткаў – Інь і Янь (жыццё і смерць). У IV–VI стст. гэтыя вучэнні ўтварылі складанае сплященне з мясцовымі першабытнымі анімістычнымі культамі, якія выяўляліся ва ўшанаванні духаў Неба, Зямлі, Луны, горных пячор і вяршыняў. Гэты сінкрэтычны комплекс ідэй і вераванняў паспрыяў фарміраванню карэйскага мастацтва, у якім самабытныя фальклорныя вобразы змяшаліся з вобразамі краін Азіі.

Пастаянная пагроза варожых нападкаў спрыяла фарміраванню больш гнуткай і разгалінаванай, чым у Кітаі, канфігурацыі горада, які складаўся звычайна з дзвюх частак – цытадэлі, якая размяшчалася на ўзвышанасці, і раўніннай часткі, што размяшчалася каля яе падножжа (сталіцы Когурё ў Кунесоне і Чанансоне, сталіца Сілла ў Кымсоне, сталіца Пэкчэ ва Унджыне). Галоўнымі тыпамі культавых і свецкіх гарадскіх ансамбляў сталі храмавыя і палацавыя комплексы, якія ўзводзіліся на каркаснай аснове і спалучалі камень і дрэва. Палацавыя комплексы ўяўлялі двухпавярховыя пабудовы з калонамі, умацаванымі на каменнай платформе, увенчаныя чарапічным дахам з выгнутымі бакамі і шэрагам памяшканняў. Парадныя будынкі ўпрыгожваліся керамічнымі пліткамі з разнастайным рэльефным арнаментам.

У сувязі з існаваннем і замацаваннем культу продкаў, узводзяцца пахавальныя склепы знаці. Найбольш урачыстымі былі шматлікія *ўсыпальніцы когурёгскіх правіцеляў і вяльмож*, выкладзеныя з вялікіх гранітных пліт (да 5 м у даўжыню). Яны ўяўлялі сабою шматступенчатыя каменныя піраміды ці схаваныя ўнутры насыпнога кургана пахаванні, арыентаваныя па баках свету. Лічылася, што жыццё жывых цалкам залежыць ад шчаслівага знаходжання ў свеце памерлых продкаў. Таму нябожчыка пасля яго смерці павінны былі суправаджаць усе знакі годнасці, усе зямныя ўшанаванні і ўсе сімвалы і абярэгі яго зямнога жыцця. Вядучае месца ў гранітных магільных склепах, як і ў Кітаі, заняў не рэльеф, а жывапіс мінеральнымі фарбамі, выкананы з дамешкаю лаку і клею непасрэдна па камені ці па нанесенаму на яго грунту з гліны, змешанай з саломай. Колеравая гама будавалася на спалучэнні блакітных, вохрыстых, зялёных, карычневых і фіялетавых фарбаў. Уся будова падземных залаў была разлічана на вялікую колькасць роспісаў (агульная плошча залаў у найбольш буйной грабніцы Мічхон-вана – 70 м$^2$). Звычайна ўсыпальніцы налічвалі ад 2-х – да 6-ці памяшканняў з калідорамі, калонамі перад уваходам у галоўную залу і імітавалі драўляныя канструкцыі. Сюжэтам роспісаў былі рытуальныя шэсці музыкантаў і воінаў, баляванні, танцы, сцэны палявання і барацьбы, заклінальныя абрады, звязаныя з земляробчымі цыкламі. Галоўнае масца на паўночнай і заходняй сцяне адводзілася выяве знатнага вельможы, які ўвасабляў канфуцыянскі ідэал маральнай дасканаласці. На 4-х сценах па 4-х баках свету размяшчаліся *выявы духаў-ахоўнікаў* – сасін: тыгр, фенікс,

дракон і чарапаха, абвітая змяёй. Сінкрэтычны характар пахавальнага комплексу дадаваўся пахавальным начыннем – пасудзінамі ў формах птушак, вершнікаў і дамоў, залатымі каронамі, філіграннымі завушніцамі, паясамі з падвескамі, рытуальнымі свяцільнямі.

У VI–VII стст. распаўсюджваюцца новыя тыпы культавых ансамбляў будыйскіх манастыроў, дзе найбольш значнае месца адводзіцца скульптуры (будыйскія манастырскія комплексы – Ібулан, Чхомунса, Мірыкса).

**§ Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва**

У старажытны перыяд асноўная ўвага майстроў канцэнтравалася на стварэнні *скульптур для храмавых алтароў* і маленькіх пераносных свяцілішчаў. У бронзавых і драўляных фігурках божастваў, такіх як Мірык (бог будучыні), Канным (багіня міласці) увасобіўся ідэал прыгажосці. Распрацоўка дэталей, рытмы фалдаў, узоры адзення адрозніваюцца высокай дасканаласцю; прапорцыі цела падаўжаюцца, твары набываюць акругленасць, з’яўляецца лёгкая ўсмешка, франтальнасць парушаецца лёгкім рухам корпуса, рук і нахілам галавы.

Першыя спробы ў карэйскім дэкаратыўным мастацтве адзначыліся ў керамічных вырабах, якія спачатку выконваліся ўручную, а затым пры дапамозе ганчарнага кола. Менавіта ў гэты час з’яўляецца 5 асноўных раёнаў, якія сталі калыханкай карэйскай цывілізацыі (Пусан, Сеул, Пхеньян, паўвостраў Хванхэ, паўночны ўсход краіны). Найбольшага росквіту ў ранні перыяд у Карэі дасягнула *грабенчатая кераміка*. Гэта былі конусападобныя вострадонныя і шарападобныя пасудзіны, пакрытыя цалкам ці толькі каля гарлавіны прадрапаным арнаментам геаметрычнага ўзору. Пра новую, больш высокую ступень развіцця карэйскага грамадства можна меркаваць на падставе больш дасканалай па тэхніцы і формах керамікі. У канцы II – пачатку I тыс. да н. э. з’яўляюцца гладкія акруглыя пасудзіны, афарбаваныя ў густа-чырвоны колер, нярэдка без арнаменту (вазы, чашы, кубкі на падстаўках).

## ТЭМА 9. МАСТАЦТВА СТАРАЖЫТНЫХ ЦЫВІЛІЗАЦЫЙ. СТАРАЖЫТНАЯ МАНГОЛІЯ

**§ Агульная характарыстыка мастацкай культуры**

Манголія – краіна, якая знаходзіцца ў Цэнтральнай Азіі. Яе культура склалася на велізарных абшарах высокага пласкагор’я, у самым цэнтры Азіяцкага матэрыка. Фарміраванне мангольскай народнасці здзяйсняецца ў XII–XIII стст. Аднак задоўга да гэтага на тэрыторыі мангольскіх стэпаў качавалі жывёлаводы, ствараліся родавыя аб’яднанні, племянныя саюзы, якіх яднала мова і рэлігія шаманізму. Гуны, сяньбійцы, цюркі, уйгуры і кідані, якія насялялі Манголію з другой паловы I тыс. да н. э. па XII ст., паслужылі базай для развіцця ўласна мангольскай пісьменнасці, літаратуры, выяўленчага мастацтва. У працэсе развіцця мастацтва манголаў увабрала элементы культуры Сярэдняй і Усходняй Азіі, Індыі і Непала. У мангольскую архітэктуру феадальнага перыяду ўвайшлі многія элементы кітайскага

драўлянага і тыбецкага каменнага дойлідства; выяўленчае мастацтва ўзбагацілася шэрагам новых іканаграфічных прыёмаў, арнаментальных матываў, набыло новыя сюжэты і вобразы. У выніку ў Манголіі склалася своеасаблівае ўспрыманне колеру, формы і законаў сіметрыі. Вернасць традыцыям народнага мастацтва ўвасобілася ў дэкаратыўным афармленні архітэктурных ансамбляў манастыроў і храмаў, ва ўпрыгожванні жылля і начыння. У іх знайшлі выраз: любоў да прыроды, да кантрастных чыстых колераў, дакладнасць і яснасць арнаменту.

Мастацкая культура Старажытнай Манголіі храналагічна ахоплівае час з ІІ тыс. да н. э. па ХІІ ст.

**§ Архітэктура і выяўленчае мастацтва**

У канцы І тыс. да н. э. на тэрыторыі Манголіі ствараецца буйны племянны саюз гунаў, які вядзе аселы вобраз жыцця, будуе ўмацаваныя гарадзішчы, узводзіць палацы і багатыя пахаванні. У *курганах* Ноін-Улы (Паўночная Манголія) знойдзены прывазныя і мясцовыя тканіны, вышыўкі і лямцавыя дываны з аплікацыямі, выкананыя ў *звярыным стылі*, вырабы з бронзы, срэбра і золата. Многія геаметрычныя матывы звярынага стылю працягвалі сваё жыццё ў мастацтве качэўнікаў наступных часоў.

У VI–VIII стст. цюркамі былі ўзведзены першыя скульптурныя манументы, звязаныя з афармленнем пахавальнага культу і праслаўленнем баявых подзвігаў военачальнікаў. Імі былі створаны *партрэтныя вобразы палкаводцаў* (галава мемарыяльнай статуі Кюль-Цегіна), якія адрозніваліся статычнасцю і грубасцю формаў.

**§ Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва**

Самыя раннія помнікі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва – гэта *посуд з сетчатым арнаментам*, а таксама малюнкі, выкананыя чырвонай фарбай ці прадрапаныя на паверхні скалаў. Яны апавядаюць пра свет уяўленняў старажытных паляўнічых і скатаводаў. Увага стваральнікаў такіх малюнкаў была засяроджана на выяўленні важных для чалавечага жыцця жывёл – куланаў, казлоў, ваўкоў, змеяў.

Наскальныя роспісы канца ІІ – сярэдзіны І тыс. да н. э., а таксама гравіраваныя арнаменты манументальных надмагільных каменных стэл (т. зв. “*аленевых камянёў*”), скульптурныя ўпрыгожванні зброі, хатняе начынне сведчаць аб развіцці пачуцця рытму, уменні выявіць прыгажосць руху, уключыць у адзіную араментальную сістэму дынамічную фігуру выяўляемай жывёлы – аленя, птушкі ці каня.

## ТЭМА 10. МАСТАЦТВА СТАРАЖЫТНАЙ АМЕРЫКІ

**§ Агульная характарыстыка мастацкай культуры**

Своеасаблівая культура існавала ў народаў амерыканскага кантынента да яго адкрыцця Калумбам і каланізацыяй еўрапейцамі. Асноўныя цывілізацыі, якія існавалі на кантыненце, – альмекі (на беразе Мексіканскага заліва), майя (Гватэмала, Паўднёва-Усходняя Мексіка), тэоціукан, тальтэкі, ацтэкі, сапатэкі, міштэкі, мочыка, чыму, інкі (Перу, Эквадор, Чылі).

**§ Архітэктура і манументальнае мастацтва**

На паўднёвым захадзе сучасных ЗША ў гарыстай мясцовасці з сухім, жаркім кліматам жылі аселыя індзейскія плямёны, якіх іспанскія заваёўнікі назвалі “*poble*” (ісп., гарадок). Паселішча іх уяўлялі кампактныя збудаванні ў выглядзе дапасаванага адзін да аднаго жылля. Памяшканні размяшчаліся ступенчатымі ярусамі вакол унутранага двара, заднія сцены ўтваралі глухую абарончую лінію паселішча-дома. Жылыя памяшканні былі чатырохвугольнымі ў плане, а свяцілішчы – круглымі.

Далей на поўдзень (сучасная тэрыторыя Мексікі) існавалі цывілізацыі з больш высокай культурай і развітай архітэктурай манументальных збудаванняў рэлігійна-грамадскага характару. Хаціны мелі плятнёвыя, абмазаныя глінай сцены і завяршаліся высокім крутым дахам. Храмы ранняга перыяду мелі востраверхае завяршэнне, якое нагадвала саламяны дах жылля. Пазней у каменных пабудовах пачалі рабіць дах плоскім. Само свяцілішча было невялічкім па памерах, але ўзвышалася на высокім аснаванні ў выглядзе ступенчатай піраміды (да 60–70 м), на яе вяршыню вялі прамыя шырокія лесвіцы. Пабудовы гэтага тыпу ўзводзіліся з зямлі і шчэбню і абмуроўваліся каменем. Знешні выгляд іх нагадваў зікураты Месапатаміі, а арнамент у аздабленні быў падобным да кітайскага. Вялікае значэнне меў дэкор – высячаныя з каменю арнаменты, барэльефы і скульптура ўпрыгожвалі сцены пабудоў. Як і сама архітэктура *ацтэкаў*, так і яе скульптурныя вобразы мелі на мэце ўстрашэнне, таму выявы багоў адлюстроўваліся з суровым выразам твару, а змеі і фантастычныя істоты – з адкрытай пасцю. Сярод выяў сустракаюцца таксама чарапы, перакрыжаваныя косці, чалавечыя сэрцы.

У *архітэктуры майя* склалася некалькі стыляў. Будынкі стылю *петэн* мелі пірамідальную аснову з шырокай лесвіцай. Пры будаўніцтве выкарыстоўваліся вялікія валуны і каменныя блокі. У памяшканнях такіх пірамід сцены былі масіўнымі, а калідоры вузкімі. Для стылю *паленке* ўласцівы платформы вертыкальный формы, балюстрады на лесвіцах. Звычайна храмы мелі дзве залы. У задняй зале знаходзілася свяцілішча. Фасады ўпрыгожваліся ляпнымі фігуркамі, якія ўтваралі асобныя фрызы. Храмы *мексіканскага* стылю мелі высокія падмуркі ў выглядзе вертыкальных платформ, балюстрады лесвіц упрыгожваліся зміінымі галовамі, атары аздабляліся змеепадобнымі галовамі. З архітэктурай была звязана скульптура. У якасці матэрыяла для круглай скульптуры выкарыстоўвалі камень, дрэва і гліну. Разьбой па камені ўпрыгожвалі стэлы. Асноўнай тэматыкай была рэлігійная. Скульптура майя, захаваная да нашага часу, прадстаўляе выявы багоў і асілкаў.

*Дойлідства інкаў* (Перу) мае агульныя рысы з цывілізацыяй Цантральнай Амерыкі. Тут таксама ўзводзяцца храмавыя піраміды, але не абмураваныя каменем, са стрыманым скульптурным дэкорам. Арнаментацыя выконвалася на гліне, таму да сённяшняга часу захавалася мала ўзораў. Адным з самых вядомых храмаў з'яўляецца *храм Сонца ў даліне Куско*. Пасля заваявання іспанцамі, храм быў перададзены дамініканцам. Па захаваных апісаннях вядома, што храм быў абнесены магутнай сцяной

(380 м$^2$), узведзенай з валуноў. Інтэр'ер быў упрыгожаны залатымі пласцінамі. Каля ўсходняй сцяны стаялі два крэслы з мармуру, упрыгожаныя залатымі пласцінамі і ізумрудамі. У цэнтры храма знаходзілася свяцілішча Сонца, якое ўключала 5 залаў. У цэнтральнай зале размяшчалася выява Сонца з плаўленага золата, інкрусціраваная ізумрудамі. Перад гэтым сонечным дыскам заўжды гарэла вогнішча. Вакол храма размяшчаліся памяшканні жрацоў і стойлы для ахвярвання жывёл. Гэты комплекс уключаў славуты *"залаты сад" інкаў*, дзе расліны, птушкі, жывёлы і выявы людзей былі зроблены з золата і срэбра. Цывілізацыя інкаў адметна таксама крапасным будаўніцтвам. Крэпасці ўзводзіліся з буйных блокаў абчасаных камянёў.

**§ Выяўленчае мастацтва**

Вялікую ролю ў мастацкай культуры меў і дэкаратыўны насценны жывапіс. *Фрэска* ў Тэпанціtлане (V–VI стст.), якая апавядае аб прыбыцці бога дажджу Чакма ў Рай і пра яго жыццё там, выканана ў натуралістычнай манеры і адрозніваецца рэалістычнасцю выяў. Жывапіс Тэцітлы больш умоўны, а сюжэт таксама звязаны з культам бога дажджу. Ад класічнага перыяду майя захаваліся насценныя роспісы па тынкоўцы храма ў Бонампаке (800 г.). Насценны жывапіс не звяртаўся да шырокага гледача, ён блізкі да старажытнаегіпецкага мастацтва: галовы людзей заўсёды павернуты ў профіль; сцэны размяшчаюцца адна над адной. Сімвалічны сэнс у мастацтве майя меў колер: чорны азначаў вайну, белы – поўнач, жоўты – поўдзень, чырвоны – усход, крывю, зялёны – уладу. У найлепшым стане да сённяшняга часу захаваліся фрэскавыя роспісы майя у храме Ягуараў у Чычэн-Іцэ, у Вашактуне; дэкаратыўны фрыз у Тамуіне і ў Мітле (міштэкі).

Са старажытных часоў захаваліся і *мініяцюры рукапісаў*. Манускрыпты напісаны на лубяной аснове, пакрытай тонкім слоям вапны.

**§ Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва**

Пануючае месца сярод відаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Старажытнай Амерыкі займаюць кераміка, ювелірнае майстэрства і ткацтва. Кераміка адносіцца да лепшых дасягненняў. Асноўнымі тэхнікамі былі лепка і фармоўка. Найбольшае распаўсюджанне на ранніх этапах атрымала ваза-трыножнік з прадрапаным арнаментам. Але ў керамічных вырабах маюцца і рэгіянальныя адрозненні. Культура майя пакінула шматлікія *пахавальныя ўрны*, паліхромныя вазы і пасудзіны з гравіраваным арнаментам. У Цэнтральнай Амерыкі выраблялі статуэткі, гліняныя пячаткі і амфары з конусападобным дном. Цывілізацыя інкаў вылучаецца вырабамі *вазаў-партрэтаў*, пасудзінаў з выявамі багоў, воінаў, музыкантаў, хворых людзей, таксама сюжэты чэрпаліся з паўсядзённага жыцця. Сустракаюцца выявы жывёл і раслін, выкарыстоўваецца і геаметрычны арнамент. Альмекі выраблялі *цыліндрычныя і яйкападобныя пасудзіны*, *вазы з гарлавінай у выглядзе чалавечай галавы*. Чыму ўвялі ў архітэктуру ляпны арнамент. Пасудзіны, якія выраблялiся ў паўднёвыя раёнах матэрыка, пакрываліся шматкаляровымі роспісамі.

*Золата* пачалі шырока апрацоўваць у Перу з IX ст. да н. э., а срэбра – з V ст. да н. э. Асноўнымі тэхнікамі былі: халодная коўка, чаканка, штампоўка на драўлянай аснове, разьба, гравіроўка, плаўка (упрыгожванні). Анак залатыя вырабы дакаланіяльнай эпохі амаль не захаваліся, таму што былі пераплаўлены іспанцамі.

З металаў таксама рабіліся ўпрыгожванні. У асноўным выкарыстоўваліся сплавы: золата – медзь, срэбра – медзь, золата – срэбра – медзь, выкарыстоўваўся і свінец.

*Тканіна* вядома з XXV ст. да н. э., асноўным матэрыялам для яе вырабу служылі шэрсць і бавоўна. Пахавальныя манціі ўпрыгожваліся вышыўкай з міфалагічнымі і бытавымі сцэнамі, адрозніваліся багаццем расфарбоўкі (да 190 таноў). Вядомы таксама вырабы з пер'яў, якія прышываліся ці замацоўваліся з дапамогай раслiннага клею. З 800 г. да н. э. да нашых дзён захавалася даволі шмат ткацкіх вырабаў, якія па тэхніцы выканання нагадваюць шпалеры: аснова – баваўняная нітка, уток – з шэрсці. Асноўныя колеры, што выкарыстоўваліся ў ткацтве, – чырвоны, сіні, жоўты, карычневы. Арнамент быў звычайна анімалістычны, зрэдку – абстрактны. Развівалася вышыўка.

## ТЭМА 11. АФРЫКАНСКАЕ МАСТАЦТВА

### § Агульная характарыстыка мастацкай культуры

Разглядаючы мастацтва Афрыкі, вылучаюць 3 зоны:

1. Суданскую (прыбрэжныя саваны да возера Чад);
2. Гвінейскую (Бераг Слановай косці, Гана, Дагамея, Камерун);
3. Кангалезскую (Цантральна-Афрыканская рэспубліка, Конга, Ангола).

### § Архітэктура

Асноўным будаўнічым матэрыялам у Суданскай зоне служыла гліна, некаторыя пабудовы ўзводзіліся з дробных неапрацаваных камянёў. Добрага лесу тут не было, для бэлек і перакрыццяў выкарыстоўваліся кароткія тонкія ствалы, таму *памяшканні* былі *вузкія і падоўжаныя*. Дрэва выкарыстоўвалася ў якасці каркаса гліняных сцен. Для большай трываласці сцены патаўшчаліся да нізу і мелі на фасадзе вертыкальныя выступы (падобна да архітэкуры Месапатаміі).

У Гвінейскай зоне звычайна будавалі круглае ў плане жыллё. З цягам часу склалася *два тыпы збудаванняў*: *цыліндрычныя з конусападобным ці шлемападобным дахам*, і *вульепадобныя*, у якіх сцены наверсе пераходзяць у пакрыцце сферычнай формы. Усе гэтыя пабудовы ўзводзіліся на плятнёвым каркасе, абмазаным глінай; кроўля выраблялася з саломы ці травы. Самабытнасцю адрозніваецца культавае дойлідства: гэта комплексы, выдзеўбаныя ў скале. Адначасова ў Гвінейскай зоне будавалі і прамавугольныя ў плане дамы з двухсхільным дахам ці квадратныя з шатровым дахам. У галіне горадабудаўніцтва існавала прамавугольная планіроўка гарадоў.

Архітэктуры Кангалезскай зоны ўласцівы *каменныя пабудовы буйных памераў*. Планы гэтых збудаванняў круглыя ці эліпсічныя адпаведна мясцовым традыцыям узвядзення жылых пабудоў. Матэрыялам для сцен служыла сумесь гліны і шчэбню.

Для афрыканскага дойлідства ўвогуле характэрны архітэктурныя формы пластычных абрысаў, якія выпрацоўваліся пры будаўніцтве з гнуткіх матэрыялаў – гліны, лазы, травы.

**§ Выяўленчае мастацтва**

Сярод усіх відаў выяўленчага мастацтва асобнае месца належыць *скульптуры*. Скульптура адрозніваецца геаметрычнасцю, выразнасцю, багаццем пластычных сімвалаў, адвольнасцю форм. Прадстаўлена скульптура ў асноўным ідаламі, якія лепяцца з асобных мас. Шматлікія часткі цела зліваюцца ў адну масу. Напрыклад, галава не звязана з шыяй, а накладзена механічна, таму што з'яўляецца самастойнай масай.

Афрыканскія народы маюць і спецыфічныя асаблівасці ў мастацтве *графікі*, для якой уласцівы вострыя контуры, разнастайнасць узораў і багатая арнаментыка.

**§ Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва**

Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва прадстаўлена вырабамі з керамікі, металу, дрэва, слановай косці і ткацтвам. Асноўным арнаментам у кераміцы з'яўляецца лінейны. У Суданскай зоне выраблялі разнастайныя пасудзіны і прадметы ўжытку з тэракоты. Сярод металаў на ўсім кантыненце былі распаўсюджаны бронза, медзь і золата. Пры гэтым выкарыстоўваліся тэхнікі: васкавое ліццё, коўка, чаканка, набіўка тонкага ліставога золата на драўляную аснову. З дрэва выраблялі мэблю (троны, сядзенні), дэталі архітэктурных упрыгованняў (створкі дзвярэй), посуд, музычныя інструменты (барабаны), прадметы ўжытку, *маскі*. У ткацтве распаўсюджанне атрымалі тканіны з рафіі (кітайскі аксаміт) з геаметрычным малюнкам (Кангелезская зона), тканіна ў краты нябесна-блакітнага колеру з чырвонымі чарапахамі і завіткамі (Гвінейская зона). Са слановай косці выраблялі званочкі.

## ТЭМА 12. АНТЫЧНАЕ МАСТАЦТВА. КРЫТА-МІКЕНСКАЯ КУЛЬТУРА

**§ Агульная характарыстыка мастацкай культуры**

У III–II тыс. да н. э., у эпоху росквіту старажытных цывілізацый Егіпта, Месапатаміі, Ірана, Індыі, Кітая, на астравах і ўзбярэжжах Эгейскага мора існавала эгейская культура, якая папярэднічала старажытнагрэчаскай. У гэты час тут атрымалі развіццё рамёствы і гандаль, а грамадскі лад не характарызаваўся крайнімі формамі дэспатыі, у выніку чаго вобразы мастацтва былі больш гуманістычнымі. Менавіта ў Крыта-Мікенскім мастацтве ўпершыню ў старажытнчм свеце ўзмацнілася ўвага да чалавечай асобы, да яго пачуццяў і паўсядзённага жыцця.

Асноўнымі цэнтрамі эгейскай культуры былі востраў Крыт, гарады Троя (на ўсходнім узбярэжжы Дарданэлы) і Мікены (на поўдні Балканскага паўвострава).

У развіцці Крыта-Мікенскай мастацкай культуры вылучаюць два этапы:

1. Эгейская (Крыцкая) культура [другая палова II тыс. да н. э.];
2. Ахейская (Мікенская) культура [XIV–XII стст. да н. э.].

У канцы XII ст. да н. э. уся тэрыторыя сучаснай Грэцыі, заходняе ўзбярэжжа Малой Азіі і астравы Эгейскага мора былі заняты плямёнамі даран, якія трапілі з поўначы, і эгейская культура перапыніла сваё існаванне.

**§ Архітэктура і выяўленчае мастацтва**

Адрозненні ў культурах Крыта і Мікен адбіліся на характары архітэктуры. Старажытнай формай жылля на Крыце была складзеная з каменю ці сырцовай цэглы круглая пабудова з канічным дахам. Ужо ў II тыс. да н. э. на Крыце распаўсюджваецца характэрная для Егіпта і Месапатаміі суцэльная забудова, пры якой невялікія прамавугольныя памяшканні шчыльна прымыкаюць адзін да аднаго, утвараючы хаатычны план квартала.

У Мікенах і Троі характэрным тыпам жылля быў т. зв. *мегарон* – прамавугольны ў плане дом з двухсхільным дахам і ўваходам з тарцовага боку. Працяг даху ўтвараў над уваходам павець, якая падтрымлівалася драўлянымі слупамі ці падоўжанымі сценамі. На аснове планіроўкі і структуры жылля тыпу мегарон пазней сфарміраваўся старажытнагрэчаскі храм перыпцер, формы якога ўдалейшым ужываліся для пабудоў рознага прызначэння ў еўрапейскіх краінах і ва ўсім свеце.

Найбольшую цікавасць у крыта-мікенскай архітэктуры ўяўляюць палацы. Буйнымі цэнтрамі Крыта ў той час былі Кнос, Фест і Маліа. Руіны *палаца ў Кносе*, рэстаўраваныя англійскім вучоным Эвансам, дапамагаюць уявіць з найбольшай паўнатой палацавую архітэктуру Крыта. Кноскі палац быў пабудаваны на невялікай узвышанасці. Першапачаткова палац складаўся з некалькіх самастойных будынкаў – *інсул*. У комплекс протапалаца ўваходзілі жылыя пабудовы, вялікі двор і *іпагей* – круглае ў плане збудаванне дыяметрам каля 8 м, глыбінёй каля 15 м, высячанае ў схіле ўзгорка. На яго дно спускаліся лесвіцы, таксама высячанай у камені. Прызначэнне іпагея невядома. У хуткім часе палац быў перабудаваны. Ранні палац уяўляў сабою велізарны коплекс, вонкавыя межы якога не змяніліся. У заходняй частцы палаца знаходзіўся шэраг магутных рэльефных каменных пліт – *артастатаў*, якія ядналіся з ядром сцяны магутнымі драўлянымі звязкамі. Паўднёвы бок палаца вянчала двухмаршавая лесвіца, абмежаваная звонку калонамі. Заходняя глухая сцяна была ўпрыгожана жывапісам, а знізу – каменнымі рэльефамі з разеткамі (арнаментальнымі матывамі ў выглядзе стылізаваных распушчаных кветак). У сярэдзіне II тыс. да н. э. лесвіца была разбурана, пасля чаго яна не ўзнаўлялася. У паўночнай частцы палаца знаходзілася тэатральная пляцоўка з двума маршамі. Асноўным яе прызначэннем былі тэатральныя і рытуальныя дзеянні. Доступ непасрэдна да палаца з поўначы ішоў праз вялікую гіпасцільную залу, а затым падымаўся

да цэнтральнага двара вузкім праходам, па абодвух баках якога ўздымаліся высокія масівы з распіснымі рэльефамі, што выяўлялі лоўлю быкоў. Перад імі знаходзіліся калоны. Самі калоны мелі унікальную форму: у адрозненне ад іншых культур, у архітэктуры Крыта ўжываліся калоны, якія памяншаліся ў сячэнні да нізу. Заходні фасад цэнтральнага двара быў пабудаваны ў апошні перыяд (XIV ст. да н. э.). У ім спалучаліся каланады рознага маштаба. Комплекс палаца ўключаў тронную залу з падсобнымі памяшканнямі, якія мелі культавае прызначэнне. Да троннай залы прымыкаў паглыблены на некалькі ступеняў ачышчальны басейн. Унутраныя сцены палаца багата аздабляліся фрэскавым жывапісам. Тут сустракаюцца пейзажы з выявамі фантастычных фігур жывёл, выявы беласкурых жанчын і загарэлых мужчын (як у Егіпце), юнака, які нясе збан і інш. Асаблівай вядомасцю на сённяшні дзень карыстаецца т. зв. *фрэска “Парыжанка”*, якая ўяўляе партрэт беласкурай жанчыны. Акрамя асноўнай, ужо вядомай дагэтуль гамы, у фрэсцы ўжываецца *зялёны колер*. Сам крыцкі жывапіс у параўнанні з жывапісам краін старажытнага Усходу становіцца больш маляўнічым, чым дэкаратыўным, што дасягаецца дзякуючы наяўнасці і характару мазкоў.

Ахейская архітэктура славіцца шматлікімі абарончымі збудаваннямі, якія ўзводзіліся звычайна на ўзвышаных месцах і абносіліся трывалай сцяной з каменных блокаў. Найбольш знакамітым помнікам архітэктуры з’яўляецца *палацавы комплекс у Мікенах*, часткай якога з’яўляюцца знакамітыя *Ільвіныя вароты*, якія знаходзіліся ў глыбіні знешняга двара, утворанага бастыёнам справа і выступам сцяны злева. Уваходная канструкцыя Ільвіных варот уяўляе сабою шэраг каменных блокаў, шчыльна пакладзеных адзін на адзін. Рэбры блокаў маюць акругленні. Квадратны прасвет варот (3 х 3 м) абрамлён чатырма гіганцкімі блокамі, адзін з якіх утварае парог. Вялікі блок – перамычка – над пралётам павышаецца да сярэдзіны; пры даўжыні 4,5 м ён важыць каля 20 т. Напускам блокаў над перамычкай зроблены разгрузачны трохкутнік, які запоўнены плітой з рэльефам, на якім выяўлена магутная, калона, што пашыраецца да верху, і дзве львіцы па яе баках. Калона (сімвал палаца і царскай улады) абапіраецца на алтар (сімвал культа) і ахоўваецца звярамі.

Асаблівае развіццё ў Мікенах атрымалі купальныя грабніцы – *талосы*. Найбольш знакамітай грабніцай з’яўляецца *грабніца цара Агамемнона* (Атрэя), купал якой уяўляе 33 каменныя кольцы. Цэнтрам грабніцы была зала з агменем, акружаная калонамі. Унутраныя сцены былі пакрыты фрэскамі з выявамі палявання і батальных сцэн. Верхняя частка купала была ўпрыгожана бронзавымі разеткамі і гарызантальным дэкаратыўным поясам.

**§ Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва**

Асаблівай увагі заслугоўвае крыта-мікенская *кераміка*. Славай карыстаюцца *крыцкія вазы* – шматлікія пасудзіны з лінейным арнаментам і раслiннымі матывамі. Агульнымі рысамі з’яўляюцца: імкненне да шматколернасці, дынамічнасць малюнка, схільнасць да выгнутых ліній (валют, спіралей). Такімі ж разнастайнымі з’яўляюцца і формы керамічных пасудзін.

Сярод тэхнік ювелірнай справы вядомы чаканка і інкрустацыя. Золата і срэбра звычайна выкарыстоўваліся для вырабу ўпрыгожванняў, посуду і зброі (кінжалы).

Сярод меалаў апрацоўвалася бронза, вядомая тут з III тыс. да н. э. З бронзы выраблялі зброю і статуэткі.

Ткацкія вырабы да сённяшняга часу не захаваліся.

## ТЭМА 13. АНТЫЧНАЕ МАСТАЦТВА. МАТЭРЫКОВАЯ ГРЭЦЫЯ

### § Агульная характарыстыка мастацкай культуры

Антычная культура (у шырокім сэнсе) – гэта перыяд у развіцці ў гісторыі і культуры чалавецтва паміж першабытным і феадальным ладам. У вузкім сэнсе – гэта гісторыя культуры Старажытных Грэцыі і Рыму. Рэгіянальныя межы Антычнасці ўключаюць сучасную тэрыторыю Грэцыі, Італіі і паласу ўздоўж Міжземнага і Чорнага мораў, якія зараз належаць Егіпту, Пярэдняй Азіі, Балгарыі, Румыніі, Украіне, Расіі і Турцыі.

Сярод усіх народаў грэкі ўтрымліваюць лідэрства ва ўздзеянні на развіццё духоўнай культуры Еўропы. У галіне мастацтва менавіта ў Грэцыі была распрацавана ордэрная сістэма архітэктуры, росквіт атрымалі скульптура, фрэскавы жывапіс, мазаіка. Сярод навуковых дасягненняў пэўны ўклад быў зроблены ў развіцці геаметрыі, арыфметыкі, астраноміі, анатоміі, батанікі, механікі, гісторыі.

У развіцці мастацтва (архітэктуры, выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога) Антычнай Грэцыі вылучаюць тры найбольш значныя перыяды:

1. Архаіка [VII–VI стст. да н. э.] У гэты перыяд адбываецца станаўленне грэчаскай культуры, фарміруюцца дзяржавы-полісы (поліс – горад з прыпісанай да яго сялянскай акругай, горад-дзяржава). Усталёўваецца форма дзяржаўнага кіравання – рэспубліка.

2. Класіка [V–IV стст. да н. э.]. Гэта перыяд росквіту антычнай культуры і фарміравання рабаўладальніцкай дэмакратыі.

3. Элінізм [IV–I стст. да н. э.]. Перыяд пачынаецца з заваёў Аляксандра Македонскага. У гэты час пашыраецца тэрыторыя старажытнагрэчаскай цывілізацыі ў вобласць Пярэдняй Азіі, Чарнамор'я і Афрыкі. Адбываецца ўзаемаўплыў культур: антычнай і традыцыйных культур заваяваных народаў. Цэнтр культурнага жыцця перамяшчаецца ў Пярэднюю Азію і ў Александрыю.

### § Архітэктура

У перыяд архаікі адбываецца станаўленне трох асноўных ордэраў.

Архітэктурны _ордэр_ (ад лац. ordo – парадак, будова) – адзін з відаў архітэктурнай кампазіцыі; спалучэнне нясучых і нясомых частак, якое вобразна выражае работу стоечна-бэлечнай канструкцыі. Узнікненне ордэра адносіцца да перыяду Старажытных цывілізацый. Першыя віды архітэктурнага ордэра адрозніваліся афармленнем капітэлей, што мелі ў аснове раслінны і анімалістычны матывы (у Старажытным Егіпце – капітэлі ў выглядзе папіруса, лотаса, пальмы, з выяўленнем багіні-каровы – Гатор, у Старажытным Іране, Месапатаміі – у выглядзе здвоеных паўфігур быкоў).

Каноны класічнай ордэрнай сістэмы склаліся ў Старажытнай Грэцыі. Антычныя ордэры – дарычны (тасканскі як разнавіднасць), іанічны, карынфскі атрымалі назву ад адпаведных абласцей і плямён. Спалучэнне іанічнай і карынфскай ордэрнай сістэмы прадстаўлена кампазітным ордэрам. Структура класічнага ордэра ўключае часткі: нясучую – базу (у дарычным ордэры можа адсутнічаць), калону (у Старажытным Рыме і ў больш познія эпохі – паўкалону, пілястру) з канелюрамі (падоўжанымі жалабкамі) або без іх, капітэль (верхнюю па-мастацку афармленую частку); нясомыя – архітраў, фрыз, карніз, якія складаюць у сукупнасці антаблемент. Адрозненні ордэраў выяўляюцца ў прапорцыях, формах капітэлі, ствала калон, абломаў. У дарычным ордэры (храм Парфенон) ствол калоны мае "прыпухласць" – энтазіс (пачынаючы з 1/3 яе вышыні); капітэль складаецца з трох частак: шэйкі, злучанай са ствалом калоны, эхіна (паўавала) і абакі (квадратнай верхняй пліты); фрыз расчленен трыгліфамі (трайнымі вертыкальнымі ўрэзамі) і метопамі (чатырохвугольнымі плітамі, упрыгожанымі рэльефамі). Іанічны ордэр (храмы Нікі Аптэрос, Эрэхтэён) мае канеліраваную калону, што звужаецца да верху; капітэль аформлена ў выглядзе буйных завіткоў – валют. Карынфскі ордэр (храм Апалона ў Басах) – найбольш зграбны – мае капітэль у выглядзе карзіны са стылізаваных лісцяў і завіткоў. У еўрапейскай архітэктуры ордэр ужываўся ў розныя гістарычныя эпохі: у Старажытным Рыме (храм Геркулеса, трыумфальныя аркі Ціта, Сепцімія Севера, Пантэон), дзе з'явіўся шматярусны ордэр (Калізей), у мастацтве Рэнесанса (капэла Паці ў Фларэнцыі, віла Ратонда ў Рыме, палацо К'ерыкаці ў Вічэнцы), барока (царква Іль Джэзу ў Рыме, ратуша ў Саламанцы, касцёл Віленскага універсітэта), класіцызму (Луўр, сабор Дома інвалідаў у Парыжы, сабор Святога Паўла ў Лондане, Брандэнбургскія вароты ў Берліне, Дом П. Пашкова ў Маскве, Горны інстытут у Санкт-Пецярбурзе), эклектыкі (тэатр Гранд-Опера ў Парыжы), неакласіцызма (музей Прыгожых мастацтваў у Маскве).

Першапачаткова калоны былі драўлянымі, і ставіліся не звонку, а ўнутры храма, падзяляючы яго на часткі – нэфы. У дарычным стылі выкананы храм Апалона ў Карынфе і Пасейдона ў Пестуме. Іанічны стыль прадстаўлены свяцілішчам Артэміды ў Эфесе (Малая Азія), храмамі Геры на в. Самос, Апалона ў Дзідзімах (Малая Азія).

У перыяд класікі найбольш значным дасягненнем у архітэктуры з'яўляецца *выпрацоўка прапорцый пра будаўніцтве храмаў*, аб чым сведчыць усталяванне сістэмы калон адпаведна на галоўным і бакавым фасадах. Гэтая адпаведнасць выяўляецца ў суадносінах: 1:2+1. Выпрацоўваецца тып храма – *перыпцер* – прамавугольны ў плане будынак, акружаны з усіх бакоў каланадай. Найбольш значным архітэктурным ансамблем гэтага перыяду з'яўляецца Афінскі Акропаль, будаўнічымі справамі якога кіраваў Фідый. Галоўнае ў абліччы храмаў гэтага перыяду – імкненне да сумяшчэння дарычнага і іанічнага ордэраў. Яскравым прыкладам з'яўляецца Парфенон (храм Афіны Парфенас (Афіны ткачыхі), арх. Ікцін і Калікрат) і Прапілеі (вароты на Акропаль). Акрамя названых пабудоў Акропаль уключаў будынак

Пінакатэкі (збор мастацкіх твораў), невялічкі паводле аб'ёму храм Нікі Аптэрос, вырашаны іанічным стылем, храм Эрэхтыён, які мае асіметрычны план, паўднёвы фасад аформлены карыяцідамі. Асаблівасцю архітэктуры храмаў у гэты перыяд з'яўляецца фактар успрымання: калоны стаяць на няроўнай адлегласці паміж сабой і выгнуты ўнутр храма, вуглавыя калоны больш масіўныя. Быў распаўсюджаны і другі тып храма – *дзіпцер* (з падвоенымі радамі калон). У канцы перыду з'яўляцца новы тып архітэктурных збудаванняў, пачатак якога паклала ўсыпальніца цара Маўсола ў Галікарнасе (адсюль назва *Маўзалей*). Будынак ўяўляў сабой 24-ступенчатую, трохярусную мармурную піраміду вышынёй 49 м, увенчаную чацвёркай коней у вупражы – *квадрыгай*. Пачынае развівацца і свецкае дойлідства, якое дасягае росквіту ў эліністычны перыяд.

Эліністычны перыяд вядомы перш за ўсё сваёй архітэктурай. Актыўна ў гэты час развіваецца свецкае дойлідства. *Каменныя тэатры* будуюцца ў Дэльфах, Прыене, Пергаме. У храмавым дойлідстве выкарыстоўваецца, пераважна, іанічны ордэр. Цікавымі з'яўляюцца манументальныя збудаванні – *алтар Зеўса ў Пергаме* (II ст. да н. э.), на вялікім фрызе якога ў гарэльефе адлюстравана бойка багоў з гігантамі. Інтэнсіўна будуюцца *бібліятэкі* (Александрыя, Пергам). Сярод самых значных пабудоў вылучаецца *Фароскі маяк у Александрыі* (арх. Састрат, III ст. да н. э.), які ўяўляў сабою трохярусную вежу ў 120 м: першы ярус – квадратны ў плане, другі – васьмівугольны, трэці – круглы, увенчаны статуямі.

**§ Выяўленчае мастацтва**

На ўсіх этапах развіцця культуры Старажытнай Грэцыі квітнела мастацтва пластыкі. У скульптуры архаікі назіраецца ўплыў егіпецкай традыцыі. Тыповыя вобразы гэтага часу – *Курасы* (аголеныя юнакі) і *Коры* (дзяўчаты), для якіх характэрна франтальнасць выявы і архаічная ўсмешка на твары.

У перыяд класікі галоўнай рысай скульптуры становіцца імкненне да ідэалізацыі вобраза чалавека. З'яўляецца дынаміка, імкненне адлюстраваць характар персанажаў. Скульптура адзначаецца пошукамі прапорцый чалавечай фігуры. Набліжэнне да рэальных прапорцый ужо бачна ў скульптуры Ранняй класікі ("Нараджэнне Афрадыты з пены"). Высокая класіка пакінула шэдэўры такіх скульптараў як Міран ("Дыскабол", "Афіна і Марсій"), у якіх назіраецца імкненне адлюстраваць рух; Паліклет ("Дарыфор-коп'яносец", "Параненая Амазонка"), у якіх ідзе распрацоўка канонаў ідэальнай чалавечай фігуры: галава – 1/7, твар і кісць – 1/10, ступня – 1/6 чалавечага цела; Фідый ("Зеўс", рэльефы Парфенона, статуі Афіны). Скульптура Позняй класікі прадстаўлена творчасцю Скопаса ("Галава параненага воіна", "Менада"), у якіх адчуваецца перадача захапленняў і пакутаў; Праксіцеля ("Гермес з Дзіонісам", "Афрадзіта Кніцкая"); Лісіпа ("Апаксіамен") і Леахара ( "Апалон Бельведэрскі").

У перыяд элінізму ў скульптуры пазначаецца дзве тэндэнцыі: да велічнасці, грандыёзнасці ("Калос Радоскі"; "Лаакаон", скульп. Агесандр, Палідор, Афінадор) і да вытанчанасці, зграбнасці ("Венера Мілоская").

### § Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва

У дэкаратыўна-прыкладным мастацтве найбольш значныя дасягненні звязваюцца з *керамікай*. Кераміка служыла для абіходных мэтаў, выкарыстоўвалася ў гандлі, ужывалася для культавых патрэбаў. Матэрыялам служыла чырвоная гліна. Вырабы фармаваліся на ганчарным коле, сушыліся, паліраваліся, распісваліся і падвяргаліся абпальванню. У гэты час ствараецца *два тыпы вазапісу – чорнафігурны*, у якім роспіс здзяйсняецца чорным лакам па чырвоным колеры гліны (Эксекій "Ахіл і Аякс за ігрой у шашкі") і *чырвонафігурны*, дзе фон афарбоўваўся ў чорны колер, а незафарбаваная гліна ўтварала дэкор (Эўтымід "Падрыхтоўка воіна"; Еўфроній, пеліка з ластаўкай). Белая фарба ўжывалася рэдка. Акрамя ваз керамісты выраблялі курыльніцы і элементы архітэктурнага дэкора, а таксама статуэткі і карыкатурныя галовы.

Росквіту дасягнула ювелірная справа. Статуі пакрываліся чаканным ліставым золатам, выраблялiся са слановай косці і золата. З V ст. са срэбра выраблялі манеты. Асноўнымі тэхнікамі былі: коўка, чаканка, ліццё, паянне.

З металаў апрацоўваліся бронза і жалеза, з якіх выраблялі шчыты, шлемы, мэблю, посуд, люстэркі, круглую скульптруру. Ручкі шматлікіх люстэрак уяўлюць статуэтку Афрадыты.

Дрэва ішло на выраб мэблі, якая прадстаўлена тронамі, крэсламі, табурэтамі з ажурнымі ці цалкам дэкарыраванымі спінкамі, а таксама куфрамі, буфетамі для посуду і шафамі. Ножкі мэблі былі прамавугольнымі, тачонымі ці разнымі ў выглядзе звярыных лап.

У галіне ткацтва апрацоўваліся лён, шэрсць, пазней – шоўк, а таксама скура. Тканіна выкарыстоўвалася для абіўкі мэблі, драпіровак і падушак.

## ТЭМА 14. АНТЫЧНАЕ МАСТАЦТВА. ЭТРУСКАЯ МАСТАЦКАЯ КУЛЬТУРА

### § Агульная характарыстыка мастацкай культуры

Да рымлян на тэрыторыі Італіі панавалі этрускі – народ малаазійскага паходжання. Этрускі перыяд Старажытнай Італіі (VIII–V стст. да н. э.) супадае з архаічным перыядам Старажытнай Грэцыі. У IV ст. да н. э. рымляне звергли панаванне этрускаў. Архітэктура Этрурыі (Тасканы) фарміравалася ў кантакце з дойлідствам іншых міжземнаморскіх абласцей старажытнага свету, у тым ліку пад уплывам Грэцыі і яе калоній у Італіі.

### § Архітэктура

Этрускі будавалі *гарады з крапаснымі сценамі*, ірыгацыйныя збудаванні для асушэння балоцістай глебы, дарогі, масты і храмы. У этрускаў атрымала шырокае развіццё тэхніка абчасання каменю і апрацоўкі дрэва.

У этрускаў існаваў звычай хаваць нябожчыкаў у *грабніцах*. Грабніцы ў падрабязнасці паўтаралі жыллё.Па форме грабніцы адрозніваліся. Існавалі круглыя ў плане грабніцы, а таксама прамавугольныя. І тыя, і другія мелі паглыбленне ў зямлю. Выкладваліся грабніцы з буйнога каменю і абмазваліся глінай. Круглыя ў плане грабніцы мелі купальнае завяршэнне.

Унутры грабніцы захоўвалі асноўныя элементы арганізацыі жылля. Тут меліся лавы, паліцы, на якіх з гліны імітаваліся неабходныя ў быце прадметы.

У некаторых грабніцах на ложаку размяшчалі скульптурныя выявы супружаскай пары.

**§ Выяўленчае мастацтва**

Грабніцы ўпрыгожваліся фрэскамі. Многія *фрэскі* выяўляюць сцэны піршаства. На сценах грабніц выяўляюцца жанчыны і мужчыны, якія танчаць ці піруюць за сталом.

Фігуры жанчын, як і ў егіпецкай традыцыі, выяўляюцца больш светлымі за жаночыя.

**§ Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва**

З гліны этрускі выраблялі пахавальныя ўрны – *канопы*. Яны мелі форму збана з дзвюма ручкамі, у якія ўстаўляліся імітаваныя ў гліне выявы рук нябожчыка са складзенымі двума пальцамі ў кальцо. Накрыўка ўрны мела выгляд галавы памерлага.

Да сённяшняга часу захавалася шмат вырабаў з бронзы (статуэткі, люстэркі). У галіне керамікі распаўсюджанне атрымала тэхніка "*букера*" (прадымленая да чарнаты гліна з бліскучай паверхняй і рэльефнымі выявамі).

## ТЭМА 15. АНТЫЧНАЕ МАСТАЦТВА. СТАРАЖЫТНАРЫМСКАЕ МАСТАЦТВА

**§ Агульная характарыстыка мастацкай культуры**

Мастацтва Старажытнага Рыму ў сваім развіцці прайшло шэраг этапаў:

1. Ранні (царскі) Рым [VIII–V стст. да н. э.];
2. Ранняя Рымская Рэспубліка [V–IV стст. да н. э.];
3. Рымская Рэспубліка [III–I стст. да н. э.];
4. Росквіт Рымскай Імперыі [I–II стст.];
5. Заняпад Рымскай Імперыі [III–V стст.].

**§ Архітэктура**

У галіне горадабудаўніцтва існавалі рэгулярная планіроўка гарадоў, брукаваныя вуліцы, сістэма каналізацыі. У перыяд Ранняга (царскага) Рыму на Капіталійскім узвышшы быў пабудаваны храм Юпіцера з франтонам, увенчаным квадрыгай. Была пракладзена Вялікая клаака – падземная каналізацыйная труба. У перыяд Рымскай Рэспублікі быў *вынайдзены бетон*, атрымала пашырэнне арачна-скляпенчатая канструкцыя, на аснове якой з'явіліся і атрымалі распаўсюджанне *тры тыпы скляпенняў*: крыжовае, цыліндрычнае і карабавае. Бетон атрымаў шырокае распаўсюджанне пасля будаўніцтва *акведекаў* (шляхаводаправодаў), якія мелі арачную канструкцыю і вытрымлівалі вялікую вагу. У архітэктуры быў запазычаны старажытнагрэчаскі тып храма *перыпцер*, і распрацаваны новы тып храма – *ратонда* (храм Весты). Асобна ўзводзіліся калоны ў гонар перамог. Галоўныя вуліцы і плошчы ўпрыгожваліся мармурнымі копіямі грэчаскіх статуй. У перыяд Рымскай Імперыі быў узведзены *Пантэон* у Рыме, у канструкцыі якога ўжываліся аркі і скляпенні. Дыяметр купала дасягаў 43 м,

у цэнтры купала знаходзілася круглае акно – “вока Пантэона” – 8,5 м у дыяметры. У гэты ж час быў пабудаваны Рымскі Калізей, які ўяўляе сабою трохпавярховае эліпсічнае збудаванне з арачна-скляпеністым перакрыццем. Першы ярус вырашаны дарычным ордэрам, другі – іанічным, трэці – карынфскім. У нішах першага і другога ярусаў знаходзіліся статуі. Па ўсёй тэрыторыі Рымскай Імперыі будаваліся *Трыумфальныя аркі* і *Трыумфальныя калоны*. Атрымала пашырэнне будаўніцтва тэрм (лазняў), найбольш праслаўленымі сярод якіх былі *тэрмы імператара Каракалы*.

**§ Выяўленчае мастацтва**

У галіне выяўленчага мастацтва развіццё атрымаў *фрэскавы жывапіс*, аб чым сведчаць раскопкі *г. Пампеі*, а таксама жанр рэалістычнага партрэту. На тэрыторыі Егіпта знойдзены т. зв. “*фаюмскія партрэты*”, створаныя васкавымі фарбамі на драўлянай дошцы або на палатне. Партрэты падкрэсліваюць вялікую ўвагу рымлян да чалавечай індывідуальнасці, выяўляюць рысы яго характару.

У манументальным жывапісе назіраецца імітацыя каменнай і мармурнай abліцоўкі і інкрустацыі сцен, выявы архітэктурных дэталей ствараюць ілюзію члянення сцяны, глыбіннай прасторы з багатым дэкорам.

Росквіт атрымаў *скульптурны партрэт*, прадстаўлены бюстамі і статуямі імператараў і палкаводцаў. У скульптурным партрэце выяўляюцца рысы характару, падкрэсліваюцца мужнасць і гераічны пафас (партрэт старога рымляна, Вітэлія, Каракалы). Манументальная скульптура прадстаўлена, пераважна, коннымі помнікамі (статуя Марка Аўрэлія).

**§ Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва**

У кераміцы быў распаўсюджаны рэльефны дэкор. Актыўна ўжывалася *тэракотавая кераміка*, з якой выраблялі свяцільні і ганчарны посуд, аздоблены на сюжэты грэка-рымскай міфалогіі.

Росквіту дасягнула мастацтва шкла. У Старажытным Рыме распаўсюджваецца тэхніка выдзіманага шкла, з дапамогай якой выраблялі пасудзіны рознай формы: з выявамі чалавечых галоў, малпы, гроздзяў вінаграда, птушак, рыб. У І ст. да н.э. распаўсюджваецца “*паліхромны стыль*”, які ўяўляў тэхніку інкрустацыі яшчэ гарачага выраба кавалкамі шкла рознага колеру. Такім метадам выраблялі пацеркі, бранзалеты, кубкі, падносы. Была вядома таксама тэхніка гравіравання па шкле і тэхніка залачэння шкла.

У ювелірнай справе атрымалі вядомасць міфалагічныя, анімалістычныя і раслінныя ўзоры. З золата і срэбра выраблялі, пераважна, упрыгожванні і посуд. У галіне апрацоўкі металаў вядомасцю карысталіся вырабы з бронзы – конская збруя, ваенныя атрыбуты, а таксама посуд. Нярэдка бронзавымі дэкаратыўнымі элементамі ўпрыгожвалася драўляная мэбля. *Мэбля* мела свае адрозненні. Напрыклад, *сталы* былі прамавугольнымі на адной апоры ў выглядзе дэкарыраванай калоны ці *круглымі на трох апорах у форме звярыных лап.*

Ткацтва мела замежныя ўплывы. Шоўк імпартаваўся з Кітая і пераймаў яго матывы. Распаўсюджанне атрымала тэхніка набойкі. Нярэдка тканіна ўпрыгожвалася дэкаратыўнымі нашыўкамі і вышыўкай з фігурнымі выявамі.

## ТЭМА 16. МАСТАЦТВА СЯРЭДНЯВЕЧЧА. ПЕРАДУМОВЫ ФАРМІРАВАННЯ СТЫЛІСТЫКІ МАСТАЦТВА

У 313 г. у Рымскай Імперыі хрысціянства было абвешчана дзяржаўнай рэлігіяй. У 395 г. дзяржава распалася на Усходнюю Рымскую Імперыю (Візантыю) і Заходнюю Рымскую Імперыю. Культура гэтых дзяржаў грунтавалася на хрысціянскай рэлігіі. Самае значнае месца ў культурным жыцці займаў храм, які быў сінтэзам усіх праяў духоўнага жыцця грамадства. Ужо ў IV ст. узніклі адрозненні ў тыпах храмаў Усходняй і Заходняй Імперый. Усходняя Імперыя за аснову ўзяла *крыжова-купальны тып храма*, у аснову планіровачнай структуры якога была пакладзена форма грэчаскага крыжа (роўнабаковага). Заходняя Імперыя пераняла са Старажытнага Рыму форму *базілікі*. Гэты тып храма ў Рыме меў прызначэнне сховішча і быў запазычаны хрысціянамі па прычыне ўмяшчальнай унутранай прасторы.

## ТЭМА 17. МАСТАЦТВА ВІЗАНТЫІ

### § Агульная характарыстыка мастацкай культуры

Сталіцай Усходняй Рымскай Імперыі – Візантыі быў Канстанцінопаль (сучасны Стамбул, Турцыя). Насялялі Візантыю грэкі, сірыйцы, копты, армяне і інш. Пануючай мовай была грэчаская. Ужо ў ранні перыяд (IV–VII стст.) у Візантыі пачаў складвацца феадалізм. Сацыяльныя працэсы адзначаліся наяўнасцю цэнтралізаванага дзяржаўнага апарата і налогавай сістэмы, адсутнасцю саслоўнай замкнутасці пануючага класа, нетрываласцю гандлёва-рамесных карпарацый, сялянскай абшчыны і гарадскіх камун.

Заняпад культуры Візантыі адбыўся ў 1453 г., калі Імперыя была захоплена турэцкімі войскамі.

У сваім развіцці мастацкая культура Візантыі прайшла шэраг этапаў:

1. Эпоха Канстанціна Вялікага і Юсцініана I [IV–VI стст.];
2. Перыяд іконаборства [VIII–IX стст.];
3. Македонскі Рэнесанс [IX – сярэдзіна XI стст.];
4. Эпоха Камнінаў [сярэдзіна XI – пачатак XIII стст.];
5. Перыяд Палеалогаў [XIII–XIV стст.].

### § Архітэктура

На архітэктуру Візантыі паўплывалі культурныя традыцыі Бліжняга Усходу – Сірыі, Палесціны, Малой Азіі. Асноўнай формай пабудоў былі хрысціянскія храмы, якія пачалі актыўна будавацца пры імператары Канстанціне. У адрозненне ад антычнага храма, які лічылся жыллём багоў і ўваходзіць у яго маглі толькі жрацы, хрысціянскі храм разглядаўся як сімвал сусвету і прызначаўся для наведвання яго ўсімі прыхажанамі. Найбольш выдатны і знакаміты помнік архітэктуры Візантыі – храм святой Сафіі ў

*Канстанцінопалі* (арх. Анфімій, Ісідор, 532–537 гг.), пабудаваны пры імператары Юсцініане І. Галоўная зала яго мае выцягнутую форму, у заходняй сцяне знаходзіцца ўваход, ва ўсходняй – апсіда, якая адыгрывае ролю алтарнай нішы. Цэнтральная частка залы перакрыта купалам дыяметрам 31,4 м, які прарэзаны каля аснавання кальцом вокнаў. Купал абапіраецца на чатыры размешчаныя па перыметры аркі, у зоне паміж смежнымі аркамі ўзведзена канструкцыя трохвугольна-сферычнай формы, якая атрымала назву “*парус*”.

**§ Выяўленчае мастацтва**

Найбольшага росквіту ў эпоху Канстанціна Вялікага і Юсцініана І дасягнула мазаіка. Яскравым творам гэтага перыяду з’яўляецца *смальтавая мазаіка* базілікі Сан Апалінарэ ў Равэне “Дзівоснае насычэнне пяццю хлябамі і дзвюма рыбамі” (520 г.). Мазаіка адрозніваецца глыбокімі, насычанымі колерамі, якія надаюць царкоўнаму інтэр’еру сакральнае ззянне. Фон выкладваецца з кавалкаў залачонага шкла, што надае таямнічасць кампазіцыі, падкрэслівае рэлігійны характар, што выяўляецца ў ідэі праслаўлення Бога. У цэнтры кампазіцыі размяшчаецца фігура Хрыста ў пурпурным адзенні. Па баках ад яго знаходзяцца 4 апосталы. Растаноўка і позы фігур нагадваюць урачыстую цырымонію.

У VIII–IX стст. у Візантыі ішла вострая барацьба “іконаборцаў” і “іконапрыхільнікаў”. Сутнасць іконаборства заключалася ў адмаўленні культа святых абразоў, крыжа і ва ўспрыманні гэтага як ідалапаклонства. Іконаборцы вынішчалі хрысціянскія святыні, замазвалі фрэскі і мазаікі, разбуралі храмы, манастыры. Яны даказвалі, што Бога выявіць немагчыма, паколькі яго Дух недаказуем, невывучаны і нябачны. І калі мастак выяўляе Бога-Сына – Ісуса Хрыста ў чалавечым абліччы, ён быццам бы падзяляе на дзве часткі сутнасць Хрыста: на боскую і чалавечую і абмяжоўваецца пры гэтым толькі выяўленнем чалавечай часткі – цялеснай.

Перыяд іконаборства займае ў гісторыі культуры і мастацтва каля стагоддзя. Яго пачатак узыходзіць да 730 г., калі па замове духавенства Малой Азіі візантыйскі імператар Леў-ІІІ выдаў загад, што забараняў шанаваць іконы. З гэтага часу іконаборства сцвердзілася ва ўсёй імперыі, за выключэннем асобных манастыроў, жыхары якіх працягвалі захоўваць і пісаць іконы і ілюстраваць рукапісы. У 843 г. пры візантыйскім імператары Феадоры было адноўлена іконашанаванне.

Буйнейшым цэнтрам іконаборства быў г. Дамаск (сучасная Сірыя), дзе на службе ў арабскага халіфа знаходзіўся знатны і адукаваны хрысціянін Іаан-Мансур, які пазней атрымаў прозвішча Дамаскін. Менавіта яму належыць заслуга распрацоўкі тэорыі свяшчэннага абраза. Вылучаныя Дамаскіным погляды ў дачыненні да стварэння абразоў удасканальваліся. Але ўзнікла неабходнасць уніфікаваць правілы пісання святых. Гэта дазволіла бы з лёгкасцю пазнаваць выяўленых на абразах святых нават з далёкай адлегласці і няграматным людзям. Напрацаваныя на працягу перыяду іконаборства правілы пісання ікон склаліся ў іканаграфічны *канон*. Канон рэгламентаваў схематычнае выяўленне святых, датычыўся фону,

колеру, адзення і атрыбутыкі, прадметаў выяўлення. Асноўнымі элементамі іканаграфічнага канону сталі:

1. Перспектыва. У Антычную эпоху быў распрацаваны і панаваў прынцып прамой лінейнай перспектывы, пры якой лініі сыходзяцца ўдалечыні палатна. У выніку фігуры, размешчаныя ўдалечыні выяўляюцца меншымі ў параўнанні з фігурамі, што знаходзяцца на першым плане. Прамая лінейная перспектыва ствarала ілюзію глыбіні выявы, "прасторавасці". Але такі прыём не падыходзіў для выяўлення святых, бо нічым не адрозніваўся ад рэальных выяў. Візантыйцы распрацавалі прынцып *зваротнай лінейнай перспектывы*. Згодна зваротнай лінейнай перспектыве лініі сыходзіліся не за межамі халста, а перад дошкай або халстом. У выніку выява здавалася вывернутая, апракінутая, накіраваная да вока гледача. Прыём зваротнай лінейнай перспектывы спрыяў таму, што фігуры святых аказаліся распластанымі па дошцы ці па халсце. Пры такім выяўленні дэталі і падрабязнасці апускаліся, бо станавіліся цяжкімі для выканання. У выніку выява абраза падвяргалася *стылізацыі* – абагульненню і спрашчэнню. Мастак павінен быў перадаць не сам прадмет, а яго ідэю агульнадаступным спосабам. Напрыклад, пры выяўленні стала, ўсе 4 ножкі павінны былі быць выяўлены; пры выяўленні пяцікупальнага храма – усе 5 купалоў разгортваліся на палатне. Усё, што выяўлялася на іконе, павінна было перадавацца так, якім можа бачыць гэта Бог.

2. Час. Святыя, выяўленыя на іконе, павінны былі перадавацца па-за межамі часу, у іншым свеце. Гэта спрыяла распрацоўцы сістэмы ўмоўнасцей, якія дазвалялі перадаваць мінулае і будучыню ў адным творы – т. зв. *сістэма сумяшчэння часу*. Напрыклад, пры выяўленні сюжэта нараджэння будучага святога, ён паказваецца ў царкоўным ззянні ў чрэве Маці.

3. Колер. *Колер меў сімвалічнае значэнне*. Адзенне Хрыста – хітон – звычайна вішнёвага колеру, яго плашч – блакітны. У Божай Маці – цёмна-сіні хітон і вішнёвы мафорый (галаўная хустка). Вішнёвы колер сімвалізуе спалучэнне пачатку і канца колеравага спектра (чырвонага і фіялетавага), што азначае самога Хрыста, які ёсць пачатак і канец усяго існага. Блакітны колер – колер неба і чысціні; чырвоны – колер крыві Хрыста і пакутнікаў, колер царственнасці, божскага полымя; зялёны сімвалізуе юнацтва і квяценне; залаты (жоўты) – царкоўнае ззянне. Белы колер азначае бога, які падобен святлу, які аб'емле ўвесь свет. Чорны нагадвае аб боскіх тайнах.

4. Фарбы. Рэгламентацыя колеру патрабавала змены фарбы. На змену энкаўстыцы прыйшла *тэмпера*. Тэмперная фарба рыхтавалася на аснове мінеральных пігментаў, якія расціраліся на яйкавым жаўтку.

5. Фон. Фон атрымаў умоўную трактоўку. З мэтай выключэння з абраза ўсяго рэальнага было забаронена выяўленне ў якасці фона архітэктурных пабудоў, пейзажаў – усяго, што нагадвала пра зямное жыццё. Фон павінен быў спрыяць стварэнню містычнай прасторы. Візантыйцы выбралі *залаты фон*, які нагадваў пра звышрэальнае і выключаў выяўленне іншых крыніц святла – факелаў, свеч, сонца.

6. Размяшчэнне. Для кожнага абраза прадугледжвалася сваё *месца ў храме*: купал – для выявы Хрыста Пантакратара (Уседзяржыцеля), апсіда – для выявы Божай Маці Аранты (Божая Маці, якая моліцца) і г. д.

У перыяд Македонскага Рэнесансу росквіт атрымалі мініяцюра, фрэска і мазаіка. Сама назва перыяду ўмоўная і звязаная з адраджэннем традыцый Антычнасці у адной з прагрэсіўных мастацкіх школ Візантыі IX–XI стст. – Канстанцінопальскай. Назва “македонскі” мае характар гістарычнай канстатацыі таго факта, што адным з саправіцелей імператара Візантыі Міхаіла-III быў македонскі селянін Васіль, які падманам у 867 г. захапіў трон Візантыйскага імператара і заснаваў Македонскую дынастыю, якая кіравала Візантыяй да 1056 г.

У перыяд Македонскага рэнесансу канстанцінопальскія майстры стваралі *копіі мініяцюр з рукапісаў антычных часоў*. Некаторыя з іх афармляліся ў манускрыпты, іншыя мелі форму скруткаў. Адзін з такіх захаваных скруткаў ілюструе біблейскую гісторыю палкаводца Ісуса Навіна (арыгінал датуецца IV ст., копія – X ст.). Антычны арыгінал скрутка захаваўся да сённяшняга часу часткова, фарбы згубілі яркасць або асыпаліся. Таму дакладнае ўяўленне пра скрутак дае яго копія. На доўгай стужцы пергаменту выяўлены воіны ў антычных даспехах, якія ідуць у вайсковы паход, змагаюцца, прыносяць ахвяраванні. Дастаткова ўмоўную трактоўку мае фон, але па антычных традыцыях на ім пазначаны рысы ўзгоркаў, дрэў або пабудовы. Згодна антычным традыцым у мініяцюры ўжываецца прыём прамой лінейнай перспектывы.

З гэтага часу захаваліся і мініяцюры, створаныя як самастойныя старонкі. Яны з’яўляюцца копіямі Александрыйскага рукапісу IV ст. і выкананы візантыйскімі майстрамі ў IX–X стст. Кожная мініяцюра выканана на асобным аркушы і мае арнаментальную рамку. Яны выяўляюць антычныя сюжэты, але вобразы кожнага персанажа маюць рэлігійны падтэкст. Рукапісы выяўляюць архангела Міхаіла, цара Давіда, прарока Ісайю.

*Фрэскавы жывапіс* Македонскага Адраджэння захоўваюць пячоры і храмы *Кападокіі* (уперакл. з арабскай мовы – краіна коней) – цэнтральнай часткі сучаснай Турцыі. Кападокія – гэта унікальнае прыроднае горнае ўтварэнне. Яе геалагічная будова адбылася ў выніку сутыкнення двух супрацьлеглых прыродных сіл. Адной з гэтых сіл з’яўляецца перыяд утварэння, калі лавіны, звяржэнні вулканаў, туфы сваімі элементамі пакрывалі тэрыторыю; другой сілай з’яўляецца разбурэнне, стаўшае вынікам уздзеяння вятроў і ападкаў – дажджу і снегу. Самі горныя ўтварэнні Кападокіі з’явіліся прыблізна 65–62 млн. год да н. э. У перыяд горнага ўтварэння ў старажытнай Анатоліі ўтварыліся глыбокія шчыліны і правалы ў глебе. Пазней, магма, якая паднялася на паверхню, спрыяла стварэнню вулканаў. У выніку частых вулканічных звяржэнняў утвараліся новыя вулканы. Пад час звяржэнняў лава павольна сцякала да праваленай глебы, пакрывала даліны і надавала ім выгляд плата. Па прычыне рэзкай перамены тэмпературы ў зімовы і летні перыяды ў скалах утварыліся шчыліны, а застылая ў іх вада спрыяла разбурэнню. Рэкі, дажджы і вятры размывалі

нават трывалую вулканічную пароду, у выніку чаго ўтварыліся незалежныя вяршыны. На працягу гісторыі Кападокія, якая належала ў розныя часы Анатоліі, Асірыі, хетам, рымлянам, візантыйцам, сельджукам (турэцкія качэўнікі), заставалася буйным сховішчам мірных грамадзян, якія не ўдзельнічалі ў ваенных паходах. У Візантыйскі перыяд у Кападокіі пасяліліся хрысціяне, якія прыстасоўвалі прыродныя горныя ўтварэнні для жыцця. Яны сяліліся ў пячорах, выдзёўбвалі і ўсталёўвалі ў іх храмы, манастыры, распісвалі сцены фрэскамі. Сярод захаваных фрэсак ёсць выявы, якія распавядаюць пра ваенныя паходы, пра жыццё імператараў, але большасць мае рэлігійны характар. Фрэскі візантыйскага перыяду выкананы па іканаграфічных канонах: у падкупальнай частцы выяўляецца Хрыстос Пантакратар, на невялічкіх (бакавых) купалах – выявы архангелаў. Сярод сюжэтаў сустракаюцца сцэны распяцця Хрыста, Уваскрашэнне, Хрышчэнне, Узнясенне і інш. Найбольшую цікавасць уяўляе роспіс царквы Барбары ў даліне Гарэмэ. Акрамя выяў святых – Хрыста, Георія, Тэадора, Барбары на паўночнай сцяне знаходзяцца стылізаваныя выявы кедровых дрэў і пеўніка, якія з’яўляюцца сімваламі Святога Пятра, а таксама выява кузнечыка, які выступае сімвалам хрысціянскай веры.

Лепшыя фрагменты мазаікі перыяду Македонскага адраджэння захаваліся ў *аздабленні храма Ая-Соф’я ў Стамбуле* (былы сабор Святой Сафіі ў Канстанцінопалі). Мазаіка выканана па канонах Візантыі і захоўвае адносную плоскаснасць і ўмоўнасць трактоўкі персанажаў. У выяўленні святых і імператараў прысутнічае схематызм і геаметрызм. Так, у мазаіцы “Імператар Леў-VI перад Хрыстом” (IX ст.) імператар паказваецца ў профіль, але яго твар крыху павернуты да гледача. Твар імператара Льва-VI выяўляецца схематычна – асобна падкрэсліваюцца доўгі шырокі нос, вялікія вочы з апушчанымі знешнімі бакамі, цёмныя бровы ў выглядзе палосак з кавалкаў смальты і геаметрычная ушная ракавіна. Асобная ўвага майстра звяртаецца на вопратку імператара. Яна паказваецца ўмоўна з арнаментальным чаргаваннем складак і геаметрычных ўзораў. *Цікавасць майстроў да арнаменту* стала адметнай асаблівасцю Македонскай эпохі і захавала пераемнасць у наступныя перыяды.

Наглядна дэманструе любоў візантыйцаў да арнаментацыі мазаіка “Імператар Канстанцін Манамах і імператрыца Зоя перад Хрыстом” (сярэдзіна XI ст.). Адзенне імператара і Зоі сталі для майстра больш значнымі, чым рысы твару. Арнамент перадаецца не толькі ў адзенні, але і на вокладцы Бібліі ў руках Хрыста, і на каронах імператара і імператрыцы, і нават, прысутнічае ў німбе Хрыста.

Эпоха Камнінаў уяўляе перыяд у мастацтве Візантыі, звязаны з панаваннем буйной дынастыі Камнінаў, пачатак якой паклаў палкаводзец Ісаак Камнін. Найбольшы росквіт у мастацтве эпохі Камнінаў атрымала мазаіка.

*Мазаіка* Камнінаўскай эпохі працягвае традыцыі, пакладзеныя мастакамі Македонскага рэнесансу. Найбольшая ўвага надаецца арнаментацыі выяў. Фігуры трактуюцца плоскасна, іх сілуэты пакрываюцца

геаметрычным арнаментам, быццам бы наклееным на залаты фон. Такой з’яўляецца вядомая мазаіка Ая-Соф’і – “Імператар Іаан-ІІ Камнін і імператрыца Ірына перад Божай Маці з немаўляткам” (XII ст.). Але нават у гэтай мазаіцы, якая пераймае традыцыі папярэдняй эпохі, ужо бачна новая рыса мастацтва перыяду Камнінаў – *увага да твараў святых, на якіх мастакі імкнуцца выявіць румянец*.

У перыяд Камнінаў мазаіка страчвае былую яркасць, з’яўляюцца кантрасты цёмных і светлых таноў, змяняюцца лікі святых. Так, пры выяўленні ліку Хрыста ў смальтавай мазаіцы “Хрыстос” Ая-Соф’і майстар спалучае белую смальту з чырвонай, ружовую – з зялёнай у разліку на *аптычнае змешванне колераў*. У выніку глядач замест рознакаляровых кубікаў смальты бачыць нежны румянец на твары Хрыста, тонкія зеленаватыя цені на яго веках, светлы, напоўнены жыццём твар. Тыя ж тэндэнцыі бачны ў мазаіцы “Божая маці з немаўляткам” (XI ст.).

У эпоху Палеалогаў росквіт атрымлівае іканапіс. Да найбольш цікавых твораў іканапісу гэтага часу можна аднесці алтарны абраз з Канстанцінопаля “Божая маці на троне” (XIII ст.), які выяўляе Божую Маці з немаўляткам. У гэты час іканапісны канон канчаткова сцвердзіўся ў мастацтве Візантыі. Значны ўплыў візантыйскае мастацтва эпохі Палеалогаў аказала на рускі жывапіс часоў сярэднявечча, у прыватнасці на творчасць Феафана Грэка і Андрэя Рублёва.

**§ Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва**

Керамічныя вырабы Візантыі прадстаўлены каляровай кафляй і посудам. Першапачаткова *паліва*, якой аздаблялі керамічныя вырабы, мела жоўта-карычневы ці зялёны колер, пазней – каляровы спектр пашырыўся. З XI ст. ужываецца тэхніка *зграфіта* (працарапванне па паліве).

Сярод шкляных вырабаў найбольшую цікавасць уяўляюць вітражы, якія маюць яркую расфарбоўку сапфірна-сіняга, жоўтага, ізумруднага і зялёнага колераў.

Ювелірныя ўпрыгожванні мелі ў аснове хрысціянскія матывы. Асноўнымі тэхнікамі былі чэрнь, інкрустацыя, эмаль. Набыла пашырэнне *перагародчатая эмаль*, якая па знешнім выглядзе нагадвае мазаіку. Яна стваралася са шкляной масы, расплаўленай непасрэдна на паверхні вырабу. На металічную аснову рэбрам напайваліся тонкія металічныя пласціны, якія ўтваралі контурны малюнак. У атрыманыя ячэйкі засыпаліся мінеральныя парашкі розных колераў і кварцавы пясок, які плавіцца пры нізкіх тэмпературах. Пры нагрэве парашкі расплаўляліся і запаўнялі ўсю паверхню бліскучай масай, падобнай да каштоўных камянёў. Артыманы выраб шліфавалі да таго, пакуль ён не атрымае гладкую паверхню. У тэхніцы перагародчатай эмалі выраблялі іконы, рэлікварыі, жаночыя ўпрыгожванні і царскія кароны. Адным з шэдэўраў мастацтва з’яўляецца крыж-рэлікварый, падараваны Юсцініанам папе Рымскаму ў 565 г., адваротны бок якога ўпрыгожаны каштоўнымі камянямі. Сярод драўляных вырабаў найбольшую вядомасць мае кафедра ў Равэне (трон архіепіскапа Максіміана), упрыгожаная пласцінамі слановай косці.

У ткацтве распаўсюджанымі былі хрысціянскія матывы (асноўны сюжэт – Дабравешчанне). Адчуваецца і ўплыў усходніх краін. Адной з найбольш распаўсюджаных выяў становіцца арол як сімвал улады і магутнасці.

## ТЭМА 18. ІРЛАНДСКАЕ І ДАРАМАНСКАЕ МАСТАЦТВА

### § Ірландскае мастацтва

У раннім сярэднявеччы ў Ірландыі росквіту дасягае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Адметнай рысай мастацтва з’яўляецца моцная яго сувязь з хрысціянствам. У галіне апрацоўкі каменю вядомасцю карыстаюцца *крыжы*. У разьбе па камені з’яўляецца спачатку гравіраваны арнамент, затым – пластычны з рэльефам няроўнай вышыні. У дэкоры з’яўляюцца стылізаваныя чалавечыя фігуры. У XII ст. рэалістычныя выявы выцясняюць абстрактны арнамент.

Дэкаратыўны жывапіс прадстаўлены *кніжнай мініяцюрай*, якая найчасцей афармляе хрысціянскія рукапісы (евангеллі).

### § Дараманскае мастацтва

Дараманскае мастацтва ўяўляе сінтэз мастацтваў розных народаў. Мастацтва *вікінгаў* славілася вырабам зброі і паясных блях са складаным арнаментам. У вырабах з металаў панаваў *звярыны стыль*. Развіта была і металапластыка. Асноўнымі тэхнікамі былі: насечка (у ювелірнай справе і металічных вырабах), перагародчатая эмаль, філігрань (тонкі, ажурны арнамент са скручанага металічнага жгуціка).

У *Галіі* перыяду Меровінгаў найбольшага росквіту дасягнулі апрацоўка каменю, керамічныя, шкляныя вырабы і ювелірная справа. *Каменнымі рэльефамі* аздаблялі саркафагі і надмагільныя пліты. *Керамічныя вырабы* карысталіся попытам у архітэктуры: імі ўпрыгожвалі падлогу, а таксама аздаблялі сцены. Асаблівасцю *шкляных вырабаў* было тое, што яны ў якасці дэкора мелі *падцёкі ў выглядзе выпуклых “слёз”* (вазы). З золата і срэбра выраблялі ўпрыгожванні, дзе асноўнай тэхнікай была перагародчатая, а таксама круглую скульптуру.

Сваім мастацтвам вылучаюцца і *Каралінгі* (Францыя, Галандыя, Германія, Італія). У галіне апрацоўкі каменю майстры капіруюць антычныя першавобразы (капітэлі калон, разныя фрызы). Дэкаратыўны жывапіс прадстаўлены фрэскай, у якой выкарыстоўваюцца чырвоны, жоўты, зялёны і белы колеры, мазаікай, а таксама *кніжнай мініяцюрай*, якая адрозніваецца экспрэсіўнасцю малюнка і спалучае ў сабе рысы візантыйскага і традыцыйнага мастацтва. Кніжная мініяцюра выкарыстоўвалася ў аздабленні псалтыра. Развіваецца таксама ювелірная справа і апрацоўка металаў.

У галіне архітэктуры з’яўляюцца новыя тыпы пабудоў – *бургі*, якія ўяўлялі сабою умацаваны ваенны лагер, які з часам трансфармаваўся ў рэзідэнцыю феадала. Менавіта ў бургах з’яўляецца ўпершыню высокая вежа, акружаная рвом і пасадам, якая стала правобразам больш позніх абарончых збудаванняў – *данжонаў*.

# ТЭМА 19. СТАРАЖЫТНАРУСКАЕ МАСТАЦТВА

## § Агульная характарыстыка культуры

У IX ст. на тэрыторыі, населенай усходнеславянскімі плямёнамі, утварылася буйная дзяржава – Русь, межы якой ахоплівалі сярэдняе цячэнне Дняпра і Дона на поўдні і Анежскае і Ладожскае азёры на поўначы. Сталіцай дзяржавы быў Кіеў, другім значным цэнтрам – Ноўгарад. У 988 г. пры кіеўскім князі Уладзіміры хрысціянства было прынята ў якасці афіцыйнай рэлігіі, што паспрыяла наладжванню больш трывалых сувязей Русі з Візантыяй. У XV ст. на тэрыторыі Русі была заснавана Маскоўская дзяржава, якое праіснавала да XVII ст.

## § Архітэктура

У 989–996 гг. візантыйскія майстры пабудавалі ў Кіеве *першы каменны храм – Дзесяцінную царкву*. Крыжова-купальная трохапсідная царква, тыповая для візантыйскіх культавых пабудоў, мела свае асаблівасці: з мэтай большай умяшчальнасці галоўны аб'ём царквы з трох бакоў меў дадатковыя памяшканні.

У 1017–1037 гг. пры Яраславе Мудрым у Кіеве будуецца *Сафійскі сабор*. Храм уяўляў *крыжова-купальную пабудову*; у кампазіцыі дамінаваў галоўны купал, акружаны чатырма меншымі, за якімі размяшчаліся бакавыя купалы. Цэнтральны аб'ём будынка меў абхадную галерэю. Сцены сабора былі выкладзены *візантыйскай кладкай* – з плоскай цэглы і каменю на вапневым растворы з дабаўленнем таўчонай цэглы. Пазней (XVII ст.) фасады былі атынкаваны. У інтэр'еры сабора ўжываліся мармурная абліцоўка сцен, мазаікі са смальты, фрэскавыя роспісы.

Вялікага размаху атрымала культавае будаўніцтва ў Ноўгарадзе. У XII ст. тут была пабудавана манастырская царква Спаса на Нярэдзіцы, разбураная ў 1941 г. Званіца пры гэтай царкве была першай у Кіеўскай дзяржаве. Прыкладна ў гэты час фарміруецца *наўгародская архітэктурная школа*, якая адрозніваецца пластычнасцю, лаканічнасцю форм, выцягнутасцю прапорцый.

У XII – пачатку XIII ст. першанства пераходзіць да *Уладзіміра-Суздальскай школы дойлідства*. Уладзіміра-Суздальскія храмы мелі кампактны кубічны аб'ём і вянчаліся адным купалам; знешнія масы і ўнутраная прастора адрозніваліся статычнасцю; пабудовы былі аздоблены каменнай пластыкай, якая з'явілася пад уплывам раманскай скульптуры і разьбы, часам сцены ўпрыгожвалі дэталі з залачонай медзі; інтэр'еры распісваліся фрэскамі, аздабляліся іконай у візантыйскай традыцыі па канонам іканаграфіі. Асаблівасцю Уладзіміра-Суздальскай архітэктурнай школы было ўжыванне закамарнага перакрыцця. *Закамара* – гэта паўкруглае або кілепадобнае завяршэнне сцяны, якое адпавядае па сваіх абрысах перакрыццю. Такімі былі царква Пакрова на Нерлі, Дзмітрыеўскі сабор ва Уладзіміры.

У XV ст. пачынаецца перабудова Маскоўскага Крамля. Першым крокам у гэтым напрамку стала ўзвядзенне на тэрыторыі Крамля ў канцы XV ст. па праекце італьянскага архітэктара А. Фіараванці першага каменнага

храма ў Маскве – *Успенскага сабора*. Сабор пабудаваны ў формах, якія нагадваюць стыль Уладзіміра-Суздальскай школы архітэктуры, але з удакладненнем геаметрычнай будовы і выкарыстаннем новай будаўнічай тэхнікі. Тут упершыню на Русі былі ўжыты крыжовыя скляпенні і жалезныя звязкі; дзякуючы памяншэнню вагі скляпенняў і добрай якасці мураўкі былі пабудаваны больш тонкія і шырока пастаўленыя слупы, што зрабіла інтэр’ер прасторным.

У канцы XV – пачатку XVI ст. на тэрыторыі Маскоўскага крамля ўзводзяцца Дабравешчанскі сабор; Архангельскі сабор; дазорная вежа Маскоўскага крамля, якая пасля яе дабудовы ў 1600 г. набыла вышыню больш 80 м і стала служыць званіцай; будынак прыёмнай залы Вялікага Князя – т. зв. Гранавітая палата, фасады якой выкладзены гранёнымі камянямі.

Адным з найбольш славутых твораў рускай архітэктуры XVI ст. з’яўляецца *храм Узнясення* ў падмаскоўнай царскай сядзібе – Каломенскім, пабудаваны па загаду цара Васіля III у сувязі з нараджэннем сына – будучага цара Івана Грознага. Смелым наватарствам у гэты перыяд было выкарыстанне ў кампазіцыі храма *шатровага даху*, запазычанага з драўлянага дойлідства. Акрамя запазычання формы васьміграннай вежы, увенчанай шатром, з народнага дойлідства былі пераняты абрысы асноўнага аб’ёма, які ў плане мае форму квадрата з выступамі на кожным з чатырох бакоў. Аднак пры гэтым архітэктура храма пластычная, маляўнічая, дзякуючы ўжыванню арак, пілястраў і *какошнікаў* (несапраўдных закамар).

У гэты ж час у гонар узяцця Казані ўзводзіцца *храм Васіля Блажэнага* (Пакроўскі сабор на Рву, арх. Барма і Поснік). Храм мае 9 вежаў, аб’яднаных агульнай кампазіцыяй. Цэнтральная вежа ўвенчана шатром, астатнія – цыбулінамі з розным дэкаратыўным аздабленнем. Агульнае аблічча збудавання адрозніваецца казачнай маляўнічасцю.

У XVII ст. у архітэктуры Маскоўскага княства з’яўляецца новы стыль – *узорач’е*. Ён сустракаецца ў купечаскіх палатах і храмах і адрозніваецца багатым аздабленнем, вялікай колькасцю дэкаратыўнах архітэктурных дэталей (какошнікаў, нішаў, лапатак, пілястраў і г. д.). Яскравым прыкладам увасаблення стылю узорач’е з’яўляецца Царква Троіцы ў Кітаі-горадзе ў Маскве.

У канцы XVII – пачатку XVIII ст. у архітэктуры Расіі з’яўляюцца рысы барока, якое атрымала тут свае лакальныя праявы. Першымі спробамі адзначыўся стыль *Нарышкінскага (Маскоўскага) барока*, які ўвасобіўся ў пабудовах, што ўзводзіліся сваякамі цара Нарышкіна. Крыху пазней атрымлівае распаўсюджанне *Галіцынскае барока* (царква Знамення ў Дуброўі). Абодвум кірункам уласцівы пластычнасць, наяўнасць валют, крывалінейных форм у абрысах сцен, разлік на гульню светлацені, выхады архітэктурных мас у навакольную прастору.

**§ Выяўленчае мастацтва**

Росквіт у Старажытнай Русі атрымаў *іканапіс*. Па паданні першай іконай быў абрус, на якім выяўляўся лік Хрыста (“Спас Нерукатворны”).

Пазней былі створаны іконы з выявай Божай Маці. Лічыцца, што іх стварыў грэчаскі ўрач і жывапісец Лука Евангеліст. З цягам часу былі распрацаваны правілы пісання ікон, якія ў Візантыі былі сістэматызаваны і аформлены ў канон. У іканапісе Старажытнай Русі быў запазычаны візантыйскі іканаграфічны канон. Асноўнымі *тыпамі ікон* былі:

1. “Аранта” (з грэч. – Божая Маці, якая моліцца). Божая Маці выяўлена ў поўны рост з узнятымі да верху рукамі.
2. “Знаменне”. Божая Маці выяўлена па пояс з немаўляткам Хрыстом у чрэве.
3. “Адзігітрыя” (назва паходзіць ад храма Адэгон, дзе візантыйскія імператары маліліся перад вайсковымі паходамі). У Старажытнай Русі вядома таксама пад назвай “Настаўніца”. Божая Маці выяўлена па пояс з немаўляткам Хрыстом на левай руцэ. Галава Божай Маці крыху нахілена ў бок немаўляткі, які крыху паварочваецца да яе.
4. “Перыўлепта” (ад грэч. – прыгожы від). У Старажытнай Русі вядома таксама пад назвай “Казанская Божая Маці”. Божая Маці выяўлена па пояс з немаўляткам Хрыстом на правай руцэ. Твары Марыі і Ісуса звернуты адзін да аднаго.
5. “Гелеўса” (ад грэч. – міласэрдная). У Старажытнай Русі вядома таксама пад назвай “Замілаванне”. Божая Маці выяўлена па пояс з немаўляткам Хрыстом на правай руцэ. Твары Марыі і Ісуса прыціскаюцца адзін да аднаго.

З мэтай аддзялення сакральнай прасторы ад малельнай залы, прызначанай для наведвання прыхажанамі, у XIV ст. у храмах Старажытнай Русі з’явілася перагародка – *іканастас*.

Іканастас уключаў іконы, размешчаныя ў строга рэгламентаваным парадку. Для кожнай іконы было вызначана адпаведнае месца – чын (рад). *Асноўнымі чынамі* былі: *Прарочаскі, Святочны, Дэісусны, Мясцовы*. Прарочаскі чын уключае іконы біблейскіх пракрокаў, якія апавяшчаюць прыход Хрыста. Вышэй можа знаходзіцца Прабацькоўскі чын. У Святочным чыне выяўлена 12 самых значных падзей, звязаных з Хрыстом і Божай Маці: Ражство Багародзіцы, Ражство Хрыста, Увядзенне Божый Маці ў храм, Дабравешчанне, Успенне, Срэценне, Хрышчэнне, Праабражэнне, Уздзвіжэнне крыжа, Уваход у Іерусалім, Узнясенне і Троіца. Дэісусны чын (ад грэч. déēsis – маленне) у цэнтры выяўляе Хрыста, па баках – Божую Маці, Іаана Хрысціцеля, святых, што моляцца. Мясцовы чын утрымлівае выявы мясцовых святых. У цэнтры мясцовага чына размяшчаюцца Царскія вароты, справа ад якіх – ікона Божай Маці, злева – ікона Ісуса Хрыста. Такая сістэма размяшчэння ікон у іканастасе захавала пераемнасць і ў наступныя часы, ужываецца і сёння.

Побач з іканапісам у Маскоўскім княстве атрымлівае росквіт *фрэска*. Славу ў XIV–XV стст. набывае творчасць Феафана Грэка і Андрэя Рублёва. Прадстаўнік канстанцінопальскай школы жывапісу *Феафан Грэк* атрымаў вядомасць дзякуючы сваім роспісам. Сярод яго славутых твораў – роспісы царквы Спаса Праабражэння ў Ноўгарадзе. Асаблівасцю манеры пісьма

мастака з’яўляецца дакладнасць у размеркаванні блікаў на тварах святых, дзякуючы чаму форма набывае *трываласць і канструктыўнасць*. Вобразы прабацькоў адрозніваюцца напружаным псіхалагізмам, незвычайнай астратой індывідуальных характарыстык, дынамічнай свабодай і маляўнічасцю кампазіцыйнай будовы, своеасаблівым танальным каларытам.

Вучнем Феафана Грэка быў *Андрэй Рублёў*. Ужо на ранніх этапах сваёй мастацкай творчасці Рублёў выконваў мініяцюры да Евангелля. Адна з першых яго работ – выява сімвала евангеліста Матфея ў вобразе анёла, выкананая ў адценнях блакітнага і ліловага колераў, дзе толькі чырвоны абрыс кнігі ў руках анёла вылучаецца яркай плямай. У сталым узросце Рублёў распісвае сцены Успенскага сабора ва Уладзіміры; сярод роспісаў вылучаецца сцэна “Страшны суд”. Усе фігуры сцэны надзвычай лёгкія, паветраныя, амаль невясомыя. Рублёў па-майстэрску звязаў фігуры і групы з закругленымі скляпеннямі храма. Сярод мноства фігур роспісаў сабора вылучаецца фрэска з вобразам апостала Пятра. Пётр звяртае твар да ідучага за ім натоўпа, упэўнены, што яго пачуюць і зразумеюць. Усё яго аблічча кажа пра давер да людзей, пра цвёрдую ўпэўненасць, што добрым заклікам можна накіраваць людзей на шлях ісцінны. У адрозненне ад фрэсак Феафана Грэка, блікі ў Рублёва больш тонкія і нежныя, больш моцна выступае контур, абрысы галавы блізкія да абрысаў круга.

Найбольшую славу Рублёву прынесла ікона “Троіца” для іканастаса Троіцкага сабора Сергіевага манастыра. У “Троіцы” Рублёва прадстаўлены тыя ж стройныя, прыгожыя постаці юнакоў, якіх можна бачыць ва ўсіх яе правобразах. Але і ў гэтым творы бачна імкненне мастака да выкарыстання свайго *ўлюблёнага матыва – круга*. Сярэдні анёл схіляе сваю галаву, німб яго парушае сіметрыю ў верхняй частцы іконы, і раўнавага ўзнаўляецца толькі тым, што абодва падножжы анёлаў адсунуты ў адваротны бок. У кожнай частцы кампазіцыі бачны водгаласы асноўнай “кругавой мелодыі”, лінейныя адпаведнасці, формы, што ўзнікаюць з іншых форм ці з’яўляюцца іх люстэркавым адлюстраваннем – усё тое, што ўласціва манеры мастака. Рублёў быў выдатным каларыстам. Ён жадаў, каб фарбы прагучалі як мага гучней. Ікона “Троіца” пабудавана на кантрастным спалучэнні насычаных сіняга, цёмна-вішнёвага, нежна-ружовага і зялёна-блакітнага колераў на асноўным залатым фоне.

Крыху пазней фарміруюцца дзве асноўныя рускія *школы жывапісу – Наўгародская і Пскоўская*. Абодвум школам уласцівы выкарыстанне насычанага чырвонага колеру, цёмная колеравая гама. Творы Пскоўскай школы пішуцца на залатым фоне. Асаблівасцю Наўгародскай школы з’яўляецца адлюстраванне ў вобразах святых народнага тыпажу.

У іканапісе XVII ст. адбываюцца значныя змены, у чым заслуга належыць іканапісцу Сымону Ушакову. Дзякуючы Сымону Ушакову ў іконе гэтага часу з’яўляецца светлацень, што дазваляе выяўляць фігуры аб’ёмнымі.

**§ Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва**

У Старажытнай Русі дасягнула свайго апагея ювелірная справа. На ранніх этапах для вырабу ўпрыгожванняў ужывалася тэхніка ліцця, на аснове

якой выраблялі пярсцёнкі, колты, пацеркі, аздобленыя каштоўнымі камянямі, кавалкамі каляровага шкла або крышталю. Сусветна вядомым помнікам ювелірнага мастацтва XI ст. з’яўляецца чаканны залаты медальён – “грыўна Уладзіміра Манамаха”, знойдзеная пад Чарнігавым у 1821 г. На адным з бакоў медальёна выяўлена жанчына, абвітая змеямі, якая сімвалізуе зло, на другім баку – архангел Міхаіл як сімвал аховы, дабра. Надпісы па краях медальёна, зробленыя на стараславянскай мове, сведчаць пра тое, што ён выконваў функцыю абярэга.

З XIII ст. у ювелірнай справе распаўсюджваюцца новыя тэхнікі аздаблення: зернь, прыйшоўшая са Скандынавіі, скань (філігрань), чэрнь. Атрымліваюць пашырэнне эмалі.

## ТЭМА 20. РАМАНСКАЕ МАСТАЦТВА

### § Агульная характарыстыка мастацкай культуры

У эпоху сярэднявечча ў Заходняй Еўропе ўзнікаюць першыя два мастацкія стылі – раманскі (раманіка) і гатычны (готыка). Панаванне раманскага стылю ў мастацтве краін Заходняй Еўропы не мае дакладна вызначаных храналагічных межаў; росквіт стылю прыпадае на X–XII стст.

Сам тэрмін “раманскі” мае ўмоўны характар, утварыўся ад лац. “Roma” – Рым. Упершыню тэрмін быў ужыты археолагамі XIX ст., якія вызначылі знешняе падабенства старажытнарымскіх і заходнееўрапейскіх пабудоў X–XII стст.

### § Архітэктура

Найбольшы росквіт у перыяд панавання раманскага стылю ў Еўропе атрымала архітэктура. Раманская архітэктура прадстаўлена храмамі базілікальнага тыпу і абарончымі замкамі. *Замак* уяўляў абарончую пабудову, у якой жыў уладар мясцовасці. Замак быў яго жыллём і апошнім прытулкам у выніку асады. У перыяд панавання раманскага стылю ў Заходняй Еўропе склаўся тып замка – *кастэль*, які меў у плане форму шматгранніка (часцей, чатырохвугольніка), фланкіраванага вартавымі (баявымі) вежамі. Сцены замка былі ўвенчаны зубцамі, з унутранага боку якіх рабілі драўляны насціл, адкуль абаронцы стралялі па ворагу. Пазней пачалі рабіць галерэйкі з люкамі ў падлозе. Уся тэрыторыі замка акружалася вялікім рвом. Звычайна замак знаходзіўся на ўзвышанай частцы мясцовасці і маскіраваўся лясным масівам. Адзіным уваходам служылі вежавыя вароты, да якіх падводзіў пад’ёмны мост. Замкавы ансамбль уключаў высокую прамавугольную ці круглую вежу – *данжон*.

Раманскі стыль фарміраваўся пад уплывам мастацтва Візантыі. Візантыі належыла невялікая вобласць у Паўночнай Італіі з цэнтрам у г. Равэна. Тут яшчэ ў VI ст. былі ўзведзены культавыя пабудовы высокай ступені дасканаласці, якой у іншых гарадах Еўропе дасягнулі толькі праз 500 г. У сталіцах заходнееўрапейскіх дзяржаў працавалі візантыйскія майстры, што спрыяла распаўсюджанню будаўнічых тэхналогій і эстэтычных густаў, пануючых у Візантыі.

У найбольшай ступені раманскі стыль выражаны ў абліччы будынкаў *каталіцкіх храмаў*. Асновай плануровачнай структуры раманскага храма стала рымская *базіліка*. Характэрная *кампазіцыя фасада з двума вежамі* па баках увахода сфарміравалася пад уплывам аблічча цэркваў Сірыі. Вежы раманскіх цэркваў вянчаліся высокімі шатровымі дахамі пірамідальнай ці конусападобнай формы. Унутры цэнтральная прастора асноўнай залы першапачаткова аддзялялася ад бакавых нэфаў двума радамі калон, на якія абапіраліся аркі, што неслі сцяну з аконнымі праёмамі. У архітэктуры раманікі панавалі *цяжкія формы* пры тым, што *аконныя праёмы* былі *невялікімі і вузкімі*. Знешні выгляд раманскіх храмаў ствараў уражанне *масіўнасці, замкнёнасці*.

Дойліды раманікі адмовіліся ад фармальнай мовы антычнай эпохі і пераадолелі візантыйскую мадэль храма. Калоны занялі месца апор, *прастора пашырылася і была расчленена сценамі*; сцены, што аддзялялі нэфы, структурна падзяліліся на *чатыры ўзроўні*: аркада, галерэя, трыфорыум, ліхтар. Шырокая прастора храма перакрывалася скляпеннямі.

У перыяд росквіту раманскага стылю скляпенне становіцца распаўсюджанай канструкцыяй перакрыцця. Цэнтральная зала храма перакрывалася простым *цыліндрычным скляпеннем*, а бакавыя – больш складанымі *крыжовымі скляпеннямі*, якія былі вядомыя яшчэ ў Старажытным Рыме. Крыжовае скляпенне ўяўляла канструкцыю перакрыцця, ніжняя паверхня якой утваралася перакрыжаваннем двух узаемнаперпендыкулярных цыліндрычных скляпенняў. Крыжовае скляпенне абапіралася на чатыры слупы, устаноўленыя па вуглах квадрата, што дазваляла перакрываць вялізныя па прасторы залы.

Характэрным элементам раманскай архітэктуры з'явілася *паўцыркульная* (паўкруглая) *арачная форма*. У ранні перыяд ужываліся простыя каменныя аркі, форма якіх была сугуба утылітарнай. З часам уваходы ў сабор набылі афармленне ў выглядзе размешчаных адна за другой арак, якія памяншаюцца і абапіраюцца на прысценныя калоны, – т. зв. *перспектыўнага партала*.

Найбольш знакамітымі помнікамі раманскага стылю з'яўляюцца царква Нотр-Дам ля Гранд у Пуацье (Францыя), храмы ў Вормсе, Шпейеры і Майнцы (Германія), венецыянскі сабор Святога Марка, архітэктурны ансамбль у Пізе (Італія), Царква Сант Яга дэ Кампастэла (Іспанія), Лонданскі Тауэр з Белай вежай (Англія).

**§ Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва**

У выяўленчым мастацтве раманікі пашырэнне набыў дэкаратыўны жывапіс, прадстаўлены фрэскай і мініяцюрай. У *фрэскавым жывапісе* склалася *дзве школы*: "*школа светлых фонаў*" з графічным малюнкам і пераважна светла-жоўтым фонам (заходнія правінцыі Францыі, а таксама Аверні) і "*школа сініх фонаў*", для якой характэрны арнамент з раслінных завіткоў, яркія фарбы і лазурна-сіні фон (манастыр Клюні). Колькасць колераў у абедзвюх школах была невялікай. Звычайна выкарыстоўваліся

жоўтая охра, чырвоная охра, свінцовыя бялілы, чорны, шэры і сіні. Асноўным сюжэтам быў рэлігійны.

*Кніжнай мініяцюрай* ілюстравалі манускрыпты і рукапісы. Найбольшага росквіту мініяцюра дасягнула ў Францыі і Іспаніі. Кніжная мініяцюра французскай школы вылучаецца дакладным контурным малюнкам, прыглушанымі фарбамі ў межах аднаго колеру. Мініяцюра Іспаніі адрознівалася яркімі фарбамі.

Шырока практыкавалася ў перыяд панавання раманскага стылю разьба па камені. Асноўнымі матывамі былі геаметрычны, раслінны, зааморфны і антрапаморфны. Пануючае месца ў *пластычным аздабленні архітэктурных пабудоў* раманікі займаюць вобразы пачвараў, запазычаныя з Усходу. Дэкаратыўная каменная скульптура пераважае ў дэкоры парталаў і капітэляў калон у цэрквах і манастырах. Галоўным чынам упрыгожваліся цімпан партала і архівольты (абрамленне арачнага праёма, якое вылучае дугу аркі з плоскасці сцяны) скляпенняў. Скульптурныя матывы дэфармуюцца, прапорцыі людзей і жывёл выцягваюцца і нагрувашчваюцца адзін на адзін. Часам ствалы калон упрыгожваюцца раслінным арнаментам. Улюблёным анімалістычным матывам мастакоў становяцца леў і арол. З’яўляюцца дэкаратыўныя інкрустацыі, падобныя да мазаікі. Устаўкі робяцца з бура-чырвонага цэмента на фоне адшліфаванага мармуру.

У галіне керамікі папулярнасцю карысталіся пліткі для падлогі. Форма пліткі была квадратнай, прамавугольнай ці шасцівугольнай. Малюнак звычайна выкладваўся жоўтай пліткай на чырвоным фоне ці чырвонай пліткай на жоўтым фоне.

Славу набылі раманскія *вітражы*. У гэты час драўляныя рамы замяніліся свінцовай арматурай, якая дапускала большую разнастайнасць контураў і памераў малюнкаў. Асноўнымі колерамі былі сіні і чырвоны. Выраблялiся i бескаляровыя вітражы. З выдзіманага шкла рабілі посуд.

Апрацоўка металаў і ювелірная справа зведала ўплыў хрысціянства. Асноўным матывам быў рэлігійны. З золата, срэбра, жалеза, бронзы і свінца выраблялі пацiры, рэлiкварыi, агароджы хораў, распяцці і іншыя культавыя рэчы. Асноўнымі тэхнікамі былі: коўка, чыканка, пайка, клёпка, часам ужывалася эмаль.

Галоўнымі прадметамі драўлянай мэблі былі *куфар і лаўка*. Куфры не мелі ўпрыгожванняў, затое багата аздаблялася лаўка. Куфэркі для захавання ўпрыгожванняў ці каштоўнасцей выраблялі таксама са слановай косці.

Пашырэнне набыла вышыўка. Вышывалі сцябляным швом ці гладдзю (“Дыван з Байё”, шаўковая туфля папы Клімента II). З XI ст. пачалася вытворчасць шпалер – тканых насценных дываноў.

## ТЭМА 21. ГОТЫКА

### § Агульная характарыстыка мастацкай культуры

Тэрмін “гатычны” ўмоўны. Готы – германскія плямёны, якія першапачаткова жылі кая берагоў Балтыйскага мора. У III ст. готы распаўсюджваюцца на поўдзень да берагоў Чорнага мора і Балкан, часткова ў

Малую Азію. У IV–V стст. готы ўваходзяць у Італію і Іспанію, утвараючы свае дзяржавы. Па ўяўленнях сярэдневяковых італьянцаў, готы – гэта народы поўначы, таму мастацкі стыль паўночных адносна Італіі краін быў названы гатычным, пры тым, што заснавальнікамі стылю з’яўляюцца французы.

Развіццё гатычнага мастацтва адзначылася і дасягнула вышэйшага росквіту ў больш моцных у эканамічных, палітычных і культурных адносінах гарадах Паўночнай Францыі – Іль-дэ-Франсе (Парыж), Амьене, Рэймсе, Шартры і Руане. Развіццё готыкі ў Францыі ахоплівае час з сярэдзіны XII да пачатку XVI ст. Унутры гэтага перыяду вылучаюць:

1. Раннюю готыку [XII ст.];
2. Сталую готыку [XIII–XIV стст.];
3. Познюю готыку [канец XIV–XV ст.].

У заходнееўрапейскай літаратуры атрымала пашырэнне перыядызацыя гатычнага стылю, распрацаваная французскім даследчыкам Латры, які вылучыў:

1. “Пераходны стыль” [1140–1180 гг.];
2. “Стральчаты стыль” [1180–1270 гг.];
3. “Прамянёвы стыль” або “ззяючы стыль” [сярэдзіна XIII – канец XIV ст.];
4. “Палымяны стыль” [каля 1380 г. – пачатак XVI ст.].

**§ Архітэктура**

Месцам засяроджання грамадскага жыцця горада быў *сабор*. У ім адбываліся не толькі багаслужэнні, але і сходы гараджан, вяліся багаслоўскія спрэчкі. З часам гарады разрасталіся, і сабор патрабаваў больш месца для жыхароў. Павелічэнне ўнутранай прасторы залаў сабора дасягалася павелічэннем яго памераў у шырыню і ў вышыню, памяншэннем сячэнняў унутраных калон з тым, каб яны не загрувашчвалі прастору. Дойліды готыкі пачалі ўжываць *спосаб члянення крыжовага скляпення* на сістэму арачных рэбраў (*нервюраў*), што дазволіла паменшыць вагу канструкцыі перакрыцця. Акрамя таго, сцены сярэдняй часткі *базілікі* пераўтварыліся ў шэраг прасценкаў з вялікімі вокнамі паміж імі, у выніку чаго прастора сабора стала больш светлай. На тонкія і высокія апоры, якія замянілі былыя масіўныя сцены, распор быў перададзены на калонныя упорныя аркі (*аркбутаны*), што знаходзіліся звонку будынка і абапіраліся на слупы (пілоны) – *контрфорсы*. Уражанне лёгкасці, ажурнасці абумоўлена і своеасаблівай *пластыкай архітэктурных форм*: падкрэсленымі вертыкалямі апор, якія маюць выгляд не слупоў, а пучкоў тонкіх калонак; стральчатымі аркамі; востраканечнымі шатрамі і франтонамі; расчлененасцю мас; тонкай прафіліроўкай дэталей. З мэтай памяншэння распора паўцыркульная (паўкруглая) *форма арак* і скляпенняў была заменена *стральчатай*, запазычанай з краін Усходу (Ірана, Сярэдняй Азіі). Важнае месца ў гатычнай архітэктуры адводзілася *пластычнаму аздабленню храма*. Часта храм быў асіметрычны, кожны яго партал быў аформлены індывідуальна. Унутры храм быў пазбаўлены жывапісу, яго ролю выконвалі *каляровыя вітражы*. Адной з асаблівасцей

гатычнай архітэктуры з'яўляюцца *вокны-ружы* (круглыя вітражы на галоўным фасадзе і ў завяршэнні трансэптаў).

У розных краінах Еўропы гатычны стыль атрымаў лакальныя праявы. У выкарыстанні дэкаратыўных элементаў найбольшага поспеху дасягнула Англія. У Італіі культавыя пабудовы не былі вядучым архітэктурным тыпам, большая ўвага тут надавалася будаўніцтву ратуш, палацаў і жылых дамоў.

Яскравае ўяўленне аб архітэктуры готыкі даюць царква абацтва Сэн-Дэні, сабор Парыжскай Божай маці, саборы ў Рэймсе, Амьене, Руане (Францыя); Кёльнскі сабор (Германія); Кентэрберыйскі сабор, саборы ў Лінкальне, Уэлсе, Солсберы (Англія); саборы ў Леоне, Бургасе, Таледа (Іспанія); саборы Санта-Крочэ, Санта-Марыя Навэла, Санта Марыя дэль Ф'ёрэ, Міланскі сабор (Італія); Карлаў мост у Чэхіі.

Гатычны стыль знайшоў праявы і ў свецкім дойлідстве, асабліва ў Італіі, дзе яскрава выявіўся ў будаўніцтве *палацаў* (палацца Веккіо ў Фларэнцыі, палац Дожаў у Венецыі).

**§ Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва**

Жывапісная палітра ў перыяд готыкі ўзбагачалася. У ёй з'явіліся лазурна-блакітная, пурпурна-ружовая і ярка-чырвоная *фарбы*. Роспісы часта выкоўваліся ў тэмпернай тэхніцы. У краінах Паўночнай Еўропы з XIV ст. пачала ўжывацца алейная фарба. Але сярод тэхнік жывапісу па-ранейшаму першанства займае *фрэска*. Фрэскавыя роспісы ўпрыгожвалі замкі, палацы, жылыя дамы, храмавыя комплексы.

Развіта была *кніжная мініяцюра*. У ёй назіраецца тэндэнцыя да рэалізму. Кніжная мініяцюра ўпрыгожвала псалтыры, рукапісы і манускрыпты. Ілюстрацыі абрамляліся *раслiннымі завіткамі*. Менавіта ў гэты перыяд з'ўляецца індывідуальная мастацкая творчасць, дзякуючы чаму вядомы імёны мініяцюрыстаў – Жана Фуке і Жана Бурдзішона.

Керамісты гэтага часу славяцца вырабам *пліткі для падлогі, ганчарнага посуду, дахоўкі*. Большасць керамічных вырабаў аздабляецца гравіраваным арнаментам (тэхніка зграфіта) і *палівай*. Існаваў і іншы метад, пры якім узор уцісквалі ў яшчэ мяккую гліну і атрыманыя паглыбленні запаўнялі глінай другога колеру (часцей, жоўтага). Асноўнымі колерамі былі: чырвоны, жоўты, чорны. Плітка была звычайна квадратнай, прамавугольнай, шасцівугольнай з раслінным, геаметрычным, зааморфным і антрапаморфным матывамі.

Сярод шкляных вырабаў першае месца займаюць *вітражы*, асноўнай функцыяй якіх першапачаткова было асвятленне памяшканняў, з XIII ст. – упрыгожванне. У XIV ст. мастакі звяртаюцца да вітражнай *грызайлі* (адценні аднаго колеру); памеры асобных кавалкаў шкла павялічваюцца. У XV ст. у вітражах з'ўляецца прыродная тэматыка. У гэты час была вынайдзена *тэхніка дубліравання*, г. зн. сумяшчэння рознакаляровага шкла. У вытворчасці шклянога посуду першае месца належыць *венецыянскаму шклу*.

Мастацкія цэнтры *ювелірных вырабаў* існавалі не толькі пры манастырах, але і пры палацах. Асноўнымі тэхнікамі былі: ліццё, штампоўка, гравіроўка, чаканка, залачэнне і цісненне. З дапамогай гэтых тэхнік

вырабляліся рэльефныя фігуркі, круглая скульптура, манеты, рэлікварыі, надмагіллі з пазалотай і эмаллю, цырыманіяльныя чашы. Вядомы былі празрыстая і перагародчатая эмалі на залатым фоне, якія выкарыстоўваліся пры вырабе пасудзін, скіпетраў, спражак.

Сярод металаў апрацоўваліся бронза, латунь, жалеза і волава. З дапамогай розных тэхнік апрацоўкі металаў выраблялiся царкоўныя дзверы, пячаткі манархаў, буйных феадалаў і цэхавых карпарацый, аконныя рашоткі, упрыгожванні для мэблі, царкоўныя люстры, ключы і г. д.

Сярод драўляных вырабаў пашырэнне набылі *куфар* і *куфэрак*. Куфры рабіліся з дубовых дасок. Асноўнымі матывамі былі геаметрычны і анімалістычны. Распаўсюджанне атрымалі лаўкі-куфры, дзе захоўвалі адзенне, царкоўныя крыжы. Часам з дрэва выраблялі дзверы з разным арнаментальным дэкорам. Вядома была разьба па косці, дзе асноўным матывам быў рэлігійны.

У ткацтве готыкі першанства належыць Італіі, Іспаніі і Германіі. У Германіі цанілася *парчовая тканіна*, якую аздаблялі вышыўкай шаўковай ніткай (алтарныя пакрывалы). У тканінах Іспаніі пераважалі ўсходнія матывы з геаметрычным малюнкам, шаўковыя вырабы адрозніваліся разнастайнасцю малюнка і расфарбоўкі. Мусульманскія матывы знайшлі ўжыванне ў ткацтве Італіі. Асноўнымі матэрыяламі былі шоўк, парча, атлас, тафта, муар, аксаміт. Вышыўкай славіліся англійскія вырабы. Вялікай славай карысталіся шпалеры з хрысціянскімі і бытавымі сюжэтамі. Распаўсюджанне атрымала набіўная тэхніка.

## ТЭМА 22. МАСТАЦТВА СЯРЭДНЕВЯКОВАГА ЎСХОДУ. МАСТАЦТВА ІНДЫІ

### § Перыядызацыя мастацкай культуры

У развіцці мастацкай культуры Індыі часоў сярэднявечча і Новага часу вылучаюць некалькі перыядаў:

1. Дынастыя Губтаў [350–500 гг.].
2. Раннемусульманскі перыяд [1200–1550 гг.];
3. Перыяд Маголаў [1550– 650 гг.].
4. Школа Кампаніі [1800–1900 гг.];
5. Бенгальская школа [1900–1950 гг.].

### § Архітэктура

З V ст. захаваліся каменныя храмы ў выглядзе наземных пабудоў. Найбольш раннія храмы ўяўляюць кампактныя ў плане пабудовы з адным памяшканнем унутры, зрэдку з прыбудаваным порцікам ці вестыбюлем. Правобразам такога храма служыў паўднёвы тып жылля з плоскім земляным дахам. Першапачаткова пабудову гэтага тыпу рабілі двух’яруснай: верхняя частка паўтарала ніжнюю ў меншых памерах. Пазней з’яўляюцца шмат’ярусныя храмы, складзеныя быццам бы з некалькіх аднапавярховых пабудоў, прычым на фасадзе кожнага яруса маюцца асобныя ўяўныя дзверы.

Такім чынам вежа мае выгляд шматпавярховага збудавання, але ўнутры яе адзіная прастора. Гэты паўднёвы тып храма атрымаў у Індыі назву *вімана*.

Другі, паўночны тып храма, – *шыкхара* – мае больш плаўна акрэсленыя формы. Архітэктура быццам бы вырастае з зямлі і арганічна звязана з прыродай. Храм складаецца з дзвюх асноўных частак: невялічкага замкнутага свяцілішча (у якім знаходзіцца статуя бажаства) з вежай у 20–30 м увышыню, падобнай на калпак; і малельнай залы перад свяцілішчам. Паверхні каменных сцен маюць гарызантальную гафрыроўку, якая імітуе драўляныя бярвенчатыя пабудовы.

У перыяд сярэднявечча з'яўляюцца каменныя пабудовы абарончага і грамадскага прызначэння, упрыгожаныя багатым каменным дэкорам (крэпасці і палацы). У XII ст. частка паўвострава Індастан была заваявана мусульманскімі правіцелямі – народамі Ірана, Афганістана і Сярэдняй Азіі. На поўначы Індыі з гэтага часу распаўсюджваецца ірана-сярэднеазіяцкая архітэктура. Узводзяцца мячэці, медрэсэ, маўзалеі ў адпаведнай будаўнічай тэхніцы – з наяўнасцю скляпенняў і купалоў, ужываюцца цэгла і вапна. Цікавым помнікам перыяду Маголаў з'яўляецца бела-мармуровы маўзалей *Тадж-Махал* у г. Агры. Узвышаецца маўзалей на платформе вышынёй 7 м; агульная вышыня – 81 м. У плане збудаванне ўяўляе сабою квадрат памерамі 104 х 104 м са зрэзанымі вугламі. Пабудаваны на беразе ракі Джамны, маўзалей перакрыты 5-цю купаламі, сярод якіх цэнтральны цыбулепадобны купал значна ўзвышаецца над астатнімі. Фасады ўпрыгожаны стральчатымі аркамі, аформлены парталамі-*айванамі* (запазычаны з араба-мусульманскай архітэктуры). Па баках маўзалея знаходзяцца 2 будынкі з чырвонага пясчаніка – мячэць і гасцініца для паломнікаў. Да Тадж-Махала датыкаюцца 4 тонкія мінарэты вышынёй па 45 м і рэгулярны кіпарысавы сад з вадаёмамі, каналамі і фантанамі. Інтэр'ер аздоблены мазаікай з каштоўных і паўкаштоўных камянёў, разьбой па белым мармуры і стральчатымі аркамі.

Яшчэ ў VIII–XII стст., у перыд станаўлення ўласнай культуры, на *в. Ява* з'яўляюцца традыцыйныя індыйскія архітэктурныя *храмавыя комплексы*, якія складаюцца са шматлікіх невялічкіх храмаў, размешчаных дзесяткамі ці сотнямі на адным участку ў выглядзе прыземістай піраміды з тэрасамі, да якіх вядуць лесвіцы. У XII–XVIII стст. у Індыі сказваецца ўплыў кітайскай архітэктуры. Культавыя пабудовы горных абласцей (Непал) нагадваюць кітайскія пагады за кошт памяншэння да верху ярусаў пабудоў і шырокай навесі страхі. Гэтыя ж тэндэнцыі праглядаюцца і ў народным жыллі.

**§ Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва**

У Сярэднія вякі працягвае развівацца фрэскавы жывапіс. У XI ст. з'яўляецца *кніжная мініяцюра*. Захаваліся да сённяшняга часу рукапісы з каляровымі мініяцюрамі на дрэве ці на пальмавых лістах. Мініяцюры дакладна аддзелены ад тэкста і па-майстэрску ілюструюць разнастайныя сюжэты.

У эпоху Губтаў былі створаны дэкаратыўныя рэльефы для сцен храмаў і тэракотавыя пліты для машчэння падлогі. Пры дынастыі Маголаў

з'яўляюцца вырабы з фаянсу ў мусульманскім стылі. Захаваліся і ганчарныя вырабы і без палівы ў выглядзе дахоўкі, упрыгожанай выявамі ільвоў і штампаваным геаметрычным арнаментам.

У Сярэднія вякі працягвае развівацца ювелірнае майстэрства ва ўласных традыцыях. З золата, срэбра і металаў вырабляюць *статуі і статуэткі Будды* і іншых мужчынскіх і жаночых божастваў, зброю, культавыя пасудзіны, прадметы хатняга начыння. Асноўныя металы, якія выкарыстоўваліся – бронза, медзь, жалеза, сталь і латунь.

Шырокае выкарыстанне цыновак і пляцёнак, вырабаў з трыснягу і бамбуку (крэслы) абмяжоўвалі ўжыванне дрэва ў якасці мэблі. Захавалася толькі *рытуальная драўляная мэбля* – сталы і ларчыкі. Пад уплывам Партугаліі з XVI ст. Індыя пачала ўжываць *цёмнае дрэва з інкрустацыяй золатам і слановай косцю*, што вызначыла станаўленне *партугальскага стылю*. Існаваў і *інда-галандскі стыль*, які выкарыстоўваў *светлыя пароды дрэў, лак і інкрустацыю золатам*. У інтэр'ерах дамоў бытавалі дэкаратыўныя пано з ажурнага дрэва, створкі дзвярэй і экраны для вокнаў. Пры гэтым ужывалася інкрустацыя перламутрам. Для вырабу тронаў часцей за ўсё выкарыстоўвалі сандалавае, цікавае і чорнае дрэва. Троны дэкарыраваліся драўлянай мазаікай, інкрустацыяй з золата, срэбра ці слановай косці, і ўпрыгожваліся каштоўнымі камянямі.

Вышыўка атрымала распаўсюджанне з XI ст. Вышывалі залатой ніткай, пазней – срэбранай ці шаўковай. Матывы чэрпаліся з прыроды, міфалогіі і легенд. Быў распаўсюджаны і геаметрычны арнамент. Захаваная тканіна XVII–XVIII стст. нясе на сабе адбітак Ірана, што бачна ў выкарыстанні ўзораў – раслінны арнамент, дзе пераважае выява кіпарысавай галінкі з нахіленым кончыкам.

## ТЭМА 23. МАСТАЦТВА СЯРЭДНЕВЯКОВАГА ЎСХОДУ. МАСТАЦТВА КІТАЯ

### § Перыядызацыя мастацкай культуры

Мастацкая культура Кітая ў часы сярэднявечча і ў Новы час ў сваім развіцці прайшла некалькі этапаў:

1. [IV–VI стст.];
2. [VII–XIII стст.];
3. [канец XIII–XIV стст.];
4. [канец XIV–XIX стст.].

### § Архітэктура

На працягу IV–VI стст. у Кітаі сцвярджаюцца феадальныя адносіны. У гэты час паступова складваецца адзіны мастацкі стыль кітайскага сярэднявечча. Замацаванню ўлады новай феадальнай дзяржавы спрыяла новая ідэалогія – будызм, які трапіў з Індыі праз Цэнтральную Азію ў першых стагоддзях нашай эры.

Ранняе сярэднявечча ў Кітае з'явілася часам фарміравання новых вобразаў, новых стылявых заканамернасцяў мастацтва. Распаўсюджанне будызму адбілася на мастацкай творчасці і выявілася ў імкненні да стварэння

грандыёзных ансамбляў. Па ўсёй краіне на стыках караванных шляхоў, каля вялікіх гарадоў пачалі будаваць шматкіламетровыя скальныя кляштары і мемарыяльныя сховішчы будыйскіх рэліквій – *вежы-пагады*. Але яны набылі новы эстэтычны сэнс і сталі *сімвалам будызму*. У некаторых выпадках пагады выконвалі функцыю маякоў ці сігнальных вежаў. Галоўнай стала ідэя імкнення ўвышыню. Пры ўзвядзенні пагад выкарыстоўвалі дрэва і цэглу, што і вызначыла іх *пластычны сілуэт*.

Раннія будыйскія скальныя храмы Кітая паўсюль былі зрэзаны шматлікімі нішамі і пячорамі, выдзеўбанымі без адзінага дакладнага плана, і звязвалі ў адзінае з прыродай архітэктуру, скульптуру і жывапіс. На ўзвядзенне такіх гіганцкіх храмаў былі запрошаны не толькі мясцовыя рамеснікі, але і майстры з іншых краін. За кошт ужывання форм іншаземнага мастацтва кітайскае ўзбагацілася новымі вобразамі.

Кожны з *пячорных комплексаў* меў свае асаблівасці. Але звычайна ўнутраныя сцены дзяліліся на ярусы з нішамі, дзе быў размешчаны рэльеф, распісаны фарбамі; столь падтрымлівалася цэнтральным каменным слупом у выглядзе пагады. Унутры такіх храмаў ставілі статую Будды велізарных памераў (да 17 м), адна з якіх абавязкова знаходзілася ў алтарнай частцы (насупраць уваходу каля супрацьлеглай сцяны). Манументальнасці і статычнасці гэтых фігур супрацьстаялі рэльефы на столях і сценах гротаў, якія выглядаюць як багаты шматкаляровы ўзор і робяць паверхню сцен "жывой" і дынамічнай. Арнаментальныя рэльефныя фігуры часам паўтараліся, што яшчэ больш узмацняла дынамічны рытм. У рэльефах знайшлі адлюстраванне і нацыянальныя традыцыі. Тут выкарыстоўваліся старажытныя вобразы кітайскай міфалогіі, зааморфныя матывы (драконы).

VII–XIII стст. – часы кіравання дзвюх магутных дынастый: Тан (618–907 гг.) і Сун (960–1279 гг.). Высокага ўзроўню дасягае эканоміка краіны. Вялікі канал (1800 км), які пачаў будавацца яшчэ напрыканцы VI ст., злучыў рэкі Вэйшуў, Хуанхэ і Янцзы з залівам Ханчжовань і адкрыў новы выхад да мора. Вялікі шаўковы шлях стаў важнейшай трасай паміж усходнімі і заходнімі землямі. Удасканальвалася тэхніка вырабу паперы і шоўку. Былі зроблены новыя адкрыцці ў галіне медыцыны, астраноміі і геаграфіі. Тры вынаходніцтвы сусветнага значэння – порах, магнітны компас, разборны шрыфт – належалі да шэрага буйных адкрыццяў таго часу. Складваюцца новыя віды, жанры і формы ў мастацтве. У VII ст. быў вынайдзены *ксілаграфічны спосаб кнігадрукавання*, а ў IX ст. – *друк пры дапамозе рухомага шрыфта*. У X ст. пры Імператарскім двары ўтварылася *Акадэмія жывапісу*.

Важная роля ў мастацкім жыцці краіны належала архітэктуры, якая разумелася ў арганічным адзінстве з прыродай. Для архітэктуры Танскага перыяду характэрны ўрачыстасць і манументальная яснасць форм. Вялікая ўвага надавалася праблемам *горадабудаўніцтва*: паўсюль узводзіліся каналы, дарогі, масты, якія спрыялі развіццю гандлёвых сувязей. Планам прадугледжвалася *галоўная магістраль горада. Палацы саноўнікаў размяшчаліся каля галоўнай магістралі, а жыллё рамеснікаў – на ўскрайку.*

Усё, што знаходзілася за палацавай сцяной, дзялілася на *кварталы*. У цэнтры горада знаходзіліся гандлёвая і храмавая часткі. Кляштарныя і палацавыя збудаванні ўзводзіліся на платформе з каменю і дасягалі велізарных памераў. У аснове ўсіх тыпаў пабудоў – аднапавярховых і ўрачыстых залавых павільёнаў, шматпавярховых будынкаў з абходнымі галерэямі, надбрамавых альтанак на высокім каменным цокалі, паркавых альтанак і галерэй – ляжала *ячэйка каркаса*, якая ўтваралася слупамі і сістэмай бэлек і перакрыццяў. Унутраная прастора дзялілася слупамі на некалькі нефаў. Урачыстае аблічча ансамбля горада дадавалі будыйскія храмы і кляштары з падкрэсленай сіметрычнай планіроўкай. Побач з храмамі ўзводзіліся пагады.

Сунская архітэктура больш складаная. У Сунскі перыяд было ўсталявана *8 тыпаў бэлек*, ад памераў якіх залежалі і сячэнні калон, і ўсе астатнія дэталі збудаванняў. Важнае месца належала дэкаратыўнаму аздабленню драўляных канструкцый, фасадаў і інтэр’ераў, разьбе па дрэве і камені. Архітэктура перыяду Сун адрозніваецца дэкаратыўнасцю і пластычнасцю. Для пакрыцця дахаў выкарыстоўвалася глазураваная дахоўка, сцены распісваліся паліхромным жывапісам. Змяніліся канструкцыйныя і эстэтычныя прынцыпы *пагад*, якія сталі *6-ці- і 8-мі-граннымі,* узмацнілася іх дэкарыроўка; яны акружаліся абходнымі галерэйкамі; у канструкцыю быў уведзены масіўны цэнтральны слуп. Сярод матэрыялаў ужываліся камень, цэгла, дрэва; у аздабленні – бронза, жалеза, арнаментаваныя чыгунныя пліты. На позніх этапах перыяду развіваецца новы від мастацтва – ландшафтныя сады з маляўнічымі альтанкамі і маленькімі павільёнамі. Размяшчаліся яны сярод квітнеючых зялёных гор з трапічнымі дрэвамі.

У канцы XIII ст. Кітай быў заваяваны манголамі, якія паклалі пачатак новай дынастыі Юань. Вялікая роля па-ранейшаму надавалася горадабудаўніцтву і архітэктуры. Сталіца была перанесена ў г. Даду (Пекін), на яе тэрыторыі ўзніклі новыя палацы і храмы.

Перыяд позняга феадалізму ў Кітаі характарызуецца застойнасцю культуры, звязанай з агульным заняпадам тэмпа гістарычнага развіцця. Гэта быў час кіравання дзвюх дынастый: Мін (1368–1644 гг.) і Цын (1644–1911 гг.).

У перыяд дынастыі Мін была абмуравана каменем і *дабудавана Вялікая Кітайская сцяна*, пашыраны і абнесены абарончымі збудаваннямі гарады (Нанкін і Пекін), пабудаваны шэраг палацаў і храмаў, сядзіб і садова-паркавых комплексаў, у планіроўцы і будаўніцтве якіх выкарыстоўваліся традыцыйныя метады. Пекін узводзіўся як урачысты палацавы комплекс з улікам асаблівасцей рэльефу. Палацы, храмы, пагады і сядзібы аддзяляліся сценамі і адрозніваліся колерам, маштабам, памерамі ад аднапавярховых жылых пабудоў. Дахі палацаў і храмаў пакрываліся залацістай, сіняй і зялёнай чарапіцай. Горад быў абнесены сцяной, а фасады ўсіх збудаванняў былі павернуты на поўдзень. Была прадугледжана і галоўная магістраль. Найбольш буйным храмавым ансамблем з’яўляецца *Храм Неба* (XV–XVI стст., перабудаваны ў XVIII–XIX стст.). Цікавым з’яўляецца *ансамбль 13-ці царскіх пахаванняў Мін* (XV–XVII стст.). Амаль кіламетровая алея

Духаў да гэтых пахаванняў абрамляецца 24-ма фігурамі жывёл і 12-цю фігурамі воінаў і чыноўнікаў. Само пахаванне ўключае магільны курган, комплекс храмаў, крапасных вежаў, падземных залаў з каштоўным начыннем. Галоўны парадны павільён, узведзены ў эпоху Мін, – *Зала вышэйшай гармоніі*, прызначаны для дзяржаўных цырымоній, увабраў асаблівасці палацавага дойлідства (каларыстычная дынаміка). У Цынскі перыяд архітэктура адрозніваецца больш дробнай арнаментацыяй дэталей, узмацняецца значэнне паліхроміі.

**§ Выяўленчае мастацтва**

У IV–VI стст. побач з храмавымі насценнымі роспісамі з'яўляецца *апавядальны жанр жывапісу*, які ўпершыню ўзнік у якасці ілюстрацый да вершаваных твораў. Аб'ектам жывапісу становіцца прырода. Творы жывапісу IV–VI стст. мелі форму гарызантальных і вертыкальных *скруткаў*, якія пісаліся тушшу і мінеральнымі фарбамі на спецыяльна апрацаваных і праклееных шаўковых палотнах і суправаджаліся каліграфічнымі надпісамі. Менавіта ў гэты час сцвердзіўся *прынцып зліцця жывапісу з каліграфіяй*. Найбольш вядомымі мастакамі гэтага часу былі Цзун Біну, Гу Кай-чжы, Ван Вэй. У іх творчасці выявіліся спецыфічныя якасці кітайскага сярэднявечнага жывапісу – графічная астрата, арганічнасць злучэння з каліграфічным тэкстам, выразнасць лінейнага контуру, стройнасць кампазіцыі. Асноўным *сюжэтам* з'яўляецца *быт прыдворных людзей*, дзе сцвярджаецца чалавечая годнасць, гуманнасць, вернасць. Шмат захоўваецца ў жывапісе *сімвалічных выяў*: дракон, які сімвалізуе ўладу; пара дзікіх качак як алегорыя непарыўнага кахання і інш.

У VII–XIII стст. адбываецца роскавіт *скульптуры*, якая з'яўляецца неад'емным *кампанентам будыйскага ансамбля*. Увасобленая ў шматфігурныя кампазіцыі алтара, яна складае галоўную святыню, эстэтычны цэнтр наземнага кляштара, дадае архітэктурнае аблічча пагад, храмавых брам. Таксама скульптура дэкарыруе шлях да пахаванняў, выкарыстоўваецца ў пахавальных склепах. У будыйскай скульптуры адлюстроўваецца канфлікт паміж фізічным і духоўным пачаткамі. У манументальнай пластыцы скальных кляштараў, як і ў рэльефах, і ў гліняных фігурках пахавальных комплексаў атрымаў распаўсюджанне жыццёсцвярджальны пафас часу. У перыяд Тан ужо пашыраецца кола выяўляемых божастваў. У скульптуры назіраецца тэндэнцыя да *пластычнай лепкі твару, акруглай масіўнай галавы, прапрацоўкі дэталей адзення і ўпрыгожванняў*. З'яўляецца новы тып прыгажосці. Робасць юнацкіх эмоцый змяняецца пачуццём сталай годнасці, завершанасцю рухаў і форм; з твараў божастваў знікае містычная паўусмешка, фалды адзення губляюць сваю лінейную дробнасць і жорсткасць. Усе гэтыя рысы добра прасочваюцца ў велізарнай 25-метровай *статуі Будды Лаканы* (VII ст.), размешчанай высока ў гарах у цэнтры пляцоўкі 30 х 35 м, над пячорай Лунмэня. Пластычнасць, любоў да колеру, дынаміка яшчэ больш прыкметныя ў *пахавальнай пластыцы*, якая апавядае пра зямное жыццё. Гэта выявы вельмож, танцаўшчыц, спевакоў, музыкантаў, слуг. Асобнае месца адводзіцца выявам рэальных і фантастычных жывёл. У

Сунскі перыяд змяняюцца вобразы будыйскіх божастваў, іх прапорцыі выцягваюцца, жэсты становяцца манернымі. Скульптары імкнуцца выявіць адзінства чалавека і прыроды.

Цэнтральнае месца ў часы сталага сярэднявечча займае *жывапіс*. У гэты час узбагачаюцца сюжэты насценных роспісаў, больш вольна будуецца кампазіцыя будыйскіх сцэн. *Роспісы ў пячорах* ужо не размяшчаюцца вузкімі фрызамі, а *імкнуцца запоўніць усю паверхню сцен*. Ускладняецца кампазіцыйная будова, лінія гарызонту ўзвышаецца, што стварае ілюзію бязмежнай прасторы.

У жывапісе на скрутках адлюстроўваюцца пейзажныя і бытавыя тэмы, пашыраецца кола сюжэтаў. У гэты час складваюцца і канчаткова замацоўваюцца *жанры кітайскага жывапісу*:

1. “людзі і прадметы” (мастакі – Янь Лі-бэнь, VII ст.; Чжан Сюань, VIII ст.; Чжоў Фана, VIII–IX стст.);
2. “анімалістычны жанр” (Хань Гань, VIII ст.);
3. “кветкі і птушкі” (Бянь Луань, Дзяо Гуань-інь, VIII–IX стст.).

Пры дапамозе дэталей (стол, дрэва, лава) мастакі характарызуюць месца дзеяння. На скрутках вольна і натуральна кампануюцца групы людзей. У некаторых пейзажах прырода ўяўляе сферу дзейнасці чалавека. Пейзажы Ван Вэя (VIII–IX стст.) становяцца бязлюднымі, адзіным прадметам выявы становіцца прырода. У IX–X стст. па-новаму асэнсоўваецца *прастора*, якая *сімвалізуе бязмежнасць свету*. Шматколернасць змяняецца *манахромнай гамай з дабаўленнем колеравых нюансаў*. У X ст. галоўнай ідэяй стала неабходнасць раскрыцця ў творы духоўнасці, цэласнага вобраза прыроды. Больш мяккімі і лірычнымі былі пейзажы мастакоў паўднёвага Кітая. Дун Юань (X ст.) першым з жывапісцаў асэнсаваў фон шаўковага скрутка як бясконцую прастору. Яго шматколерныя пейзажы напісаны ў мяккіх цёмна-зялёных, карычневых і блакітных танах.

Росквіт кітайскага пейзажнага жывапісу пачаўся з другой паловы X ст. і быў звязаны з імёнамі Лі Чэн, Сюй Дао-нін, Го Сі. Сунскія мастакі імкнуліся да стварэння максімальна абагульненых пейзажаў, дзе кожнае дрэва, камень, чалавек з’яўляліся носьбітам духоўнага пачатку. На карцінах мастакоў перыяду Сун адлюстраваны горы і рэкі, вадаспады, горныя абвалы, квітнеючыя даліны. Галоўнай заваёвай з’яўляецца перадача бязмежнай прасторы. *Пейзажныя скруткі* абодвух перыядаў адрозніваюцца фрагментарнасцю (незавершанасцю) кампазіцыі. У творчасці мастакоў XII–XIII стст. (Ма Юань, Ся Гуй) упершыню важны сэнс набывае *вобраз чалавека ў яго супастаўленні з прыродай*.

У XIII–XIV стст. у жывапісе пануючым жанрам заставаўся пейзаж. У юаньскіх скрутках *злучыліся жывапісная выява і паэтычны каліграфічны надпіс*, які адначасова меў сімвалічны і дэкаратыўны сэнс. Адной з галоўных тэм жывапісу становіцца выява бамбука, якая сімвалізуе магутнасць духу (мастакі У Чжэнь, Лі Кань, Гу Ань). Своеасаблівым мастаком быў Ні Цзань (XIV ст.), які ствараў скруткі не на шоўку, а на паперы. Сярод прыдворных

мастакоў вылучаюцца Жэнь-Жэнь-фа, Ван-Чжэн-пэн, Ван Юань, Чжао Мэн-фу, творы якіх адрозніваюцца яркасцю і насычанасцю фарбаў.

У XIV–XIX стст. адбываюцца змены і ў жывапісе, актыўна развіваецца *апавядальны жанр*. У бытавым жанры працавалі Тан Інь (XV–XVI стст.) і яго вучань Чоў Ін (першая палова XVI ст.). Іх творы адрозніваюцца паэтычным асэнсаваннем літаратурнага сюжэта з дапамогай своеасаблівай манеры пісьма і гарманічных колеравых спалучэнняў. Захаваліся і *партрэтныя творы* гэтага перыяду, дзе вялікая ўвага надавалася выяўленню твара і позы партрэтаванага. Шмат захавалася і пейзажаў, якія працягвалі Юаньскія традыцыі.

**§ Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва**

У перыяд сярэднявечча ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве асаблівае месца належыць *кераміцы*. Да 608 г. адносяцца першыя вырабы з *белага фарфору*, з якога стваралі збаны, амфары, пахавальныя фігуркі, статуэткі. У перыяд Сун была распаўсюджана *аднаколеравая кераміка*, якая шырока экспартавалася і *дала пачатак карэйскай керамікі*. У Танскі перыяд вырабляюцца падвескі і фігуркі з каляровага шкла. У абодва перыяды росквіту дасягае ювелірнае майстэрства. З золата і срэбра выраблялiся рэчы хатняга ўжытку (посуд), разнастайныя ўпрыгожванні, усыпаныя жэмчугам і каштоўнымі каменнямі. Са слановай косці выраблялі грэбні, ручкі нажоў, вераў, паясныя ўпрыгожванні. Шоўк шырока экспартаваўся ў Японію, на Блізкі Усход і на Захад.

Афіцыйная кітайская культура XIV–XIX стст. арыентавалася на мінулыя культурныя традыцыі, новыя тэндэнцыі выявіліся ў разьбе па дрэве, камені, косці, вырабах з фарфору, у вышыўцы, дзе таксама знайшоў адбітак *фальклорны пачатак*. У перыяд Мін адраджаецца вытворчасць керамікі. У архітэктуры выкарыстоўваецца глазураваная цэгла і дахоўка. У вялікай колькасці вырабляецца фарфор, чаму спрыяе *дзейнасць Імператарскай мануфактуры*. Да XV ст. адносіцца *вынаходніцтва бела-сіняга фарфору*. Паліхромнасць дасягаецца дзякуючы нанясенню другога слоя фарбаў паверх палівы і замацаваннем іх паўторным абпальваннем. Керамічныя вырабы разнастайна арнаментуюцца – пейзажы, жанравыя сцэны, драконы, кветкі. У эпоху Цын вяршыні дасягае стварэнне сапфірна-сініх вырабаў на кобальтавай аснове. Існуюць і аднатонныя вырабы – зялёныя, фіялетавыя, жоўтыя, чырвоныя, белыя.

Перыяд Цын славіцца вырабамі з *літога*, а не выдзіманага *шкла*, з якога вырабляюць вазы, флаконы і інш. У галіне ювелірнага майстэрства вырабляюць кароны і разнастайныя ўпрыгожванні для ўрачыстых цырымоній (вясельных), посуд з чаканнага золата з ніфрытавай інкрустацыяй.

Для металічных вырабаў па-ранейшаму выкарыстоўваецца бронза, медзь і жалеза. З дрэва вырабляюць мэблю з дэкорам у тэхніцы лака. Высокага ўзроўню дасягае ткацтва, якое адрозніваецца багаццем фарбаў і дэкаратыўнасцю. Але пры гэтым ворсавыя кітайскія дываны не карыстаюцца сусветнай славай.

# ТЭМА 24. МАСТАЦТВА СЯРЭДНЕВЯКОВАГА ЎСХОДУ. МАСТАЦТВА ЯПОНІІ

## § Перыядызацыя мастацкай культуры

У эвалюцыі мастацкай культуры Японіі часоў сярэднявечча і Новага часу можна вылучыць 3 значныя перыяды:

1. Ранняе сярэднявечча [XIII–XV стст.];
2. Сталае сярэднявечча [XVI – пачатак XVII стст.];
3. Позняе сярэднявечча і Новы час [другая палова XVII–XIX стст.].

## § Архітэктура

У XIII–XV стст. адбываюцца змены ў палітычным і культурным жыцці. Гэта быў перыяд панавання другога саслоўя – ваеннага дваранства. Упершыню афармляецца т. зв. Самурайскі кодэкс гонару – “Бусіда” (літаральна, шлях воіна). Сацыяльныя і маральныя асновы жыцця другога саслоўя ўмацоўваліся вучэннем секты Дзэн, якое з XIII ст. стала найбольш уплывовым. З гэтага часу пачынаюць аднаўляцца разбураныя манастыры і храмы, узводзяцца сінтаісцкія храмавыя комплексы, якія адрозніваюцца прасторавасцю пабудоў, урачыстасцю цырыманіяльных дарог, манументальнай стрыманасцю архітэктурных форм. Ствараюцца і дзэнскія храмавыя комплексы. Сам *дзэнскі храм* меў высокую кроўлю, закругленыя вокны, характэрныя для кітайскай архітэктуры. Дасягае росквіту *садовае мастацтва*, у якім адрозніваюць два тыпы: пейзажны сад з узвышшамі – *цукіяма*, і плоскі сад – *хіраніва*. Галоўным у працы мастака саду лічылася мастацтва расстаноўкі камянёў. Камяні падбіралі па форме, колеры, фактуры і супастаўлялі з агульным характарам саду.

Асаблівасцю позняга сярэднявечча з’явіўся росквіт гарадской культуры. Стандартызацыя будаўніцтва спрыяла выпрацоўцы *тыпу традыцыйнага жылля*, які лёг у аснову шэрагу палацавых ансамбляў і масавай забудовы горада. Японія XVII–XIX стст. не ведала прынцыпова новых горадабудаўнічых ідэй. Гарады мелі нерэгулярную, зблытаную сістэму вуліц і не мелі да пачатку XX ст. адзінага адміністрацыйнага і культурнага цэнтра.

## § Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва

Самай яскравай з’явай у скульптуры XIII–XV стст. заставаўся *партрэт* (скульптары – Кокэй, Ункэй, Кайкэй). У скульптуры з’яўляюцца *рысы суровасці і лаканізму*, ідзе *адмаўленне ад маляўнічасці, у трактоўцы вобразаў злучаюцца суровая прастата адзення і экспрэсія дэталёва прапрацаваных твараў з іх актыўнай мімікай*. Ствараюцца вобразы апосталаў Буды, легендарных прапаведнікаў, патрыярхаў, божстваў; з’яўляюцца *статуі і рэальных людзей – палкаводцаў і дзяржаўных дзеячоў.* Пры характарыстыцы аблічча партрэт фіксуе не асобу, а *чалавека як прадстаўніка пэўнага саслоўя*. Гэта былі першыя ў Японіі нерэлігійныя выявы.

У часы сярэднявечча развіваецца *жывапіс на скрутках*, які паступова становіцца больш дэмакратычным па сваіх сюжэтах і ідэалах. Тут упершыню дзеючай асобай становіцца чалавечая маса, актыўная і дынамічная, а вобразы

музыкаў замяняе *галоўны герой – воін-вершнік*. Галоўным з'яўляецца перадача настрою і пачуццяў выяўляемых персанажаў. Узрастае і значэнне пейзажных матываў. Мастакі надаюць значэнне рытму, каларыту і маштабу. Фон становіцца ўсё больш распрацаваным і азначаным. Нярэдка фонам для сюжэтных карцін становіцца пейзаж.

Вышэйшы росквіт японскага *манахромнага жывапісу*, успрынятага з Кітая, звязаны з імем Сэсю (1420–1506 гг.). Галоўным сродкам перадачы аб'ёму і прасторы, руху і пакою ў Сэсю была лінія. Сэсю прынес у японскі жывапіс высокую духоўнасць задумы, адчуванне прыроды як грандыёзнага свету, арганічнай часткай якога быў чалавек.

У XVI ст. рэлігія паступова пачынае саступаць месца свецкай культуры, а XVII ст. характарызуецца росквітам гарадской культуры. У XVI ст. фарміруецца ўласна свецкі прафесійны жывапіс, складваецца *прыдворная жывапісная школа Кано*. Складаныя дэкаратыўныя кампазіцыі выконваюцца ўжо не на скрутках, а на *шырмах*. Галоўным прызначэннем распісанай мастаком шырмы было раздзяленне памяшканняў, яны з'яўляліся прыгожай рэччу ў інтэр'еры палаца, служылі фонам для ўрачыстых сходаў і ўвесяленняў. Галоўным формаўтваральным элементам становіцца колер і рытм, асноўны эмацыянальны эффект будуецца на руху ліній.

У XVI – пачатку XVII ст. развіваецца і манументальны жывапіс. Хаця матэрыялам заставалася ўсё тая ж папера, нярэдка пакрытая золатам ці срэбрам, сама задача размяшчэння карціны на вялікай плоскасці сцяны прывяла да змянення кампазіцыйнай і вобразнай будовы, тыпу колеравай і прасторавай умоўнасці. У XVII – пачатку XX ст. у жывапісе ўзрасла роля дэкаратыўных роспісаў. Росквіту дасягае *гравюра на дрэве*, якая стала ў XVIII – пачатку XX ст. галоўным відам японскага мастацтва.

У галіне дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва росквіт атрымала *кераміка*. У перыяд сярэднявечча побач з шырокім развіццём вытворчасці фарфору, тканіны, лакавых вырабаў, атрымлівае росквіт мастацтва дробнай пластыкі – *нэцке*.

## ТЭМА 25. МАСТАЦТВА СЯРЭДНЕВЯКОВАГА ЎСХОДУ. МАСТАЦТВА КАРЭІ

### § Перыядызацы мастацкай культуры

У мастацкай культуры Карэі часоў сярэднявечча і Новага часу можна вылучыць некалькі этапаў:

1. Перыяд аб'яднанага Сілла [VIII–IX стст.];
2. Перыяд Корё [X–XIV стст.];
3. позняе сярэднявечча і Новы час [XIV – пачатак XIX ст.].

### § Архітэктура

Брацьба паміж трыма царствамі – Когурё, Пэкчэ, Сілла скончылася ў канцы VII ст. перамогай Сілла. Аб'яднанне Карэі паскорыла працэс феадалізацыі і фарміравання карэйскай народнасці. У гэты час былі сцверджаны агульнадзяржаўныя мова і пісьменнасць, усталяваны гандлёвыя і культурныя сувязі з Кітаем, Японіяй, Індыяй і Іранам. У выніку ў Карэю

трапілі новыя літаратурныя творы, архітэктурныя ідэі, мастацкія вобразы. Змены ў дзяржаўным жыцці былі выкліканы і замацаваннем пазіцый будызму. Найбольшая ўвага ў культавым дойлідстве гэтага часу надавалася будаўніцтву пагад.

VIII–IX стст. характарызуецца імкненнем да стварэння буйных ансамбляў, разлічаных на больш актыўнае ўздзеянне архітэктурна-пластычных матываў. Гэтыя ж рысы праявіліся і ў *горадабудаўніцтве*. Змяніла аблічча сталіца Сілла – г. Кёнджу. Акружаны сценамі горад паўсюль перасякаўся магістралямі, у цэнтры якіх размяшчаўся вялізны палацавы комплекс з садамі, узвышшамі і вадаёмамі. Астатняя частка дзялілася на *кварталы*, дзе знаходзіліся рынкі, адміністрацыйныя будынкі і жылыя дамы. Ансамбль будыйскіх кляштараў размяшчаўся ўздоўж сталіцы і адрозніваўся вялікай урачыстасцю, рытмічнай згоднасцю ўсіх кампанентаў, гармоніяй з навакольнай прыродай. Узбагачаюцца колеравыя спалучэнні, вышэй паднімаюцца цокалі. Па сваім вырашэнні храмы могуць быць ступеньчатымі ці ўпрыгожанымі калонамі, лесвіцамі і шпілем. Сярод матэрыялаў пераважна ўжываюцца камень і дрэва. У інтэр'еры размяшчаюцца бронзавыя статуі будыйскіх божастваў.

Атрымліваюць распаўсюджанне і *пячорныя храмы*. Аднак цвёрдасць граніту не дазволіла высякаць вялізныя залы. Таму майстры выкладвалі храм блокамі і каменнымі плітамі. Храм меў *2 залы*: квадратную і круглую, перакрытую *паўсферычным купалам*, якія сімвалізавалі саюз Неба і Зямлі. Калідор і сцены ўпрыгожвалі гарэльефы, ля ўваходаў у залы размяшчаліся фігуры воінаў-ахоўнікаў. У нішах над скляпеннем купала размяшчаліся фігуры божастваў. У цэнтры залы на высокім п'едэстале ў форме лотаса высілася 2-метровая фігура Будды. Так выглядаў пячорны храм Соккурам (742–764 гг.), які ўваходзіў у частку наземнага манастыра Сокпульса.

Пад канец IX ст. улада правіцеляў Сілла паслабела і тэрыторыя дзяржавы распалася на шматлікія ўдзелы. Аднак у X ст. адным з буйных правіцеляў Ван Гонам зноў была заснавана цэнтралізаваная дзяржава Корё. Сталіца была перанесена ў г. Кэгён (сучасны г. Кэсон). У X ст. распаўсюдзіўся *ксілаграфічны спосаб кнігадрукавання*, а з XIII ст. дзякуючы рухомаму металічнаму шрыфту разнастайныя літаратурныя жанры ўвайшлі ў побыт гараджан. Вядучай ідэалогіяй заставаўся будызм, аднак важную ролю пачалі адыгрываць вучэнні сектаў. Манументальная пластыка ў гэты час губляе былое значэнне, усё большую ролю ў аздабленні пабудоў пачынаюць адыгрываць малыя архітэктурна-пластычныя формы – каменныя ліхтары, *ступы* розных абрысаў (круглыя і слупападобныя), упрыгожаныя рэльефамі ці выгнутымі дахамі.

На працягу X–XIV стст. узводзяцца шматлікія крапасныя збудаванні, палацы, будыйскія храмы і пагады, пахавальныя ансамблі. Пабудовы гэтага перыяду губляюць манументальную ўстойлівасць, прыземленасць і набываюць стройнасць. Пры іх узвядзенні выкарыстоўваецца мармур, камень і цэгла.

Доўгі этап праўлення дынастыі Лі (1392–1910 гг.) не быў аднародны. У канцы XVI ст. назіраецца эканамічны ўздым краіны. Першая палова XVII ст. – перыяд захопніцкіх манчжурскіх нашэсцяў – характарызуецца ўпадкам культуры. Перыяд з другой паловы XVII па XIX стст. азнаменаваўся ўздымам гарадской культуры, росквітам літаратуры і жывапісу. На працягу больш чым 4-х стст. ішла пераацэнка духоўных каштоўнасцей. Паступова будызм пачаў саступаць месца канфуцыянству, успрынятаму з Кітая. Таму і ў мастацтве гэтага перыяду прасочваюцца трывалыя кітайскія традыцыі. Буйных маштабаў дасягае будаўніцтва палацавых комплексаў. Пабудаваныя паводле ўзору кітайскіх палацавых ансамбляў, рэгулярныя ў плане галоўныя збудаванні акружаліся велізарным колам сцен, у межы якіх уваходзілі і *цырыманіяльныя павільёны*, якія ўключалі рэдкія расліны і дрэвы, азёры з астравамі, скаламі і вадападамі. Галоўная тронная зала мела манументальныя вароты, да якіх вялі парадныя алеі. Да самой залы прымыкала мармурная лесвіца, упрыгожаная фігурамі звяроў-ахоўнікаў. Карнізы пакрываліся складанай разьбой і роспісамі. Нярэдка ў верхняй частцы сцен меліся абходныя галерэйкі.

**§ Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва**

У *скульптурных творах* VIII–IX стст. назіраецца тэндэнцыя да выяўлення руху. Гібкія рукі багінь паступова набываюць мяккасць і зграбнасць, акруглыя твары набліжаюцца да *нацыянальнага ідэалу прыгажосці*. Статуі ўзбагачаюць і ступеньчатыя пагады з выявамі наверсе сідзячых ільвоў.

Вядучым відам выяўленчага мастацтва ў XV–XVIII стст. становіцца *жывапіс на скрутках*. Развіццю гэтага віду мастацтва паспрыяла заснаванне ў 1392 г. *Прыдворнай акадэміі жывапісу Тохвавон*. К XV ст. склаліся асноўныя *жанры карэйскага жывапісу на скрутках*: “кветкі і птушкі”, пейзаж, партрэт, бытавы і анімалістычны. Скруткі ствараліся на шоўку і паперы, асноўнымі сродкамі жывапісу былі пэндзаль, празрыстыя ці шчыльныя гуашнага тыпу фарбы, чорная туш.

У VIII–IX стст. у дэкаратыўна-прыкладным мастацтве вядучае месца належыць *керамíцы*. З VIII ст. захаваліся пахавальныя урны з пясчаніка, пакрытыя *шэраватай палівай*. Карэйскі посуд і лямпы на ажурнай падстаўцы ў гэты час капіраваліся ў Японіі.

Новыя тэндэнцыі выявіліся ў X–XIV стст. у дэкаратыўна-прыкладным мастацтве. *Керамічныя пасудзіны становяцца тонкасценнымі*, набываюць правільныя формы, губляецца манументальная архаічнасць, на змену якой прыходзіць лёгкасць. Майстры пачынаюць пазбягаць яркіх фарбаў. Атрымлівае росквіт глазураваная кераміка, дзе выкарыстоўваюцца бледныя, зялёна-блакітныя, чырвона-карычневыя, чорныя і белыя колеры. Сярод тэхнік аздаблення выкарыстоўваліся гравіроўка, штампоўка, рэльефная лепка, падглазурны роспіс меднай фарбай, пазней – інкрустацыя белай глінай – “*місіма*”.

Сярод твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва XIV–XIX стст. па-ранейшаму галоўнае месца належыць кераміцы. *Пасудзіны пачалі ўнутры*

*ўпрыгожвацца дробным раслінным арнаментам*. З XVII ст. пачынаецца вытворчасць *фарфору*, які адрозніваўся грубасцю формаў, і быў малапразрыстым. Да тыпаў роспісаў фарфоравых вырабаў дадаліся і кобальтавыя. Для керамікі ўвогуле быў характэрны аднатонны малюнак, выкананы кобальтам ці вокісам жалеза. У гэты ж час атрымлівае распаўсюджанне і вытворчасць інкруставаных перламутравых лакавых куфраў, куфэркаў і шафаў, якія аздабляліся шматлікімі ўпрыгожваннямі з металаў.

## ТЭМА 26. МАСТАЦТВА СЯРЭДНЕВЯКОВАГА ЎСХОДУ. МАСТАЦТВА МАНГОЛІІ

### § Перыядызацыя мастацкай культуры

У мастацкай культуры Манголіі часоў сярэднявечча і Новага часу вылучаецца тры найбольш значных перыяды:

1. [XIII ст.];
2. [XIV–XVI стст.];
3. [XVII–XIX стст.].

### § Архітэктура

На пачатку XIII ст. адбылося аб'яднанне мангольскіх плямёнаў у адзіную дзяржаву пад уплывам Цямучына ці Чынгісхана (1155–1227 гг.). Утвораная магутная дзяржава ўжо ў сярэдзіне XIII ст. дзякуючы захопніцкім войнам пераўтварылася ў магутную імперыю. У гэты час пашыраюцца гандлёвыя сувязі; успрыняцце гурскай пісьменнасці садзейнічала нараджэнню ўласнай літаратуры, збіранню паданняў, песняў, стварэнню гістарычных хронік (напрыклад, "Патаемнае сказанне"). Да XIII ст. узыходзіць пачатак кнігадрукавання з драўляных дошак. Асноўнай рэлігіяй застаецца шаманізм, аднак набываюць значэнне і іншыя вераванні – хрысціянства, іслам, будызм.

У 1220 г. была заснавана сталіца – *г. Каракорум*. Тут быў закладзены першы будыйскі храм і іншыя культавыя збудаванні. Абнесены сцяной горад меў, як і кітайскія гарады, *рэгулярную планіроўку*; *фасады будынкаў арыентаваліся па восі поўнач-поўдзень*. Цэнтральная забудова была каменнай і мела некалькі вуліц. Галоўным ансамблем сталіцы быў абнесены сцяной *палац хана Угедэя*, узведзены ў 1235 г., размешчаны ў паўднёва-заходняй частцы сталіцы. Ад яго захаваліся 64 магутныя гранітныя кубічныя базы, на якія абапіраліся калоны. Да будынка памерамі 40 х 70 м з поўдня прымыкала лесвіца, складзеная з гранітных плітаў. Пад падлогай праходзіла ацяпляльная сістэма. Дах быў пакрыты зззяючай на сонцы зялёнай і чырвонай дахоўкай, упрыгожаны скульптурнымі фігурамі драконаў. У адрозненне ад кітайскіх урачыстых ансамбляў, ён вылучаўся *разамкнутай сістэмай будынкаў*. Бакавыя павільёны фасадамі былі звернуты да галоўнага будынка, залы звязваліся паміж сабой галерэяй. Перад уваходам у палац знаходзілася срэбранае дрэва-фантан, абвітае залачонымі змеямі, увенчанае анёламі з трубамі і акружанае ля падножжа 4-ма фігурамі ільвоў.

Пасля ўсталявання ў 1280 г. Юаньскай дынастыі Хубілай-хан перанес сваю сталіцу ў г. Даду (Пекін). На працягу XIV–XVI стст. у краіне ішлі міжусобныя войны. Феадальная раздробленасць перашкаджала будаўніцтву буйных ансамбляў. У якасці палацаў ханамі выкарыстоўваліся велізарныя *перасоўныя шатры*, якія лёгка разбіраліся, былі прыстасаваны да клімату і да частага перамяшчэння.

Манументальнае дойлідства адраджаецца ў Манголіі з канца XVI ст., калі разам з новым укараненнем з Тыбета будызму ўзнікае шмат манастыроў і храмаў. Больш за ўсё прывіўся ламаізм (вучэнне будызму), які ўключыў у сябе і пантэон мясцовых божастваў, і ўспрыняў з Кітая абрады. Помнікі XVI ст. па прычыне вялікай колькасці войнаў і пажараў амаль не захаваліся. Першым буйным *манастыром* XVI ст. стаў пабудаваны паводле кітайскага тыпу ў 1586 г. каля г. Каракорума *ансамбль Эрдэні-дзу*. Квадратны ў плане, абнесены сцяной, ён уключаў у сябе на першым этапе будаўніцтва ўсяго 3 храмы, якія паклалі пачатак велізарнаму комплексу, завершанаму ў XIX ст.

Адначасова з манументальнымі культавымі збудаваннямі з дрэва, цэглы і каменю ў XVI ст. распаўсюджваецца новая галіна дойлідства – *юрта-гэр*. Яна лёгка разбіралася, была багата *ўпрыгожана вышыўкай і аплікацыяй*. Усё развіццё сярэдневечнага мангольскага дойлідства звязана з эвалюцыяй юрты. Менавіта ў абліччы гэтага жылля праявіліся рысы нацыянальнай эстэтыкі. Аснову *зборна-разборнага каркаса юрты*, выкананага без ужывання металу, складалі рассоўныя складныя краты сценаў – *ханы* (сустракаліся 4-ханныя і 12-ханныя юрты). Да іх пры дапамозе петляў замацоўваліся тонкія жэрдкі, што разыходзіліся прамянямі зверху ўніз, – *уні*, якія наверсе заканчваліся масіўным абручом – *тона*. Каркас пакрываўся некалькімі слаямі лямцу. Святло трапляла ў юрту праз дзвярны праём і праз тона, куды выходзіў дым ад размешчанага ў цэнтры юрты агменю. Найважнейшыя элементы канструкцыі падкрэсліваліся колерам, роспісамі, яркімі аплікацыямі. Уваход афарбоўваўся ў чырвоны колер і багата ўпрыгожваўся.

Іншымі формамі жылля былі перасоўныя крытыя павозкі (*чорныя кібіткі*), палаткі (*майханы*) і палаткі-шатры для ўрачыстых цырымоній (*асар*).

На працягу XVII–XIX стст. мангольскія майстры распрацавалі вялікія і ўрачыстыя *храмы на аснове прынцыпаў традыцыйнага жылля*. Першыя вопыты ішлі па прынцыпу простага злучэння 2-х юрт, звязаных драўляным праходам. Тонкія жэрдкі замяніліся трывалымі бярвеннямі, узнік устойлівы каркас, з’явіўся фундамент. Форма круглых у плане будынкаў эвалюцыяніравала да шматвугольных і квадратных, павялічылася ўнутраная прастора, што выклікала неабходнасць ужывання шматлікіх апорных слупоў. Конусападобны дах набыў характар купала ці шатра, выкананага з дахоўкі, дрэва, жалеза. Будынкі абмазваліся глінай, бяліліся, упрыгожваліся арнаментам.

Асаблівай умяшчальнасцю адрозніваліся саборныя храмы – *цогчын*. У 1654 г. быў узведзены першы *цогчын у манастыры Да-хурэ* (не захаваўся),

які стаў самай вялікай культавай пабудовай Манголіі (51 х 51 м). Гэта быў квадратны ў плане, перакрыты чатырохсхільным пірамідальным дахам будынак, акружаны па перыметры праасторнай галерэяй з двухсхільным дахам.

У канцы XVII – пачатку XVIII ст. у Манголіі будуецца шэраг вялікіх манастырскіх ансамбляў, якія звычайна размяшчаліся ў далінах рэк, ля падножжа гор. Кожны тып пабудовы меў свае адрозненні: манастыры тыпу *хурэ* мелі кальцавы план; тыпу *хійд* выкарыстоўвалі планы тыбецкіх ансамбляў з галоўным храмам, узведзеным на вяршыні гары; *сум* (сумэ) узыходзіў да манастырскай сістэмы кітайскага тыпу і адрозніваўся рэгулярнасцю, паслядоўным чаргаваннем будынкаў і двароў. Аднак дэкаратыўная сістэма ўпрыгажэнняў ва ўсіх храмах была аднолькавай.

У канцы XVIII–XIX ст., у перыяд падпарадкавання Манголіі манчжурам, колькасць храмаў узрастае. Уезд у манастыр афармляўся з вялікай урачыстасцю. Перад уваходам узводзіліся дзве стройныя разныя драўляныя мачты вышынёй ад 10 да 12 м. На адлегласці ад галоўных брамаў узводзіліся парадныя драўляныя ці каменныя брамы. Шырокі, выкладзены каменем шлях вёў да галоўнага храма (*імператарскі манастыр Амур-баясхуланту,* 1728–1735 гг.; манастыр Маньчжушры-хійд, 1783 г.; *манастыр Эрдэні-дзу*). У XVIII–XIX стст. у Манголіі ўзводзяцца і драўляныя палацавыя комплексы, пабудаваныя па тыпу рэгулярных храмавых ансамбляў (палац Ногон-Орго ў Угры, 1832 г.).

На працягу XIX–XX стст. змяняюцца тыпы храмавых ансамбляў. Ускладняюцца варыянты выгнутых шматкаляровых дахаў, зараджаюцца новыя камбінацыі злучэнняў масіўных каменных і лёгкіх драўляных структур (манастыр Гандан у Угры, манастыр Чойчжын-ламын-сумэ, 1904–1908 гг.). Акрамя храмавых пабудоў узводзіліся і ламаісцкія рэлікварыі – *субурганы,* правобразам якіх былі індыйскія ступы.

**§ Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва**

У VIII–IX стст. вялікае ўздзеянне на фарміраванне мангольскай культуры аказалі ўйгуры, а ў X–XII стст. – кідані. Ад уйгураў манголы атрымалі ў спадчыну пісьменнасць, ад кіданяў да іх перайшла значная літаратурная і мастацкая спадчына ў выглядзе песень і вершаў.

Разнастайныя формы пластыкі вядомы з часоў сярэднявечча. Разам з пранікненнем ламаізма скульптура стала важным кампанентам храмавага інтэр’ера. *Статуі*, якія выяўлялі *караючых і міласэрдных божастваў,* выконваліся з розных матэрыялаў: дрэва, гліны, папяровай масы, медзі, бронзы, але заўсёды *залаціліся і расфарбоўваліся ў яркія колеры*.

Росквіт будыйскай пластыкі прыпадае на XVII – пачатак XVIII ст. і звязаны з імем Дзанабадзара (1635–1724 гг.) – главы мангольскага духавенства, які ўзяў імя Ундургегена. Выкананыя ім статуі божастваў-выратоўнікаў злучаюць у сабе фізічную дасканаласць, пачуццёвую грацыю і духоўную напоўненасць (“*Зялёная Тара*” – багіня міласці, бронза). Статуі ўстрашальных божастваў выконваліся з вялікай экспрэсіяй. Да іх блізкія

буйныя, выкладзеныя пунсовымі каралямі ці распісаныя маскі, прызначаныя для рэлігійнай містэрыі – пантамімы цам.

Мангольскі жывапіс, як і скульптура падпарадкоўваўся задачы ўпрыгажэння храмавых інтэр'ераў, а таксама ілюстравання свяшчэнных кніг. Росквіт атрымаў іканапіс. *Тэхніка выканання іконы* была складанай: на палатно наносілі мелавы грунт, змяшаны з клеем, які паліравалі зубам кабана. Ужываліся мінеральныя фарбы.

З сярэдзіны XVII ст. з'яўляецца *двухколерны жывапіс*, пабудаваны на спалучэнні золата з чырвоным ці чорным фонамі (*тэхнікі* адпаведна – *мартан* і *нагтан*). У XVIII–XIX стст. у якасці афармлення інтэр'ераў выкарыстоўваліся шматкаляровыя *іконы-аплікацыі*. Накладзеныя на тканіну кавалкі парчы і шоўку ўпрыгожваліся дадаткова залатым шыццём, жэмчугам, каралямі, бірузой, якія надавалі іконе каштоўны від.

У перыяд сярэднявечча ў Манголіі багата дэкарыравалася ўсё начынне, адзенне, абутак, нават жыллё. Асноўным матывам быў геаметрычны. Са старажытных часоў майстры Манголіі дасягнулі вялікага майстэрства ва ўпрыгажэнні зброі, ювелірным мастацтве, пра што сведчаць *інкрустацыі каштоўнымі камянямі па металу і косці*. Выкарыстоўваліся таксама тэхнікі *філігрань і чаканка*.

Шматлікія вобразы, створаныя на працягу сярэднявечча і ў Новы час, працягваюць сваё жыццё ў мастацтве сённяшняга часу.

## ТЭМА 27. МАСТАЦТВА АЗЕРБАЙДЖАНА І СЯРЭДНЯЙ АЗІІ

### § Мастацкая культура Азербайджана

Насельніцтва большай часткі Азербайджана да цюркізацыі, якая адбылася ў Сярэднія стагоддзі, было іранамоўным. Гэтыя раёны шмат разоў і на доўгі час палітычна аб'ядноўваліся з Іранам і да пачатку XIX ст. мелі з Іранам палітычнаыя, эканамічныя і культурныя сувязі. Таму дойлідства Азербайджана, у прыватнасці, манументальныя пабудовы (мячэці, маўзалеі, палацы), мае шмат агульнага з іранскай архітэктурай. Народнае дойлідства адрозніваецца мясцовымі асаблівасцямі. На поўначы, у гарах Вялікага Каўказа, жылыя дамы маюць гарызантальную працягласць, яны двухпавярховыя, узведзены з каменю, з плоскімі землянымі дахамі, і размяшчаюцца тэрасамі на схілах. На паўднёвым захадзе, у гарах Малога Каўказа, было распаўсюджана жыллё армяна-грузінскага тыпу: кампактны ў плане аднапавярховы каменны дом з пірамідальным дахам з бярвення. На паўднёвым усходзе, у горнай лясной мясцовасці, былі распаўсюджаны зрубы з бярвення з двухсхільным дахам. Паўсюль будаваліся глінасырцовыя дамы з пакоямі, размешчанымі ўздоўж галерэі.

З IV па VII стст. у паўночнай частцы Азербайджана (Албанія) панавала хрысціянства. У 642 г. Азербайджан быў заваяваны арабамі, насельніцтва было звернута да ісламу, але хрысціянства існавала яшчэ да XI–XII стст. У горнай мясцовасці яшчэ захаваліся рэшткі хрысціянскіх храмаў V–XII стст.

У V–VI стст. сасаніды з мэтай абароны ад нашэсцяў хазараў узвялі на паўночным захадзе *Дэрбенцкія ўмацаванні*. На ўзвышшы знаходзілася

цытадэль, ад якой да мора ішлі 2 крапасныя сцяны, паміж якімі знаходзіўся горад. У другі бок ад цытадэлі на 40 км у глыбіню гор ішла вялікая каменная сцяна (некалькі метраў таўшчынёй), уздоўж якой узвышаліся магутныя крэпасці-форты.

*Будаўнічая тэхніка* Азербайджана набліжаецца да візантыйскай. Тут *выкарыстоўвалі змешаную кладку з абпаленай цэглы і неапрацаванага каменю, а таксама кладку з чыста абчасаных камянёў*.

У XII ст. назіраецца ўздым культуры Азербайджана. Паўсюль будуюцца феадальныя замкі, мячэці, маўзалеі, масты. Фасадныя плоскасці сцен пакрывае арнаментальны дэкор у выглядзе фігурнай выкладкі цэглы. У XIV ст. рэльефная арнаментацыя замяняецца плоскай, але шматкаляровай. Выкарыстоўваецца геаметрычны матыў з надпісамі “Алах”, “Мухамед”. У XV ст. *цэглавы дэкор замяняецца маёлікай*. Шырока ўжываецца ў архітэктуры Азербайджана *арнаментальная разьба па камені* і *па гіпсе*. Галоўныя *мячэці*, як і ў Іране, былі *купальныя*, а невялічкія мячэці ўзводзіліся паводле *мясцовай традыцыі*: з плоскім дахам і навессю на разных драўляных слупах уздоўж фасада. Пры мячэцях узводзіліся мінарэты.

Паўсюль будавалі *маўзалеі* – усыпальніцы знаці і духавенства. У X–XIII стст. яны былі вежавыя з шатровым дахам, у XIV–XV стст. з’яўляюцца маўзалеі агульнамусульманскага тыпу ў выглядзе прыземістай пабудовы, увенчанай купалам.

Адзін са значных помнікаў манументальнага дойлідства Азербайджана – *палацавы комплекс шырваншахаў у Баку* (XV ст.), які складаецца з палаца, усыпальніцы, судзілішча, мячэці, лазні і іншых пабудоў, – наглядна дэманструе асаблівасці архітэктуры краіны.

**§ Мастацкая культура Сярэдняй Азіі**

У Сярэдняй Азіі асноўным будаўнічым матэрыялам была гліна; пабудовы ўзводзіліся з сырца ці з абпаленай цэглы. З IV ст. да н. э. па IV ст. паселішчы мелі скразную забудову, акружаную крапасной сцяной. У гэты час ужо існавалі гарады, акружаныя сценамі з байніцамі, часам з вежамі.

У VI–IV стст. да н. э. большая частка Сярэдняй Азіі была падпарадкавана ахемянідам, пасля яе заваяваў Аляксандр Македонскі. Пасля распаду яго імперыі Сярэдняя Азія ўваходзіла ў склад эліністычнай дзяржавы селеўкідаў, пазней – у склад Парфянскага, Бактрыйскага і Кушанскага царстваў. У VI–VII стст. Сярэдняя Азія падверглася нашэсцю цюркаў.

У раннім сярэднявеччы, як і ў Еўропе, тут будаваліся *феадальныя замкі*. Гэта былі збудаванні вежавага тыпу, акружаныя крапасной сцяной. Сырцовыя сцены мелі гафрыраваную паверхню.

У VII ст. Сярэдняя Азія была далучана да Арабскага халіфата, а насельніцтва звернута ў іслам. У XI ст. народы Сярэдняй Азіі вызваліліся ад арабскай улады і з гэтага часу пачынаецца росквіт культуры, які доўжыўся да нашэсця манголаў. Інтэнсіўна забудоўваліся гарады, узводзіліся мячэці, медрэсэ, караван-сараі, гасцініцы, рабаты. Будынкі ўзводзіліся з абпаленай цэглы на вапнавай аснове. Купалы мелі сфера-канічную форму, а скляпенні – стральчаты абрыс.

Пабудовы IX–XI стст. дэкарыраваліся *ўзорчатай кладкай цэглы*, з XII ст. з'яўляецца *глазураваная цэгла і разная тэракота*. У XIV–XV стст. распаўсюдзіліся *маёліка і кафляная мазаіка, разьба па гіпсе і дрэве*, якія ўжываліся для аздаблення афіцыйных пабудоў.

З заваёвай Сярэдняй Азіі манголамі ў 1220–1221 гг. культура прыйшла ў заняпад.

У XIV ст. на змену зграбным формам дамангольскай архітэктуры прыйшлі больш цяжкія. Атрымаў распаўсюджанне *сталактытны дэкор,* запазычаны са Старажытнага Ірана. У канцы XIV ст. адзін з феадалаў – Тамерлан – заваяваў і падпарадкаваў сабе ўсю Сярэднюю Азію і Іран. У яго сталіцы – *Самаркандзе* і ў іншых гарадах імперыі ўзводзіліся грандыёзныя збудаванні. Паратлы будынкаў паступова становяцца велізарнымі, мінарэты высокімі, купалы велічнымі. Будынкі паўсюль пакрываюцца цэглай з глазураванай каляровай паверхняй, маёлікавай пліткай, кафлянай каляровай мазаікай. Інтэр'еры ўпрыгожваюць шматкаляровыя роспісы, разныя драўляныя дзверы.

У іранскай і сярэдняазіяцкай архітэктуры паверхні пабудоў (глухія сцены фасадаў, лоджыі ўнутры двароў, велізарныя парталы, высокія сцены мінарэтаў і г.д.) і сёння паўсюль пакрыты дыванам шматкаляровай муроўкі, *сярод колераў пераважаюць блакітны і зялёны*.

## ТЭМА 28. МАСТАЦТВА АРАБАЎ

### § Агульная характарыстыка мастацкай культуры арабаў

Радзімай арабаў з'яўляецца Аравійскі паўвостраў з камяністымі пустынямі, праз якія праходзяць караванныя шляхі. У старажытныя часы і сярэднія вякі асноўным заняткам была жывёлагадоўля, бо ў Аравіі мала зямель, прыгодных для земляробства.

Асноўнае верванне араба-мусульманскіх краін – іслам (літаральна, пакорнасць). Асноўны рэлігійны твор – "Каран", змест якога быў надыктаваны Мухамеду па-арабску на працягу 20 гадоў архангелам Джабрыілам. "Каран" – гэта мова самога Аллаха, таму мусульмане шануюць гэты твор. Рэлігійныя вераванні мусульман аказалі значны ўплыў на развіццё ўсіх сфер культурнага жыцця, знайшлі адбітак у мастацтве.

Перыядызацыя арабскага мастацтва звычайна разглядаецца па геаграфічнай прыкмеце і ўключае:

1. Бліжні Усход – Сірыя, Малая Азія, Іран [661–1736 гг.];
2. Егіпет [868–1805 гг.];
3. Іспанія і Паўночная Афрыка [755–1465 гг.].

Характэрная асаблівасць мастацтва араба-мусульманскіх краін – перавага ў ім дэкаратыўнага пачатку. Мастацтва развівалася на аснове адмаўлення культуры Антычнасці, асноўнымі рысамі сталі: адсутнасць выяў жывых істот; любоў да абстрактнага дэкора, пераважна геаметрычнага характару; раслінны матыў; імкненне пазбегнуць пустэчы. Мастацтва араба-мусульманскіх краін зведала ўплыў Старажытнага Усходу. Развівалася мастацкая культура, пераважна пры палацах і ў буйных гарадах. Вядучымі

відамі мастацтва ў арабскіх краінах былі дэкаратыўна-прыкладное і архітэктура.

## § Архітэктура

У старажытныя часы ў прыбярэжных раёнах Аравійскага паўвострава (раёны Йемена, Хадрамаўта) утварыліся невялічкія дзяржавы. Будаўніцтва вялося тут з каменю, але большасць пабудоў узводзілася з сырцу з ужываннем драўляных дэталей. Таму старажытныя пабудовы мала захаваліся.

Пастаянныя войны і ўнутраная міжусобная барацьба абумовілі фарміраванне тыпа *замкнутага вежавага жылля*. Гарады акружаліся абарончымі сценамі. Палацы правіцеляў будаваліся ў выглядзе велізарных шматпавярховых комплексаў з тэрасамі, крапаснымі сценамі і абарончымі вежамі. Сельскае паселішча ўяўляла сабою вялікую колькасць глінабітных хацінаў, акружаных сцяной з вартавымі вежамі. Вежы і іншыя манументальныя пабудовы ў Аравіі ўпрыгожваліся дэталямі пластычных абрысаў, паколькі яны абмазваліся глінай; драўляныя часткі пакрываліся разьбой. Асноўным прыёмам аздаблення памяшканняў была высцілка паверхні падлогі, сцен і столяў цыноўкамі і каляровымі ўзорчатымі пляцёнкамі. Гэтыя традыцыі абумовілі ўжыванне дыванова̀га дэкору ў манументальнай архітэктуры арабскіх краін.

Архітэктура розных мусульманскіх краін мае мясцовыя асаблівасці, перш за ўсё ў абліччы, планіроўцы і будаўнічай тэхніцы масавых збудаванняў – жылля, гаспадарчых пабудоў. Агульныя рысы назіраюцца ў стылі *афіцыйных будынкаў* – мячэцяў, палацаў, маўзалеяў, медрэсэ.

Пры будаўніцтве жылля ў арабскіх краінах прытрымліваліся традыцыі, распаўсюджанай на тэрыторыі Пярэдняй Азіі і Блізкага Усходу: пакоі былі звернуты да ўнутранага дворыка. Дамы багатых гараджан будаваліся шматпакаёвымі з прасторнымі дварамі, дзе ўсталёўвалі галерэі, басейны, кветнікі. У цэлым, сядзіба ўяўляла сабою замкнуты комплекс, агароджаны глухімі сценамі. У вясковых мясцовасцях Алжыра, Туніса і Марока ўзводзілі глінабітныя канструкцыі ў выглядзе вежы з унутраным светлавым дворыкам. У Егіпце сказаўся ўплыў Турцыі: тут верхнія паверхі дамоў па сённяшні час навісаюць над ніжнімі, шырока ўжываюцца эркеры на фасадах і балконы.

Вядучым тыпам манументальных збудаванняў у мусульманскіх краінах з'яўляюцца *мячэці*. Агульнай рысай для ўсіх культавых будынкаў вылучаецца наяўнасць малельнай залы са свяшчэннай нішай Міхраб, звернутай да Меккі. У Іране і Сярэдняй Азіі мячэці маюць формы масіўных аб'ёмаў, увенчаных купаламі. З цягам часу ў арабскіх краінах склаўся тып мячэці з прасторнай шматкалоннай залай; перад будынкам быў двор, акружаны галерэямі. Калоны, якія падтрымліваюць перакрыцце, маюць невялікае сячэнне і расстаўлены шырока, каб не загрувашчваць прастору залы. У VIII–IX стст. пачалі ўзводзіць мінарэты па ўзоры форм пярэднеазіяцкіх вартавых вежаў.

У выніку палітычных, рэлігійных і культурных сувязей сфарміравалася падабенства культуры розных арабскіх краін, склаліся і адзіныя стылявыя

характарысткі архітэктуры. Ля вытокаў гэтай архітэктуры – элементы розных традыцый – пярэднеазіяцкіх, іранскіх, візантыйскіх і ўласна арабскіх.

У ходзе эвалюцыі ў арабаў склалася спецыфічная архітэктурная распрацоўка ўваходу – *айван*. Увогуле архітэктура арабаў вельмі геаметрычная і паліхромная. Любая мячэць адзначаецца адсутнасцю выяў жывых істот на сценах, скульптур і музычнага суправаджэння, таму што гэта забаронена “Каранам”. Галоўную эстэтычную функцыю ў аздабленні храмаў узяў на сябе *арнамент*. Арнаментальнае аздабленне прадстаўлена разьбой па камені, гіпсе і дрэве; упрыгажэннем каляровай кафляй; кладкай з цэглы і камяню рознага колеру, мазаікай падлогі і сцен, шматкаляровымі роспісамі.

**§ Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва**

У мусульманскіх краінах распаўсюджанне атрымала 2 віды жывапісу: *фрэска* і мініяцюра. Дэкаратыўны фрэскавы жывапіс паўсюль упрыгожвае палацы і мячэці (Самара, Афганістан, Каір). У ХІІ ст. мастакі *багдадскай школы* ўпрыгожвалі *мініяцюрамі* самыя разнастайныя кнігі, у тым ліку і навуковыя. Фігуры людзей і жывёл, якія тут дазваляліся, выяўляліся з вялікай рэалістычнасцю. Мініяцюры ілюстравалі байкі, тэксты “Карана”, упрыгожваліся арабэскамі і раслліннымі завіткамі. Росквіт мастацтва кніжнай мініяцюры ў Іране назіраўся ў ХІV–ХVІІІ стст. Паэмы Нізамі і Саадзі ілюстраваў знакаміты мастак Бехзад (1455–1533 гг.). Іранскі ўплыў кніжнай мініяцюры назіраецца нават у Індыі. Таксама развіта ў арабаў мастацтва *каліграфіі*. З дапамогай дробных літар мастакі араба-мусульманскіх краін па-майстэрску выяўляюць разнастайныя сюжэты.

Найвышэйшага ўзроўню ў дэкарытаўна-прыкладным мастацтве дасягнула майстэрства керамікі і ткацтва. *Кераміка* працягвала традыцыі вытворчасці кафлі Блізкага Усходу. Яе адметныя рысы – плоскасны малюнак і бязмежная фантазія лінейных узораў. У Самары ў ІХ ст. была развіта вытворчасць непаліванага і паліванага ганчарнага посуду, з’явіліся аднакаляровыя люстравыя вырабы. Навіной было ўвядзенне *фіялетавай фарбы на марганцавай аснове*. Іншымі цэнтрамі керамічнай вытворчасці былі Рака (Сірыя), Рэй, Кушан, Гурган (Іран). У ХVІ–ХVІІІ стст. адбылося знаёмства з бела-сінім кітайскім фарфорам. Фаянс у гэты час ужываўся для абліцоўкі інтэр’ераў мячэцяў. У ХV ст. дасягае высокага ўзроўню турэцкае ганчарнае майстэрства (*фаянс*). Росквіт люстравай тэхнікі прыпадае на ХІІІ–ХІV стст. у краінах Міжземнамор’я.

Распаўсюджанне атрымалі і шкляныя вырабы. Рэчы з выдзіманага шкла з дэкорам у выглядзе сеткі вядомы ў Егіпце і Сірыі. Каляровае шкло развіваецца ў Турцыі. Развіта была апрацоўка і горнага крышталю, з якога выраблялі грушападобныя пасудзіны для вады.

Ювелірнае майстэрства і металы не атрымалі шырокага распаўсюджання. Асноўнымі тэхнікамі былі інкрустацыя і філігрань. Затое была развіта разьба па дрэве і слановай косці.

Пашырэнне атрымала *ткацтва*. Асноўнымі тканінамі былі: шэрсць, шоўк, парча, аксаміт, выкарыстоўвалася шаўковая тканіна на бавоўнянай

аснове. Матывы чэрпаліся з фальклорных легенд, а таксама бытавалі касмалагічны і анімалістычны арнаменты.

Росквіту дасягнула *дывановае майстэрства*, дзе асноўным матывам быў раслінны. Дываны заключалі ў сабе складаную сімволіку і ў малюнку, і ў фарбах. Узоры іранскіх дываноў адрозніваліся вялікай гнуткасцю матываў, тут была наладжана вытворчасць шарсцяных і шаўковых дываноў. Турцыя славіцца дыванамі з XIV ст. Малельныя дываны мелі ў цэнтры спецыфічны ўзор у выглядзе аркі, якая сімвалізуе Міхраб. Сярэднеазіяцкія дываны належаць да геаметрычнага стылю.

## ТЭМА 29. МАСТАЦТВА КАЎКАЗА

### § Агульная характарыстыка мастацкай культуры

Арменія і Грузія – краіны старажытнай і высокай культуры. На працягу III–I тыс. да н. э. на тэрыторыі Закаўказзя шмат разоў здаралася перасоўванне плямёнаў, і гэты працэс фарміравання армянскай і грузінскай народнасцей завяршыўся ў IV–III стст. да н. э. Палітычнае, грамадскае і культурнае жыццё гэтых народаў праходзіла ў кантактах з цывілізацыямі Пярэдняй Азіі і Міжземнамор'я. Хрысціянства рана стала афіцыйнай рэлігіяй у краінах Закаўказзя: у Арменіі – з 301 г., у Грузіі – з 337 г. Узорамі для раннехрысціянскіх храмаў былі цэрквы Сірыі, адкуль і было ўспрынята хрысціянства. Першыя цэрквы тут пачалі будаваць паводле ўзору сірыйскіх базілік, у выглядзе трохпралётных будынкаў (г. зн. з двума прадольнымі радамі ўнутраных калон) з узвышанай сярэдняй часткай. У далейшым развіццё атрымалі аднапралётныя базілікі – пабудовы прамавугольнай формы з двухсхільным дахам і тарцовым уваходам. Такія цэрквы будаваліся да XI–XII стст.

### § Архітэктура і манументальна-дэкаратыўнае мастацтва

Яшчэ ў IV–VI стст. усё Закаўказзе ўваходзіла ў склад імперыі Сасанідаў. У выніку тут распаўсюдзіліся іранскія формы жылля, арнаменту, адзення і бытавога начыння. Агульнасць рэлігіі вызначыла культурныя сувязі Арменіі і Грузіі з Візантыяй, адкуль пачаўся ўплыў культавага дойлідства. Аднак меў месца і зваротны ўплыў. Будаўнікі з Арменіі працавалі ў Візантыі. Адзін з двух дойлідаў, якія пабудавалі храм Святой Сафіі ў Канстанцінопалі, – Анфімій, атрымаў мастацкую падрыхтоўку ў Арменіі, а армянскі дойлід Трдат у X ст. узнавіў зруйнаваны пры землятрусе купал сабора.

*План храма ў форме крыжа*, які склаўся ў Сірыі ў IV–V стст., быў успрыняты культавай архітэктурай Арменіі і Грузіі, і сцвердзіўся тут у канцы VI – пачатку VII ст. Галоўныя асаблівасці сярэдневечных армянскіх і грузінскіх храмаў – групоўка архітэктурных мас і *цэнтрычнасць кампазіцыі*. Вертыкаль, уласцівая кампазіцыі, падкрэслівалася дэкарыроўкай фасадаў: высокімі вузкімі нішамі, радамі тонкіх калон, шчылінападобнай формай вокнаў. У інтэр'ерах ранніх храмаў сцены маюць гладкую паверхню без упрыгажэнняў.

Адзін з сусветна вядомых помнікаў сярэдневечнай архітэктуры Закаўказзя – *ансамбль збудаванняў Санаінскага манастыра ў Арменіі* (X–XIII

стст.). Комплекс уключае 2 царквы, далучаныя да іх 2 вялізныя залы, памяшканні для вучэбных заняткаў, кнігасховішчы, званіцы і інш.

Па агульнай кампазіцыі планаў храмы Арменіі і Грузіі падобныя да храмаў Візантыі, але адрозніваюцца па знешнім абліччы. Для іх характэрны падкрэсленая пірамідальнасць і скульптурная пластыка мас. Ужо ў VI ст. тут пачалі ўзводзіць над скляпеннямі двухсхільныя дахі, а над купалам – шасціграннны ці канічны шацёр. Апсіда звычайна не выступае з асноўнага аб'ёму, а падкрэсліваецца звонку дзвюма фланкіруючымі яе нішамі.

Багатай арнаментацыяй адрозніваецца *каменны дэкор на фасадах*. У інтэр'еры толькі ў верхняй частцы алтарнай нішы размяшчаецца мазаічная выява. Тынкоўка паверхні сцен і роспіс фрэскамі з'яўляюцца толькі ў X ст.

У XIII ст. Закаўказзе было заваявана манголамі, у XIV ст. падверглася нашэсцям Тамерлана. У XV–XVIII стст. Грузія і Арменія былі арэнай пастаянных агрэсіўных дзеянняў з боку Персіі і Турцыі. Манументальныя помнікі ў гэты час не ўзводзіліся.

Рэгіянальныя асаблівасці атрымала будаўніцтва жылля. У гарах Малога Каўказа будавалі дамы тыпу *дарбазі* – квадратныя ў плане, аднапавярховыя дамы з земляным дахам, які абапіраўся на ўнутраныя слупы і меў пасярэдзіне пірамідальнае ўзвышша з бярвенняў з адтулінай наверсе для святла і выхаду дыма з агменю. У Заходняй Грузіі ўзводзілі *зрубы з бярвенняў з двухсхільным дахам*, падобныя на рускія хаты. На Паўночным Захадзе Грузіі дамы былі каменнымі з двухсхільным дахам і страхою з плітак шыфернага сланцу. Чачэнцы і інгушы жылі ў дамах, падобных на маленькія крэпасці ў выглядзе трохпавярховай замкнутай вежы. Тут паўсюль сустракаюцца сярэдневечныя грабніцы і свяцілішчы са ступеньчата-грабенчатым дахам. Жыллё Паўднёва-усходняга Каўказа зведала ўплыў Ірана: гэта нізкія, падоўжаныя ў плане дамы з плоскім земляным дахам, з уваходам у кожны пакой звонку, з навессю на слупах уздоўж фасада.

# II. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 2.1 ПЛАН СЕМІНАРСКІХ ЗАНЯТКАЎ

***Тэма 1. Мастацтва першабытнага грамадства***

1. Тэорыі паходжання мастацтва.
2. Агульная характарыстыка і перыядызацыя культуры перашабытных часоў.
3. Наскальныя роспісы ў першабытныя часы.
4. Скульптура перашабытных часоў.
5. Архітэктура першабытных часоў: мемарыяльная, жыллёвая, мегалітычная (культавая).
6. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва першабытных часоў.

***Тэма 2. Мастацтва Саражытных цывілізацый. Старажытны Егіпет***

1. Эвалюцыя архітэктуры ў Старажытным Егіпце.
2. Егіпецкі ордэр і каменныя рэльефы.
3. Канон у выяўленчым мастацтве Старажытнага Егіпта.
4. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Старажытнага Егіпта.

***Тэма 3. Мастацтва Саражытных цывілізацый. Месапатамія***

1. Палацавае і культавае будаўніцтва ў Месапатаміі: агульная характарыстыка.
2. Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Месапатаміі: агульная характарыстыка.
3. Мастацтва шумераў.
4. Мастацтва асірыйцаў.
5. Мастацтва вавіланян.

***Тэма 5. Мастацтва Старажытных цывілізацый. Старажытны Кітай***

1. Жывапіс Старажытнага Кітая.
2. Мастацтва каліграфіі.
3. Керамічныя вырабы Старажытнага Кітая.
4. Ювелірныя вырабы Старажытнага Кітая.
5. Асаблівасці драўлянай мэблі ў Кітаі.
6. Ткацтва ў Старажытным Кітаі.

***Тэма 7. Мастацтва Старажытных цывілізацый. Старажытны Іран***

1. Мастацтва Старажытнага Ірана ў часы Ахемянідаў.
2. Старажытнаіранскае мастацтва перыяду Парфянскага царства.
3. Іранскае мастацтва ў часы Сасанідаў.

***Тэма 8. Мастацтва Старажытных цывілізацый. Старажытная Карэя***

1. Мастацтва Старажытнай Карэі.
2. Скульптура і жывапіс на скрутках у Старажытнай Карэі.
3. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Старажытнай Карэі.

***Тэма 10. Мастацтва Старажытнай Амерыкі***

1. Архітэктурныя стылі пірамід майя.
2. Дойлідства інкаў.
3. Асаблівасці мастацтва ацтэкаў.
4. Скульптура народаў Старажытнай Амерыкі.
5. Фрэскавы жывапіс майя.
6. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва народаў Старажытнай Амерыкі.

***Тэма 11. Афрыканскае мастацтва***

1. Асаблівасці афрыканскай скульптуры.
2. Афрыканскія ідалы.
3. Афрыканскія маскі.
4. Асаблівасці жылля ў афрыканскіх народаў.
5. Грабніцы царства Куш.
6. Тканыя вырабы Гвінейскай зоны.
7. Вырабы са слановай косці.

***Тэма 12. Антычнае мастацтва. Крыта-Мікенская культура***

1. Архітэктура Крыта. Будаўніцтва палацаў.
2. Абарончая архітэктура Мікен.
3. Мемарыяльнае дойлідства Мікен.
4. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Крыта і Мікен.

***Тэма 13. Антычнае мастацтва. Матэрыковая Грэцыя***

1. Ордэрная сістэма ў Старажытнай Грэцыі.
2. Эвалюцыя архітэктуры ў Старажытнай Грэцыі.
3. Скульптура Старажытнай Грэцыі: архаіка, ранняя класіка.
4. Скульптура Старажытнай Грэцыі: высокая класіка.
5. Скульптура Старажытнай Грэцыі: позняя класіка.
6. Скульптура Старажытнай Грэцыі: элінізм.
7. Сем цудаў свету.
8. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Старажытнай Грэцыі. Вазапіс.

***Тэма 14. Антычнае мастацтва. Этруская мастацткая культура***

1. Пахавальныя ўрны – канопы: вобразнасць і функцыянальнасць.
2. Саркафагі этрускаў.
3. Фрэскавыя роспісы грабніц этрускаў.
4. Мастацтва бронзавых вырабаў этрускаў.

***Тэма 15. Антычнае мастацтва. Старажытнарымскае мастацтва***

1. Дасягненні ў будаўнічай тэхніцы Старажытнага Рыма. Архітэктура перыяду Рымскай Рэспублікі.
2. Архітэктура Старажытнага Рыма ў часы Імперыі.
3. Скульптурны партрэт Старажытнага Рыма.
4. Фаюмскі партрэт.
5. Адметныя рысы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Старажытнага Рыма.

***Тэма 17. Мастацтва Візантыі***

1. Культавая архітэктура Візантыі і яе значэнне для далейшага развіцця дойлідства.
2. Выяўленчае мастацтва Візантыі ў эпоху Канстанціна Вялікага і Юсцініана I.
3. Выяўленчае мастацтва Візантыі перыяду іконаборства.
4. Выяўленчае мастацтва эпохі Македонскага Рэнесансу.
5. Выяўленчае мастацтва Візантыі ў перыяды Каммнінаў і Палеалогаў.
6. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Візантыі.

***Тэма 19. Старажытнаруское мастацтва***

1. Старажытнаруское мастацтва (X–XIII стст.).
2. Выяўленчае мастацтва перыяду Маскоўскага княства (XIV–XVII стст.).
3. Архітэктура Маскоўскага княства (XIV–XVII стст.).

***Тэма 20. Раманскае мастацтва***

1. Раманскі стыль у мастацкай культуры Сярэднявечча: архітэктура.
2. Раманскі стыль у мастацкай культуры Сярэднявечча: выяўленчае мастацтва.
3. Раманскі стыль у мастацкай культуры Сярэднявечча: дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.

***Тэма 21. Готыка***

1. Гатычны стыль у мастацкай культуры Сярэднявечча: архітэктура.
2. Гатычны стыль у мастацкай культуры Сярэднявечча: выяўленчае мастацтва.
3. Гатычны стыль у мастацкай культуры Сярэднявечча: дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.

## 2.2 ПРЫКЛАДНАЯ ТЭМАТЫКА ДАКЛАДАЎ НА СЕМІНАРСКІЯ ЗАНЯТКІ

1. Да вытокаў першабытнага мастацтва.
2. Сведкі даўніх часоў: старажытнаегіпецкія піраміды.
3. Сем цудаў старажытнага свету.
4. Дасягненні ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве Кітач: фарфор, шоўк.
5. Эвалюцыя жанраў у кітайскім жывапісе.
6. Культавая архітэктура Індыі ў Старажытныя часы і ў перыяд Сярэднявечча.
7. Японскае садовае мастацтва.
8. Культ Чайнай цэрымоніі ў Японіі.
9. Мастацкая культура Старажытнай Амерыкі.
10. Грэчаская архітэктура перыяду архаікі.
11. Архітэктурны ансамбль Афінскага Акропалю.
12. Скульптура грэчаскай класікі.
13. Мастацкая культура Элінізму.
14. Антычны вазапіс.
15. Асаблівасці мастацкай культуры перыяду Рымскай Рэспублікі.
16. Росквіт архітэктуры ў перыяд Рымскай Імперыі.
17. Візантыйскі іканапіс.
18. Сафійскія саборы свету.
19. Творчасць Феафана Грэка і Андрэя Рублёва.
20. Раманскі стыль у еўрапейскай архітэктуры.
21. Гатычны стыль у еўрапейскім дойлідстве.

# 2.3 ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ПА ВЫВУЧЭННІ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

**Пытанні і заданні да тэмы 1**

1. Працягніце сказ:

*Першыя спробы ў мастацкай культуры датуюцца …*

2. Пацвердзіце ці абвергніце выказванне:

*Першымі месцамі жылля неандэртальцаў былі зямлянкі і гроты ў скалах, з цягам эвалюцыі першабытны чалавек пачаў бадаваць жыллё на адкрытай прасторы – пячоры, якія ўяўлялі невялікія паглыбленні ў зямлі прамавугольнай формы.*

3. Выбярыце правільныя адказы:

Самыя вядомыя пячорныя роспісы перыяду палеаліту, захаваныя да нашага часу, знаходзяцца ў Іспаніі, у пячорах:

а) Касцільё;
б) Ля Мадлен;
в) Альтаміра;
г) Ляско;
д) Хорнас дэ ла Пэнья;
е) Фон дэ Гом.

4. Назавіце матэрыял, які выкарыстоўваўся для вырабу скульптуры ў мастацтве першабытнага грамадства.

5. Адзначце мастацка-вобразныя асаблівасці твора скульптуры “Венера Вілендорфская”, ахарактарызуйце яго.

6. Выбярыце правільны адказ:

*У перыяд Мадлен цэнтральным вобразам мастацтва становіцца …*

а) жывёла;
б) расліна;
в) жанчына;
г) камень.

7. Устаўце прапушчаныя словы:

*Галоўнае месца ў жывапісе перыяду мезаліта займае вобраз ..., які выяўляецца схематычна, але дынамічна і адлюстроўвае пэўнае дзеянне. У параўнанні з папярэднім перыядам развіцця наскальнага жывапісу ў гэты час з’яўляецца ...*

8. Адзначце, з якіх элементаў і сімвалаў складаўся арнамент у дэкаратыўна-прыкладным мастацтве перыяду неаліта.

9. Запоўніце табліцу з указаннем асаблівасцяў асноўных тыпаў мегалітычнай архітэктуры:

| Менгір | Дальмен | Кромлех | Каменныя шары |
|---|---|---|---|
| | | | |

10. Працягніце сказ:

*Шырокае распаўсюджанне ў бронзавым веку атрымалі ... На тэрыторыі Італіі існавала ўласная канструкцыя жылля – ...*

11. Выбярыце правільны адказ:

*Якія матэрыялы выкарыстоўваліся для пабудовы жылля ў бронзавым веку?*

а) камень, гліна, жалеза;

б) гліна, дрэва, сырцовая цэгла;

в) камень, гліна, бетон.

12. Якія віды мастацкай творчасці пераважалі у перыяд жалезнага веку?

**Пытанні і заданні да тэмы 2**

1. Размясціце ў храналагічнай паслядоўнасці этапы развіцця мастацкай культуры Старажытнага Егіпта: *элінiстычны перыяд, Ранняе царства, Старажытнае царства, Сярэдняе царства, познеегіпецкі перыяд, дадынастычны перыяд, Новае царства*.

2. Пацвердзіце ці абвергніце выказванне:

*На працягу ўсіх перыядаў існавання Старажытнага Егіпта моцны ўплыў на ўсе сферы чалавечага жыцця аказвала міфалогія.*

3. Пералічыце вядучыя віды мастацкай культуры Старажытнага Егіпта.

4. Працягніце сказ:

*Грабніцы, сцены якіх былі масіўнымі і мелі невялікі нахіл да цэнтру, называліся ...*

5. Ці верылі Старажытныя егіпцяне ў замагільнае жыццё? Калі так – у чым гэта ўвасаблялася?

6. Параўнайце наступныя архітэктурныя помнікі: замагільны храм фараона Аменемхета III і храм фараона Ментухатэпа I.

7. Выбярыце правільны адказ:

*Адным з буйных храмавых комплексаў Новага царства, пазбаўленых пахавання, з'яўляецца храм ...*

а) Хеопса;

б) Мікерына;

в) Хатшэпсут;

г) Ментухатэпа.

8. Прасачыце эвалюцыю развіцця храмавага будаўніцтва ў Старажытным Егіпце.

9. Параўнайце будаўніцтва храмаў у перыяды Ранняга, Старажытнага, Сярэдняга і Новага царстваў з храмавым будаўніцтвам элiнiстычнага Егіпта. У чым іх адрозненні?

10. Пра які элемент ордэра Старажытнага Егіпта ідзе гаворка?

*Папірусападобная, лотасападобная, пальмападобная, кампазітная, гатарычная.*

11. У чым заключалася сутнасць какона ў выяўленчым мастацтве Егіпта?

12. Выбярыце правільныя адказы:

У дэкаратыўным жывапісе Старажытнага Егіпта для аздаблення храмаў, палацаў, жылых дамаў, грабніц выкарыстоўваліся наступныя фарбы:

а) чорная, шэрая, зялёная, блакітная, жоўтая, ліловая, фіялетавая, сіняя, аранжавая.

б) сіняя, шэрая, карычневая, блакітная, малінавая, жоўтая, бэзавая, ліловая.

в) чорная, белая, шэрая, сіняя, зялёная, карычневая, чырвоная, ружовая, жоўтая.

13. Ахарактырызуйце дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Старажытнага Егіпта з выкарыстаннем наступных апорных слоў: *архітэктурны дэкор, каменныя пасудзіны, базальт, цвёрдыя пароды каменю, блакітная мармурная ваза, алебастравыя пасудзіны, палеткі для расцірання фарбаў, гліна, ганчарнае кола*.

14. Дапоўніце сказ:

*Звычайна ў якасці ўпрыгажэнняў драўлянай мэблі выкарыстоўваліся выявы ..., ..., ножкі крэслаў мелі завяршэнні ў выглядзе...*

**Пытанні і заданні да тэмы 3**

1. Пацвердзіце ці абвергніце выказванне:

*Месапатамія (Міжрэчча) – адна з самых старажытных цывілізацый, якая ўзнікла ў VIII тыс. да н. э. на тэрыторыі паміж рэкамі Тыгр і Еўфтрат і існавала адначасова з цывілізацыямі Індыі, Кітая, Японіі*.

2. Выбярыце правільны адказ:

*Улада ў дзяржавах Месапатаміі належала ...*

а) цару;

б) знаці;

в) саноўнікам;

г) вольным абшчыннікам.

3. Выбярыце правільны адказ:

*У духоўнай культуры Месапатаміі вялікае значэнне мела ...*

а) рэлігія;

б) мастацтва;

в) філасофія.

4. Дапоўніце характарыстыку палацаў цара ў Месапатаміі:

*Палац цара з'яўляўся адміністрацыйным цэнтрам, павінен быў уражваць велічнасцю і магутнасцю, ...*

19. Якія культавыя пабудовы былі распаўсюджаны ў архітэктуры Месапатаміі, у чым іх асаблівасці? Прывядзіце прыклады такіх пабудоў.

20. Адзначце, што выяўляў партрэт у мастацтве Месапатаміі, калі вядома, што партрэтнае падабенства з мадэллю адсутнічала?

21. У чым заключалася эстэтычная функцыя мастацтва Месапатаміі на Вашу думку.

**Пытанні і заданні да тэмы 4**

1. Выбярыце правільныя адказы:

У Старажытнай Індыі існаваў каставы лад, звязаны з узнікненнем грамадскай і маёмаснай няроўнасці. *У сувязі з гэтым вылучалі 4 варны*:

а) кшатрыі;
б) шыкхары;
в) брахманы;
г) вайш'і;
д) шудры;
е) чаіцы.

2. З чым звязана забарона будаўніцтва з каменю грамадскіх пабудоў і палацаў у Старажытнай Індыі?

3. Як называлася культавая пабудова ў Старажытнай Індыі, якая мела выгляд сферычнага купала, але была без унутранай прасторы?

4. Пералічыце адметныя асаблівасці храма чаіцы?

5. У чым заключалася асаблівасць выканання фрэскі ў Старажытнай Індыі? Працягніце сказ:

*Падмалёвак выконваўся грызайлью па сырой тынкоўцы ...*

6. Выбярыце правільныя адказы:

*Асноўнымі матывамі ў керамічных вырабах старажытнай Індыі з'яўляліся ...*

а) геаметрычны;
б) раслінны;
в) анімалістычны;
г) рэлігійны.

**Пытанні і заданні да тэмы 5**

1. Працягніце сказ:

*Старажытны перыяд цывілізацыі Кітая ахоплівае час ...*

а) з II тыс. да н. э. па III ст.
б) з I тыс. да н. э. па I ст.
в) з V тыс. да н. э. па II ст.

2. Адзначце сярод пералічаных рыс тыя, якія характэрны для культуры Кітая. Абгрунтуйце сваю думку.

а) перавага традыцый ва ўсіх сферах грамадскага жыцця;
б) культура падпарадкоўваецца дзяржаўнай ідэалогіі;
в) культура валодае надзвычай вялікай адаптацыйнай сілай;
г) культурныя традыцыі амаль не захоўваюцца з часам.

3. Вызначыце суадносіны кітайскай дынастыі і часу яе кіравання:

| | |
|---|---|
| дынастыя Чжоў | 206 г. да н. э. – 220 г. н. э. |
| дынастыя Хань | 1122–256 гг. да н. э. |

4. Працягніце ланцужок "Асаблівасці архітэктуры перыяду Хань":

*строгі стыль → ... → геаметрычны арнамент → ... → ...*

5. Назавіце сусветна вядомае кітайскае старажытнае збудаванне, што захавалася да нашага часу. Што стала перадумовай яго будаўніцтва?

6. Запоўніце табліцу "Старажытнакітайскі жывапіс"

| | |
|---|---|
| Тэхніка | |
| Форма | |
| Жанр | |

7. Што згодна кітайскай традыцыі з’яўляецца галоўным прынцыпам мастацтва? Чым гэта выклікана?

8. Назавіце асноўныя тэхнікі апрацоўкі шаўковай тканіны і іх адрозненні.

9. Пацвердзіце ці абвергніце выказванне:

*Кітайскія вырабы з бронзы (званы, зброя, посуд) адрозніваліся разнастайным арнаментам, які меў абстрактны характар, звязаны з касмагоніяй, і геаметрычны малюнак.*

10. Напішыце эсэ аб тым, якое ўражанне ў Вас выклікала мастацтва Кітая.

**Пытанні і заданні да тэмы 6**

1. Выбярыце правільны адказ:

*“Краіна узыходзячага сонца” – гэта ….*

а) Кітай;

б) Японія;

в) Індыя;

г) Егіпет.

2. Пацвердзіце ці абвергніце выказванне:

*У рэлігійных адносінах у Японіі існаваў політэізм – шматбожжа.*

3. Якая рэлігія ў Японіі лічыцца найбольш старажытнай? Што было пакладзена ў яе аснову?

4. Працягніце ланцужок “Асаблівасці японскага мастацтва”:

*элітны мастацкі густ → … → любоў да прыроды → … → ….*

5. Параўнайце раней вядомы Вам храм адной са старажытных цывілізацый з японскімі храмамі Сінта. У чым іх падабенства і адрозненні?

6. Назавіце асаблівасці скульптурнага партрэта у мастацтве Старажытнай Японіі, што ў ім імкнуліся выявіць скульптуры ў першую чаргу?

7. Як у Старажытнай Японіі называлася тэракотавая скульптура, якая выяўляла людзей, коней і дамы.

**Пытанні і заданні да тэмы 7**

1. Вызначыце правільную храналагічную паслядоўнасць перыядаў развіцця мастацтва Старажытнага Ірана. Укажыце іх часавыя межы:

*Парфянскае царства, часы Ахемянідаў, дынастыя Сасанідаў.*

2. Выбярыце правільныя адказы.

Асноўнымі рэлігіямі ў Старажытным Іране з’яўляліся …

а) маздакізм;

б) будызм;

в) зораастрызм;

г) іслам;

д) індуізм;

е) маніхейства.

3. Пацвердзіце ці абвергніце выказванне:

*У Іране, як і ў некаторых іншых старажытных цывілізацыях, цароў і іншых знатных асоб хавалі ў скальных грабніцах.*

4. Прывядзіце прыклады грабніц у архітэктры Ірана. У чым заключаюцца іх асаблівасці?

5. Аб якім помніку скульптуры ідзе гаворка? Ці адпавядае канонам Ірана створаны рэльеф, калі так, то ў чым гэта праяўляецца?

*Барацьба за царскі трон адлюстравана ў мануменце. Для выканання волі цара скульптары выбралі недасягальны ўчастак скалы, размешчанай на караванным шляху, і выдзеўбалі на ім на вышыні 50 м ад зямлі вялізны прамавугольнік. Пасля таго, як скульптары прыбралі будаўнічыя лясы, на працягу двух тысячагоддзяў ніхто не прыбліжаўся да помніка. Выява разлічана на ўспрыманне здалёк.*

6. Назавіце асноўны будаўнічы матэрыял у Старажытным Іране і Месапатаміі?

7. Якія змены адбыліся ў эпоху Сасанідаў у архітэктуры? Прывядзіце прыклады архітэктурных збудаванняў гэтай эпохі.

8. Устаўце прапушчаныя словы, якія азначаюць прыёмы купальнага перакрыцця:

*Невялічкія скляпенні канічнай формы мелі назву ..., а выступ, які ствараўся пры дапамозе напуска цэглы называўся ...*

9. Выбярыце з пералічаных тыя тыпы будынкаў, якія характэрны для архітэктуры Старажытнага Ірана. Адзначце іх прызначэнне для чалавека, асаблівасці мастацкай мовы архітэктуры.

*Мячэць, акведук, мінарэт, медрэсэ, караван-сарай, крыты рынак, лазня, агора, форум.*

10. Працягні сказ:

*Важным кампанентам арнаментацыі пабудоў з'яўлялася шматкаляровая глазураваная кераміка – ...*

## Пытанні і заданні да тэмы 8

1. Назавіце важныя, на Вашу думку, фактары, якія аказалі ўплыў на развіццё мастацкай культуры Старажытнай Карэі.

2. Устанавіце суадносіны перыяду развіцця мастацтва Старажытнай Карэі з правільнм варыянтам яго храналагічных межаў.

| | |
|---|---|
| Старажытны | 206 г. да н. э. – 220 г. н. э. |
| | 1122–256 гг. да н. э. |
| Перыяд трох дзяржаў | IV–VI ст. |
| | II тыс. да н. э. – III ст. |

3. Як выглядалі першыя жылыя пабудовы ў Старажытнай Карэі эпохі неаліту?

4. Ці ўшаноўвалі памяць памерлага племянога правадыра ў Старажытнай Карэі? Калі так, то ў чым гэта праяўлялася?

5. Выбярыце правільныя адказы:

*У VII–V стст. да н. э. на Карэйскім паўвостраве фарміруюцца шматлікія племянныя аб'яднанні, якія на працягу IV–VI стст. пераўтварыліся ў першыя карэйскія раннефеаддальныя дзяржавы:*

а) Когурё;

б) Корё;

в) Пэкчэ;

г) Сілла.

6. Якія рэлігіі мелі месца ў духоўным жыцці карэйскага насельніцтва? Ці аказвалі яны ўплыў на адукацыю, архітэктуру, выяўленчае мастацтва?
7. Чым адрозніваласяся размяшчэнне і будаўніцтва гарадоў у Кітаі і Карэі? Чым гэта можна растлумачыць?
8. Ці існаваў у Карэі культ продкаў? Калі існаваў, што аб гэтым сведчыць?
9. Працягніце сказ:

*Сюжэтам роспісаў пахавальных склепаў знаці былі рытуальныя шэсці музыкантаў і воінаў, ..., ...*

10. Выбярыце правільныя адказы. Пра якія новыя тыпы культавых ансамбляў будыйскіх манастыроў ідзе гаворка?

а) Ібулан;

б) Йемен;

в) Чхомунса;

г) Хадрамаўт;

д) Мірыкса.

11. Працягніце ланцужок “асаблівасці скульптуры Старажытнай Карэі”:

*Распрацоўка дэталей → ... → дасканаласць узораў адзення → ... → ... → ... → ...*

**Пытанні і заданні да тэмы 9**

1. Ці аказала, на Вашу думку, уплыў геаграфічнае становішча Старажытнай Манголіі на развіццё яе мастацкай культуры?
2. Пацвердзіце ці абвергніце выказванне:

*Вернасць традыцыям народнага мастацтва ўвасобілася ў дэкаратыўным афармленні архітэктурных ансамбляў манастыроў і храмаў Манголіі, ва ўпрыгожванні жылля і начыння, у якіх знайшлі выраз: любоў да прыроды, да кантрастных чыстых колераў, дакладнасць і яснасць арнаменту.*

3. Выбярыце правільны адказ:

*Першыя скульптурныя манументы, звязаныя з афармленнем пахавальнага культу і праслаўленнем баявых подзвігаў военачальнікаў былі ўзведзены цюркамі ў ...*

а) VI–VIII стст.

б) V–VI стст.

в) I–VIII стст.

4. Чым характэрызаваліся створаныя цюркамі партрэтныя вобразы палкаводцаў (напрыклад, галава мемарыяльнай статуі Кюль-Цэгіна)?

5. Назавіце самыя раннія помнікі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Манголіі.

6. Пра што апавядаюць малюнкі, выкананыя чырвонай фарбай ці прадрапаныя на паверхні скал?

7. На выяўленні якіх жывёл была засяроджана ўвага мангольскіх стваральнікаў малюнкаў, выкананых чырвонай фарбай ці прадрапаных на паверхні скалаў?

**Пытанні і заданні да тэмы 10**

1. Пералічыце асноўныя вядомыя Вам цывілізацыі, якія існавалі на амерыканскім кантыненце да яго адкрыцця Калумбам.

2. Запоўніце табліцу, указаўшы асаблівасці архітэктуры розных плямёнаў Амерыкі.

| Ацтэкі | Майя | Інкі |
|---|---|---|
| | | |

3. Адзначце з пералічаных архітэктурныя стылі племені майя. Назавіце іх асаблівасці:

а) петэн;

б) раманіка;

в) паленке;

г) готыка;

д) мексіканскі.

4. Дайце мастацка-вобразную характарыстыку помніку архітэктуры інкаў – храму Сонца ў даліне Куско.

5. Культ якога Бога прысутнічае ў творах жывапісу племені майя?

6. У чым заключаецца падабенства насценнага жывапісу племені майя са старажытнаегіпецкім мастацтвам?

7. Якое значэнне ў мастацтве майя меў колер? Што сімвалізізаваў кожны з калераў?

8. Прывядзіце вядомыя Вам прыклады фрэскавых роспісаў племені майя. Дайце ім мастацка-вобразную характарыстыку.

9. Выбярыце правільныя адказы:

*Пануючае месца сярод відаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Старажытнай Амерыкі займалі ...*

а) кераміка;

б) саломапляценне;

в) ювелірнае майстэрства;

г) ткацтва.

10.Працягніце сказ:

*Асноўнымі тэхнікамі керамікі ў Старажытнай Амерыкі былі ...*

11. Укажыце адрозненні ў стварэнні керамічных вырабаў цывілізацый майя, інкаў, альмекаў.

12. Працягніце пералік:

*Асноўнымі тэхнікамі апрацоўкі золата ў Старажытнай Амерыцы з'яўляліся: халодная коўка, чаканка, ..., ...*

13. Назавіце асноўныя колеры, якія выкарыстоўваліся ў ткацтве Старажытнай Амерыкі.

14. Выбярыце правільны адказ:

*У дэкаратыўна-прыкладным мастацтве Старажытнай Амерыкі выкарыстоўваўся ... арнамент.*

а) геаметрычны;
б) анімалістычны;
в) абстрактны;
г)раслінны.

15. Складзіце "візітную картку" Дакалумбавай Амерыкі, асвятляючы наступныя аспекты:

а) геаграфічнае месцазнаходжанне;
б) насельніцтва;
в) архітэктура;
г) выяўленчае мастацтва.

**Пытанні і заданні да тэмы 11**

1. Назавіце 3 зоны, якія вылучаюць пры вывучэнні мастацтва Афрыкі.
2. Запоўніце табліцу "Асаблівасці архітэктуры розных зон Афрыкі".

| Суданская зона | Гвінейская зона | Кангалезская зона |
|---|---|---|
| | | |

3. Працягніце ланцужок "Асаблівасці скульптуры ў афрыканскім мастацтве":

*Геаметрычнасць → ... → пластычная выразнасць → ... → ... → ...*

4. Пералічыце спецыфічныя асаблівасці графікі Афрыканскіх народаў.
5. Што з'яўлялася асноўным у арнаменце керамічных вырабаў Афрыкі:

а) квадрат;
б) прамавугольнік;
в) лінія.

6. Працягніце сказ:

*З дрэва ў Афрыцы выраблялі мэблю (троны, сядзенні), ..., ...*

7. Суаднясіце адну з зон Афрыкі і асаблівасці вырабу тканіны, якія характэрны для дадзенай зоны:

| | |
|---|---|
| Кангелезская зона | тканіна ў краты нябесна-блакітнага колеру з чырвонымі чарапахамі і завіткамі |
| Гвінейская зона | тканіна чырвонага колеру з чорнымі коламі |
| Суданская зона | тканіны з рафіі (кітайскі аксаміт) з геаметрычным малюнкам |

**Пытанні і заданні да тэмы 12**

1. Што ўпершыню ў свеце стала аб'ектам выявы ў крыта-мікенскім мастацтве?

2. Назавіце асноўныя цэнтры эгейскай культуры.

3. Суаднясіце назвы этапаў развіцця крыта-мікенскай мастацкай культуры і іх часавыя межы:

| | |
|---|---|
| Эгейская культура | XIV–XII стст. да н. э. |
| Ахейская культура | другая палова II тыс. да н. э. |
| Крыцкая культура | XIV–XII стст. да н. э. |
| Мікенская культура | другая палова II тыс. да н. э. |

4. Запоўніце табліцу "Асаблівасці архітэктуры Крыта і Мікен":

| Архітэктура Крыта | Архітэктура Мікен |
|---|---|
| | |

5. Працягніце сказ:

*Тып жылля ў Мікенах і Трої, які ўяўляў сабою прамавугольны ў плане дом з двухсхільным дахам і ўваходам з тарцовага боку; працяг даху ўтвараў над уваходам павець, якая падтрымлівалася драўлянымі слупамі ці падоўжанымі сценамі, меў назву ...*

6. Старажытнай формай жылля на Крыце з'яўлялася …

а) круглая ў плане пабудова з канічным дахам;

б) прамавугольная ў плане пабудова з канічным дахам;

в) пірамідальная пабудова з канічным дахам;

7. Дзе ўпершыню сфарміраваўся тып пабудовы мегарон? Выбярыце правільны адказ.

а) на Крыце;

б) у Мікенах;

в) у Троі.

8. Першапачаткова Кноскі палац складаўся з некалькіх самастойных памяшканняў, якія мелі назву:

а) інсулы;

б) талосы;

в) іпагеі.

9. Дайце мастацка-вобразную характарыстыку помніка архітэктуры – Кноскаму палацу.

10.Запішыце азначэнне прыведзеных у табліцы паняццяў.

| | |
|---|---|
| Мегарон | |
| Інсула | |
| Іпагей | |
| Талос | |

11. Назавіце знакамітую фрэску Кноскага палаца, на якой адлюстраваны партрэт беласкурай жанчыны.

12.Пералічыце адрозненні крыцкага жывапісу ад жывапісу краін старажытнага Усходу.

13.Пацвердзіце ці абвергніце выказванне:

*Ахейская архітэктура славілася шматлікімі абарончымі збудаваннямі, якія ўзводзіліся звычайна на ўзвышаных месцах і абносіліся трывалай сцяной з каменных блокаў.*

14. Назавіце помнік архітэктуры Мікен, часткай якога з'яўляюцца знакамітыя Ільвіныя вароты.

15. Адзначце архітэктурныя асаблівасці палацавага комплекса ў Мікенах і яго часткі – Ільвіных варот.

16. Выбярыце правільны адказ:

*Найбольш знакамітай грабніцай у Мікенах з'яўляецца ...*

а) грабніца цара Агамемнона (Атрэя);

б) грабніца Тутанхамона;

в) грабніца Кіра.

17. Пералічыце характэрныя рысы крыта-мікенскіх керамічных вырабаў.

**Пытанні і заданні да тэмы 13**

1. Пацвердзіце ці абвергніце выказванне:

*Антычная культура (у шырокім сэнсе) – гэта перыяд ў развіцці гісторыі і культуры чалавецтва паміж першабытным і феадальным ладам; у вузкім сэнсе – гэта гісторыя культуры Старажытных Грэцыі і Рыму.*

2. Вызначце рэгіянальныя межы Антычнасці.
3. У гісторыі развіцця мастацтва Антычнай Грэцыі вылучаюць 3 асноўныя перыяды. Назавіце іх і адзначце хранлагічныя межы.
4. Запоўніце табліцу з вызначэннем характэрных асаблівасцей кожнага з перыядаў развіцця мастацтва Антычнай Грэцыі.

| Архаіка | Класіка | Элінізм |
|---|---|---|
| | | |

5. У перыяд архаікі ў архітэктуры адбываецца станаўленне трох асноўных ордэраў. Назавіце іх, адзначце адрозненні.
6. Выбярыце найбольш дакладнае вызначэнне тэрміна:

*Ордэр – гэта ...*

а) суаднясенне нясомай і нясучай частак бэлечна-стоечнай канструкцыі;

б) суаднясенне прапорцый будынка;

в) суаднясенне памераў калон з будынкам.

7. Адкуль паходзіць назва кожнага з ордэраў?
8. Прывядзіце прыклады архітэктуры з дарычным, іанічным, карынфскім і кампазітным ордэрамі.
9. Працягніце ланцужок:

*Структура класічнага ордэра ўключае: нясучую частку – базу → ..., → ...; нясомую частку – архітраў → ... → ....*

10. У скульптуры Старажытнай Грэцыі перыяду архаікі назіраецца ўплыў:

а) егіпецкай традыцыі;

б) старажытнаіранскай традыцыі;

в) старажытнакітайскай традыцыі.

11. Тыповымі вобразамі скульптуры перыяду архаікі з’яўляюцца ...

а) Курасы;

б) Коры;

в) Венеры.

12. Тып храма, характэрны для перыяду класікі Антычнай Грэцыі мае назву:

а) перыпцер;

б) піраміда;

в) ратонда.

13. Будаўніцтвам Афінскага Акрапалю кіраваў:

а) Фідый;

б) Ікцін;

в) Калірат.

14. Галоўнай рысай скульптуры перыяду класікі ў Антычнай Грэцыі з’яўлялася:

а) імкненне да ідэалізацыі чалавечага твару;

б) імкненне да гіпертрафіравання асобных частак цела чалавека;

в) імкненне да ідэальнага адлюстравання чалавечай фігуры.

15. Знайдзіце адпаведнасць аўтара і твора скульптуры:

| | |
|---|---|
| Міран | “Зеўс” |
| Паліклет | “Апаксіамен” |
| Фідый | “Дарыфор-коп’яносец” |
| Скопас | “Гермес з Дзіонісам” |
| Праксіцель | “Апалон Бельведэрскі” |
| Лісіп | “Менада” |
| Леахар | “Дыскабол”, “Афіна і Марсій” |

16. У перыяд класікі ў Антычнай Грэцыі ствараецца два тыпы вазапісу:

а) чорнафігурны;

б) зялёнафігурны;

в) чырвонафігурны.

17. Пра які твор ідзе гаворка:

*Статуя перадае вобраз атлета у самы крытычны момант дзеяння ... атлет, які напружвае ўсе сілы, нагнуўшыся, далёка адкінуў назад правую руку.*

а) Паліклет “Дарыфор-коп’яносец”;

б) Фідый “Зеўс”;

в) Міран “Дыскабол”.

18. Аб якім цудзе свету ідзе гаворка:

*Статуя, узведзеная Харэсам з горада Ліндаса, мела вышыню 32 метра і праз 60 год пасля свайго ўзвядзення была павалена землетрусам*:

а) Статуя Зеўса;

б) Статуя Афіны;

в) Статуя Апалона.

19. *У IV ст. да н.э. ствараццa пабудова ў выглядзе 24-ступеньчатай пірамiды, вышынёй каля 50 метраў, увенчаная чацвёркай коней.* Што гэта за пабудова:

а) Алтар Зеўса;

б) Свяцілішча Афіны;

в) Галікарнаскі маўзалей;

1) Храм Пасейдона.

20. *Актыўнае развіццё свецкага дойлідства ў Старажытнай Грэцыі назіраецца ў …*

а) Эліністычны перыяд;

б) Класічны перыяд;

в) Архаічны перыяд.

21. Прывядзіце прыклады помнікаў свецкага дойлідства эліністычнага перыяду.

22. *Архітэктарам Фароскага маяка ў Александрыі з'яўляўся*:

а) Палідор;

б) Састрат;

в) Фідый.

23. Суаднясіце тэрмін з адпаведным паняццем:

| | |
|---|---|
| Перыпцер | суадносіны нясомай і нясучай частак бэлечна-стоечнай канструкцыі, іх структура і мастацкая апрацоўка |
| Дзіпцер | прамавугольны ў плане будынак, акружаны з усіх бакоў каланадай |
| Ордэр | прамавугольны ў плане будынак з падвоенымі радамі калон |

24. Прывядзіце прыклады грэчаскай скульптуры, у якой назіраецца імкненне адлюстраваць рух; назіраецца распрацоўка канонаў ідэальнай чалавечай фігуры; адчуваецца перадача захапленняў і пакутаў.

25. Якія дзве тэндэнцыі вылучаюцца ў скульптуры Грэцыі ў перыяд элінізму?

**Пытанні і заданні да тэмы 14**

1. Назавіце храналагічныя рамкі Этрускага перыяду:

а) VIII–V стст. да н. э.

б) III–I стст. да н. э.

в) X–IX стст. да н. э.

2. Як называліся пахавальныя ўрны ў этрускаў:

а) канопы;

б) амфары

**Пытанні і заданні да тэмы 15**

1. Устанавіце адпаведнасці назвы перыяду і яго храналагічных рамак:

| | |
|---|---|
| Ранні (царскі) Рым | I–II стст. |
| Ранняя Рымская рэспубліка | VIII–V стст. да н. э. |
| Рымская рэспубліка | III–I стст. да н. э. |
| Росквіт Рымскай імперыі | III–V стст. |
| Заняпад Рымскай імперыі | V–IV стст. да н. э. |

2. У які перыяд у Старажытным Рыме быў вынайдзены бетон?

а) Рымскай Рэспублікі;
б) Рымскай Імперыі;
в) Этрускі перыяд.

3. Якую назву мела інжынернае збудаванне у выглядзе маста з функцыяй шляхаводаправода, якое упершыню ўзнікае ў Старажытным Рыме як арачная канструкцыя з бетону:

а) клаака;
б) ратонда;
в) акведук.

4. У галіне выяўленчага мастацтва ў Старажытным Рыме развіццё атрымаў жанр…

а) пейзажа;
б) рэалістычнага партрэта;
в) нацюрморта.

5. У чым асаблівасці “паліхромнага стылю” шкляных вырабаў Старажытнага Рыма?
6. Запоўніце табліцу. Адлюструйце ў ёй змены ў архітэктуры, якія адбываліся ў розныя перыяды развіцця Старажытнага Рыма.

| | |
|---|---|
| Ранні (царскі) Рым | |
| Ранняя Рымская рэспубліка | |
| Рымская рэспубліка | |
| Росквіт Рымскай імперыі | |
| Заняпад Рымскай імперыі | |

7. Адзначце асаблівасці тэхнікі выканання “фаюмскіх партрэтаў”.
8. Прывядзіце прыклады скульптурнага партрэта Старажытнага Рыма. Аб чым можа сведчыць іх вобразнае адлюстраванне?
9. Пацвердзіце ці абвергніце выказванне:

*Актыўна ў Старажытным Рыме ўжывалася тэракотавая кераміка, з якой выраблялі свяцільні і ганчарны посуд, аздоблены на сюжэты грэка-рымскай міфалогіі.*

10. Пералічыце, якія ўзоры ў ювелірнай справе атрымалі найбольшае распаўсюджанне ў Старажытным Рыме.
11. Чаму ў ткацтве Старажытнага Рыма назіралася перайманне матываў з іншых краін?

**Пытанні і заданні да тэмы 17**

1. Якая рэлігія была прынята ў IV ст. у Рымскай Імперыі і стала асноўнай у Візантыі?

2. Якія адрозненні існавалі ў тыпах храмаў Усходняй і Заходняй Імперыях Рыма?

3. Назавіце паслядоўнасць этапаў развіцця мастацкай культура Візантыі, акрэсліце іх часовыя межы.

4. Прывядзіце прыклад помніка архітэктуры Візантыі. Прааналізуйце яго стылявыя асаблівасці.

5. Працягніце сказ:

*Найбольшага росквіту ў эпоху Канстанціна Вялікага і Юсцініана I дасягнула ...*

6. У чым заключаецца сутнасць тэхнікі “мазаіка” і якое паходжанне гэтага віда манументальнага жывапісу?

7. Адзначце выкарыстаныя мастаком выразныя сродкі ў выкананні смальтавай мазаікі базілікі Сан Апалінарэ ў г. Равэне (520 г.), якія садзейнічаюць стварэнню вобразнай асновы твора.

8. Растлумачце сутнасць з’явы “іконаборства”. Адзначце прычыны ўзнікнення гэтага руху. Выкарыстоўвайце наступны рад апорных слоў: *адмаўленне ад выяў рэлігійных вобразаў, ідалапрыкланенне, вынішчэнне помнікаў мастацтва рэлігійнага характару, 843 г., імператар Феадор*.

9. Працягніце сказ:

*Распрацоўка тэорыі свяшчэннага абраза належыць ...*

10. Пералічыце асноўныя элементы іканаграфічнага канону. Дайце характарыстыку кожнаму элементу.

11. Адкуль паходзіць назва перыяду “Македонскі Рэнесанс”, з чым яна звязана?

12. Прывядзіце прыклады вядомых Вам скруткаў перыяду македонскага рэнесансу. Адзначце іх ідэйны змест.

13. Што выяўляюць мініяцюры, якія з’яўляюцца копіямі Александрыйскага рукапісу IV ст., выкананыя візантыйскімі майстрамі ў IX–X стст.

14. Працягніце сказ:

*Фрэскавы жывапіс Македонскага Адраджэння захоўваюць пячоры і храмы ...*

15. Пералічыце рысы фрэскавага жывапісу Візантыі.

16. Ці характэрны сімвалізм для мастацкай мовы фрэсак Візантыі? Прывядзіце прыклады.

17. Параўнайце мазаіку “Імператар Леў-VI перад Хрыстом” (IX ст.) і мазаіку “Імператар Канстанцін Манамах і імператрыца Зоя перад Хрыстом” (сярэдзіна XI ст.). Што агульнага ў гэтых творах?

18. Адзначце асаблівасці развіцця мазаікі ў эпоху Камнінаў. Прывядзіце прыклады твораў гэтага перыяду.

19. У які перыяд развіцця мастацтва Візантыі росквіт атрымаў іканапіс?

20. Выбярыце правільны адказ:

*Тэхніка аздаблення керамічных вырабаў, заснаваная на прадрапванні па паліве мае назву ...*

а) графіці;

б) зграфіта;

в) гравюра.

21. Адзначце паслядоўнасць працы над вырабам ў тэнніцы перагародчатай эмалі.

**Пытанні і заданні да тэмы 18**

1. Назавіце матывы, якія атрымалі распаўсюджванне ў ткацтве Візантыі.
2. Які від мастацтва ў Ірландыі ў раннім Сярднявеччы дасягае найбольшага росквіту?
3. Назавіце адметную рысу мастацтва Ірландыі перыяду ранняга сярэднявечча?
4. Якія асаблівасці арнаменту адзначаюцца ў разьбе па камені ў Ірландыі ў раннім сярэднявеччы?
5. Што ўяўляла сабою дараманскае мастацтва?
6. У чым праяўляўся "звярыны стыль", характэрны для вырабаў з метала ў дараманскім мастацтве?
7. Працягніце ланцужок "Тэхнікі ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве дараманскага перыяду":

   *Насечка → ... → ... → ...*
8. Працягніце сказ:

   *У Галіі перыяду Меровінгаў найбольшага росквіту дасягнулі ...*
9. Развіццё якіх відаў мастацтва характэрна для *Каралінгаў* (Францыя, Галандыя, Германія, Італія)?
10. Вызначце паслядоўнасць ўзнікнення такіх тыпаў пабудоў, як бургі і данджоны. Што яны сабою ўяўлялі?

**Пытанні і заданні да тэмы 19**

1. Якое значэнне для Русі мела прыняцце хрысціянства ў якасці афіцыйнай рэлігіі?
2. Назавіце архітэктурныя асаблівасці Дзесяціннай царквы ў Кіеве.
3. Запоўніце табліцу, адлюстраваўшы час і асаблівасці архітэктурных помнікаў Старажытнарускага мастацтва.

| | |
|---|---|
| Першы каменны храм у г. Кіеве – Дзесяцінная царква | |
| Сафійскі сабор у г. Кіеве | |
| Манастырская царква Спаса на Нярэдзіцы ў г. Ноўгарадзе | |
| Дзмітрыеўскі сабор у г. Уладзіміры | |
| Успенскі сабор у г. Маскве | |
| Дабравешчанскі сабор у г. Маскве | |
| Храм Узнясення ў падмаскоўнай | |

| | |
|---|---|
| царскай сядзібе Каломенскім | |

4. Выбярыце правільны адказ:

*Узвядзенне ў Маскве на тэрыторыі Крамля ў канцы XV ст. Успенскага сабора адбывалася па праекце італьянскага архітэктара ...*

а) Л. Берніні;

б) А. Фіараванці;

в) Я.М. Бернардоне.

5. Прывядзіце прыклад архітэктурнага помніка ў стылі ўзорач'е. У чым заключаюцца асаблівасці архітэктурнага стылю ўзорач'е?

6. Адна з самых цікавых з'яў у рускім дойлідстве XVI ст. – выкарыстанне ў кампазіцыі каменнага храма шатровага даху. Назавіце асаблівасці яго архітэктуры; з прыведзеных ніжэй выказванняў аб іх паходжанні выбярыце тое, з якім вы згодны:

а) прататыпам пабудовы быў паходны шацёр;

б) архітэктура захоўвала традыцыі драўлянага дойлідства, што прывяло да з'яўлення стоўпападобных пабудоў з канструкцыяй верха ў выглядзе шатра;

в) гэта трохапсідны, чатырохстоўпны, аднакупальны храм, прататыпам якога была царква Пакрова на Нэрлі.

7. Працягніце пералік архітэктурных рыс, агульных для пабудоў Нарышкінскага (Маскоўскага) і Галіцынскага барока:

*Пластычнасць → ... → наяўнасць валют → ... → ...*

8. Знайдзіце адпаведнасць назвы іконы Божай Маці з яе мастацка-вобразным выражэннем.

| | |
|---|---|
| "Аранта" | Божая Маці выяўлена па пояс з немаўляткам Хрыстом у чрэве |
| "Знаменне" | Божая Маці выяўлена па пояс з немаўляткам Хрыстом на левай руцэ. Галава Божай Маці крыху нахілена ў бок немаўляткі, які крыху паварочваецца да яе |
| "Адзігітрыя" | Божая Маці выяўлена па пояс з немаўляткам Хрыстом на правай руцэ. Твары Марыі і Ісуса звернуты адзін да аднаго |
| "Перыўлепта" | Божая Маці выяўлена па пояс з немаўляткам Хрыстом на правай руцэ. Твары Марыі і Ісуса прыціскаюцца адзін да аднаго |
| "Гелеўса" | Божая Маці выяўлена ў поўны рост з узнятымі да верху рукамі |

9. Пералічыце асноўныя чыны ікон у парадку іх размяшчэння ў іканастасе. Адзначце іх асаблівасці.

10. Назавіце вядомых Вам мастакоў Старажытнай Русі і Маскоўскага княства, у творчасці якіх атрымала ўвасабленне тэхніка фрэскі.

11. Дапоўніце сказы:

*Прадстаўнік канстанцінопальскай школы жывапісу Феафан Грэк атрымаў славутасць дзякуючы сваім роспісам ... Асаблівасцю манеры пісьма мастака з'яўляецца ...*

12. Прааналізуйце творчасць мастака Андрэя Рублёва.
13. Параўнайце адметныя асаблівасці Наўгародскай і Пскоўскай школ жывапісу.
14. Назавіце славуты помнік ювелірнага мастацтва XI ст., знойдзены пад Чарнігавым у 1821 г. Аб чым сведчаць надпісы па краях выраба?

**Пытанні і заданні да тэмы 20**

1. Выбярыце правільны адказ:

*Росквіт раманскага стылю прыпадае на ...*

а) X–XII стст.

б) XI–XII стст.

в) XII–XIX стст.

2. Пацвердзіце ці абвергніце выказванне:

*Тэрмін “раманскі” ўтварыўся ад лац. “Roma” – Рым і ўпершыню быў ужыты археолагамі XXI ст., якія вызначылі знешняе падабенства старажытнарымскіх і заходнееўрапейскіх пабудоў X–XIX стст.*

3. У чым заключаецца адметнасць раманскай архітэктуры, прадстаўленай храмамі і замкамі?
4. Вызначце тып замка па апісанні:

*У перыяд панавання раманскага стылю ў Заходняй Еўропе склаўся тып замка, які меў у плане форму шматгранніка (часцей, чатырохвугольніка), фланкіраванага вартавымі (баявымі) вежамі. Сцены замка былі ўвенчаны зубцамі, з унутранага боку якіх рабілі драўляны насціл, адкуль абаронцы стралялі па ворагу. Уся тэрыторыі замка акружалася вялікім рвом. Звычайна замак знаходзіўся на ўзвышшы і маскіраваўся лясным масівам. Адзіным уваходам служылі вежавыя вароты, да якіх падводзіў пад’ёмны мост.*

5. Якую назву мела круглая вежа, уключаная ў замкавы архітэктурны ансамбль раманскага стылю?
6. Што з’яўлялася асновай планіровачнай структуры раманскага храма?
7. Падбярыце азначэнні, што характарызуюць знешні выгляд раманскіх храмаў.
8. Пералічыце змены, якія адбыліся ў дойлідстве раманскай эпохі:

*Калоны занялі месца апор* → ... → ... → ... → ... → ...

9. Працягніце сказ:

*Характэрным элементам раманскай архітэктуры з’явілася...*

а) арачная форма;

б) стральчатая форма;

в) шарападобная форма.

10. Прывядзіце прыклады найбольш знакамітых помнікаў раманскага стылю.
11. Параўнайце дзве школы фрэскавага жывапісу (“школа светлых фонаў” і “школа сініх фонаў”). Якія сюжэты яны выкарыстоўвалі?

12. Назавіце адрозненні кніжнай мініяцюры французскай школы ад іспанскай.
13. Якім было асноўнае прызначэнне скульптуры ў эпоху панавання раманскага стылю?
14. Працягніце сказ:

*Найбольш знакамітымі поінікамі вышыўкі раманскага стылю з'яўляюцца ...*

а) дыван з Байё;

б) шаўковая туфля папы Клімента II;

в) шпалера з краявідамі Рыма.

**Пытанні і заданні да тэмы 21**

1. Якое паходжанне мае тэрмін "гатычны"?
2. Развіццё готыкі ў Францыі ахоплівае час:

а) з сярэдзіны X да пачатку XIII ст.

б) з сярэдзіны XII да пачатку XVI ст.

в) з сярэдзіны XVI да пачатку XIX ст.

3. Назавіце перыяды развіцця гатычнага стылю.
4. У перыядызацыі гатычнага стылю, распрацаванай французскім даследчыкам Латры вылучаюцца такія перыяды, як "прамянёвы стыль" або "ззяючы стыль", "пераходны стыль", "стральчаты стыль", "палымяны стыль". Размясціце іх у правільнай паслядоўнасці з указаннем храналагічных межаў.
5. Якія з пералічаных асаблівасцей характэрны для гатычнай архітэктуры:

а) імкненне ўвышыню падкрэслівалася стральчатымі формамі;

б) у канструкцыі скляпення ўжываюцца нервюры (арачныя рэбры), якая расчляняюць прастору на мноства ўзмоцненых частак;

в) з мэтай умацавання высокіх сцен звонку ўладкоўвалася канструкцыя з контрфорсаў і аркбутанаў;

г) імкненне да ідэальнага адлюстравання чалавечай фігуры ў скульптуры, што аздабляе храмы;

д) палягчэнне канструкцыі сцен дзякуючы ўвядзенню вялікіх вокнаў з вітражамі;

е) лёгкасць форм падкрэсліваецца ажурнасцю прапрацоўкі дэталей і мноствам скульптуры;

ж) на галоўным фасадзе знаходзіўся вітраж круглай формы – "ружа";

з) масіўныя формы ствараюць уражанне цяжкасці, падкрэсліваюць абарончы характар пбудоў.

6. Прывядзіце прыклады архітэктуры, якія даюць яркія ўяўленні аб асаблівасцях готыкі.
7. Пацвердзіце ці абвергніце выказванне:

*Жывапісная палітра ў перыяд готыкі ўзбагацілася за кошт з'яўлення ў ёй лазурна-блакітнай, пурпурна-ружовай і ярка-чырвонай фарбаў.*

8. Абазначце асаблівасці выкарыстання вітражоў у гатычую эпоху.

9. Працягніце сказ:

*З развіццём кніжнай мініяцюры ў перыяд панавання гатычнага стылю звязана творчасць мастакоў-мініяцюрыстаў ...*

а) Ж. Фуке;
б) Ф. Бушэ;
в) Ж. Бурдзішона;
г) Ш. Буля.

10. Дапоўніце пералік:

Асноўнымі тэхнікамі вырабу ювелірных прадметаў былі ліццё, …

**Пытанні і заданні да тэмы 22**

1. Пералічыце этапы развіцця мастацкай культуры Індыі часоў сярэднявечча і Новага часу. Вызначыце іх храналагічныя межы.
2. Запоўніце табліцу “Асаблівасці архітэктуры Індыі”.

| | |
|---|---|
| Вімана | |
| Шыкхара | |

3. У час распаўсюджання ірана-сярэднеазіяцкай архітэктуры ў Індыі ўзнікаюць новыя тыпы пабудоў. Назавіце іх.
4. Назавіце мастацкія асаблівасці помніка перыяду Маголаў – беламармуровага маўзалея Тадж-Махал у г. Агры.
5. Што з’яўляецца сведчаннем уплыву кітайскай архітэктуры на дойлідства Індыі.
6. Якія вырабы ў Сярэднія стагоддзі стваралі ў ювелірных майстэрнях? Якія металы выкарыстоўвалі ў ювелірным мастацтве?
7. Назавіце асноўныя стылі вырабу мэблі, у чым іх адметнасці?

**Пытанні і заданні да тэмы 23**

1. Назавіце храналагічныя рамкі этапаў развіцця мастацкай культуры Кітая ў часы сярэднявечча і ў Новы час.
2. Ці аказаў уплыў будызм на архітэктуру Кітая? Калі так, у чым гэта праявілася?
3. У чым заключаецца адметнасць ранніх будыйскіх скальных храмаў Кітая?
4. Суаднясіце вынаходніцтвы і падзеі з часам іх ўзнікнення:

| | |
|---|---|
| Друк пры дапамозе рухомага шрыфта | VII ст. |
| Ксілаграфічны спосаб кнігадрукавання | X ст. |
| Акадэмія жывапісу | IX ст. |

5. Параўнайце архітэктуру Сунскага і Танскага перыядаў.
6. Адзначце адметныя асаблівасці архітэктуры ў час праўлення дынастыі Мін.
7. Прывядзіце прыклады храмавых пабудоў перыяду праўлення дынастыі Мін.
8. Чым адрознівалася архітэктура цынскага перыяду ад архітэктуры перыяду праўлення дынастыі Мін?

9. З якім мастацкім жанрам, узнікшым у IV–VI стст., звязана творчасць вядомых мастакоў Цзун Біну, Гу Кай-чжы, Ван Вэя?

10. Пацвердзіце ці абвергніце выказванне:

*Асноўным сюжэтам апавядальнага жанру кітайскага жывапісу з'яўляецца быт прыдворных людзей, дзе сцвярджаецца чалавечая годнасць, гуманнасць, вернасць.*

11. Параўнайце скульптуру Сунскага і Танскага перыядаў. Прывядзіце прыклады скульптурных твораў гэтага часу.

12. Пералічыце жанры кітайскага жывапісу. Якія мастакі працавалі ў гэтых жанрах?

13. Дапоўніце сказ:

*Росквіт кітайскага пейзажнага жывапісу пачаўся з другой паловы X ст. і быў звязаны з імёнамі ...*

14. Чым характэрызуюцца партрэтныя творы Кітая XIV–XIX стст.?

15. Да якога часу адносіцца вынаходніцтва бела-сіняга фарфору?

**Пытанні і заданні да тэмы 24**

1. Назавіце храналагічныя рамкі перыядаў развіцця мастацкай культуры Японіі часоў сярэднявечча і Новага часу.

2. Працягніце сказ:

*Дзэнскі храм меў ...*

3. Якія тыпы садовага мастацтва Японіі Вам вядомы? У чым іх адрозненні і падабенствы?

4. На які час прыпадае росквіт гарадской культуры Японіі? Дайце характарыстыку гарадской культуры Японіі.

5. Якія адметныя рысы характэрны для скульптурнага партрэта Японіі часоў сярэднявечча?

6. Адзначце асаблівасці жывапісу на скрутках Японіі. Якія сродкі выразнасці дапамагаюць мастаку Японіі ў стварэнні вобразнай мовы твора жывапісу?

7. Назавіце мастака, творчасць якога звязана з росквітам японскага манахромнага жывапісу.

8. Пацвердзіце ці абвергніце выказванне:

*Прыдворная жывапісная школа Кано ўзнікла ў выніку развіцця гарадской культуры.*

9. Працягніце сказ:

*Галоўным відам мастацтва Японіі ў XVIII – пачатку XX ст. стала ...*

**Пытанні і заданні да тэмы 25**

1. Назавіце этапы развіцця мастацкай культуры Карэі часоў сярэднявечча і Новага часу. Вызначце іх храналагічныя межы.

2. Якія змены адбыліся ў горадабудаўніцтве і архітэктуры Карэі ў эпоху сярэднявечча і ў Новы час?

3. Чым адрознівалася будаўніцтва пячорных храмаў Карэі? Які выгляд яны мелі?

4. Устаўце прапушчаныя словы:

*У X ст. распаўсюдзіўся ..., а з XIII ст. дзякуючы рухомаму металічнаму шрыфту разнастайныя літаратурныя жанры ўвайшлі ў побыт гараджан.*

5. Які матэрыял выкарыстоўваўся пры ўзвядзенні пабудоў Карэі ў X–XIV стст.?

6. Працягніце сказ:

*У скульптурных творах Карэі VIII–IX стст. назіраецца тэндэнцыя да выяўлення руху, ...*

7. Які від выяўленчага мастацтва ў XV–XVIII стст. становіцца вядучым у Карэі:

а) жывапіс на скрутках;
б) скульптура;
в) графіка.

8. Пералічыце асноўныя жанры карэйскага жывапісу на скрутках.

9. Запоўніце табліцу “Асаблівасці карэйскай керамікі эпохі сярэднявечча і Новага часу”:

| | |
|---|---|
| Кераміка X–XIV стст. | |
| Кераміка XIV–XIX стст. | |

**Пытанні і заданні да тэмы 26**

1. Назавіце найбольш значныя перыяды ў развіцці мастацтва Манголіі часоў сярэднявечча і Новага часу?

2. Назавіце сталіцу Манголіі, заснаваную ў 1220 г. Параўнайце горадабудаўніцтва Манголіі і Кітая.

3. Які тып жылля выкарыстоўваўся ў Манголіі на працягу XIV–XVI стст., калі ў краіне ішлі міжусобныя войны:

а) палаткі-шатры для ўрачыстых цырымоній (асар);
б) шалашы;
в) крытыя павозкі (чорныя кібіткі);
г) палаткі (майханы).

4. Адзначце, у абліччы якога тыпу жылля праявіліся рысы нацыянальнай эстэтыкі Манголіі.

5. У чым заключаюцца асаблівасці мангольскага тыпу жылля юрты-гэр?

6. Працягніце сказ:

*Асаблівай умяшчальнасцю адрозніваліся саборныя храмы – ..., прыкладам якога можа служыць узведзены ў 1654 г. храм у манастыры Да-хурэ.*

7. Суаднясіце тып пабудовы манастыра з характэрнымі асаблівасцямі.

| | |
|---|---|
| хурэ | выкарыстоўваў у аснове план тыбецкага ансамбля з галоўным храмам, узведзеным на вяршыні гары |
| сум | меў кальцавы план |
| хійд | узыходзіў да манастырскай сістэмы кітайскага тыпу і адрозніваўся рэгулярнасцю, паслядоўным чаргаваннем будынкаў і двароў |

8. Параўнайце храмавае дойлідства Манголіі XVIII–XIX стст. з помнікамі архітэктуры таго ж прызначэння XIX–XX стст. Якія змены адбыліся з тэхніцы іх будаўніцтва?
9. Якія народы аказалі ўплыў на развіццё мангольскай культуры, у выніку чаго манголы атрымалі ў спадчыну пісьменнасць, літаратурны і мастацкі скарб у выглядзе песень і вершаў?
10. Адзначце вядучую функцыю мангольскага жывапісу і скульптуры?
11. Назавіце паслядоўнасць тэхнікі выканання манголамі іконы.
12. Што ўяўляў сабою двухколерны жывапіс Манголіі XVII ст. Якія тэхнікі яго выканання існавалі?

**Пытанні і заданні да тэмы 27**

12 Чым тлумачыцца падабенства дойлідства Азербайджана і Ірана?
2. Якія адметныя ўласцівасці народнага дойлідства Азербайджана Вам вядомы?
3. У чым заключаецца адметнасць Дэрбенцкіх умацаванняў?
4. Устаўце прапушчанае слова.

*Будаўнічая тэхніка Азербайджана набліжавецца да ..., яна ўяўляла змешаную кладку з абпаленай цэглы і неапрацаванага каменю, а таксама кладку з чыста абчасаных камянёў.*

а) іранскай;
б) візантыйскай;
в) арабскай.

5. Пералічыце змены ў архітэктуры Азербайджана, якія адбыліся ў XII ст.
6. Адзначце асаблівасці мастацкага аблічча культавай архітэктуры Азербайджана.
7. Прааналізуйце адзін з помнікаў манументальнага дойлідства Азербайджана – *палацавы комплекс шырваншахаў у г. Баку* (XV ст.).
8. Які будаўнічы матэрыял у Сярэдняй Азіі з’яўляўся асноўным?
9. *Асноўным тыпам пабудоў у раннім сярэднявеччы, як і ў Еўропе, у Сярэдняй Азіі з’яўляўся ...*

а) феадальны замак;
б) храм;
в) адміністрацыйны будынак.

10. Як выглядалі пабудовы феадальных замкаў у раннім сярэднявеччы ў Сярэдняй Азіі?
11. Дайце азначэнне наступным архітэктурным тэрмінам: *мячэць, медрэсэ, караван-сарай, рабат*.
12. Ці дэкарыраваліся пабудовы IX–XI стст. у Сярэдняй Азіі? Калі так, то з дапамогай якіх сродкаў выразнасці?
13. Якія змены ў мастацкай культуры Сярэдняй Азіі адбыліся пасля іх заваёвы манголамі ў 1220–1221 гг.?

**Пытанні і заданні да тэмы 28**

1. Выбярыце правільны адказ:

*Асноўным вераваннем араба-мусульманскіх краін з'яўляецца …*

а) іслам;

б) будызм;

в) канфуцыянства.

2. Назавіце характэрныя асаблівасці мастацтва араба-мусульманскіх краін.
3. Чаму старажытныя пабудовы Аравійскага паўвострава мала захаваліся?
4. Які тып жылля пераважаў у араба-мусульманскіх краін, чым гэта было выклікана?
5. У чым заключаюцца мясцовыя асаблівасці архітэктуры розных мусульманскіх краін?
6. Выбярыце правільны адказ:

Вядучым тыпам манументальных збудаванняў у мусульманскіх краінах з'яўляецца …

а) мячэць;

б) медрэсэ;

в) караван-сарай.

7. Дайце характарыстыку адной з мячэцяў (на выбар).

738 Пацвердзіце ці абвергніце выказванне:

*Архітэктура арабаў аб'ядноўвае ў сабе пярэднеазіяцкія, іранскія, візантыйскія і ўласна арабскія традыцыі.*

9. Эстэтычную функцыю ў аздабленні храмаў араба-мусульманскіх краін выконваў …

а) колер;

б) жывапіс;

в) арнамент.

10. Назавіце асноўныя віды жывапісу, якія атрымалі найбольшае распаўсюджанне ў араба-мусульманскіх краінах.
11. Пералічыце адметныя рысы керамікі араба-мусульманскіх народаў.
12. Назавіце асноўныя цэнтры керамічнай вытворчасці ў араба-мусульманскіх краінах часоў сярэднявечча.
13. Асноўнымі матывамі ткацкіх вырабаў арабаў з'яўлялюцца …

а) фальклорныя;

б) міфалагічныя;

в) рэлігійныя.

14 У чым заключаецца адметнасць дыванoвага майстэрства арабаў?

**Пытанні і заданні да тэмы 29**

1. Ці аказала, на Вашу думку, уздзеянне на архітэктуру Каўказа геаграфічнае становішча і рэлігія дадзенай мясцовасці. Калі так, то ў чым гэта праявілася?
2. Пацвердзі ці абвергніце выказванне:

*Закаўказзе ў IV–VI стст. уваходзіла ў склад імперыі Сасанідаў, у выніку чаго тут распаўсюдзіліся іранскія формы жылля, арнаменту, адзення і бытавога начыння.*

3. Працягніце сказ:

*Да асаблівасцей армянскіх і грузінскіх храмаў часоў сярэднявечча адносяць ...*

4. Прааналізуйце асаблівасці мастацкай мовы аднаго з сусветна вядомых помнікаў сярэдневечнай архітэктуры Закаўказзя – ансамбля збудаванняў Санаінскага манастыра ў Арменіі (X–XIII стст.).

5. Чаму на працягу XIII–XVIII стст. на Каўказе манументальныя пабудовы не ўзводзіліся?

6. Прывядзіце прыклады розных тыпаў жылля Каўказа, разнастайнасць якіх абумоўлена рэгіянальнымі асаблівасцямі.

# III. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ

## 3.1 КРЫТЭРЫІ АЦЭНЬВАННЯ СТУДЭНТАЎ ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ

Ацэньванне прафесійнай кампетэнтнасці студэнтаў у галіне мастацтва Старажытнага свету і Сярэдніх стагоддзяў ажыццяўляецца падчас навучання. У працэсе навучання ацэньваюцца тэарэтычныя веды ў галіне сусветнай мастацкай культуры (валоданне мастацтвазнаўчай тэрміналогіяй; веданне тэхнік мастацтва; асноўных тэндэнцый развіцця сусветнай мастацкай культуры), практычныя ўменні і навыкі аналізу твораў мастацтва і схематычнага выяўлення элементаў твораў мастацтва. Ацэньванне прафесійнай кампетэнтнасці здзяйсняецца падчас лекцый (пры ўмове дыскусійнага характару правядзення лекцый з выкарыстаннем сучасных педагагічных тэхналогій, як, напрыклад, “разумовы штурм”, “круглы стол” і інш.), на семінарскіх занятках, пры выкананні навукова-даследчых работ. Крытэрыі ацэньвання па 10-бальнай шкале прыведзены ў Табліцы 1.

*Табліца 1*

| **Бал** | **Крытэрыі ацэньвання тэарэтычных ведаў па дысцыпліне** | **Крытэрыі ацэньвання практычных уменняў і навыкаў па дысцыпліне** |
|---|---|---|
| 10 (дзесяць) | Студэнт валодае грунтоўнымі тэарэтычнымі ведамі, што ўключаюць лекцыйны матэрыял і дадатковую інфармацыю, атрыманую ў працэсе самастойнай падрыхтоўкі ў межах ацэньваемага модуля (модуляў, храналагічнага перыяду), умее супастаўляць гістарычныя факты і праводзіць стылявыя і мастацка-вобразныя паралелі; па выніках групавых прамежкавых форм кантроля (тэсты, калёквіўмы, кантрольныя работы) прадэманстраваў высокі % ведаў (90–100%), прымаў актыўны ўдзел у дыскусіях, выступаў з паведамленнямі на пераважнай большасці семінарскіх заняткаў. | Студэнт мае навуковы задзел і праявіў высокія здольнасці да навукова-даследчай работы ў працэсе падрыхтоўкі да семінарскіх заняткаў (падрыхтоўка дакладаў, паведамленняў); у поўнай ступені валодае ўменнямі і навыкамі аналізу твораў мастацтва (у межах вучэбнай дысцыпліны), умее схематычна выявіць элемент твора мастацтва (напрыклад, перспектыўны партал гатычнага сабора, крэсла ў стылі барока і г. д.). |
| 9 (дзевяць) | Студэнт валодае глыбокімі тэарэтычнымі ведамі, што ўключаюць лекцыйны матэрыял і дадатковую інфармацыю, атрыманую ў працэсе самастойнай падрыхтоўкі ў межах ацэньваемага модуля (модуляў, | Студэнт мае навуковы задзел або праявіў высокія здольнасці да навукова-даследчай работы ў працэсе падрыхтоўкі да семінарскіх заняткаў |

| | | |
|---|---|---|
| | храналагічнага перыяду), ужывае метад параўнання са стылявымі і мастацка-вобразнымі прататыпамі, па выніках групавых прамежкавых форм кантроля (тэсты, калёквіўмы, кантрольныя работы) прадэманстраваў дастаткова высокі % ведаў (80–100%), прымаў удзел у дыскусіях, выступаў з паведамленнямі на большасці семінарскіх занятках. | (падрыхтоўка дакладаў, паведамленняў); у дастаткова поўнай ступені валодае ўменнямі і навыкамі аналізу твораў мастацтва (у межах вучэбнай дысцыпліны), умее схематычна выявіць элемент твора мастацтва. |
| 8 (восем) | Студэнт валодае тэарэтычнымі ведамі, што ўключаюць лекцыйны матэрыял і дадатковую інфармацыю, атрыманую ў працэсе самастойнай падрыхтоўкі ў межах ацэньваемага модуля (модуляў, храналагічнага перыяду), але ў яго разважаннях сустракаюцца невялікія недакладнасці, фрагментарна ўжывае метад параўнання са стылявымі і мастацка-вобразнымі прататыпамі, па выніках групавых прамежкавых форм кантроля (тэсты, калёквіўмы, кантрольныя работы) прадэманстраваў дастаткова высокі % ведаў (70–90%), прымаў удзел у дыскусіях, выступаў з паведамленнямі на семінарскіх занятках. | Студэнт праявіў здольнасці да навукова-даследчай работы ў працэсе падрыхтоўкі да семінарскіх заняткаў (падрыхтоўка дакладаў, паведамленняў); у дастаткова поўнай ступені валодае ўменнямі і навыкамі аналізу твораў мастацтва (у межах вучэбнай дысцыпліны), умее схематычна выявіць элемент твора мастацтва. |
| 7 (сем) | Студэнт валодае тэарэтычнымі ведамі, што ўключаюць лекцыйны матэрыял і дадатковую інфармацыю, атрыманую ў працэсе самастойнай падрыхтоўкі ў межах ацэньваемага модуля (модуляў, храналагічнага перыяду), але ў яго разважаннях сустракаюцца невялікія памылкі (у межах храналагічнага перыяду), фрагментарна ўжывае метад параўнання са стылявымі і мастацка-вобразнымі прататыпамі, па выніках групавых прамежкавых форм кантроля (тэсты, калёквіўмы, кантрольныя работы) прадэманстраваў сярэдні % ведаў (60–80%), прымаў удзел у дыскусіях або выступаў з паведамленнямі на семінарскіх занятках. | Студэнт праявіў здольнасці да навукова-даследчай работы ў працэсе падрыхтоўкі да семінарскіх заняткаў (падрыхтоўка дакладаў, паведамленняў); у сярэдняй ступені валодае ўменнямі і навыкамі аналізу твораў мастацтва (у межах вучэбнай дысцыпліны), умее схематычна выявіць элемент твора мастацтва, але не заўсёды дакладна. |

| | | |
|---|---|---|
| 6 (шэсць) | Студэнт валодае тэарэтычнымі ведамі, што ўключаюць лекцыйны матэрыял і дадатковую інфармацыю, атрыманую ў працэсе самастойнай падрыхтоўкі ў межах ацэньваемага модуля (модуляў, храналагічнага перыяду), але ў яго разважаннях сустракаюцца памылкі (у межах храналагічнага перыяду), зрэдку ўжывае метад параўнання са стылявымі і мастацка-вобразнымі прататыпамі, па выніках групавых прамежкавых форм кантроля (тэсты, калёквіўмы, кантрольныя работы) прадэманстраваў сярэдні % ведаў (50–80%), прымаў удзел у дыскусіях або выступаў з паведамленнямі на семінарскіх занятках. | Студэнт праявіў невялікія здольнасці да навукова-даследчай работы ў працэсе падрыхтоўкі да семінарскіх заняткаў (падрыхтоўка дакладаў, паведамленняў); валодае ўменнямі і навыкамі аналізу твораў мастацтва (у межах вучэбнай дысцыпліны), але робіць памылкі, умее схематычна выявіць элемент твора мастацтва, але не заўсёды дакладна. |
| 5 (пяць) | Студэнт валодае тэарэтычнымі ведамі, што ўключаюць лекцыйны матэрыял і дадатковую інфармацыю, атрыманую ў працэсе самастойнай падрыхтоўкі ў межах ацэньваемага модуля (модуляў, храналагічнага перыяду), але ў яго разважаннях сустракаюцца памылкі, не ўжывае метад параўнання са стылявымі і мастацка-вобразнымі прататыпамі, па выніках групавых прамежкавых форм кантроля (тэсты, калёквіўмы, кантрольныя работы) прадэманстраваў невысокі % ведаў (30–60%), зрэдку прымаў удзел у дыскусіях або выступаў з паведамленнямі на семінарскіх занятках. | Студэнт праявіў невысокія здольнасці да навукова-даследчай работы ў працэсе падрыхтоўкі да семінарскіх заняткаў (падрыхтоўка дакладаў, паведамленняў да асобных заняткаў); валодае базавымі ўменнямі і навыкамі аналізу твораў мастацтва (у межах вучэбнай дысцыпліны), але робіць памылкі, недакладна схематычна выяўляе элемент твора мастацтва. |
| 4 (чатыры) | Студэнт валодае тэарэтычнымі ведамі, што ўключаюць лекцыйны матэрыял або дадатковую інфармацыю, атрыманую ў працэсе самастойнай падрыхтоўкі ў межах ацэньваемага модуля (модуляў, храналагічнага перыяду), але ў яго разважаннях сустракаюцца значныя памылкі, не ўжывае метад параўнання са стылявымі і мастацка-вобразнымі прататыпамі, па выніках групавых | Студэнт праявіў невысокія здольнасці да навукова-даследчай работы ў працэсе падрыхтоўкі да семінарскіх заняткаў (падрыхтоўка дакладаў, паведамленняў да адзінкавых заняткаў); валодае базавымі ўменнямі і навыкамі аналізу твораў мастацтва (у межах |

| | | |
|---|---|---|
| | прамежкавых форм кантроля (тэсты, калёквіўмы, кантрольныя работы) прадэманстраваў невысокі % ведаў (20–50%), зрэдку прымаў удзел у дыскусіях або выступаў з паведамленнямі на семінарскіх занятках. | вучэбнай дысцыпліны), але робіць значныя памылкі, недакладна схематычна выяўляе элемент твора мастацтва. |
| 3 (тры) | Студэнт валодае базавымі тэарэтычнымі ведамі, што ўключаюць лекцыйны матэрыял або інфармацыю, атрыманую ў працэсе самастойнай падрыхтоўкі ў межах ацэньваемага модуля (модуляў, храналагічнага перыяду), але ў яго разважаннях прысутнічаюць значныя памылкі, не ўжывае метад параўнання са стылявымі і мастацка-вобразнымі прататыпамі, па выніках групавых прамежкавых форм кантроля (тэсты, калёквіўмы, кантрольныя работы) прадэманстраваў нізкі % ведаў (10–40%), у адзінкавых выпадках прымаў удзел у дыскусіях або выступаў з паведамленнем на семінарскіх занятках. | Студэнт праявіў нізкія здольнасці да навукова-даследчай работы ў працэсе падрыхтоўкі да семінарскіх заняткаў (падрыхтоўка даклада, паведамлення да аднаго з заняткаў); валодае мінімальнымі базавымі ўменнямі і навыкамі аналізу твораў мастацтва (у межах вучэбнай дысцыпліны), але робіць значныя памылкі, недакладна схематычна выяўляе элемент твора мастацтва або не ўмее выявіць схематычна твор мастацтва. |
| 2 (два) | Студэнт валодае фрагментарнымі тэарэтычнымі ведамі, што ўключаюць лекцыйны матэрыял або інфармацыю, атрыманую ў працэсе самастойнай падрыхтоўкі ў межах ацэньваемага модуля (модуляў, храналагічнага перыяду), але ў яго разважаннях прысутнічаюць крытычныя памылкі, не ўжывае метад параўнання са стылявымі і мастацка-вобразнымі прататыпамі, па выніках групавых прамежкавых форм кантроля (тэсты, калёквіўмы, кантрольныя работы) прадэманстраваў нізкі % ведаў (10–20%), прымаў пасіўны ўдзел у дыскусіях і не выступаў з паведамленнем на семінарскіх занятках. | Студэнт не праявіў здольнасцей да навукова-даследчай работы ў працэсе падрыхтоўкі да семінарскіх заняткаў; валодае мінімальнымі базавымі ўменнямі і навыкамі аналізу твораў мастацтва (у межах вучэбнай дысцыпліны), але робіць крытычныя памылкі, не ўмее выявіць схематычна твор мастацтва. |
| 1 (адзін) | Студэнт валодае фрагментарнымі | Студэнт не праявіў |

| | | |
|---|---|---|
| | мінімальнымі тэарэтычнымі ведамі ў межах ацэньваемага модуля (модуляў, храналагічнага перыяду), але большасць яго разважанняў памылковыя, не ўжывае метад параўнання са стылявымі і мастацка-вобразнымі прататыпамі, па выніках групавых прамежкавых форм кантроля (тэсты, калёквіўмы, кантрольныя работы) прадэманстраваў вельмі нізкі % ведаў (да 10%) або не прымаў удзел у прамежкавых формах кантролю, прымаў пасіўны ўдзел у дыскусіях і не выступаў з паведамленнем на семінарскіх занятках. | здольнасцей да навукова-даследчай работы ў працэсе падрыхтоўкі да семінарскіх заняткаў; не валодае базавымі ўменнямі і навыкамі аналізу твораў мастацтва (у межах вучэбнай дысцыпліны), не ўмее выявіць схематычна твор мастацтва. |

## 3.2 КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ (ТЭСТЫ)

**Кантрольныя пытанні 1**

1. У распаўсюджанні арнаменту вялікае значэнне належыць:
а) ганчарству;
б) кераміцы;
в) скульптуры;
г) пляценню;
д) ткацтву.
2. Першабытны чалавек сцены пячор упрыгожваў …
а) карцінамі;
б) фрэскамі;
в) малюнкамі.
3. Пячорныя выявы ў выглядзе графічных узораў абстрактнага характару ...
а) адыгрывалі ролю іканаграфічных знакаў;
б) неслі інфармацыйную нагрузку;
в) выконвалі функцыю ўпрыгажэння.
4. Непадзельнасць матэрыяльнай і духоўнай культуры, паўсядзёнага жыцця і мастацкай творчасці азначае ...
а) сінкрэтызм;
б) абстракцыянізм;
в) класіфікацыю.
5. Першыя спробы жывапісу звязаны з выкарыстаннем …
а) мінеральных фарбаў;
б) вохры;
в) акварэлі;
г) гуашы.

6. Галоўным вобразам у эпоху палеаліту ў скульптуры з’яўляецца ...
а) жанчына-маці;
б) дзіця;
в) расліна;
г) жывёла.
7. У перыяд Мадлен асноўным вобразам мастацтва становіцца вобраз …
а) жывёлы;
б) расліны;
в) жанчыны;
г) мужчыны.
8. Кампазіцыя ў наскальным жывапісе з’яўляецца ў перыяд ...
а) неаліту;
б) палеаліту;
в) мезаліту.
9. У часы неаліту ў арнаментыцы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва адлюстроўваюцца …
а) салярны сімвал;
б) раслінны сімвал;
в) лунарны сімвал;
г) геаметрычны сімвал.
10. Матэрыялам для будавання жылля ў эпоху неаліту служыў:
а) камень;
б) пясок;
в) мармур;
г) метал.
11. Да асноўных тыпаў мегалітычнай архітэктуры адносяць:
а) кромлех;
б) пліту;
в) дальмен;
г) мезаліт;
д) менгір.
12. Вядучым відам мастацкай творчасці ў перыяд Жалезнага веку з’яўляецца:
а) жывапіс;
б) архітэктура;
в) скульптура;
г) дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.
13. Асноўным матывам арнаментыкі ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве ў перыяд Жалезнага веку з’яўляўся …
а) геаметрычны;
б) раслінны;
в) абстрактны;
г) комплексны.
14. Тэрамары ўяўлялі сабой драўляныя зрубы, што запаўняліся …

а) каменем;
б) глінай;
в) пяском;
г) дрэвам.
15. Кромлех утвараў … ў плане збудаванне з велізарных камянёў.
а) квадратнае;
б) прамавугольнае;
в) трохвугольнае;
г) круглае.
16. Дальмен мог складацца з …
а) 3-х камянёў;
б) 6-ці камянёў;
в) 5-ці камянёў;
г) 9-ці камянёў.
17. Мегалітычная архітэктура выкарыстоўвалася для забеспячэння …
а) жыллёвых патрэбаў;
б) грамадскіх патрэбаў;
в) культавых патрэбаў.
18.Самыя вядомыя пячорныя роспісы перыяду палеаліту, захаваныя да нашага часу, знаходзяцца ў …
а) Іспаніі;
б) Германіі;
в) Егіпце;
г) Францыі;
д) Партугаліі.
19. У перыяд палеаліту матэрыялам для вырабу круглай скульптуры служылі:
а) косці жывёл;
б) гіпс;
в) дрэва;
г) мармур;
д) гліна.
20. Каменныя шары цэнтральнаамерыканскай дзяржавы Коста-Рыка выраблялiся з …
а) крэмнію;
б) апсідзіяну;
в) граніту;
г) мармуру.

**Кантрольныя пытанні 2**

1. Аб сувязі мастаб і пірамід Старажытнага Егіпта сведчыць ...
а) піраміда фараона Джосэра;
б) піраміда фараона Хеопса;
в) піраміда фараона Хефрэна;
г) піраміда фараона Мікерына.

2. Якую назву атрымаў замагільны храм фараона Аменемхета III?
а) Лабірынт;
б) Аменемхет;
в) Хатшэпсут.

3. Адным з самых знакамітых архітэктурных збудаванняў у перыяд Сярэдняга царства ў Егіпце з'яўляецца …, які ўяўляе комплекс збудаванняў, у склад якога ўваходзяць скальныя грабніцы, храмавыя двары і залы з манументальнымі каланадамі, размешчанымі на трох вялікіх тэрасах, што паслядоўна ўзвышаюцца. Выбярыце правільны адказ.
а) храм фараона Джосэра;
б) храм фараона Хеопса;
в) храм фараона Ментухатэпа I;
г) храм фараона Хефрэна.

4. У 1922 г. англійскім археолагам Картэрам была адкрыта грабніца фараона ...
а) Тутанхамона;
б) Аменемхета III;
в) Рамсеса II;
г) Тутмоса III.

5. Які горад, пабудаваны Аляксандрам Македонскім у дэльце Ніла ў IV ст. да н. э., стаў буйнейшым гандлёвым і культурным цэнтрам грэка-усходняга свету?
а) Саіс;
б) Фівы;
в) Александрыя;
г) Карнак;
д) Луксор.

6. Рэльеф сцен храмаў Старажытнага Егіпта прысвячаўся шанаванню …
а) прыгажосці жанчыны;
б) магутнасці фараона;
в) велічы Сонца.

7. Калі з'явілася ганчарнае кола ў Старажытным Егіпце?
а) каля 3200 г. да н. э.;
б) у 3000 г. да н. э.;
в) каля 3500 г. да н. э.;
г) у 10 г.

8. Адна з самых старажытных цывілізацый, якая ўзнікла ў IV тыс. да н. э. на тэрыторыі паміж рэкамі Тыгр і Еўфтрат, мае назву ...
а) Індыя;
б) Кітай;
в) Егіпет;
г) Месапатамія.

9. Шматярусная ступеньчатая піраміда культавага прызначэння ў Месапатаміі мае назву ...

а) зікурат;
б) медрэсэ;
в) пагада;
г) мінарэт.

10. Шэду – гэта …
а) вобраз свяшчэннага быка, які знайшоў адлюстраванне як у рэльефах, так і ў круглай скульптуры Асірыі;
б) вобраз крылатага тыгра, які ўзгадваецца ў змесце аднаго са свяшчэнных пісанняў Асірыі;
в) вобраз свяшчэннага дракона, у якім перадаваўся партрэт цара.

11. Каменная мазаіка “штандарты” характэрна для выяўленчага мастацтва …
а) Старажытнага Егіпта;
б) Старажытнай Індыі;
в) Месапатаміі;
г) Старажытнага Кітая.

12. Тып культавай пабудовы ў Старажытнай Індыі ў выглядзе сферычнага купала, але без унутранай прасторы меў назву …
а) ступа;
б) зікурат;
в) чаіцья.

| 7 (семь) | Студент обладает теоретическими знаниями, включающими лекционный материал и дополнительную информацию, полученную в процессе самостоятельной подготовки, но в его размышлениях встречаются небольшие ошибки (в пределах темы), фрагментарно применяет метод сравнения со стилевыми и художественно-образными прототипами, по результатам групповых промежуточных форм контроля (тесты, контрольные работы) продемонстрировал средний процент знаний (60-80%), принимал участие в дискуссиях или выступал с сообщениями на семинарских занятиях. | Студент проявил способности к научно-исследовательской работе в процессе подготовки к семинарским занятиям (подготовка докладов, сообщений); в средней степени обладает умениями и навыками анализа произведений искусства (в пределах учебной дисциплины), умеет схематически изобразить элемент произведения искусства, но не всегда точно. |
| 6 (шесть) | Студент обладает теоретическими знаниями, включающими лекционный материал и дополнительную информацию, полученную в процессе самостоятельной подготовки, но в его размышлениях встречаются ошибки (в пределах хронологического периода), изредка применяет метод сравнения со стилевыми и художественно-образными прототипами, по результатам групповых промежуточных форм контроля (тесты, контрольные работы) продемонстрировал средний процент знаний (50-80%), принимал участие в | Студент проявил небольшие способности к научно-исследовательской работе в процессе подготовки к семинарским занятиям (подготовка докладов, сообщений); обладает умениями и навыками анализа произведений искусства (в пределах учебной дисциплины), но делает ошибки, умеет схематически изобразить |

| | | |
|---|---|---|
| | дискуссиях или выступал с сообщениями на семинарских занятиях. | элемент произведения искусства, но не всегда верно. |
| 5 (пять) | Студент обладает теоретическими знаниями, включающими лекционный материал и дополнительную информацию, полученную в процессе самостоятельной подготовки, но в его размышлениях встречаются ошибки, не применяет метод сравнения со стилевыми и художественно-образными прототипами, по результатам групповых промежуточных форм контроля (тесты, контрольные работы) продемонстрировал невысокий процент знаний (30-60%), изредка принимал участие в дискуссиях или выступал с сообщениями на семинарских занятиях. | Студент проявил невысокие способности к научно-исследовательской работе в процессе подготовки к семинарским занятиям (подготовка докладов, сообщений к отдельным занятиям); обладает базовыми умениями и навыками анализа произведений искусства (в пределах учебной дисциплины), но делает ошибки, неточно схематически изображает элемент произведения искусства. |
| 4 (четыре) | Студент обладает теоретическими знаниями, включающими лекционный материал или дополнительную информацию, полученную в процессе самостоятельной подготовки, но в его размышлениях встречаются значительные ошибки, не применяет метод сравнения со стилевыми и художественно-образными прототипами, по результатам групповых промежуточных форм контроля (тесты, контрольные работы) продемонстрировал невысокий процент знаний (20-50%), изредка принимал участие в дискуссиях или выступал с сообщениями на семинарских занятиях. | Студент проявил невысокие способности к научно-исследовательской работе в процессе подготовки к семинарским занятиям (подготовка докладов, сообщений к единичным занятиям); обладает базовыми умениями и навыками анализа произведений искусства (в пределах учебной дисциплины), но делает значительные ошибки, неточно схематически изображает элемент произведения искусства. |
| 3 (три) | Студент обладает базовыми теоретическими знаниями, включающими лекционный материал или информацию, полученную в процессе самостоятельной подготовки, но в его размышлениях присутствуют значительные ошибки, не применяет | Студент проявил низкие способности к научно-исследовательской работе в процессе подготовки к семинарским занятиям (подготовка доклада, сообщения к одному из |

| | | |
|---|---|---|
| | метод сравнения со стилевыми и художественно-образными прототипами, по результатам групповых промежуточных форм контроля (тесты, контрольные работы) продемонстрировал низкий процент знаний (10-40%), в единичных случаях принимал участие в дискуссиях или выступал с сообщением на семинарских занятиях. | занятий); обладает минимальными базовыми умениями и навыками анализа произведений искусства (в пределах учебной дисциплины), но делает значительные ошибки, неточно схематически изображает или не умеет изобразть элемент произведения искусства. |
| 2 (два) | Студент обладает фрагментарными теоретическими знаниями, включающими лекционный материал или информацию, полученную в процессе самостоятельной подготовки, но в его размышлениях присутствуют критические ошибки, не применяет метод сравнения со стилевыми и художественно-образными прототипами, по результатам групповых промежуточных форм контроля (тесты, контрольные работы) продемонстрировал низкий процент знаний (10-20%), принимал пассивное участие в дискуссиях и не выступал с сообщением на семинарских занятиях. | Студент не проявил способностей к научно-исследовательской работе в процессе подготовки к семинарским занятиям; обладает минимальными базовыми умениями и навыками анализа произведений искусства (в рамках учебной дисциплины), но делает критические ошибки, не умеет изобразить схематично элемент произведения искусства. |
| 1 (один) | Студент обладает фрагментарными минимальными теоретическими знаниями, но большинство его размышлений ошибочны, не применяет метод сравнения со стилевыми и художественно-образными прототипами, по результатам групповых промежуточных форм контроля (тесты, контрольные работы) продемонстрировал крайне низкий процент знаний (до 10%) или не принимал участие в промежуточных формах контроля, принимал пассивное участие в дискуссиях и не выступал с сообщением на семинарских занятиях. | Студент не проявил способностей к научно-исследовательской работе в процессе подготовки к семинарским занятиям; не обладает базовыми умениями и навыками анализа произведений искусства (в рамках учебной дисциплины), не умеет изобразить схематично элемент произведения искусства. |

# ПРОТОКОЛ СОГЛАСОВАНИЯ УЧЕБНОЙ ПРОГРАММЫ УВО

| Название учебной дисциплины, с которой требуется согласование | Название кафедры | Предложения об изменениях в содержании учебной программы учреждения высшего образования по учебной дисциплине | Решение, принятое кафедрой, разработавшей учебную программу кафедрой (с указанием даты и номера протокола) |
|---|---|---|---|
| Введение в мир искусства | Кафедра теории и методики преподавания искусства | При раскрытии содержания тем 2 «Искусство Древних цивилизаций. Древний Египет» и 3 «Искусство Древних цивилизаций. Месопотамия» избегать дублирования учебного материала с темой 14 «Сказочные и мифологические образы в искусстве» учебной дисциплине «Введение в искусство» относительно мифологических образов и сюжетов в искусстве Древнего мира | Протокол № 12 от 20.05.2025 г. |

## 4.3 ГЛАСАРЫЙ

**Абліцоўка** – тэхнічнае ці дэкаратыўнае пакрыцце паверхні элементаў будынкаў ці збудаванняў плітачным ці ліставым матэрыялам.

**Айван** – спецыфічная распрацоўка ўвахода ў араба-мусульманскай архітэктуры, якая выконвае ролю партала.

**Алеі** – рэгулярныя лінейныя насаджэнні дрэў, якія ўтвараюць вузкую прастору, накіраваную на фокус ці дамінанту кампазіцыі.

**Аля прыма** (італ. alla prima – у першы прыём, у адзін прыём) – тэхніка жывапісу “ў адзін сеанс”, якая не прадугледжвае выпраўленняў; аднаслойны жывапіс.

**Ансамбль** (у мастацтве) – група аб’ектаў (выяў, будынкаў), падпарадкаваных адзінай мастацкай задуме, якія гарманіруюць адзін з адным па маштабе, прапарцыях і складаюць арганічнае цэлае.

**Антаблемент** – нясомая частака архітэктурнага ордэра, якая абапіраецца на калоны і складаецца з трох паслядоўна размешчаных частак – архітрава, фрыза і карніза.

**Апсіда** – паўкруглае ці шматграннае ў плане завяршэнне алтарнай часткі хрысціянскага храма.

**Арка** – крывалінейнае перакрыцце праёмаў у сцяне (вокнаў, дзвярэй і інш.) ці пралётаў паміж апорамі, выступ абрысаў якога звернуты ў напрмку, супрацьлеглым дзеянню асноўнай нагрузкі. Выконваецца з жалезабетону, цэглы, каменю, металу, дрэва. Адрозніваюць арку: па форме – *паўцыркульную* (апісаную па паўакружнасці), *кілепадобную* (у выглядзе папярэчнага разрэзу перавернутага судна), *клінковую* (выкладзеную з камянёў клінковай формы ці з прамавугольных камянёў з клінападобнымі швамі, што ствараюць распор), *каробчатую* (у выглядзе дугі, апісанай з трох, пяці ці сямі цэнтраў), *цыбулепадобную* (у форме абрысаў цыбуліны), *падковападобную* (у форме абрысаў падковы), *стральчатую* (складаецца з дзвюх дуг, што перакрыжоўваюцца пад вострым вуглом); па функцыі – *падпружную* (умацоўвае ці падтрымлівае скляпенне), *разгрузачную* (размяркоўвае нагрузку ад верхняй часткі пабудовы на апоры ці ад асобных апор на сценку фундамента); па характары – *несапраўдную* (выкананую шляхам гарызантальнага напуску камянёў без бакавога распору), *падвісную* (складаецца з дзвюх дуг, кропка перакрыжавання якіх знаходзіцца ніжэй за вяршыню аркі), *перспектыўную* (у выглядзе арачнага праёма, які знікае ў глыбіню сцяны некалькімі аркамі, што памяншаюцца па памерах) *трыумфальную*.

**Аркада** – шэраг арак, што абапіраюцца на калоны ці слупы.

**Аркбутан** – вонкавая мураваная паўарка, якая перадае распор скляпення на контрфорс. Ужыванне аркбутанаў і контрфорсаў дае магчымасць палегчыць канструкцыю сцен, паменьшыць сячэнне ўнутраных калон (слупоў), што

дазваляе павялічыць пралёт цэнтральнага нэфа і пашырыць прастору інтэр'ера.

**Арнамент** – выява, якая будуецца на рытмічным чаргаванні і арганізаваным размяшчэнні элементаў дэкаратыўнага ці выяўленчага характару і прызначаецца для ўпрыгожвання.

**Архітраў** (эпістыль) – элемент класічнага архітэктурнага ордэра, ніжняя частка антаблемента ў выглядзе бэлькі, што абапіраецца на калоны, пілоны або слупы і ўспрымае нагрузку ад перакрыцця.

**Асіметрыя** – нелюстэркавае размяшчэнне частак пэўнага цэлага адносна восі, плоскасці або цэнтра; адзін з прынцыпаў фарміравання кампазіцыі і будовы арнаменту, дзякуючы якому мастацкі твор набывае выразнасць. Ужываецца ў будове твораў прасторавых і прасторава-часавых мастацтваў (архітэктуры, выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладного, харэаграфічнага), масавых святочных прадстаўленнях. Мастацкі твор, пабудаваны па прынцыпу асіметрыі, стварае ўражанне парушэння раўнавагі, неўпарадкаванасці, няўстойлівасці, нетрываласці.

**Базіліка** – тып хрысціянскага храма, які ўяўляе прамавугольны ў плане будынак, падзелены ўнутры радамі калон ці слупоў на некалькі частак (звычайна 3 ці 5), цэнтральная з якіх дамінуе над бакавымі.

**Балкон** – агароджаная парэнчамі і абнесеная кратамі ці балюстрадай пляцоўка, што выступае за межы плоскасці сцяны фасада.

**Барабан** – апора купальнага перакрыцця ў форме цыліндра ці прызмы.

**Барэльеф** (франц. bas-relief, літаральна – нізкі рэльеф) – скульптурная выява на плоскасці; від рэльефу, пры якім выява выступае над плоскай паверхняй фону не больш, чым на палову свайго сапраўднага аб'ёма. Ствараецца з дапамогай тэхнік ліцця, чаканкі, разьбы, высякання, лепкі і інш. Ужываецца ў аздабленні вырабаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (рамы алтарных карцін і ікон, аправы абразоў, упрыгожванні, посуд, кафля, медалі, манеты і інш.), манументальна-дэкаратыўнай скульптуры і мемарыяльнай пластыцы. У барэльефах адлюстроўваюцца партрэты, гістарычныя і рэлігійныя сюжэты, геральдычныя, геаметрычныя і раслінныя матывы.

**Баскет** (франц. bosquet) – група густа насаджаных кустарнікаў або дрэў, што ствараюць выгляд "зялёнай сцяны".

**Блок** – каменная пліта вялікіх памераў, створаная са штучных ці прыродных будаўнічых матэрыялаў (бетону, вапны і інш.).

**Валёр** (у жывапісе, франц. valeur) – сістэма адценняў тона, якая выражае тонкія суадносіны колеру і святла.

**Вантавы мост** – мост, у якім канструкцыйная аснова – металічная ферма са стальных тросаў – вантаў.

**Вежа** (старажытнарускае – шацёр, кібітка) – архітэктурнае або інжынернае збудаванне, вышыня якога значна прыўзыходзіць яго гарызантальных памераў (боку аснавання, дыяметру). Па функцыянальным прызначэнні вылучаюць тыпы вежы: *абарончую* (аблогавая як разнавіднасць), *дазорную* (вартавая, каланча), *сігнальную* (маяк, мінарэт, званіца), *гадзіннікавую, воданапорную*, *рэтрансляцыйную* (радыё- і тэлевежа). Існуюць вежы асобна

пастаўленыя і тыя, што ўваходзяць у кампазіцыю будынкаў і збудаванняў. Па форме вылучаюць вежу круглага, авальнага і шматграннага сячэння: “круглік”, “чацвярык”, “васьмярык” і інш.

**Вімана** – індыйскі тып храма ў выглядзе шмат’яруснай пабудовы з элементаў (ярусаў), што паўтараюцца ў паменшаным выглядзе да верху.

**Вітраж** – арнаментальная кампазіцыя са шкла ці іншага матэрыялу, які прапускае святло і выкарыстоўваецца ў дэкаратыўных мэтах. Запаўняе аконныя, радзей дзвярныя праёмы.

**Вольная забудова** – тып забудовы, заснаваны на размяшчэнні будынкаў і іншых аб’ектаў архітэктуры, зыходзячы з прыродна-ландшафтных умоў, у выніку чаго населены пункт не мае рэгулярнай ці радыяльнай сістэмы планіроўкі.

**Галерэя** – паўадкрытае памяшканне, даўжыня якога значна пераважае над шырынёй.

**Гірлянда** (у архітэктуры) – від пластычнага і жывапіснага арнаменту расліннага характару ў выглядзе сплеценых стылізаваных кветак і зеляніны, часцей у форме выгнутай уніз дугі з двума сіметрычнымі вісячымі рэштамі. Выкарыстоўваецца ў афармленні фасадаў, аздабленні фрызаў пабудоў у архітэктуры барока, класіцызму, неакласіцызму. Мае сімвалічнае значэнне, пафасны характар; адлюстроўвае імкненне да праслаўлення краіны, гераізму, подзвігаў, перамогі.

**Гравюра** (франц. gravure) – від графікі, у якім выява з’яўляецца друкаваным адбіткам рэльефнага малюнку, што нанесены на дошку гравёрам, ці самі адбіткі.

**Дагератып** – прататып фатаграфіі, у якім асноўным святлоадчувальным рэчывам служыць іадзід серабра. Вынайдзены ў 1839 г. Луі Жакам Дагерам (сапраўднае прозвішча Мандэ, 1787–1851) як вынік спосаб фіксацыі выявы на металічнай пласціне.

**Дальмен** – старажытнае збудаванне ў выглядзе каменнай скрыні, накрытай плоскім каменем.

**Дрэварыт** (ксілаграфія, ад грэч. xylon – зрубленае дрэва і grapho – пішу) – гравюра на дрэве.

**Дэкаратыўны** – той, што ўпрыгожвае, аздабляе.

**Дэкараваць** – надаваць прыгожы выгляд знешнім аздабленнем, упрыгажэннем.

**Дэколь** (англ. decal) – тэхніка аздаблення шкляных і керамічных вырабаў шляхам пераносу выявы са спецыяльнай папяровай асновы з наступным абпальваннем. На паперу выява наносіцца спосабам шаўкаграфіі або афсетнага друку.

**Дэкор** – сістэма дэкаратыўных элементаў (упрыгажэнняў).

**Дэталь** (у архітэктуры) – частка збудавання, асобны элемент.

**Закамара** – паўкруглае ці кілепадобнае завяршэнне часткі сцяны праваслаўнага храма, якое адпавядае форме ўнутранага скляпення.

**Замковы камень** – клінчаты камень (цэгла) на версе скляпення або аркі.

**Збудаванне** – узведзены архітэктурны ці інжынерны аб'ект або будова без функцыянальнай унутранай прасторы, якая мае спецыялізаванае прызначэнне (мост, плаціна і да т.п.).

**Званіца** – збудаванне пры храме з праёмамі для званоў, пастаўленае асобна ці над сцяной будынка.

**Зікурат** – культавая пабудова ў Месапатаміі ў выглядзе прыступкавай піраміды з няцотнай колькасцю ярусаў ад трох да сямі, якія выкладваліся з сырцовай цэглы, абліцоўваліся абпаленай цэглай, пакладзенай на бітуме.

**Зубцы** – завяршэнне сцен старажытных ці сярэдневечных крапасных пабудоў, гарадскіх ратуш, феадальных палацаў, асобных вежаў у выглядзе прамавугольных выступаў.

**Інкрустацыя** – тэхніка дэкаравання мастацкіх вырабаў кавалкамі мармуру, металу, керамікі, дрэва, перламутру і іншымі, якія ўрэзваюцца ў паверхню і адрозніваюцца ад яе матэрыялам і (або) колерам. Распаўсюджаны інкрустацыі дрэвам па дрэве (інтарсія) і металам па металу (насечка).

**Інтэр'ер** – унутраная прастора пабудовы, памяшканне.

**Ірыгацыя** – арашэнне, комплекс будаўнічых прац па водазабеспячэнню.

**Каланада** – шэраг калон, размешчаных па прамой ці крывой лініі, што падтрымліваюць антаблемент.

**Каларыт** – сістэма суадносінаў колераў, якая служыць для раскрыцця мастацкага вобраза.

**Каліграфія** – мастацтва прыгожага і дакладнага пісьма.

**Калона** – вертыкальны апорны элемент канструкцыі пабудоў, аформлены ў адпаведнасці з пэўным архітэктурна-мастацкім стылем; вертыкальны элемент ордэра.

**Кананічны** – прыняты за ўзор, заснаваны на каноне.

**Кансоль** – гарызантальны канструкцыйны элемент, што служыць для апоры ці падвешвання пэўнай дэталі.

**Канструкцыя** – структурная аснова частак будынкаў і збудаванняў, якая забяспечвае іх цэласнасць і трываласць.

**Капітэль** – верхняя арнаментаваная частка калоны.

**Караван-сарай** – у араба-мусульманскай архітэктуры – пастаялы двор на гандлёвых шляхах.

**Каркас** – касцяк канструкцыі будынка, што складаецца са стрыжняў (стоек і бэлек).

**Карніз** – верхняя частка антаблемента; канструкцыя ў верхняй частцы вонкавай сцяны будынка, якая выступае і служыць для падтрымання навесі даху.

**Квадрыга** (лац. quadriga) – пластычная выява (скульптура) чацвёркі коней у вупражы.

**Кесоны** – невялікія прамавугольныя паглыбленні на паверхні столі ці скляпення.

**Кладка** – працэс узвядзення масіву, а таксама сам масіў, які ўтвараецца з выкладзеных у пэўным парадку натуральных ці штучных камянёў, звычайна звязаных паміж сабой росчынам.

**Контрфорс** – вертыкальны асобна пастаўлены элемент канструкцыі ў выглядзе пілона або выступ сцяны, які супрацьдзейнічае распору.

**Крыжова-купальны храм** – тып хрысціянскага (праваслаўнага) храма, у аснову планіровачнай структуры якога пакладзена форма грэчаскага крыжа.

**Купал** – аб’ёмна-прасторавая канструкцыя дваістай крывізны, якая служыць для перакрыцця вялізнага памяшкання.

**Ландшафт** – канкрэтная тэрыторыя, аднародная па свайму паходжанню і развіццю, якая валодае адзіным геалагічным фундаментам, аднатыпным рэльефам.

**Лапатка** – вертыкальны, плоскі і вузкі выступ у сцяне, які нагадвае пілястр, але без капітэлі і базы.

**Літаграфія** (ад грэч. litos – камень і grapho – пішу) – гравюра на камяні.

**Ліштва** – дэкаратыўнае абрамленне акна ці дзвярэй.

**Лоджыя** – частка будынка ці асобная пабудова, унутраная прастора якой адкрыта з аднаго боку.

**Лубок** – від графікі, у якім малюнак выконваецца ў форме літаграфіі, ксілаграфіі, гравюры на медзі або на асобным лісце, і суправаджаецца тэкстам. Назва паходзіць ад ліпавага дубу, на якім стваралі малюнкі народныя майстры. Для лубочнага малюнку характэрна выкарыстанне прыёма стылізацыі, ужыванне яркіх лакальных колераў.

**Люкарня** – акно круглай формы ў гары.

**Маёліка** – тэхніка керамічных вырабаў з каляровай абпаленай гліны з буйным порыстым чарапком, пакрытым глазур’ю.

**Мазаіка** – адзін з відаў манументальнага жывапісу, заснаваны на стварэнні кампазіцыі з рознакаляровых цвёрдых рэчываў – смальты, натуральных каляровых камянёў, каляровых эмаляў і інш.

**Малыя формы архітэктуры** – элементы добраўпарадкавання тэрыторыі, узведзеныя з мэтай стварэння эстэтычна арганізаванай і ўтульнай атмасферы (лаўкі, фантаны, агароджы, ліхтары і інш.).

**Манументальна-дэкаратыўнае мастацтва** – від дэкаратыўнага мастацтва, звязанага з архітэктурай (архітэктурны дэкор, роспісы, дэкаратыўныя рэльефы, статуі, вітражы, фрэскі і мазаікі на фасадах і ў інтэр’ерах, фантаны, паркавая скульптура і г. д.).

**Маркетры** (франц. marqueterie) – разнавіднасць мазаікі, у якой асновай служаць розныя па колеры і фактуры фігурныя пласцінкі з фанеры, што набіраюцца або наклейваюцца на драўляную аснову (мэблю, пано).

**Марына** (франц. marine, ад лац. marinus – марскі) – пейзаж з выявай мора.

**Мастацкая выразнасць** – характарыстыка мастацкай формы; дасягаецца пры выкарыстанні і ўзаемадзеянні спецыфічных сродкаў, уласцівых пэўнаму віду мастацтва, і замацоўваецца індывідуальна ў кожным канкрэтным творы.

**Мастацкая задума** – вызначэнне наперад будучага мастацкага твора, яго з’яўленне ў свядомасці аўтара. Можа быць рэалізавана дакладна або са зменамі, якія ўзнікаюць на ступені праектавання (мадэліравання) па аб’ектыўных прычынах.

**Мастацкая ідэя** – асноўная думка мастацкага твора, якая выяўляецца ўсёй мастацкай структурай твора, адзінствам і ўзаемадзеяннем элементаў зместу і формы і з’яўляецца адным з асноўных кампанентаў, што фарміруюць мастацкі вобраз.

**Мастацкі вобраз** – эстэтычная характарыстыка мастацтва, характэрны для мастацтва спосаб і вынік пераўтварэння разнастайных з’яў рэчаіснасці з дапамогай спецыфічных сродкаў выразнасці, увасоблены ў творы. Мастацкі вобраз мадэліруе, паўтарае і пераўтварае асобныя жыццёвыя з’явы, выяўляе істотнае, праяўляе закладзеныя ў ім эстэтычныя магчымасці і адлюстроўвае культурны змест эпохі.

**Маўзалей** – манументальнае пахавальнае збудаванне. Назва паходзіць ад збудавання ўсыпальніцы цара Маўсола ў Галікарнае (IV ст. да н. э.).

**Медрэсэ** – у араба-мусульманскай архітэктуры – рэлігійна-вучэбны цэнтр.

**Мінарэт** – у араба-мусульманскай архітэктуры – культавая вежа пры мячэці, з якой у адпаведныя часы заклікаюць вернікаў на малітву.

**Мініяцюра** – твор жывапісу невялікіх памераў, які адрозніваецца тонкай манерай нанясення фарбаў.

**Міхраб** – свяшчэнная ніша араба-мусульманскіх культавых пабудоў, звернутая да галоўнага рэлігійнага цэнтра – Мекі. Выконвае ролю алтара.

**Мячэць** – асноўны тып культавага збудавання араба-мусульманскай архітэктуры.

**Нэф** (неф) – унутраная прастора ў хрысціянскіх храмах, абмежаваная падоўжанымі радамі калон, арак ці слупоў.

**Ніша** – дэкаратыўнае паглыбленне ў сцяне, якое звычайна выкарыстоўвецца для размяшчэння статуй, бюстаў, ваз і г. д.

**Ордэр** архітэктурны (ад лац. ordo – парадак, будова) – адзін з відаў архітэктурнай кампазіцыі; спалучэнне нясучых і нясомых частак, якое вобразна выражае работу стоечна-бэлечнай канструкцыі. Структура класічнага ордэра ўключае часткі: *нясучыя* – базу (у дарычным ордэры можа адсутнічаць), калону (паўкалону, пілястру) з канелюрамі (падоўжанымі жалабкамі) або без іх, капітэль (верхнюю па-мастацку аформленую частку); *нясомыя* – архітраў, фрыз, карніз, якія складаюць разам антаблемент.

**Пагада** – будыйскае культавае збудаванне ў выглядзе павільёна ці вежы.

**Пандус** (ад франц. pente douce – палогі склон) – нахіленая пляцоўка (альтэрнатыва лесвіцы).

**Пано** – буйны ўчастак паверхні сцяны ці столі, запоўнены жывапісам ці мазаічнай выявай.

**Парапет** – невысокая сценка, якая ўжываецца для агароджвання даху, тэрасы, пляцовак.

**Паркі** – добраўпарадкаваныя ландшафтныя тэрыторыі, прызначаныя для адпачынку, з багатым складам дрэў, кустарнікаў, дэкаратыўных кампазіцый, архітэктурай малых форм.

**Парсуна** (скожанае ад “персона”) – партрэтная характарыстыка персанажу ў рускім жывапісе канца XVI–XVII стст.

**Партал** – выразна аформлены ўваход у будынак.

**Партал перспектыўны** – адзін з відаў партала ў выглядзе некалькіх уступаў у глыбіню сцяны, якія памяншаюцца па памерах.

**Партэр** (франц. parterre – кветнік) – адкрытая прастора парку з зялёнымі насаджэннямі, вадаёмамі, часта ўпрыгожаная скульптурай.

**Парус** – канструкцыя ў форме прасторавага трохкутніка, якая стварае пераход ад падкупальных арак да аснавання купала.

**Пастозныя мазкі** (ад італ. pastoso – цестападобны) – шчыльныя, няроўныя рэльефныя мазкі.

**Паўкалона** – калона, якая выступае ў сцяне па ўсёй сваёй вышыні на палову дыяметра.

**Перакрыцце** – гарызантальныя канструкцыйныя элементы, якія падзяляюць збудаванне на паверхі.

**Перамычка** – канструкцыя, якая служыць для перакрыцця зверху аконнага ці дзвярнога праёма.

**Перспектыва** (мастацкая) – сістэма выявы прадметнага свету на плоскасці ў адпаведнасці са зрокавым успрыманнем чалавека.

**Перыпцер** – прамавугольны ў плане храм, акружаны па перыметры радамі калон. Узнік у Старажытнай Грэцыі.

**Пілон** – буйны масіўны слуп ці аснова, пераважна прамавугольнага папярэчнага сячэння.

**Пілястра** – плоскі вертыкальны выступ у сцяне, дэкаратыўна апрацаваны ў формах калоны ордэра.

**Пластычнасць** – гарманічная выразнасць лепкі аб’ёмнай формы.

**Платформа** – шырокі плоскі масіў, які служыць у якасці аснавання манументальных будынкаў, а таксама архітэктурны аб’ём плоскай шырокай формы, на якім размяшчаюцца асноўныя аб’ёмы будынка.

**Пленэр** (франц. plein air – адкрытае паветра) – тэхніка жывапісу, заснаваная на ўзнаўленні з натуры прыроднага асвятлення і паветранага асяроддзя.

**Пліта** – дэталь канструкцыі плоскай формы, якая разлічана на ўспрыманне нагрузак, накіраваных перпендыкулярна ці пад вуглом да яе паверхні.

**Полачка** (у архітэктуры) – профіль у выглядзе вузкага прамавугольнага выступа, размешчанага гарызантальна.

**Порцік** – адкрытая галерэя, утвораная калонамі, што нясуць перакрыцце, якая выступае за лінію фасада будынка.

**Праём** – адтуліна ў сцяне, перагародцы, пакрыцці, перакрыцці, якая служыць для асвятлення, вентыляцыі, пропуску людзей ці грузаў.

**Пралёт** – частка ўнутранай прасторы будынка, абмежаваная двума суседнімі падоўжанымі радамі калон, а таксама адлегласць паміж сумежнымі апорамі нясучай канструкцыі перакрыцця.

**Прапорцыя** – суразмернасць частак мастацкага твора, адпаведнасць адна адной пры пэўных суадносінах з агульным.

**Прасценак** – частка сцяны паміж размешчанымі побач праёмамі.

**Профіль** – працяглая дэталь на паверхні сцяны, якая выступае за яе лінію.

**Рабат** – у араба-мусульманскай архітэктуры – умацаваны пункт для размяшчэння вайсковых атрадаў на дарогах і каля межаў.

**Рустоўка** – дэкаратыўная апрацоўка тынкоўкай паверхні сцяны, якая імітуе кладку з буйных камянёў.

**Рызаліт** – частка будынка, якая выступае за асноўную лінію фасада.

**Рытм** – паслядоўнасць чаргавання кампазіцыйных элементаў у архітэктуры.

**Рэльеф** (у мастацтве) – выява, размешчаная на плоскасці фону.

**Рэтабло** (ісп. retablo) – алтарная кампазіцыя вялікіх памераў, заснаваная на мастацтве жывапісу і скульптуры. Ужывалася ў аздабленні іспанскіх і лацінаамерыканскіх храмаў у XV–XVIII стст.

**Рэфлекс** (лац. reflexus – адлюстраваны) – прыём у жывапісе, заснаваны на выяўленні ўзаемадзеяння па-рознаму афарбаваных у ценю і на святле прадметаў.

**Сандрык** – дэкаратыўная дэталь над аконным ці дзвярным праёмам у выглядзе карніза ці франтона.

**Сілуэт** – абрыс прадмета, аб’екта.

**Сіметрыя** – адна з форм будовы гарманічнай ураўнаважанай кампазіцыі з уласцівай суразмернасцю.

**Скляпенне** – нясучая канструкцыя перакрыцця, якая мае ніжнюю паверхню адзінкавай крывізны.

**Станковае мастацтва** – від выяўленчага мастацтва (па характары), творы якога маюць самастойнае значэнне (карціна, бюст і г. д.).

**Стойка** – вертыкальны элемент каркаса.

**Страпіла** – сістэма нясучых элементаў схіленага даху.

**Ступа** – будыйскае культавае збудаванне сферычнай формы без унутранай прасторы з надбудовай зверху для захавання рэліквій.

**Стылізацыя** – імкненне да адлюстравання характару ўзаемазвязанасці элементаў і форм, уласцівых гістарычным традыцыям, стылям мінулых эпох. Для стылізацыі характэрна захаванне і ў той жа час трансфармаванне агульнага ўзору з ужываннем форм мінулага ў новым кантэксце.

**Стыль** – агульнасць вобразнай сістэмы, сродкаў мастацкай выразнасці, творчых прыёмаў, абумоўленая адзінствам мастацкага зместу.

**Субурганы** – мангольскія скарбніцы бутэлепадобнай формы са шпілем, узведзеныя на п’едэстале. Правобразам былі індыйскія ступы.

**Тонда** (італ. tondo) – круглая па форме жывапісная або рэльефная кампазіцыя.

**Трансэпт** – папярэчны неф.

**Тэмпера** – тэхніка манументальнага жывапісу па сухой тынкоўцы фарбамі, аснову якіх складае эмульсія – натуральная (суцэльнае яйка, жаўток, сокі раслін) або штучная (водны раствор клею з алеем).

**Тэракота** – неглазураваная кераміка з порыстым чарапком.

**Тэраса** – гарызантальная пляцоўка, уступ на схіле рэльефу мясцовасці, а таксама адкрытая ці пад навесам пляцоўка, прыбудаваная да будынка.

**Фактура** – характар апрацоўкі паверхні.

**Фасад** – адзін з бакоў будынка, а таксама чарцёж франтальнай праекцыі аб’екта.

**Фахверк** – плоскі каркас сцяны, які складаецца з драўляных, металічных ці жалезабетонных лінейных элементаў, прамежкі паміж якімі запаўняюцца малатрывалым матэрыялам.

**Філёнга** – невялікі ўчастак сцяны, дзверы ці пілястры, абмежаваны рамкай.

**Фланкіраваць** – размяшчацца па баках, вуглах.

**Філёнга** – невялікі ўчастак сцяны, дзверы ці пілястры, абмежаваны рамкай.

**Філігрань** (скань) – ажурны ці напаяны на металічны фон узор з тонкага залатога ці срэбранага дроціка, гладкага ці звітага ў вяроўку.

**Франтон** – архітэктурная форма ў выглядзе трохвугольніка, абмежаваная двума схіламі даху.

**Фрыз** – сярэдняя частка антаблемента, размешчаная паміж архітравам і карнізам, а таксама дэкаратыўная паласа, часта з рэльефнай выявай, якая ўпрыгожвае сцяну.

**Фрэска** – тэхніка манументальнага жывапісу воднымі фарбамі па сырой тынкоўцы.

**Фундамент** – ніжняя апорная частка збудавання, схаваная пад зямлёй.

**Царква** – праваслаўны храм.

**Цокаль** – ніжняя частка сцяны ад верха фундамента да ўзроўню падлогі першага паверха ці ніжняя частка збудавання, размешчаная непасрэдна на фундаменце.

**Цяга** – прафіляваная дэкаратыўная паласа на атынкаванай паверхні ў выглядзе выступу.

**Чаіцья** (чайцья) – будыйскі пячорны храм-малельня.

**Шатровы дах** – пірамідальны ці канічны дах на пабудове квадратнай, шматвугольнай ці круглай у плане формы.

**Шпіль** – вертыкальная ігла, якая вянчае дах.

**Шыкхара** – індыйскі тып храма пластычных абрысаў.

**Экстэр'ер** – знешняе аблічча будынка.

**Элемент будынка ці збудавання** – архітэктурна-планіровачная, аб'ёмна-планіровачная ці канструкцыйная частка будынка ці збудавання (фундамент, калона, сцяна, перакрыцце, лесвіца, перагародка, дзверы, вокны і інш.).

**Эмаль** (старажытнарускае фініфць) – тэхніка, якая ўжываецца ў ювелірным мастацтве. Эмаль уяўляе сабой легкаплаўкае шкло, якое ўтварае пасля абпальвання на паверхні прадмета тонкую празрыстую ці непразрыстую, безкаляровую ці каляровую плёнку. Адрозніваюць эмаль: *выемістую* (запаўняе паглыбленні ў метале); *перагародчатую* (запаўняе прамежкі паміж металічнымі стужачкамі, напаянымі рэбрам на паверхню металу); *празрыстую* (з прасвечваннем скрозь слой эмалі, упрыгожанай рэльефам ці гравіроўкай паверхні металу); *распісную* (жывапіс каляровай эмаллю, а таксама вогнеўстойлівымі фарбамі па эмалевай паверхні).

**Эркер** – частка ўнутранага аб'ёму будынка, вынесеная за межы яго вонкавых сцен, якая выступае на фасадзе ў выглядзе закрытага балкона.

**Юрта-гэр** – мангольскі тып жылля пераноснага тыпу.

**Ярус** – адзін рад над другім (балконаў, лоджый, паверхаў і г. д.).

## 4.4 СПІС РЭКАМЕНДАВАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

***Асноўная літаратура:***

1. Захарына, Ю.Ю. Сусветная мастацкая культура: вучэб.-метад. дапам. У 2 ч. Ч. 1. Ад вытокаў да Сярэднявечча / Ю.Ю. Захарына, С.М. Зелянеўская. – Мінск: БДПУ, 2011. – 228 с.
2. Лебедев, С. Ю. Мировая художественная культура : учеб. пособие / С. Ю. Лебедев. – Минск : Дизайн ПРО, 2006. – 368 с.
3. Сусветная мастацкая культура : электрон. вучэб.-метад. комплекс для спецыяльнасці 1-03 01 08 «Музычнае мастацтва і сусветная мастацкая культура» / склад. Ю. Ю. Захарына // Репозиторий БГПУ. – URL: http://elib.bspu.by/handle/doc/44618 (дата обращения: 15.05.2025).
4. Хромченко, Д. Н. История мировой культуры : пособие для студентов инженер. специальностей учреждений высш. образования / Д. Н. Хромченко ; Белорус. нац. техн. ун-т, Каф. «История, мировая и отечественная культура». – Минск : БНТУ, 2018. – 186 с.

***Дадатковая:***

5. Александров, В. Н. История русского искусства / В. Н. Александров. – Минск : Харвест, 2007. – 736 с.
6. Глушаков, И. В. Мировая художественная культура : пособие / И. В. Глушаков. – Минск : Новое знание, 2003. – 287 с.
7. Гнедич, П. П. История искусств. Живопись. Скульптура. Архитектура / П. П. Гнедич. – М. : Эксмо, 2009. – 848 с.
8. Гомбрих, Э. История искусства / Э. Гомбрих. – 16-е изд., пересмотр. и доп. – М. : Издательство АСТ, 1998. – 688 с.
9. Дмитриева, Н. А. Краткая история искусств / Н. А. Дмитриева. – М. : АСТ-Пресс : Галарт, 2006. – 623 с.
10. Захарина, Ю. Ю. История всемирного и белорусского искусства : учеб. пособие / Ю. Ю. Захарина, С. И. Колбышева, М. А. Шатарова. – Минск : Респ. ин-т проф. образования, 2021. – 463 с.
11. Захарына, Ю. Ю. Мастацтва краін Усходу: ад вытокаў да пачатку XX ст. : вучэб.-метад. дапам. – Мінск : БДПУ, 2006. – 90 с.
12. Искусство (отечественная и мировая художественная культура) : 7 кл. : рабочая тетр. : пособие для учащихся учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / С. И. Колбышева, Н. С. Волонцевич, Е. С. Бохан [и др.]. – Минск : Аверсэв, 2017. – 123 с.
13. Искусство (отечественная и мировая художественная культура) : план-конспект уроков : 7 кл. / О. Г. Пищик, Е. В. Михайловская, Ю. Ю. Захарина, С. И. Колбышева. – Минск : Аверсэв, 2018. – 283 с.
14. Искусство (отечественная и мировая художественная культура) : учеб. пособие для 7-го кл. учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения : (с электронным приложением) / Н. С. Волонцевич, С. И. Колбышева, М. Л. Карпенкова, Ю. Ю. Захарина, И. Г. Томашева, Е. С. Бохан, Е. Ф. Шунейко, А. Г. Шимелевич. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2017. – 192 с. : ил. + 1 электрон. опт. диск.

15. Лазука, Б. А. Гісторыя мастацтваў : вучэб. дапам. / Б. А. Лазука. – 2-е выд., дапрац. – Мінск : Беларусь, 2003. – 399 с.
16. Сокольникова, Н. М. История изобразительного искусства. В 2-х т. / Н. М. Сокольникова ; 2-е изд., стер. – М. : Академия, 2007. – Т.1. – 304 с.
17. Сокольникова, Н. М. История изобразительного искусства. В 2-х т. / Н. М. Сокольникова ; 2-е изд., стер. – М. : Академия, 2007. – Т.2. – 208 с.
18. Энциклопедия для детей. Т. 7. Искусство. Ч. 1. / Гл. ред. М. Д. Аксёнова. – 2-е изд., испр. – М. : Аванта+, 1998. – 688 с.
19. Энциклопедия для детей. Т. 7. Искусство. Ч. 2. Архитектура, изобразительное и декоративно-прикладное искусство XVII–XX веков / Ред. кол. : М. Аксёнова, Н. Майсурян [и др.]. – М. : Аванта+, 2005. – 656 с.
20. http://www.bibliotekar.ru
21. http://www.hermitagemuseum.org
22. http://www.metmuseum.org
23. http://www.dresdenart.ru

## 4.5 СПІС ІЛЮСТРАЦЫЙ ДЛЯ ПАДРЫХТОЎКІ ДА КАЛЁКВІЎМАЎ

1. Бізон. Наскальны жывапіс. Палеаліт. Пячора Альтаміра. Іспанія.
2. Конь. Наскальны жывапіс. Палеаліт. Пячора Ляско. Францыя.
3. Пасудзіна ў выглядзе галавы чалавека. Мастацтва інкаў. Перу. 250–550 гг.
4. “Венера Вілендорфская”. Палеаліт. Аўстрыя. Музей Гісторыі. Вена.
5. Стоунхэндж. ІІ тыс. да н. э. Солсберы. Англія.
6. Піраміды ў Гізе. ХХVІІ ст. да н. э. Старажытнае царства. Старажытны Егіпет.
7. Сфінкс Хефрэна. ХХVІІ ст. да н. э. Гіза. Старажытнае царства. Старажытны Егіпет.
8. Храм царыцы Хатшэпсут. Пачатак ХV ст. да н. э. Дэйр эль-Бахры. Новае царства. Старажытны Егіпет.
9. Рэльеф храма царыцы Хатшэпсут. Пачатак ХV ст. да н. э. Дэйр эль-Бахры. Новае царства. Старажытны Егіпет.
10. Алея барашкаў. Храм Амона ў Луксоры. ХV ст. да н. э. Новае царства. Старажытны Егіпет.
11. Храм Амона ў Луксоры. ХV ст. да н. э. Новае царства. Старажытны Егіпет.
12. Роспіс грабніцы Хнумхатэпа ў Бэні-Гасані. ХХ ст. да н. э. Сярэдняе царства. Старажытны Егіпет.
13. “Аменхатэп ІV (Эхнатон)”. Рэльеф на вапне. ХІV ст. да н. э. Новае царства. Старажытны Егіпет. Берлін. Егіпецкі музей.
14. “Тутанхамон з жонкай”. Дэталь спінкі трона з грабніцы Тутанхамона. ХІV ст. да н. э. Новае царства. Старажытны Егіпет. Каір. Егіпецкі музей.
15. “Егіпецкі сад”. Роспіс грабніцы ў Фівах. ХV ст. да н. э. Новае царства. Старажытны Егіпет.
16. “Фараон Рахатэп і княжна Нафрэт”. Першая палова ІІІ тыс. да. н. э. Старажытны перыяд. Копія скульптурнай групы. Музей у Хургадзе.
17. Рэльеф храма ў Луксоры. ХV ст. да н. э. Новае царства. Старажытны Егіпет.
18. Крэсла з грабніцы Тутанхамона ў Фівах. ХІV ст. да н. э. Новае царства. Старажытны Егіпет.
19. Палац асірыйскага цара Саргона ІІ у Хорсабадзе. Галоўны ўваход. Месапатамія. VІІІ ст. да н. э. Рэканструкцыя.
20. Зікурат у Вавілоне. Месапатамія. VІІ–VІ стст. да н. э. Рэканструкцыя.
21. Бык шэду з палаца цара Саргона ІІ у Дур-Шарукіне. VІІІ ст. да н. э. Асірыйскі рэльеф. Луўр. Парыж.
22. Ступа ў г. Санчы. Індыя. ІІІ ст. да н. э.
23. Чаіцья ў Індыі. ХІ ст. Інтэр’ер.
24. Керамічная мадэль традыцыйнага старажытнакітайскага жылля. І–ІІ стст.
25. Будыйскі культавы комплекс у г. Нара. Японія. VІІ ст.
26. Грабніца цара Кіра. Старажытны Іран. VІ ст. да н. э.
27. Калоны. Персеполь. Старажытны Іран. 540–460 гг. да н. э.

28. Керамічная ваза. Грабенчатая тэхніка. 4000 г. да н. э. Старажытная Карэя. Сеул. Брытанскі музей. Лондан.
28.1.Керамічная ваза. Эпоха неаліта. Карэя. Сеул. Карэйскі нацыянальны музей.
29. Скульптурны партрэт паўкаводца Кюль-Цэгіна. Старажытная Манголія.
30. Храм майя у Чычэн-Іцэ. Юкатан. Мексіка.
31. Традыцыйная афрыканская скульптура. Луўр. Парыж.
32. Традыцыйная афрыканская маска. Луўр. Парыж.
33. Ільвіныя вароты. Сярэдзіна II тыс. да н. э. Мікены.
34. Крыцкая ваза. 1800 г. да н. э.
35. “Курас”. Грэчаская статуя. Архаіка. VII–VI стст. да н. э. Дэльфы. Археалагічны музей.
36. “Кора”. Грэчаская статуя. Архаіка. VII–VI стст. да н. э. Дэльфы. Археалагічны музей.
37. Храм Парфенон. Арх. Ікцін і Калікрат. Афінскі акропаль. Класіка. V ст. да н. э. Грэцыя.
38. Храм Эрэхтэён. Афінскі акропаль. Класіка. V ст. да н. э. Грэцыя.
39. “Дэльфійскі вазнічый”. Каля 475 г. да н. э. Ранняя класіка. Старажытная Грэцыя. Дэльфы. Археалагічны музей.
40. Міран. “Дыскабол”. V ст. да н. э. Высокая класіка. Старажытная Грэцыя. Рымская копія бронзавай статуі. Нацыянальны музей. Рым.
41. Паліклет. “Дарыфор-коп’яносец”. Высокая класіка. Старажытная Грэцыя. Дзяржаўны музей выяўленчых мастацтваў імя А.С. Пушкіна. Масква.
42. Праксіцель. “Гермес з немаўляткам Дыёнісам”. Каля 340 г. да н. э. Позняя класіка. Старажытная Грэцыя. Алімпія. Археалагічны музей. Грэцыя.
43. Леахар. “Апалон Бельведэрскі”. IV ст. да н. э. Позняя класіка. Старажытная Грэцыя. Рымская копія. Музей Ватыкана. Рым.
44. Агесандр, Палідор, Афінадор. “Лаакаон”. I ст. да н. э. Элінізм. Старажытная Грэцыя. Рымская копія. Музей Ватыкана. Рым.
45. “Венера Мілоская”. II ст. да. н. э. Элінізм. Старажытная Грэцыя. Луўр. Парыж.
46. Алтар Зеўса ў Пергаме. II ст. да н. э. Элінізм. Старажытная Грэцыя. Музей антычнага мастацтва. Берлін.
47. Эксекій. “Ахіл і Аякс за гульнёй у шашкі”. Чорнафігурная тэхніка. Грэцыя. Каля 540 г. да н. э. Ватыкан. Этрускі музей.
48. Эўтымід. “Падрыхтоўка воіна”. Чырвонафігурная тэхніка. Грэцыя. Каля 510–500 гг. да н. э. Мюнхен. Дзяржаўны збор антычнага мастацтва і гліптатэка.
49. Еўфроній. Педіка з ластаўкай. Чырвонафігурная тэхніка. Грэцыя. Канец VI – пачатак V ст. да н. э. Дзяржаўны музей Эрмітаж. Санкт-Пецярбург.
50. Амфітэатр Калізей. I ст. Рым.
51. Трыумфальная арка імператара Канстанціна. 315 г. Рым.
52. Калона Траяна. Каля 114 г. Рым.

53. Мужчынскі партрэт з Фаюма. Каля 100 г. Старажытны Рым. Брытанскі музей. Лондан.
54. "Дзівоснае насычэнне пяццю хлябамі і дзвюма рыбамі". Мазаіка базіліка Сан Апалінарэ Нуова ў г. Равэна. Каля 520 г. Візантыя.
55. Фрэска царквы Эльмалы ў даліне Гарэмэ. Кападокія. Візантыя.
56. "Распяцце". Фрэска царквы Эльмалы ў даліне Гарэмэ. Кападокія. Візантыя.
57. "Імператар Канстанцін Манамах і імператрыца Зоя перад Хрыстом". Мазаіка храма Ая-Соф'я. Сярэдзіна XI ст. Канстанцінопаль. Візантыя.
58. "Імператар Іаан-II Камнін і імператрыца Ірына перад Божай Маці з немаўляткам". Мазаіка храма Ая-Соф'я. XII ст. Канстанцінопаль. Візантыя.
59. "Хрыстос". Мазаіка храма Ая-Соф'я. XII ст. Канстанцінопаль. Візантыя.
60. "Божая маці з немаўляткам". Мазаіка храма Ая-Соф'я. XI ст. Канстанцінопаль. Візантыя.
61. "Божая маці на троне". Алтарны абраз з Канстанцінопаля. Каля 1280 г. Візантыя.
62. Феафан Грэк. "Макарый Егіпецкі". Фрагмент роспісу царквы Спаса Праабражэння ў Ноўгарадзе. XIV ст.
63. Феафан Грэк. "Галава Ноя". Фрагмент роспісу царквы Спаса Праабражэння ў Ноўгарадзе. XIV ст.
64. Андрэй Рублёў. "Троіца". Абраз іканастаса Траецкага сабора Сергіевага манастыра. XV ст.
65. Царква Пакрова на Нерлі. XII ст. Уладзіміра-Суздальская школа дойлідства. Уладзімір.
66. Дзмітрыеўскі сабор. XII ст. Уладзіміра-Суздальская школа дойлідства. Уладзімір.
67. Арх. А. Фіараванці. Успенскі сабор Маскоўскга крамля. XV ст.
68. Царква Узнясення ў Каломенскім. XVI ст.
69. Арх. Барма і Поснік. Сабор Васіля Блажэнага (Пакроўскі сабор на Рву). XVI ст. Масква.
70. Сымон Ушакоў. "Вялікі архіерэй". Абраз. 1658 г. Дзяржаўны гістарычны музей. Масква.
71. Сымон Ушакоў. "Спас нерукатворны". Абраз. 1678 г. Дзяржаўная Траццякоўская галерэя. Масква.
72. Сабор Святога Марка ў Венецыі. Раманскі стыль. XI–XV стст. Італія.
73. Архітэктурны комплекс у г. Пізе. Раманскі стыль. Пачатак будаўніцтва 1063 г. Італія.
74. Дыван з Баё. Раманскі стыль. XI ст.
75. Сабор Парыжскай Божай Маці. Гатычны стыль. Першая палова XII ст. Францыя.
76. Палац Дожаў у г. Венецыі. Гатычны стыль. XI–XVI стст. Італія.
77. Вімана. XVII ст. Індыя.
78. Шыкхара. X ст. Індыя.
79. Маўзалей Тадж-Махал у Індыі. XV ст.
80. Пагада. Правінцыя Фуцзянь. 1238 г. Кітай.

81. Ма Юань. “Поўны месяц”. Каля 1200 г. Кітай.
82. Пагада храма Чонімса каля Пуё. 662 г. Карэя.
83. “Зялёная Тара”. XVII ст. Манголія.
84. Маўзалей у Карабаглары. XIV ст. Азербайджан.
85. Павільён палаца шырваншахаў у г. Баку. XV ст. Азербайджан.
86. Маўзалей Ісмаіла Самані ў г. Бухары. Канец IX – пачатак X ст.
87. Плошча Рэгістан у Самаркандзе XV–XVII стст.
88. Альгамбра (рэзідэнцыя ўладароў) у г. Гранадзе. 1377 г. Іспанія.
89. Царква Рыпсіма ў Эчміадзіне. 618 г. Пабудова званіцы XVII ст. Арменія.